Алесь Жук

# НА ДАЗОРНАЙ СЦЯЖЫНЕ



Алесь Жук

# НА ДАЗОРНАЙ СЦЯЖЫНЕ

АПАВЯДАННІ
І АПОВЕСЦІ

Мінск
«Юнацтва»
1990

ББК 84 Бел7
Ж 85

*Для старэйшага школьнага ўзросту*

Мастак А. А. КАРПОВІЧ

В книгу лауреата премии Ленинского комсомола Белоруссии и литературной премии имени И. Мележа А. Жука вошли повести, посвященные жизни и будням сотрудников милиции, следователей, а также рассказы о наших молодых современниках: рабочих и сельских механизаторах, ученых и студентах, учителях, воинах. В центре внимания — их духовные поиски, размышления над своей жизнью и судьбой Родины.

Жук А.
Ж 85 На дазорнай сцяжыне: Апавяданні і аповесці: Для ст. шк. узросту/Маст. А. А. Карповіч.— Мн.: Юнацтва, 1990.—367 с.: іл.

ISBN 5-7880-0380-6

Жук А. На сторожевой тропе: Рассказы и повести.

У кнігу лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і літаратурнай прэміі імя І. Мележа А. Жука ўвайшлі аповесці, прысвечаныя жыццю і будням супрацоўнікаў міліцыі, следчым, а таксама апавяданні пра нашых маладых сучаснікаў: рабочых і сельскіх механізатараў, вучоных і студэнтаў, настаўнікаў, воінаў. У цэнтры ўвагі — іх духоўны пошук, роздум над сваім жыццём і лёсам Радзімы.

Ж $\frac{4803120201-058}{М 307(03)-90}$ 65—90

ББК 84 Бел 7

ISBN 5-7880-0380-6

© Выдавецтва «Юнацтва», 1990

# АПАВЯДАННІ



# ХЛОПЧЫК НА КРАІ ПОЛЯ

— Чым гэту падлу дзяржаць, кабана б лепш выкарміў,— Була замахнуўся нагой на рослага, вастравухага і паджарага сабаку, помесь сібірскай лайкі з дварнягай. Той вінавата апусціў голаў і ступіў убок, за гаспадара.

— Падла! Што ты тут, мол, сваё я паказваеш? Ён цябе як пужне! — заступіўся за сабаку гаспадар, сярэдняга росту, круглатвары, як жанчына, Моля. Яго ружовы твар вечна быў парослы рыжаватай шчэццю. Пад пахай ён трымаў куфайку, у другой руцэ — таўставатую палку. Молем яго празвалі пасля арміі з-за прывезенага адтуль «мол я», якое Моля пад чаркай устаўляў пасля кожнага слова.

Мужчыны стаялі пры загарадзе. Даяркі пачыналі даіць кароў, і ў надвячоркавай цішыні першыя струменьчыкі востра пазвоньвалі аб дно даёнак. Адыходзіў яшчэ адзін цёплы, сухі, нават і душнаваты жнівеньскі дзень. Але пасля таго як сядзе сонца, свежа, не па-летняму пацягне ветрыкам.

Була быў адзеты ў галіфэ, пінжак і хромавыя боты, на галаве пажоўклы летні капронавы капялюш — усё ж начальства, загадчык аддзялення. Ён лена пацвельваў над Молем з-за таго, што зайздросціў таму на сабаку.

А наогул яны вымушаны былі чакаць, пакуль даяркі падояць кароў і па малако прыйдзе з цэнтральнай машына. У вёсцы сваіх пастухоў не знайшлося, і Моля згадзіўся пайсці пастухом на гэтую ферму толькі пасля таго, як старшыня накінуў яму да зарплаты дваццатку — камандзіровачныя, як гаварыў сам Моля. Була таксама вымушаны быў пайсці сюды загадчыкам аддзялення, бо на цэнтральнай яму, пасля выхаду на пенсію,

ніякай «кіруючай» пасады не прадбачылася. Сядзець склаўшы рукі яму, здароваму яшчэ мужчыну, не было як, а ісці ў пастухі Булу не дазволіў гонар — у калгасе ён увесь век пражыў на кіруючых пасадах, ніжэй фуражыра не апускаўся, на пенсію пайшоў з брыгадзіраў. Ісці ў пастухі і раўняцца з Молем яму ніяк нельга было, хаця пастухоўскі заробак муляўся яму. Моля зарабляў больш за яго разоў у чатыры, калі не ў пяць. Ён не пабаяўся пакінуць трактар, з механізатара зрабіцца пастухом гадоў дзесяць назад. Тады з Молі пасмейваліся — у даяры б ужо ішоў, каб у газетах распісалі і па тэлевізары паказалі. Моля на смешкі не зважаў — ведаю, што раблю, пасмяецца той, хто будзе смяяцца апошнім. Ён палічыў, колькі на трактары ўдыхае пылу, дыму і іншай мазутнай і саляравай атруты. На пашы ж ён, як на курорце, летам зранку ходзіць босы па расе,— яна не толькі здымае ўсе хваробы, але і здароўе наперад дае. Моля выпісваў цэлы жмут газет, у тым ліку і «Медицинского работника», насіў іх з сабой на пашу і прачытваў за дзень усе ад пачатку да канца. Часу чытаць хапала — на пашы стаялі электрапастухі, ды і Тузік быў навучаны пасвіць гавяду.

— Праўду, Аддзялёны, кажаш.

З-за кароўніка выйшаў, на хаду зашпільваючы штаны, Паваляй, Молеў напарнік. Фуфайку ён надзеў ужо, а галава, сівая, коратка астрыжаная, была без шапкі. Паваляй адзяваў лёгкую спартыўную шапачку з доўгім казырком толькі ў самую спякоту, а так з вясны да асенніх дажджоў хадзіў з «босай» галавой.

Паваляй — равеснік Булы, яны некалі разам вучыліся ў школе, разам прызываліся перад вайной у армію. Паваляй за час вайны выслужыўся да афіцэра, астаўся ў арміі і пасля вайны, пакуль яго ў шасцідзесятыя не спісалі ў запас у званні старшага лейтэнанта. Пасля вяртання дадому ён пахадзіў брыгадзірам, потым загадчыкам фермы, але навык кіравання, які ён набыў у

ахоўных войсках, у калгасе не надта падыходзіў, таму паступова ён сышоў да пастуха. Высветлілася яшчэ, што ў час ваеннае неразбярыхі ён умудрыўся — цяпер невядома нашто, хіба каб перад бабамі пакрасавацца? — абмаладзіцца на цэлых пяць гадоў. У свой час, можа, і была нейкая выгада ад гэтага амаладжэння, але цяпер з-за пенсіі даводзілася адрабляць гэтыя пяць маладзёжных год.

— Пужні яго, дык Моля суткі шукаць будзе,— злёгку ў нос прагугнеў Паваляй. Ён быў худы і рослы, на дзве галавы вышэйшы за Булу і за Молю.

— Паспорым, што не пужне,— ружова расплыўся ад усмешкі Моля.

Паваляй ужо спрачаўся з Молем і купіў дзве бутэлькі віна.

— Спорым,— азваўся Була, хаця яшчэ не вырашыў, што рабіць. Занятку не было, і машыны на дарозе пакуль што не відаць і не чуваць.

— На колькі? На два «фаусты»? — Моля сам ступіў да Булы.

Сабака знізу ўгору глянуў на гаспадара, нахіліў набок голаў, быццам хацеў зразумець, што збіраюцца рабіць гаспадар і мужчына, якога Босы добра ведаў і на якога не меў ніякай сабачай злосці.

— Давай, я перабіваю,— Паваляй стукнуў па руках.

Була моўчкі ўзяў з рук у Паваляя гэтакі ж гладкі і ёмкі, як і ў Молі, кій, ступіў да сабакі і замахнуўся.

— Тузік, узяць! — загадаў Моля, і Була толькі ўспеў угледзець чорную сабачую пашчу з белымі клыкамі, выпусціў палку, закрыўся рукамі і не ўстояў на нагах ад мяккага, але цяжкага ўдару ў грудзі.

Калі ён развёў крыху рукі, убачыў над сабой сабачы аскал, пачуў утробнае гырчанне, як над косткай, і кароткае гарачае дыханне.

— Тузік, ка мне! — пачуў ён Молеў голас і адчуў, што сабака саскочыў з яго. Прыпадняўся, ашаломлены

і спалоханы, азірнуўся, шукаючы капялюш вакол сябе.

Сабака зноў схаваўся за Молю, які задаволена ўсміхаўся ўсімі сваімі рэдкімі і жоўтымі зубамі.

Паваляй жа сагнуўся ад смеху, толькі і змог папытаць:

— Ну, маць тваю, Аддзялёны... Як? Не адзін я, дурань, паспрабаваў. Уставай!

Усе ўтрох не ўгледзелі, калі пад'ехаў і прытармазіў на дарозе аграномаў «козлік». Дзверцы прачыніліся, і аграном гукнуў:

— Була, ты што, напіўся?

Була падхапіўся на ногі. Усе плечы яго былі запудраны пылам.

— Не, ён з Молевым сабакам падужаўся,— выскаліўся Паваляй.

— Талейку на трактары не бачылі?

— Не,— адказаў Була.

Ляпнулі дзверцы, і машына пакурэла пылам далей праз вёску ў поле.

— Ён ля пашы араў сёння. Пасля Антось канцавы папрасіў, каб іржышча на пляцы заараў.— Моля ўсё пасміхаўся, цяпер невядома ўжо, ці з Аддзялёнага Булы, ці з Талейкі.— Загуў Талейка, не нойдзе яго аграном. Антось гарэлкі не пашкадуе.

Моля з Талейкам разам вучыліся на механізатараў, і цяпер, хоць Моля і лічыў, што лепш за Талейку ўстроіўся ў жыцці, усё ж зайздросціў, калі пра Талейку пісалі ў раённай газеце, нават друкавалі фотаздымкі: Талейка і на пасяўной, і на жніве хадзіў у пераможцах. Ён умеў дагледзець і трактар, і камбайн, любіў сваю работу. Яшчэ Моля дасюль не мог забыцца, што Талейка з-пад носа ў яго забраў Ядзю. Моля быў упэўнены нават, што Ядзя сама больш хацела за яго, за Молю.

— Хай шукае, гэта не наша дзела,— буркнуў Була, зняў пінжак і страсянуў яго ад пылу.

— Ядзя, чула, твой Талерка зноў загуў. Аграном

ездзіць шукае,— гукнуў задаволена Моля шыракаплечай даярцы ў белай касынцы, завязанай на патыліцы.

— Загуў, то і адгудзе. А ты як зарыеш, то і нос аблупіш,— адрэзала яна і выставіла да дзвярэй бітон з малаком. Пад чаркай Моля быў слабы на ногі, а таму часта хадзіў з аблупленым тварам.

— Давай, Аддзялёны, на пашу заўтра валачы «фугасы»,— памятаў сваё Паваляй.

Да кароўніка пад'язджала машына — па малако. Ядзя вярнулася дадому з кароўніка прыцемкамі. Сына не было дома, мужа таксама. Мабыць, Моля гаварыў праўду. Падаіла карову, і толькі тады на двор на матацыкле ўз'ехаў Коля.

— Дзе ты быў?

— Купаўся з хлопцамі на возеры.

— Бацьку не бачыў? Дзе ён сёння?

— Араў ля пашы.

— Мабыць, наараўся ўжэ. Аграном, Моля казаў, ездзіць шукае яго. Праедзь ты паглядзі. Пінжак адзень, холадна ўжо ў адной рубашцы.

Сын быў нечым падобны на бацьку і паставай, і кудлатымі валасамі. Ён і хадзіў, як бацька, пакалыхваючыся з боку на бок. І рукі нёс, як бацька, цяжка, натомлена. Змалку Валодзя вадзіў за сабой і старэйшага, і маладзейшага. Ён любіў быць з дзецьмі, і яны не мінялі яму ніколі, якую б работу ні рабіў. Даваў гайку пакруціць, трактарам пакіраваць. Дзеці і прывучыліся да машын. Ядзя з ахвотай некалі адпраўляла з мужам хлопцаў — пры дзецях ён мог дзяржацца, каб не піць.

Бацьку Коля знайшоў хутка — ля кожнага поля ён ведаў бацькавы схованкі. Трактар стаяў збоч поля пад трыма разложыстымі і вялікімі, як стагі, лазовымі кустамі. Матор ціхенька вуркатаў на халастых абаротах, а гаспадар яго на ладным ахапку сена пад фуфайкай смачным храпам перамагаў і матор.

Хлапчук доўга катурхаў бацьку, які адмахваўся ад

яго рукамі і мацюкаўся,— спрасонку яму здавалася, што будзіць яго аграном.

— Пайшоў ты, Данілавіч,— адпраўляў ён начальства туды, куды не ходзяць, але пра субардынацыю не забываўся — называў па бацьку.

— А ты, Пятровіч, яшчэ не вылежаўся? — не адступаў Коля, пакуль бацька ўсё ж не расшалопаўся.

— Мілы ты мой, знайшоў прапажу,— Талейка памкнуўся абняць сына. Цяпер ён любіў усіх, нават агранома, які найбольш пільнаваў яго.

— Садзіся, паехалі мацеры здавацца. Дзяржыся толькі, каб не згубіўся.

— Я не згублюся. Куды мне з гэтай зямлі згубіцца? Гэта вы ў свет як у капейку пойдзеце і пагубіцеся. А я тут астануся. Шу-умяць вербы...

— Шумне, шумне маці...

— Не баісь, сын, яна ў нас харошая... Шумяць вербы...

Ядзя адчыніла вароты і чакала іх на двары.

— Жонка, мілая мая!..

Талейка падаўся да жонкі, і тая не ўспела адхіліцца, згроб яе ў бярэмя і пачаў цалаваць.

— Мурза ты п'яная! Пусці ж, рэбры паломіш! Дзіця пасаромейся!..

— Мілая ты мая!..

— Пайшлі, пайшлі ўжэ на сена, мілая. Ці вячэраць хочаш?

— Не, нічога не хачу.

— То пайшлі на сена ляж... Ну не лапайся, госпадзі! Дам па руках!

Ядзя завяла мужа на сена, на пасланыя посцілкі, зняла фуфайку, прыкрыла старой коўдрай.

Павячэралі з сынам. Той пайшоў яшчэ пагуляць на вуліцу да хлопцаў. Ядзя зайшла ў хлеў, паглядзела, як спіць муж, папправіла голаў на падушцы, выйшла, пастаяла пры дзвярах і зачыніла іх на затычку.

Назаўтра раніцай, пасля таго як вярнулася з кароўніка і зазірнула ў хлеў, убачыла пустую пасцель. Пры шуле стаяла вынятая з-пад дзвярэй падваротня. Цяпер калі муж дападзе да цэнтральнай сядзібы, то сапраўды «загудзе» на некалькі дзён — хто не паставіць чарку чалавеку, які не сёння-заўтра будзе патрэбны?

Ядзя зайшла ў хату, пабудзіла сына.

— Уставай, схадзі на работу. Брыдка ж, каб трактар стаяў.

— А дзе ж бацька?

— Панёсся, як цялушка ў партызаны. Пад варотамі, зараза міленькая, вылез.

— Ну дае!

Праз паўгадзіны хлапчук у камбінезоне, у кірзавых ботах з нізка абкасанымі халявамі, з берэткай на галаве, каб не запыліць шавялюру, яшчэ больш падобны на бацьку, ехаў на матацыкле ў поле.

Харытонавіч прачынаўся рана, разам з жонкай, якая ўставала даіць карову. Паволі адзяваўся і слухаў радыё. Стала прывычкай чытаць вечарам газеты, а раніцай слухаць радыё. Потым дапамагаў жонцы карміць свіней. На год яны калолі двух кармлякоў. Аднаго калолі на зіму, другога на лета. Некалі на лета, пакуль былі меншыя, прыязджалі ўнукі. Цяпер падраслі і ў горадзе ў іх былі большыя інтарэсы. Ды і дзеці прыязджалі рэдка, праўда, пасеяць пляц і выкапаць бульбу збіраліся. А летам Харытонавіч адзін касіў сена на карову. Карову дзяржалі, бо без каровы ўжо нежывая гаспадарка...

Пяты год, як Харытонавіч пакінуў работу ў школе і пайшоў на пенсію. Спачатку радаваўся, што будзе час адпачыць і пачытаць кнігі, якія пакрысе купляў усё жыццё. Але адным чытаннем і ляжаннем не можа адбыць стары чалавек. І Харытонавіч узяўся за сад, потым за платы...

Ён крыху пахудзеў, рукі і твар загарэлі да чарнаты, і загар гэты не сыходзіў за зіму. Перастала мучыць адышка, і ў целе з'явілася нейкая ўжо старэчая хлапчукоўская лёгкасць.

Касіў сена Харытонавіч на меліярацыйных канавах. Затое, што накошваў, павінен быў даглядаць русло. Гэту прывілею даў яму старшыня. Хаця, каб на добры лад агледзець асушаныя калектары, можна было б і калгасу ўзяць сена, і людзям даць гатовага,— як гэта рабілі суседзі.

Харытонавіч бачыў, як прыгналі кароў, падключылі электрапастуха Моля з Паваляем і селі гуляць у карты. Яны цэлыя дні маглі гуляць у «падкіднога». Пасля палучкі, праўда, дзён колькі па чарзе хадзілі ў магазін і тады да вечара спалі. Сон іхні пільна вартаваў сабака, нікога не падпускаў і блізка.

Молю некалі Харытонавіч вучыў у школе. Ставіў тройкі, бо арыфметыку Моля запомніць ніяк не мог, пісаць не служылі рукі, а чытаць не паварочваўся язык. Аднаго разу ён прачытаў замест «пёсик, пёсик, иди сюда», «посік, посік, ідзі сюда», за што яго і дражнілі Посікам да канца школы, пакуль не прывёз са службы новую мянушку. Затое Молю нельга было пазнаць, калі дападаў да коней, якіх даглядаў яго бацька, аднарукі пасля вайны. Моля не адставаў ад яго, Моля змалку ўмеў усё: і воз накласці, і касіць, і араць. Ён курыў бацькаў самасад, мацюкаўся, як мужчына. Гэта пасля арміі Моля акультурыўся, кінуў курыць, пачаў хадзіць босы па расе і знайшоў сабе пастухоўскую работу.

Часам Моля падыходзіў да Харытонавіча пагаварыць. Апошнім часам ён любіў пагаварыць разумна і нават павучыць.

— Ты не дагадаўся, Харытонавіч... Трэба табе было перад пенсіяй пайсці і кароў папасвіць. І грошы меў бы, і сена, як калгасніку, прывозілі б.

— Што ты, Моля, кажаш? — за панібрацтва Хары-

тонавіч плаціў мянушкай, але Моля да яе прывык і не звяртаў увагі нават і на тон, якім яму адказвалі.

— Думаеш, чаго Паваляй даходжвае? Пенсію добрую хоча.

— І ты думаеш да пенсіі дарабіць? Доўга табе яшчэ. Прыдумаюць які аўтамат — і закрылася лавачка.

— Пакуль той аўтамат, я столькі назбіраю, што з мяне на сто год хваціць!

Не пахваліцца Моля таксама не мог.

— Твой жа Толік іх за год распатроніць. Ты ж яму і так ужо плоціш...

Пра маладзейшага Моля не любіў, калі гаварылі: і вучыцца не хацеў, і да работы не прыгыркаць. Моля нікому не прызнаваўся, што плаціў сыну пяцёрку, каб адпасвіў чаргу кароў.

— Пойдзе ў армію, абразуміцца, мол, я па сабе ведаю!

Харытонавіч бачыў, як заселі пад кустом пастухі, потым прыехаў Талейкаў хлапчук у камбінезоне і ў ботах. Харытонавіч ведаў ужо, што Талейка запіў. Праз некаторы час пачуўся з кустоў трактарны «пускач», потым выехаў і пайшоў на поле з паднятымі плугамі трактар. Дзіва ў гэтым не было — меншы Талейкаў на першы раз падмяняў на рабоце бацьку.

Заняты кошляй, Харытонавіч не заўважыў, калі да пастухоў прыйшоў Була. Роўна шахала каса, падымалася, прыгравала сонца, пругка, як хвалі вады, наплывалі павевы ветру, лазовае лісце на кусціку над вадой пачынала трымцець, і ў ваду, як лодачкі, падалі першыя пажоўклыя лісткі, шнурочкам сплывалі па плыні. Набліжаўся і аддаляўся роўны гул трактарнага матора, таксама прывычны, нечым у адзінае звязаны з надыходам восені, з першым жоўтым лісцем на пахаладзелай вадзе.

Паглядзець на пастухоў Харытонавіча прымусіў здаровы рогат. Першыя шклянкі віна былі выпіты.

Рагаталі з Аддзялёнага Булы — Моля чапляў яму на плечы «пагоны», а той агрэбаўся.

Па полі роўна хадзіў трактар, і за ім аставалася прыгладжаная баронамі свежая стужка асенняга вора, па якой услед за трактарам падлятала чарада крыклівых і мітуслівых перададлётных кнігавак.

Дзень набіраў сілу, прыгравала сонца, у жнівеньскай смузе журылася далечыня, а ветрык па-асенняму падхопліваў на дарозе і ўслед за трактарам закручваў, як снегавымі ўзвевамі, пылам...

— Харытонавіч! Ідзі сюды, Харытонавіч!

Моля махаў яму рукой, і Харытонавіч угледзеў, што ля іх стаіць і Талейкаў хлапчук.

Мужчыны весяліліся. Була шморгаў носам — такое ў яго было пакаранне: як толькі выпіваў чарку, пачынаў шморгаць носам.

— Харытонавіч, падапхні ідзі яму трактар! Каб на гусеніцу ўз'ехаў!

І Моля, і Була, і Паваляй смяяліся ад таго, што ім было добра, хацелася пасмяяцца на поўны жывот. І яго пазвалі, каб павесяліўся разам з дзіцячай дурасці.

— Мне чуць гусеніцу падцягнуць, палец выпаў, разуўся трактар,— сур'ёзна, яшчэ і сам вінавата ўсміхаючыся, спрабаваў тлумачыць хлапчук.— Далей я сам...

Ён раптам асекся, зразумеў, што яго не хочуць разумець. Голас скалоўся, вочы расшырыліся ад набеглых слёз простай і горкай дзіцячай крыўды. Хлапчук перавёў позірк на Харытонавіча, на настаўніка, нібы пытаўся ў яго пра нешта простае і незразумелае.

Була смяяўся, прыплюшчыўшы вочы і шморгаючы носам, хіхікаў Моля, як і заўсёды, цверазейшы за астатніх, гыкаў Паваляй.

Хлапчук завярнуўся, неяк быццам ссутуліўся, паменшаў і так невялікі ростам, пайшоў назад да трактара, сагнутай у локці рукой коратка, быццам незнарок, правёў па вачах.

— Була, такую тваю, гаспадар! Як вам не брыдка! Паскуства!

Була першы перастаў смяяцца, расплюшчыў вочы, глянуў імгненна працверазелымі вачыма на старога настаўніка. Перастаў пахіхікваць Моля, гыгыкнуў яшчэ раз колькі Паваляй.

— Плюнь, Коля! Я паеду на абед, вызаву «лятучку»,— гукнуў услед хлапчуку Була, але той быццам і не пачуў.

Паволі ішоў да трактара, і з-пад ботаў у яго вецер падхопліваў і закручваў пылам. Харытонавічу здалося, што і яму дастала пылам да вачэй.

— Бач, аплік, з гонарам! — мацюкнуўся неяк няўпэўнена Була і загадаў Молю: — Разлівай!

Харытонавіч моўчкі плюнуў, завярнуўся і пайшоў, чуў, як хіхікнуў услед Моля: «Яшчэ адзін ненармальны найшоўся!»

Харытонавіч бачыў, як заглушыў трактар і паехаў з поля хлапчук, хутка знік ад пастухоў і Була. Трактар прастаяў цэлы дзень. Пад вечар прыехала «лятучка», за некалькі хвілін мужчыны нацягнулі гусеніцу і пагналі на ноч трактар на цэнтральную сядзібу.

Стары настаўнік глядзеў услед трактару, і яму ўсё здавалася, што рэжа ў вачах ад пылу з недааранага хлапчуком поля.

## ПАГАРЭЛЬЦЫ

Час ідзе, бярэ сваё жыццё. Сцішана глядзіць вёска з-пад засені векавых прысад на новыя пасёлкі, цэнтральныя сядзібы. І жыве, упэўненая ў сваёй патрэбнасці, сваёй праваце, зносіць ціха і цярпліва, па-сялянску, добрае і дрэннае, успамінае старое жыццё і дзівіцца праявам новага. Хаця здзівіць яе ўжо і цяжка — такога

наглeдзелася. Летам толькі ажывае галасамі сваіх гарадскіх унукаў, якіх наязджае болей, чым саміх жыхароў асталося. Слухае і ведае таямніцы бацькоў іхніх, якіх яна нарадзіла, а разам з імі і многа такога, што яшчэ гадоў дваццаць таму ёй і сасніцца не магло. Напрыклад, легкавічкі, якія сёння пыляць па вуліцы, а на ноч хаваюцца ў гаражы, што павыстаўлялі з платоў на вуліцу тлуста пафарбаваныя чырвоныя, сінія, срабрыстыя жалезныя вароты.

Першы даў форсу Віцічак: невялічкі, шчуплы мужчына ў дзігіналевым салдацкім фрэнчы, галіфэ і ботах. Твар у яго заўсёды зарослы рэдзенькай рыжаватай шчэццю. Нават на святы, калі галіўся, усё роўна здавалася, што маленькі твар яго зарослы. А на самім Віцічку не касцюм, а дзігіналевы фрэнч.

Вёска ведала, што Віцічак прагны на работу і на дабро. Як толькі крыху абжылася вёска пасля вайны, Віцічак улёг збіраць грошы: свіней трымаў, бычкоў гадаваў, гусей, качак... Акрамя калгаснай работы зранку і вечарам цягаў мяшкі з зеллем усё лета. Потым падрасла старэйшая, Таня, пайшла ўслед за бацькамі ў работу.

У той час Віцічак быў схадзіў нават і ў начальства — пабыў брыгадзірам. Нядоўга, праўда. Дапамаглі зайздрасць і звяглівасць. Выгледзеў у жніво, што нехта схаваў пад саломай у полі кучу збожжа. Не вытрывала душа, сам паехаў дармавое забраць. На тым і папаўся.

Пасля Віцічак гаварыў канцавому Косціку:

— Нацёрта яно мне было тое брыгадзірства! Толькі з людзьмі настыраешся, а наробку ні каліва. Цяпер цялят пасу, у месяц больш за самога старсыню зарабляю!

Але гэта ўжо пасля строгай партыйнай вымовы і таварыскага суда.

— Дык цялят можна і не камуністам будучы пасвіць. А то ж плаціць трэба,— пад'ялдыкваў Косцік.

— У арміі ж нас, лепшых, прымалі, хто ж яго думаў...

Віцічак спахопліваўся і замаўкаў, на ўсякі выпадак азіраўся, ці няма каго паблізу, акрамя Косціка.

Віцічак ганарыўся, што здагадаўся і не пасылаў сваіх дзяцей у горад у вялікую навуку, як модна было на першым часе. Праўда, і самі іхнія атэстаты падказвалі, што гэтакі блат будзе дорага стоіць ды і невядома, што з яго выйдзе. Сваёй мудрасцю Віцічак потым і пахваляўся.

— А сто цяпер тая навука дае? Нуль цэлых, ... дзесятых. Мая ў сталоўцы робіць, галава не баліць, усяго хапае!..

Рабацяшчая і змысная, яго Таня ў сталоўцы знайшла сваю залатую жылу. Прыязджала дагледжаная, разадзетая.

— Цэлую сумку навезла яды. Сьто толькі хоцясь! — хваліўся Віцічак.

— То і мяне б пачаставаў,— абзываўся Косцік.

— Пайшлі! Яна да мяне без бутэлькі горкай і не едзе!

Віцічак ведаў, што цяпер яго Вера нікуды не дзенецца, выдасць прывезенае дачкой.

Потым Тані і вяселле справіў. Без вялікага размаху, але і не беднае. Маладыя ў сельсавет распісвацца на легкавых машынах ездзілі — зяць працаваў на рэмзаводзе, і Тані з «торгу» «Волгу» выдзелілі.

— Сьто ты хоцясь! У яго рукі залатыя. Усе да яго — выручы!..

Зяць умеў рабіць грошы. Хутка Таня прыязджала на ўласнай «Волзе». Зяць не без дапамогі Віцічка купіў старую машыну, а перарабіў у новую. Потым на вуліцы насупраць Віцічкавай хаты выраслі штабялі лесу, з якіх потым на ўчастку ў горадзе, які маладыя купілі разам з «урамянкай», устаў звонкі, з вялікімі вокнамі дом.

— Усё сваё. Сад. Агарод. Як і не ў горадзе, а на дацы. Толькі кватаранты за ўрамянку шэсцьдзесят рублёў плоцяць у месяц!..— не мог нацешыцца Віцічак.

Таня Віцічкава тым часам зліласяў мажную, моцную, як злепак, маладзіцу. І зяць пакруглеў з твару, заблішчаў, а вусы распушыліся і натапырыліся. Пад домам ягоны гараж ператварыўся ў майстэрню. Аднаго, чаго не хапала Віцічку,— унукаў. Калі спачатку ён мудра пасміхаўся: «Абжыцца трэба, а дзяцей нарабіць навука невялікая»,— то цяпер памоўчваў, не прызнаваўся, што Таня і па дактарах ходзіць, і на курорты ездзіць. Каб насаліць Віцічку, суседка Шура, з якой мяжу на пляцы Віцічак не можа навесці і да сённяшняга дня, гаварыла ўсім:

— Дзе ж тое дзіця будзе? Каб даставаць, усім падстаўлялася. Лякарствы піла, каб дзяцей не было. А цяпер ялаўкай і зжыве!

— Ну што ты ад дурной Сулкі хоцас? — разводзіў рукамі Віцічак.

Але і без Шуркі ведала вёска, што неаднойчы зяць, пасля таго як добра «закідаў» з цесцем, ганяў ноччу жонку з пастронкам у руках па садзе, называў адным толькі словам. Тая скуголіла, а Віцічак з Верай пераймалі зяця і ўпрошвалі:

— Колечка, людзі ж пачуюць! Брыдка будзе...

Тым часам рос і Віцічкаў Вова. Гусей ён яшчэ пасвіў паслухмяна, а далей пайшоў сучаснай дарогай. І як ні крывіўся Віцічак, а купіць сыну матацыкл у восьмым класе давялося.

— Школа цяперасьняя дзяцей распусціла. Цьорт ведае дзе ўсю ноч на матацыклах лётаюць! Я б то свайму не купіў, але Таня... Грошай хапае, падарыла.

Гэтак гаварыў Віцічак, але вёска ведала, што даў грошы сам Віцічак пасля таго, як Вовік раніцай закрыў шклом комін, калі маці толькі запаліла ў печы, а дзверы калом падпёр. Давялося Віцічку праз акно вылазіць. Хоць летам гэта і лёгка, але ж не хацелася, каб суседзі бачылі, як дым праз вокны валіць. Вовік прыгразіў, што калі не купяць матацыкл, то не такое яшчэ ўчыніць.

Год пасля школы Вовік гойсаў на матацыкле на ўсе гулянкі ў наваколлі, пакуль не забралі ў армію. Праз два гады Віцічак гаварыў:

— Армія сьтука добрая, мухі выганяе! Таня яго на мясакамбінат прыстроіла. На каапераціў на царгу стаў. А дзеўку яму я сам добрую прыгледзеў, Мішы з Замосця. Дарма, сьто маладая, але Міша дваццаць тысяч рублёў на каравай даў ёй!..

— А ты, багатыр, нябось зажаўся. Рады, што свата багатага знайшоў,— паддзеў Віцічка Косцік.

— Цяму? Я на ўсю абстаноўку, як палучаць кватэру, даў.

— Пакуль таго каапературыву дачакаешся...

— А ім за каршэнь не капае. У Тані жывуць, ва ўрамянцы. Гэта толькі сказаць, што ўрамянка, а так нармальная хата. Чакай, колькі табе хоцяцца! Усе разам, як адна сям'я— завяршаў гаворку шчаслівы Віцічак, і Косцік уздыхаў:

— Што тыя дваццаць тысяч. І я б іх даў, каб хто толькі маю браў.

Ішло жыццё. Зліквідоўваліся, а потым зноў пачалі называцца перспектыўнымі вёскі. Але пераcталі ў магазінчыкі, якія былі ў кожнай вёсачцы, штомесяц прывозіць па цэлай машыне «чарніла». А як перасталі прывозіць, то магазінчыкі тыя зачынілі, пару разоў на месяц аўталаўку прысылаць сталі. І ўсё зноў рабілася з клопатам пра чалавечы фактар, а той гэтага не разумеў. І мацюкаўся. Гэтак жа, як і на «пажарнікаў», якія пачалі лазіць па будынках, чамусьці разам з участковымі і больш нюхаць па кутках, чым аглядаць гарышчы і каміны печаў. Але ж гэта толькі забаўкі ў параўнанні з тым, што перажыла вёска пад сваімі векавымі ліпамі і вязамі, што з ёю выраблялі, малюючы сонечныя перспектывы, пакуль людзей па свеце не разагналі. Меньшае і меньшае яна, як шагрэневая шкура, а таму кожны чалавек у яе на віду.

Некалькі дзён не паказваўся на людзі Віцічак, і пачалі перапытваць у вёсцы, ці не захварэў? Але не ехала ў адведкі на «Волзе» Таня і Вовік са сваёй не паказваўся.

Усё адкрылася, калі да Віцічка зайшоў у адведкі канцавы Косцік, які апошні месяц праз дзень ездзіў у горад у гарэлачны аддзел гастранома і гараваў у кампаніі з бутэлькай сваё гора: ягоная дачка пайшла доктарам у армію, у Афганістан.

— Ну, яна ж доктар, а не салдат. І вайна гэта, кажуць, к канцу ідзе. Мо і з мужам адтуль вернецца. Сьто табе, Косцік, гараваць вельмі! А ў мяне горш, чым у вайну, карацель прыйшоў! Вот воўк навадны вырабіў дык вырабіў! З Вовікавай Ларыскай злёгся! На развод падалі, палавіну ўсяго адсудзілі, селі на «Волгу» і паехалі! Там, кажуць, радзіяцыі няма. Куды ж цяпер мая Таня? А Вовік гуляе, грошы прапівае! От вырабіў! Горсь, чым немец прайшоў! Усю жызню — падчыстую! Пагарэльцы мы з Верай! Усю жызню будаваліся, а цяпер на галавешках сядзім. Пагарэльцы

Віцічак плакаў горкімі слязамі, Косцік ківаў галавой, глядзеў у акно, за якім стаяў душны жнівеньскі дзень. Млелі на сонцы векавыя прысады. З акна відаць было, як па гравійцы пыліла калгасная агітмашына з чырвоным лозунгам на будцы — «Усе сілы на...» — развозіла механізатарам абед у тэрмасах. За ёй уставала густая сцяна пылу бязлітасна спякотнага пасля чарнобыльскага лета і асядала на траву, на лісце, на даспелую збажыну.

# АБОЧЫНЫ

## I

— Здарова, мама! А бацька дзе?

Волька аж сцепанулася, разагнулася надта хутка, і боль востра адазваўся ў паясніцы, пад грудзьмі.

Валерык стаяў у разоры між цяўніку ў джынсах, у рубашцы з закасанымі рукавамі, чарнявы, рослы, як бацька.

— Трэба было апырскваць, а то рукамі,— Валерык плюнуў убок, кіўнуў на слоік з газай, у які Волька збірала каларадскіх жукоў.

— Вы ж скарэй сабе ў горла напырскаць спяшаеце...

Абіраць жукоў і позна было ўжо, адцвіла бульба, але і глядзець на гэту плойму на зялёным не ставала цярпення.

— А ты чаго прыкурэў у рабочы дзень? — папыталася яна ў сына.

— Прыехаў вот...

— На чым прыехаў?

— На сваёй.

— Чаго?

— Ну а што? Шэф пуцёўку падпісаў... Папяроўка яшчэ не асыпалася? Яшчык яму трэба падкінуць.

— Валя з табою?

Валерык не маргнуў і вокам:

— У яе субота рабочая. План даваць трэба.

Нявестка гэты план «давала» часта.

— Забраў бы і яе, ягады абарвалі б, закаталі ў банкі...

Вольга глядзела на сына: яна не магла ўлавіць, калі ён гаворыць праўду, а калі абманвае. Можа, таму, што часцей за ўсё ў сказаным была і праўда, і няпраўда. Як жыве сын і нявестка, яна толкам не ведала. Дагад-

валася, што не надта гладка. Валерык часта наязджаў дадому адзін, цаляў, каб трапіць на якое вяселле ці «фэст» у сваёй ці суседняй вёсцы. Фэстамі і дасюль называюць у вёсках гулянкі, якія арганізоўвае раз улетку моладзь. Ажаніўся, дзіця гадуе, а мяркуе яшчэ палятаць. Бацькава натура. Са школы навучыўся і чарачку куляць, і ў бойку гатовы, як порах. Дасюль угамону і сталасці няма. Ды і Валя, мабыць, не лепшая.

Волька нікому не гаварыла, але спакайней было, калі дзеці не прыязджалі. Тады пачынала думацца, што ў іх усё добра, бо хлопцы яе не дурныя, не горшыя за другіх. І сэрца менш балела, і ціск не падымаўся. На свайго ўжо, на Баранчыка,— мужа яна прывыкла зваць па мянушцы, ды ён і адзываўся на яе, увагі не звяртала. Змірыліся нервы, ці што, прывыклі да ягоных выбрыкаў. Ды і ён пастарэў, не тое здароўе — гарэлка свайго не даруе. Цяпер, калі ўспяваў дзе хапянуць, то не надта і шалеў — зваліваўся спаць, не лез біцца, і яна не хадзіла ў сіняках.

— Дык дзе бацька?

Валерку не стаялася на месцы ад таго, што маці гэтак прыглядаецца да яго, быццам нешта западозрыла.

— У крэмль свой схаваўся. Міліцыя сёння ў калгасе лавіла матацыклістаў.

— Ясна,— Валерык зноў рашуча плюнуў.— Кідайце гэту работу, заўтра апырскаем.

— Позна ўжэ пырскаць.

Валерык пашамаў на двор, а Волька зноў нагнулася над цяўнікам. На добры лад, то пустая гэта яе работа. Але думалася спакойна, пра сваё. Усё ёсць: і добрая хата, і сад, і агарод, выфарбавана і выраблена. Толькі няма гэтаму радасці і няма здароўя, нават ахвоты рабіць работу няма. І ўся гаспадарка быццам шэрая нейкая, запыленая ўся.

І боль у сэрцы, і ціск, дактары гавораць, ад нерваў. Таму і лякарства не дабраць.

Волька ўздыхнула.

Валерык тым часам выняў кіёк, якім былі закладзены дзверы ў веранду,— каб ведалі, што ў хаце няма нікога. У хату не пайшоў, з сянец завярнуў у каморку, па лесках узлез да люка на вышкі. Хавацца на вышках прыдумаў некалі ён. Калі ўзлезці туды, уперці калок у крокву і ў люк, то ніхто не дабярэцца. На вышках ён хаваўся, калі не хацелася ісці ў школу альбо ад бацькі, каб не адлупцаваў. Гэта ўспаміналася лёгка. Ды і ў жыцці ў Валерыка ўсё было лёгка: як прасвістаў у школе, потым у арміі, паехаў у горад, ажаніўся, але ў жыцці быццам нічога і не перамянілася.

Цяпер вышкі сталі бацькавай крэпасцю. Хаваўся адсыпацца пасля п'янак. Выбавіць яго адсюль мог толькі голад. На гарышчы стаяла паломаная раскладанка, на ёй падушка і стары кажух.

Волька час ад часу ўчыняла пагром гэтага логава, выкідала і раскладанку, і падушку, і кажух, але неўзабаве ўсё вярталася на свае месцы.

На стук ніхто не адазваўся, і Валерык загрукаў мацней.

— Бацька, канец асадзе! Гэта я,— падаў ён голас, бо зразумеў, што стукам нічога не возьме.— Чуеш, бацька, гэта я, Валерык!

На вышках пачуліся крокі.

— Ты?

— Я, не бойся. Раскідай барыкаду.

Люк адкрыўся. Сам Валовіч злазіць на зямлю грэшную не збіраўся.

Валерык ускочыў на гарышча, дастаў з кішэні цыгарэту.

— Куды гэту суслу! Пажару не хватала! — прыкрыкнуў Валовіч на сына. Ён сам не курыў і не любіў, што курыць сын.

— Здароў, недаступны. Які крумкач табе сюды яду носіць?

Валерык падаў бацьку руку. Абодва падобныя, толькі адзін малады, чысты, а другі ўсохлы, маршчыністы, нібы пакамечаны ўвесь. Вісела на ім рубашка, штаны віселі. Маладога адзенне аблеплівала, целу быццам і цеснавата было ў джынсах і ў рубашцы.

На гарышчы стаяла духата, хоць на дах і падаў цень ад клёна. Валерык падышоў да шчыта, адчыніў акно.

— Чаго акапаўся? — з выгляду бацька не быў п'яны.

— Лавіць прыехалі. Я машыну кінуў на цэнтральнай і цярэспаля дадому.

— Хто там вас ловіць?

— Міліцыя. Цяпер толькі так. У каго без нумароў, усе матацыклы пазабіралі. Пад'едуць к канцу работы, трубку ў зубы — і будзь гатоў.

— І што з табою зробяць? Хто заўтра малако павязе? Міліцыянер не астанецца малако вазіць.

— А яны штрафу. І самі шастануць, і калгас яшчэ следам. Дарагавата стала паддаваць.

— Не вельмі вас напужаеш. Хватануў жа недзе.

— Што я хватануў? Любецкаму лаўкі з клуба падвёз. У яго вяселле заўтра. Бутэльку чарніла на дваіх выпілі. А ты чаго прыкурэў у рабочы дзень? Вытварыў нешта?

Валовіч паглядзеў на сына.

— Мая ўчора палезла з рукамі пад нос. Па смаркачах даў троха,— нехаця прызнаўся Валерык. У тым, што дзве ночы не начаваў дома, «прагудзеў» з кампаніяй, прызнавацца не збіраўся. І што аванс прасадзіў амаль увесь — таксама.

— З бабамі рукі не вельмі распускай. Гаварыў табе — не спяшай голаў ушчаміць. Мог найсці і з хатай. А то шэсць чалавек сядзіце на адной кухні. Успеў бы...

Валерык махнуў рукой — пра што гаварыць. Мала ажаніўся, дзіцяці ўжо трэці год, а з кватэрай і не свеціць нічога. Але бывае і горш. І Валя баба адходлівая.

— Ты мо прывёз чаго? — стары Валовіч скоса кінуў вокам на сына. Той час, калі ў самога заўсёды была гарэлка, калі рабіў яе сам, прайшоў. Пакуль новыя законы і пакуль міліцыя, Волька разбамбіла ў варыўні ўсю ўстаноўку.

— У машыне.

— Ідзі, пакуль маці на пляцы. А я сыду, перакусіць чаго гляну.

Праз хвілін дзесяць бацька і сын на гарышчы мірна вялі гаворку, абодва задаволеныя і супакоеныя.

Вечарам Валерык з'ездзіў на возера, пакупаўся. Вячэралі маладой бульбай з халаднікам і сваёй каўбасой, якая дасюль вісела ў каморцы. Гледзячы на мужа і на сына, якія хораша сядзелі за сталом і гаварылі, Волька дастала з шафы, якая замыкалася на ключ, і паставіла на стол бутэльку віна. Яна, задаволеная, не заўважыла, што стары Валовіч падміргнуў сыну.

Пасля вады, пасля вячэры, змучаны чадам перажытых дзён, Валерык соладка заснуў пры адчыненым акне адзін на шырокім белым ложку, аж слінку пусціў на падушку.

Прачнуўся адразу ад сонца, якое свяціла ў акно. У галаве было ясна і свежа. Цела дужае, маладое. Лёгка ўстаў на ногі, усцягнуў штаны, накінуў на плечы рубашку, выйшаў на двор.

Маці пры плоце на лаўцы перамывала толькі што сарваныя першыя агуркі.

— Ну, выспаўся?

— Выспаўся. А дзе бацька?

— Малако павёз бацька. Ідзі, снедай, там у верандзе на стале стаіць. Ужэ і агуркоў табе найшла.

Толькі цяпер Валерык убачыў, што пры верандзе стаіць скрынька яблык і прыгатаваная яму сумка.

— Мне ж у панядзелак на работу, успею...— пачаў Валерык, але маці не дала дагаварыць.

— Не, сынок, у цябе сям'я, дзіця. Едзь і пагуляй з ім.

Тут вяселле, нашто мне думаць, дзе ты п'еш, дзе лётаеш, пакуль ушчэмішся? Каб Валя на мяне крыўдавала? На выхадныя прыязджайце ўсе разам, я малога даўно не бачыла...

Валерык павёў вокам туды, куды зірнула маці, убачыў пад лаўкай ля плота парожнюю бутэльку з-пад гарэлкі, якую ён учора выпіў з бацькам, і зразумеў, што так і будзе, як сказала маці.

— Ладна, паедзем,— бесклапотна згадзіўся ён, кіруючы сваёй дарогай за хлеў. Два дні сварыцца з жонкай ён не планаваў. Памірыцца з ходу наўрад ці ўдасца. Але перад маці нельга было падаваць выгляду, і ён па-дзеламу хутка выпіў чаю і вырулiў з двара.

Волька стаяла ў варотцах, глядзела ўслед машыне. І з палёгкай, што паехаў сын, і з сумнай трывогай. Думала, што не надта і заробкі ў горадзе, і жыць няма дзе. Але не магла нават і падумаць, каб аставаўся тут, у вёсцы, не бачыў ні выхаднога ні праходнога, ні дня ні ночы, каб жыў так, як яны, бацькі.

Па вуліцы Валерык ехаў паволі, нібы забыўся нешта, паляпаў па кішэнях — цыгарэты асталіся на стале. Спыніўся ля магазіна.

У мураваным з цэглы будынку пасля двара было прыцемна і халаднавата. Прадаўшчыца насыпала з мяшка ў торбу цукар.

— Дзень добры,— павітаўся Валерык.

Прадаўшчыца зноў новая. Мянялася іх на год па тры, а то і па чатыры. Прыязджаюць на работу з горада на аўтобусе.

Азірнуўся і мужчына, які трымаў торбу. Гэта быў бацька аднакласніка Мішкі, з якім Валерык некалі сядзеў разам на адной парце і разам ездзіў на гулянкі да арміі. Цяпер абодва жылі ў адным горадзе і два гады ўжо як не бачыліся.

— Здароў, Валерык,— дзядзька Федзя паставіў на вагі торбу з цукрам.— На выхадныя? — пытаўся ён,

пакуль магазіншчыца важыла цукар за прылаўкам.

— Не, падскочыў тут, шэфу яблык трэба было ўзяць.

— Дык ты на машыне? Можа, падкінеш мяне да Дубровы?

Да Дубровы было з кіламетр, калі не меней.

— Пра што тут гаварыць. А дзе цяпер гаручае? — папытаўся ён у прадаўшчыцы, кінуўшы вокам на знаёмую паліцу, цяпер застаўленую слоікамі з варэннем, якое ў вёсцы ніхто не купляў.

Прадаўшчыца з гонарам зірнула на яго, нічога не адказала, застукала лічыльнікамі.

— Цяпер толькі ў адным магазіне, у цэнтры калгаса, а так усюды паздымалі. Сур'ёзна ўзяліся. Пахмяліцца хацеў.

— Не, курыва дома забыў.

Праз некалькі хвілін «Масквіч»-пікапчык курэў па палявой дарозе між запыленага бульбоўніку да зялёнай вёсачкі Дуброва.

Назад машына ехала ўжо далёка па абедзе. За гэты час Валерык паабедаў у дзядзькі Федзі, выпіў пару шклянак віна, каб было весялей, схадзіў пакупацца на сажалку, пакуль дзядзька Федзя з жонкай сабралі Мішку і маладое бульбы, і скрыньку яблык, і агуркоў, і цыбулі...

Ехалася Валерыку лёгка, не думалася пра жонку, пра тое, што будзе ў горадзе — усё наладзіцца, не першы раз. Нават не шкода было, што не ўдалося астацца пагуляць на вяселлі.

Валерык уключыў стары і разбіты транзістар, перавязаны ізалентай, які вазіў на сядзенні побач. Калі яшчэ на шашы пападзецца харошая спадарожніца, то і зусім нічога.

Але людзі ехалі не з вёскі ў горад, а з горада ў вёску. І ні спадарожніка, ні спадарожніцы Валерыку не трапілася на асфальце, затое дарога была амаль без машын, здавалася, лёгкая і свабодная, як і сам ён.

## II

На дзвярах ліфта вісела залапаная пальцамі ў мазуце шыльдачка «Ліфт на рамонце». Валянціна Пятроўна перавяла дыханне,— душна на дварэ, марачыла, нібы на дождж. І рашыла не злавацца на майстроў, якія бяруцца за рамонт, нібы назнарок, калі ёй ісці дадому. Паволі, каб не задыхацца, пайшла па лесвіцы. Злавацца сёння няварта, дзень удаўся. Усё, праз два дні самалёт — і два тыдні паўднёвага сонца. Яна мае права на гэта. Заслужыла.

Валянціна Пятроўна ўзышла на чацвёрты паверх, спынілася перад дзвярыма кватэры, ababітымі карычневым дэрмацінам і перацягнутымі залацістай стрункай, дастала з сумачкі ключы.

У прыхожай цемнавата і прахалодна. Валянціна Пятроўна разулася, уключыла святло, агледзела сябе ў трумо. У целе жанчына, але не аплыла тлушчам, на твары няма дробненькіх, як павуцінкі, старэчых маршчынак. І адчувала сябе молада, лёгка, здавалася і маладой, і стройнай, хаця пяцьдзесят чацвёрты памер адзення садзіўся ўжо на яе тугавата.

Валянціна Пятроўна скінула кофтачку, марлевую, з лёгкімі веернымі рукавамі, яшчэ раз азірнулася на сябе ў трумо, зайшла на кухню, нацадзіла са слоіка ў кубачак настойкі чайнага грыба, укінула ў яго два кавалачкі лёду, зайшла ў залу і прысела на канапу да тэлефона.

Білеты да Сімферопаля і назад ляжалі ў сумачцы. Аставалася спакаваць чамадан — і Чорнае мора яе. Білет «зрабіла» знаёмая касірка. Спецыяльна на выхадны з-за гэтага асталася ў горадзе. Сёння адвезла ёй пару каробачак цукерак.

— Надзя? Гэта я. З білетамі ў мяне праяснілася. Калі ўспею, пад канец дня загляну на работу. Я ж, здаецца, усё табе перадала, нічога не забыла? А калі не

ўспею, то пасля водпуску. Што табе прывезці? Ну, спецыі само сабой. Шчасліва табе.

Валянціна Пятроўна паклала трубку. На работу яна сёння не збіралася, таму ўчора аддала ключы намесніцы.

— Валодзя? Здароў, сын. Што ў цябе?

— Як дагаварыліся, мэм,— з усмешкай адказаў сын.

Яна нібы ўбачыла яго, рослага, з чорным матыльком на белай рубашцы, спартыўна астрыжанага пры насценным тэлефоне ў стылі рэтра тут жа, ля стойкі ў бары. Сын заўсёды разумеў маці з паўслова яшчэ са школы. Скончыў кааператыўны тэхнікум, хаця цягі да навукі ніколі не меў. Рашыла яна: дыплом есці не просіць. У бар уладкавала — сядзець упраўленцам пры гандлі маладому мужчыну няма чаго.

— Як у цябе?

— Парадак. Білеты ў два канцы. Сёння спісак прыйшоў з выканкома. Зацвердзілі.

— Значыць, адвячоркам пад'язджаю?

— Прыязджай.

Валянціна Пятроўна ўсміхнулася: Валодзю трэба была кватэра, яна прыкмеціла па мінулых гадах, што палівaць вазоны ён прыязджаў не адзін і не з жонкай. У гэтым не бачыла бяды — галоўнае, каб прыгоды не мяшалі сямейнаму жыццю. Ажаніўся Валодзя ўдала. Ліда і прыгожая, і разумная. Кончыла бібліятэчны, дачку ўмее гадаваць, гаспадарку весці. І не з тых, што з другім паедзе «кветкі палівaць». Сваты людзі талковыя. Разам маладым трохпакаёўку кааператыўную пабудавалі.

— Можна Анатоля Васільевіча?

Праз некалькі секунд пачула сухое:

— Так, слухаю.

— Добры дзень, Толя.

— Дзень добры. Усё ў парадку? — голас у трубцы



стаў густы і мяккі. Па гэтым яна павінна была здагадацца пра тое, што ён ведае — усё нармальна. Без яго гэта не абышлося.

— Зацвердзілі. Сёння спіскі прыйшлі. Дзякуй.

— Можа, выедзем на месца, паглядзім?

— Не магу сёння. Давай заўтра, пасля абеду?

— Давай. Там, дзе заўсёды?

— Ага,— Валянціна Пятроўна не стрымалася, і яе «ага» сказалася занадта хутка.

З Анатолем Васільевічам яна пазнаёмілася гадоў шэсць назад, у санаторыі. Хоць і равеснік яе Генадзя, але выглядае намнога маладзей і прыгажэй. Начальнік упраўлення, чорная «Волга» і шафёр... Першыя два гады яны і адпачываць «траплялі» ў адзін санаторый. Дзеці ў яго дарослыя, кватэра чатырохпакаёвая, у цэнтры горада. Але, як заўважыла Валянціна Пятроўна, у горадзе ён амаль і не жыў — зімой і летам на дачы. І па тым парадку, які панаваў там, Валянціна Пятроўна здагадвалася, што на дачы бывае толькі ён. У яе пра сям'ю не распытваў, пра сваю не расказваў, даў зразумець, што сямейнае жыццё, як гаворыцца, не ўдалося.

Сустракацца працягвалі, хоць і не часта. Цяпер ён памог, каб яе прозвішча асталося ў інстытуцкім спісе на садовы кааператыў, хоць яна, загадчыца стала заказаў, да інстытута — прышый кабыле хвост. Але што ў гэтым свеце не прышываецца? Калі і ёсць што такое — то не з гандлёвай сферы. Гандаль да ўсяго падыходзіць і ўсюды праходзіць — гэта яна ведала цвёрда і іншаму паняццю веры не магла даць.

Аставалася пазваніць мужу. Ён дзяжурыць, змеішца вечарам. Гэта добра — гаворку з Волькай яна правядзе сама.

— Генадзь? Усё нармальна. Як, што нармальна, што нармальна? Спісак на ўчастак зацвердзілі, білеты ўзяла. З Валодзем паедзем сёння да Олі... Да якой Олі? Помніш, прыязджала да нас? Падругі мае, з якой некалі

разам былі ў горадзе. Пра лес хачу дагаварыцца. Заўтра ў абед вернемся. На юг я сама ўсё збяру, глядзі дома... Цалую.

Цяпер у яе быў вольны час, каб памыцца пад душам, паабедаць, сабраць сумку з пачастункамі і падарункамі. Пад летнімі тугімі струменьчыкамі вады ў ванне яна не спяшала. Думала, як добра зрабіла, што не сарвалася тады ўслед за Волькай назад у вёску. Валянціна Пятроўна аж перасмыкнула плячыма, калі ўспомніла інтэрнат у барачным будынку, работу на рыштаваннях. І немаладыя, і нямодныя, куды да гарадскіх ім было тады. У старых дзеўках так і заставацца, пакуль кватэра, хоць будаўнікам і давалі ў першую чаргу. Волька тады і шарахнулася назад — замуж выйшла, зарабляць пачала на свінарніку, пабудавалася. А потым і муж запіў, і здароўе работа ўзяла. Валянціна Пятроўна не пазнала нават спачатку Вольку, калі зайшла да яе, гэтак састарэла былая сяброўка, скруціла яе, хоць і багатае вясковае жыццё. Нашто яно, калі за работай свету не бачыш? Праўда, і горад не для ўсіх мёдам намазаны. Добра, што яна тады прыгледзелася і прынаравілася: пайшла буфетчыцай у вайсковую часць, а там і Генадзя знайшла. Старшыну, як на цяперашняе, то прапаршчыка, старэйшага на трынаццаць год. Ажаніла старога халасцяка на сабе, піць адвучыла, кватэру атрымалі. Цяпер у Генадзя пенсія добрая і работа дзяжурным на аўтастаянцы. І кожнае лета на поўдзень едуць... Яе інакш як Валянцінай Пятроўнай у інстытуце ніхто і не заве.

Выключыла душ, зняла з галавы гумавую шапачку, працерла запацелае люстэрка над туалетнай палічкай, паглядзелася — прыкідвала, як адзявацца, каб ехаць у вёску: фуфырыцца і фарбавацца не выпадала — усё ж прасіць едзе, а не пахваляцца. Яшчэ тады, калі Волька заязджала да іх — накіравалі ў абласную бальніцу на абследаванне — Валянціна Пятроўна прыкінула, што

зруб на дачу можна зрабіць у вёсцы, а потым перавезці. Хаця і без гэтага яна сустрэла б былую сяброўку і дапамагла б усё роўна...

Адвячоркам белыя «Жыгулі», чыстыя, бліскучыя, прамінулі пост ДАІ на кальцавой. Інспектар на сядзенні матацыкла ў цяньку ад вышкі заўважыў і наглянцаваную фарбу, і маладога, чыстага мужчыну за рулём, які ехаў упэўнена, цвёрда. І жанчыну на заднім сядзенні. Інспектар нават пазайздросціў ім, іхняй яздзе — па вольнай ад машын шашы, насустрач цёпламу ветру з палёў і лясному халадку.

Валодзя выйшаў на сваю «крэйсерскую» хуткасць — ад дзевяноста да ста — і ўключыў магнітолу. У салоне машыны быццам заскакалі нябачныя тугія шарыкі: мякка гулялі па абшыўцы і па барабанных перапонках. Патрыётка ўсяго моднага, Валянціна Пятроўна ўсё ж не магла прывыкнуць да сучаснай музыкі. Любіла больш за ўсё тую, з дзявоцтва: «На нём защитна гимнастерка, она с ума меня сведет», нават заплакаць магла над ёй. Але пра гэта не прызнавалася і на цяперашнюю музыку не нападала, памятала: Анатоль Васільевіч гаварыў, што ўменне прамаўчаць, калі табе што і не падабаецца, прыкмета выхаванасці.

Валянціна Пятроўна ўзяла часопіс з укладышам — там расказвалася, як можна звязаць гетры. Яна вырашыла ўжо, што пасля адпачынку павінна пайсці на аэробіку. А без гетраў якая аэробіка?

Яна не бачыла перад машынай прамой, як страла, асфальтавай дарогі, выгнутай у лагчыну, з насыпанымі свежым пяском высокімі абочынамі. На тым канцы быў відаць цяжкі з прычэпам «КамАЗ», а за ім, як на прывязі сабачка, чырвоны пікапчык.

Валодзя адкінуўся да спінкі сядзення, дабавіў гуку: прыемна было вось так ісці ўніз, а потым угору. Нават спачатку паблажліва ўсміхнуўся з-за таго, што пікап-

чык паспрабаваў выткнуцца з-за аўтацягніка на абгон, калі ўсе тры машыны ішлі ўніз, на хуткасці. І ў наступнае імгненне зразумеў, што гэты расхлябаны, разбіты «калгаснік» — гэтак ён аблаяў шафёра — пайшоў на абгон, у лоб яму. Адным вокам заўважыў, як прыціснуўся да самай абочыны грузавік, сам узяўся ўправа, упэўнена, прафесійна, пакінуў шчыліну пікапчыку. Ён нават пагардліва скрывіўся, калі ўбачыў белы спалоханы твар ліхача, які нібы са сну прахапіўся. І ў гэты ж час пачуў , як віскнулі тармазы пікапчыка...

Ад удару белыя «Жыгулі» лёгка, нібы кардонныя, закуляліся ўніз з адхону, на тонкія белыя бярозы. На другі бок, па ходу, калупнуўшы коламі свежа насыпаную абочыну, паляцеў і сам чырвоны пікапчык. Ад удару дзверцы адчыніліся, машына кулялася і душыла свайго гаспадара, які напаловуываліўся з кабіны. На тармазах асеў на грэбень адхону аўтацягнік, аж затрашчаў, завішчаў, разварочваючы папярок дарогі, і спыніўся. Спалоханы шафёр адчыніў дзверцы, саскочыў на зямлю і шарахнуўся назад: нібы лопнуў вялікі паветраны шар, і адразу ж белая машына ахапілася полымем, якое неяк утробна загудзела, завыла на ўсю лагчыну.

— Куды? Куды вы лецiцé? На кусок хлеба зарабіць? Чаго вам не хватае? Мацinformed вашу...

Пажылы чалавек, шафёр грузавіка, усё яшчэ не мог ачомацца, мітусіўся туды-сюды на дарозе, размахваў рукамі адзін пасярод нізіны, у якую з двух бакоў бліскуча, няўмольна ўрэзвалася шаша з лёгкімі жоўтымі абочынамі.

# САДОЎНІК

> ...Я стал работать над словом и вырастал сад из слов, такой большой, что в нем тысячи гуляют и миллионы пройдут в нем.
>
> *М. Прышвін*

## I

Яго з'яўленне заўважылі амаль усе ў першы ж дзень. Быў ён зусім стары, ссутулены, сагнуты гадамі. Адно плячо трымаў крышку ніжэй, ад гэтага здавалася, што ходзіць неяк рубам.Чаравікі, мабыць велікаватыя, грукалі ўслед старому па бетонных плітах дарожкі. Светлы пінжак і шэрыя адпрасаваныя штаны віселі на старым неяк пакамечана. Ён адзінока прыходзіў у белую, абліцаваную мармуровай пліткай сталоўку, падымаўся на другі паверх па вінтавой лесвіцы, абапіраючыся рукой на парэнчу. Абедаў павольна, сівавалосы, цёмны з твару, быццам адпачываў, і вочы, светлыя, па-старэчаму выцвілыя, глядзелі некуды далёка, куды іншым зазірнуць не дадзена. Потым заходзіў у бібліятэку, ненадоўга з'яўляўся на пляжы, сядзеў пад навесам, чытаў альбо глядзеў у мора ўсё тым жа доўгім і глухім позіркам. Потым знікаў.

Санаторная публіка, якой у гэту пару сабралася нямнога — прыморскі корпус санаторыя рамантавалі,— гадала, хто ён такі. Адны ўспаміналі, што працаваў ён нібыта ў Саўміне, другія гаварылі пра кіраўніцтва справамі ЦК, трэція залічвалі старога па ведамству прафсаюзаў. Суседзі за сталом паспрабавалі запытацца пра былую работу ў самога старога, але Віктар Пятровіч, як ён назваўся, ці то не пачуў пытання, задуменна прамаўчаў, ці то прытварыўся. Больш старога не чапалі, а праз некалькі дзён звыкліся з ягонай маленькай

постаццю і не звярталі ўвагі. Народ у санаторыі адпачываў у асноўным наменклатурны, ад раённага ўзроўню да рэспубліканскага, а тыя, хто ўжо быў на пенсіі, таксама выйшлі з наменклатуры, і таму было пра што і пра каго пагаварыць.

Разгадка, хто такі стары, прыйшла дзесьці праз два тыдні, пасля здарэння, якое ўскалыхнула спаважны лад санаторнага жыцця, атрымала свой каментарый у наменклатурных і экс-наменклатурных, а найбольш, вядома, у верных спадарожніц тых і другіх.

## II

А тым часам стаялі сухія, сонечныя і ласкавыя кастрычніцкія дні, якія бываюць на поўдні ў гэтую пару, хаця і сюды ўжо дабіралася восень. Неўпрыкмет, але парадзелі густыя шаты букавых вершалін, і скрозь галлё свіцілася чыстае, сіняе неба. Пажаўцелі, набрынялі барвай і красаваліся, як паўліны, вастралістыя клёны. Пад лёгенькім ветрам серабрылася лісце таполяў, але і гэтага срэбра пачынала пакрысе ўбываць. У лагчыне ў зацішку, нетутэйша, жоўта, як аплыўшыя свечкі, стаялі тры бярозкі. З магнолій на бетонныя дарожкі грузна, з лубяным стукам, падалі жоўтыя блiскучыя лісты.

Стары пачынаў свой абход ад уязднОе брамы, жалезныя вароты якой віселі пастаянна расчыненыя насцеж, а дарогу перагароджваў кароткі шлагбаум, які падымаў, націскаючы на кнопкі, вахцёр. З гары, паверх даха старога даваеннага корпуса, некалі адкрываўся далягляд на мора, і стары ў свой час любіў адсюль дзівавацца на яго.

Тады на тэрыторыі амаль не было дрэў, а дзе і раслі, то маладзенькія. Да вайны давесці тэрыторыю да ладу не ўспелі. У вайну санаторый займаў шпіталь, у які трапіў і Віктар Пятровіч. Трапіў і астаўся, бо прыглянулася медсястра Каця, з якой ён збіраўся вярнуцца да-

дому. Не вярнуўся. На пісьмо, якое дайшло ў вёску, адказаў сусед: бацькоў расстралялі немцы за тое, што маладзейшыя браты пайшлі ў партызаны. Браты ў вёску не аб'явіліся, мабыць, загінулі. Далей сусед дзядзька Пятрок пісаў пра тое, што ўся вёска спалена, людзі жывуць у зямлянках, галадаюць, а вясною аралі на сабе. Каця плакала, калі чытаў ёй пісьмо, і ўгаварыла астацца тут. Пры санаторыі ў хацінцы ім выдзелілі пакойчык. Спачатку ён працаваў дворнікам, а потым, калі галоўны агледзеў, што ў дворніка за плячыма два курсы сельгасакадэміі, прызначыў садоўнікам.

— Ты для мяне залаты чалавек. Ні ў кога такога няма! Ты малады і здаровы. Вучаны. Ты зробіш тут рай. Тут усюды ружы будуць цвісці! Адны ружы! Ад брамы на ўсіх тэрасах да самага корпуса. А перад корпусам фантан, і ад яго пальмы аж да самага мора. Глядзі, як тут архітэктар нарысаваў! Мяне не будзе, цябе не будзе, а людзі сюды будуць прыходзіць любавацца на ружы. Вечны помнік. Лепшага ніхто не прыдумае і не паставіць ні табе, ні мне!

Невядома, чаму доктару здавалася, што калі многа ружаў, то гэта ўжо рай, але кінутае ім зерне прарасло ў душы Віктара Пятровіча, калі ён пачаў займацца пасадкамі. Тады і ён уявіў казачны рукатворны рай. А на першым часе, пакуль будаўнікі рабілі тэрасы, вымошчвалі бетонам дарожкі, ён хадзіў па санаторыях, закладзеных да вайны, прыглядаўся, запісваў, замалёўваў. І чытаў усё, што мог дастаць у санаторных бібліятэках. У сваіх пошуках ён нарэшце дайшоў да супрацоўніка дэндрарыя Прохара Прохаравіча, тоўстага, цяжкага, з сівой шчэцю на твары і сівымі тлустыміваласамі.

— Гэ, баценька, каб зрабіць парк, аднаго жыцця мала. Гэта нават калі ты проста талент, а не геній. А ён нараджаецца там, дзе патрэбен народу. У людзей, якія

ўмеюць глядзець не толькі ў карыта, але і на неба. Вось так, баценька! А натоўпу дастаткова рамяства. Натоўп рамесніка любіць і сыта корміць. Я знаю! — Прохар Прохаравіч цяжка аддыхваўся пасля сказанага, як пасля вялікай дарогі, арыстакратычна паводзіў перад сабой рукой у паветры, нібы адхіляў фіранку.— Дзярзай, і будзь гатовы да церняў. Садоўніку належыць быць цярплівым, нават калі ён геній. У крайнім выпадку, галадаць ты не будзеш, хіба толькі сап'ешся...

Прохар Прохаравіч сумна ківаў галавой, потым быццам ачынаўся і нібы здаля глядзеў, пазнаваў самога сябе і свайго субяседніка.

Прохар Прохаравіч, аднак, не толькі паіў чаем маладога садоўніка, але і даваў кнігі пра паркі, якія збіраў усё жыццё. Потым ён дапамагаў даставаць насенне, саджанцы. З яго саджанцаў Віктар Пятровіч развёў за маленькай яшчэ самшытавай агарожай першы свой разарый. Потым разарыямі ён запоўніў усе тэрасы, і ружы нібы сыходзілі па схіле да санаторнага будынка, да апошняга адхону з раскошнымі купінамі пампаскай травы, жорсткай і вострай, як асака. Летам між яе зеляніны буйна цвілі кусты дроку, а ўвосень трава выкідала над сабой белыя нетутэйшыя мяцёлкі. У вялікіх бетонных вазах абапал лесвіц ён пасадзіў маленькія пальмы, якія восенню трымалі над сабой султаны-ліхтары. Ад ветру з мора разарыі закрывалі сабой пасаджаныя на схіле кедры.

З вокан санаторыя цешыў курортнікаў велічэзны дыван, сатканы з ружаў. І ўсе ведалі ўжо яго, садоўніка. І ён прывык, што яго гэтак завуць. І няважна было, што Прохар Прохаравіч паблажліва каменціраваў зробленае.

— Гэта, баценька, самадзейнасць і электыка. Праўда, нешта ёсць ад прымітыву... Не, майстар робіць тое, што трэба народу, і з матэрыялу, любімага народам. Слова, фарба, камень, дрэва, трава, кветкі... Які народ,

такога і майстра ён заслугоўвае! Богу богава, кесару кесарава! А можна і так, усердзія радзї і прыляжанія...

Прохар Прохаравіч хутка размякаў пасля пачастункаў чаем і «да чаю». З-за гэтага ён хутчэй за ўсё апошнія гады і прыходзіў да садоўніка, каб пасядзець на тэрасе і выгаварыцца. Садоўнік слухаў і не надта звяртаў увагу на мармытанне старога няўдачніка, якому ўжо не пасадзіць ніякага саду. І што толку, што некалі ён мог?..

## III

Садоўнік сядзеў на лаўцы. Унізе ляжала ўся тэрыторыя, засаджаная ім. Вяршыні дрэў ужо падняліся мясцінамі вышэй за дах старога корпуса, дзве магутныя секвоі абапал будынка вынесліся высока ў неба. Сям-там над роўнай зялянінай вытыркалі вяршаліны кіпарысаў. А мора закрывала шэрая бетонная будыніна новага корпуса.

Тэрасы, на якіх некалі раскашавалі ягоныя разарыі, зараслі травой, якую акружала густая засень кустоў лігіструму. Толькі на адной тэрасе была ўскапана градка на ружы, тырчалі запушчаныя пенчукі і апошняя жоўтая кветка скінула на зямлю першыя пялёсткі. На бетонных плітках парос зялёны мякенькі лішайнік.

Каторы ўжо раз стары садоўнік сыходзіў па лесвіцы ўніз да корпуса, далей паўз круглую бетонную чашу фантана да пузатых, цяпер вялізных пальмаў. Ён не пазнаваў дрэў, яны набралі сілу, а прысады вакол іх здзічэлі, ператварыліся ў лес. Пальмавая алея ўпіралася ў будаўнічую пляцоўку пастаўленага на рамонт корпуса, і трэба было зварочваць налева, на бакавую алею. Тут высока стаялі яго кіпарысы. А дрэвы на схіле высеклі. На іх месцы стаяў водалячэбны корпус, за ім сталоўка і клуб. На схіле між будынкамі мужчыны ў спяцоўках садзілі самшыт, а трактар «Беларусь» блі-

скучымі зубамі экскаватарнага каўша ўскопваў градку.

Садоўнік не першы дзень кружыў па здзічэлай тэрыторыі. І з кожным днём усё вастрэй і вастрэй уставала з памяці жыццё, тое, у сонечным святле, яркае і шчаслівае. Там было многа сонца і руж. Там была Каця, дачка, там былі маладосць, спадзяванне і шчасце. Ён мог шчодра дарыць ружы, і Каця раўнавала яго да прыезджых маладых жанчын, а маленькая Оля радасна ўсміхалася яму блакітнымі вачанятамі. Садоўнік нават спыняўся, заплюшчваў вочы: гэтак блізка былі яна, сонца, ружы, шчасце.

Ён не заўважыў, як раслі дрэвы, мяняліся людзі. Оля скончыла медвучылішча. Знайшоў яе марачок у лейтэнанцкіх пагонах. Вясёлы лейтэнант з пшанічнымі вусікамі. На вяселлі сталы патаналі ў самых лепшых ружах. А праз год паехала Оля следам за сваім марачком на край свету, на Далёкі Усход. Адтуль прыходзілі пісьмы, потым фотаздымак унука. Нудзілася па дачцы Каця, а ён хаваўся ў свой сад і ўсё адкладваў той адпачынак, калі паедуць да дачкі. Так і не даехалі. Захварэла Каця і з бальніцы не выйшла. Оля з маленькім Эдзікам прыехала на пахаванне, пабыла з ім з тыдзень і вярнулася назад, да мужа. На край свету. Не стала к таму часу старэнькага галоўнага доктара, прыйшоў новы, а з ім будаўнікі, бульдозеры, краны. З уводам новага корпуса навалілася плойма людзей. У белы мармур адзявалі старыя лесвіцы, гудзелі па вечарах танцы, санаторны буфет шчодра разліваў каньяк і віно ў шклянкі. Не да ружаў было і не да садоўніка. І ён пакрысе запіў, як і ўсе...

## IV

Потым прыехаў брат Аляксей. Ён усё ж ацалеў у вайну, стаў вялікім начальнікам. Пісьмо, некалі пасланае садоўнікам, збярог стары Пятрок і перадаў Аляк-

сею, калі той заязджаў на былое роднае котлішча.

Садоўнік памятаў першы прыезд брата. Ен даглядаў ружы ў разарыі, калі спынілася чорная «Волга», з яе выйшаў лысы, худы, але дагледжаны чалавек, спыніўся і глядзеў на яго, садоўнікаву работу. Садоўнік не павярнуўся, нібы і не заўважыў, што за ім назіраюць: ён ужо прывыкаў, што яго паказваюць.

— Віцька, які тваю! Глядзі, як забурэў! На брата і то глядзець не хочаш! — гукнуў чалавек і ступіў да разарыя.

Па голасе садоўнік пазнаў Аляксея і кінуўся да яго, абдзіраючыся аб калючыя кусты руж.

Больш адпачываць сюды ў санаторый брат не прыязджаў. Мабыць, было ў яго сваё, лепшае месца, але віншаванні з Новым годам садоўнік атрымліваў рэгулярна. І зрэдку ў гэтых пісьмах прамільгвала ненастойлівае запрашэнне вярнуцца на радзіму. Аляксей абяцаў брату знайсці і добрую работу, і жыллё дапамагчы атрымаць. Садоўнік адказваў брату кароткімі пісьмамі, дзякаваў, але ехаць нікуды не збіраўся. Гэта пакуль ладам і парадкам ішло жыццё.

Другі раз брат з'явіўся, відаць, па выкліку галоўнага доктара санаторыя: проста выгнаць садоўніка за п'янку ён не мог, брата пабойваўся.

Аляксей прыехаў зноў з машынай, на тыдзень пасяліўся ў люксе. Ен змяніўся: пастарэў, растаўсцеў і пры хадзьбе ўжо цяжка дыхаў.

За сустрэчу з братам выпіў крыху з кілішка каньяку. І глядзеў на садоўніка стомленымі і строгімі начальніцкімі вачыма, пад якімі абазначыліся цёмныя пухіры. Ен загадаў садоўніку напісаць заяву, і небагатую мэблю, нажытую з Кацяй, садоўнік завёз у камісійны магазін.

— Мы з табою, брат, два толькі з роду асталіся. Гады не тыя, разам трэба быць. І дурату выкінь з галавы! Гарэлка ніколі яшчэ нікога не нагрэла.

На першым часе садоўнік жыў у брата, займаў пакой у прасторнай пяціпакаёвай кватэры. Аляксей падшукаў работу ў абслузе загарадных дач, даглядаць кусты і кветкі. У распараджэнні Віктара Пятровіча была невялікая брыгада рабочых, жанчын у асноўным. Не без удзелу брата пазнаёміўся садоўнік з Марыяй, якая працавала там жа, на дачах, буфетчыцай. Пасля смерці мужа яна жыла адна.

Непрыкметна пачалося ў садоўніка новае жыццё, новыя клопаты. У Марыі былі грошы, каб купіць машыну. І машыну купілі. Яна мела дачу, дзе яны жылі ўсё лета і дзе яму можна было паказаць сябе, трымаць першынство сярод суседзяў. Марыя прывыкла раней хадзіць у кіно, на канцэрты, у тэатры, павячэраць у рэстаране. І садоўніку ўсё гэта здавалася новым і цікавым. Пакрысе прыйшло адчуванне ўпэўненасці і задаволенасці жыццём, утульнасці, якой, здавалася, няма канца.

Гэтак ішло да таго часу, пакуль не памёр Аляксей. Ён ужо таксама жыў спакойным дачным пенсійным жыццём. Устаў раніцай, пагуляў па лесе, вярнуўся з прагулкі, прылёг паляжаць і не падняўся.

Пасля братавай смерці нібыта іншым позіркам зірнуў на сябе Віктар Пятровіч і ўбачыў, што стары ён таксама, старая яго Марыя. Прыйшла разам з гэтым разуменнем і незнаёмая туга. І хваробы, маленькія і вялікія, і боль у сэрцы. І ўсё часцей успаміналася маладосць, успаміналася яго работа ў санаторыі, тады, калі ён быў малады, калі ў яго была Каця, маленькая Оля, калі былі ягоныя ружы і сам ён быў самы шчаслівы чалавек на зямлі. Потым яму пачалі сніцца каляровыя сны, сніліся ружы, розных, дзіўных колераў, з ранішнімі, чыстымі, як дзіцячая сляза, кропелькамі расы. І сам ён цяпер здаля, пачынаў верыць у той дзіўны казачны сад, які стварыў і пакінуў людзям, расказваў пра яго Марыі, і яна цярпліва слухала: расказы былі пра ад-

но і тое ж. Яна не запярэчыла, калі садоўнік сабраўся ехаць і дабіўся пуцёўкі ў «свой» санаторый. Ён ажывіўся, зарадаваўся і нават не заўважыў, што Марыя, калі збірала ў дарогу яму рэчы, змахвала крадком слязу. Яна баялася, што ён можа не вытрымаць гэтай паездкі, але ні пярэчыць, ні адгаворваць не пасмела. Ёй хацелася паехаць з ім, але такое раскошы, аж дзве пуцёўкі, на іх не выдалі. Урэшце, хто яны такія, гэтыя двое старых, якія працавалі няхай сабе і ў сістэме, але ўсё ж у абслузе.

## V

Праз некалькі дзён стары садоўнік адчуў сябе як у тумане, калі навокал усё быццам і знаёмае, але разам з тым і такое аднолькавае, што пачынаеш траціць адчуванне рэальнасці, не ведаеш, ці гэта і сапраўды адбываецца з табой, ці снілася альбо прымроілася. Цяпер і самому яму здавалася, што дарэмна вяртаўся сюды. Але нешта трымала, адчуванне нейкае, што не ўсё ўспомніў, пра нешта забыўся.

Гэта турбавала думкі на пляжы пад паласатым ценем аэрарыя, у сталоўцы, у пакойчыку перад уключаным тэлевізарам.

Здагадка прыйшла нечакана, калі, седзячы ў шэзлонгу на балконе, пачуў, як моцна крычала малое і жаночы голас разіў-дапытваўся: «Будзеш больш так рабіць ці не? гавары, будзеш ці не?» Дзіця не здавалася — не адказвала, толькі спрабавала крычаць яшчэ мацней.

Стары садоўнік успомніў: Мішка, рабы маленькі Мішка! Недакормлены, бледнатвары, у штанах, перашытых з салдацкага матэрыялу, са шлейкамі наўскасяк на голай худой грудзіне, загарэлай да чарнаты.

Гадавала Мішку санітарка Варварка, дачасна састарэлая, маршчыністая, тварам, заўсёды «пад мухай» ста-

рая жанчына. Інакш як байструком унука яна не звала і заўсёды меркавала, каб ударыць па галаве.

— Бач, падкінула мне свайго байструка, а сама паехала перад афіцэрамі прыполам круціць! У-у! — гразіла яна на сваю бяспутную дачку, замахвалася на Мішку, які побач з ёй ішоў дадому, бо ведаў, што ў анучцы старая нясе з кухні яму пад'есці. Мішка адхіляўся, і яны ішлі побач далей: п'янаватая старая і малы, гатовы ў любое імгненне да ўдару.

Старая зноў лаяла дачку, якая пакінула ёй Мішку, прыжытага ад ваенных у шпіталі, следам за якімі з'ехала і сама, замахвалася на малога.

Мішка цёрся пры садоўніку цэлыя дні. І садоўнік расказваў пра ўсё, што рабіў. Каб сумна не было самому. Ды і шкадаваў дзіця. Яму ён браў з сабой перакусіць. Потым, калі Мішка падрос, а ягоная Варварка зусім знемагла ад старасці і ад гарэлкі, садоўнік папрасіў галоўнага афарміць Мішку дворнікам, а на самай справе — сабе памочнікам. Такім чынам Мішка меў хоць нейкую капейчыну, каб жыць, вучыцца ў школе і карміць сваю старую прапашчую бабку.

Калі садоўнік выехаў з санаторыя, Мішка служыў у арміі. Пасля ён павінен быў вярнуцца сюды, вярнуцца да тае работы, пры якой ён вырас.

Усё павінна было быць проста і правільна, як і належыць у жыцці.

Роспыты стары пачаў тут жа, на пляжы, у дзяжурнага на санаторным прычале, немаладога ўжо веку мужчыны.

— А, рабы Мішка? Хто яго не знае! На прычале ў «Запаляр'і» калыміць. Цяпер яго не будзе, у моры сядзіць, катрана бярэ...

Прыпільнаваў Мішку стары толькі на трэці дзень, калі той вярнуўся на катэры з мора. Рослы, плячысты мардаты мужчына ў шапачцы з доўгім казырком, які, здаецца, ніякіх адносін не мог мець да таго худога

пасляваеннага хлопчыка, абмываў струменем вады падняты на лябёдцы катэр на падводных крылах, смачна мацюкаўся і расказваў пра рыбалку, якая, па-ягонаму, не ўдалася, хаця курортнікі, якіх ён вазіў на рыбалку, нашморгалі на самадур стаўрыды і нават крыху і сельдзі перапала ім.

— Не ішоў сягоння, сцярвец... Нічога, заўтра я яго вазьму! Асцярожна, дзед, а то абалью,— крыкнуў ён садоўніку, калі той памкнуўся падысці бліжэй.

— Мішка! — стары не пазнаў свайго раптам саслабелага голасу.

— Баця! Ё-маё! Жывы яшчэ! Як цябе скруціла і сагнула! Маладзец, жывы яшчэ!

Мішка абхапіў старога, прыпадняў нават ад зямлі, але асцярожна, як малое дзіця. Стары адчуў, што нешта зашчыпала ўваччу.

— Жывы, Мішка. Прыехаў перад смерцю паглядзець...

— Маладцом, баця! Лёнька, дамый тачку. Мы з бацем да мяне ў госці пойдзем! Паглядзіш, баця, як я жыву!

Жыў Мішка недалёка, у доме на два паверхі, на ўзгорку. Дагледжаны сад, агарод і другі ўваход на адну палавіну дома.

— Я, баця, не ганюся, каб многа курортнікаў пускаць. У мяне не куратнік. Звычайна людзі сямейныя, з поўначы. У іх там грошай куры не клююць, а санаторыяў на ўсіх не хапае. А Тамара мая касір білетны. Праблемы з ад'ездам няма. Так што поўны сервіз. Яшчэ з зімы пісьмы прыходзяць і задатак па пошце! Сервіз, баця, рэч вялікая.

Мішка радаваўся сустрэчы, насіў і ставіў на стол на тэрасе страву і не пераставаў гаварыць.

— Старэйшая мая ўжо ў дзевятым класе, меншая ў пятым. Іграць любіць, піяніна мы купілі ёй. Баця, жыць цяпер, ё-маё! Хто ўмее толькі — жыві і радуйся!

Глянула б мая Варварка, як байструк яе жыве! Адмучылася, небарака. Помнік я ёй як след паставіў. Не дала мне прапасці, выгадавала, як ні кажы... Давай, бацця, за сустрэчу!

Мішка наліў у чаркі, і яны запацелі — гарэлка стаяла ў халадзільніку. Стары толькі крыху адпіў, глядзеў, як смачна кульнуў чарку Мішка, узяўся закусваць.

— А я думаў, ты на маім месцы, у садзе...

— Бацця, каму цяпер той сад! Гэта некалі букецік руж — і давольна. Цяпер што тыя цвяточкі? Цяпер трэба накарміць, напаіць, як кажуць, і каб нос у табацы. Ты не памятаеш, Пятровіч, як я некалі глядзеў, як ты анучку разгортваеш, ежу кладзеш? А раз, помню, і чакушку адкрыў, у стаканчык наліў і выпіў. Як цяпер помню: глядзеў на цябе і думаў, што гэта ў казцы толькі можа быць, каб і я вось гэтак — з'еў, колькі чаго захочацца. І чарку! А цяпер сам бачыш...

— А што, на прычале заработна надта?

— Цяпер у каго галава на плячах, таму на любым месцы заработна. Час у мяне ад дзяжурства вольны. Сад, агарод глядзець трэба? Трэба. Цяпер пячонка аднаго катрана — дваццаць пяць, сама мала. Ад раку памагае. З рукамі адрываюць. Калі каму трэба, я табе, бацця...

— Не, не, дзякуй...

Мішка зноў узяўся за бутэльку. І расказваў пра тое, як ловіць катрана, потым вадзіў па садзе, па агародзе, паказваў дом, і, калі стары запрасіўся дадому, насыпаў поўны цэлафанавы мяшок хурмы, давёў старога да санаторыя, паабяцаў, што зойдзе, яшчэ раз забярэ ў госці, каб паказаць жонку, дзяўчат сваіх.

## VI

Вечарам стары сядзеў на балконе і глядзеў, як заходзіла над морам сонца. Успамінаў жывы, шчаслівы Мішкаў рыжы твар, думаў пра тое, што бачыў малы тады не ружы, а ежу, якое яму не хапала, і што з-за ежы ён тады і хадзіў услед за ім. Гэта было жыццё. І сам ён кожны раз браў ежу, каб пакарміць Мішку.

Стары глядзеў на свой здзічэлы, зляселы сад і думаў пра тое, што і сапраўды, тым людзям, якія хвалілі яго, патрэбен быў не яго, сатканы з розных дрэў і кветак цудоўны і вечны сад, а трэба былі букеты, якіх ён не шкадаваў і шчодра раздаваў. Стары садоўнік намагаўся ўспомніць тое, што некалі гаварыў Прохар Прохаравіч пра майстэрства і рамесніцтва, пра людзей, якія не ўмеюць глядзець на зоркі. Цяпер ён, здавалася, пачынаў пра нешта здагадвацца, але ўжо позна было здагадвацца — і не ўспомніць да канца тых слоў.

Назаўтра стары амаль увесь дзень праседзеў на балконе. У парку нанятая брыгада дзяўчатак-студэнтак збольшага падстрыгала кусты, выграбала з-пад дрэў сухія галіны. З секвой ад ветру густа сыпалася насенне, і белыя бетонныя пліткі перад санаторыем былі засеены ім, як калісьці рабаціннем Мішкаў твар. У старога яшчэ звечара пачало балець сэрца. Ён не здагадваўся, што канчаткова пайшло на змену надвор'е, што пачынаецца пара бясконцых дажджоў і ў гэты час сардэчнікам і старым людзям нельга лішне хвалявацца.

Ноччу старога забрала «хуткая дапамога». Вось тады і высветлілася, хто ён такі. Загаварылі былі спачатку, што ён памёр, але аказалася, што гэта няпраўда, і ўсе з палёгкай супакоіліся. А праз тры тыдні, калі вечарам медсястра падносіла чамадан і праводзіла на вакзал старога чалавека, ужо новыя курортнікі не звярнулі на яго асаблівай увагі.

Ішоў дождж, пакорліва моклі па-восеньску яркія,



востралістыя клёны, а пад дрэвамі вылузалася на свет першая сямейка лапушыстых пахучых грыбной радасцю апенек.

## КАЦЕНЬКА-КАЦЮША

### 1

У той год я толькі скончыў школу і жыў яшчэ на нашай ціхай, зусім вясковай, парослай травою і ахінутай густымі вішанькамі, якія дружна налягаюць на платы, ускраіннай вулачцы Слуцка. І там, надвячоркам, я ўпершыню ўбачыў гэтага чалавека.

Высокі, касцісты — у свой час меў сілу! — ён хістаючыся ішоў пасярод вуліцы. Сіні, ужо добра вынашаны і паліняны плашч, які вісеў на ім, нібы на калу, быў расшпілены, і полы даставалі амаль да зямлі — здавалася, ён вось-вось наступіць на адну з іх і паваліцца; шэры фетравы капялюш з'ехаў на адно вуха, і мужчына быў падобны на клоуна, які ідзе па арэне, высока падымаючы ногі. У дадатак да ўсяго мужчына заплюшчваў вочы і зацягваў жалобна-дзікавата, з падвывам:

Каценьк-а-а — Кацю-юша-а,
Купе-е-часка до-оч...

Услед яму глядзелі здзіўлена, усміхаліся — было ва ўсім гэтым нешта недарэчна-смешнае і разам з тым горкае.

Назаўтра жанчыны ведалі ўжо, што гэта новы кватарант старое Антосіхі, што працуе ён слесарам на аўтарамонтным заводзе, што жыве бабылём...

А потым увайшлі ў звычку яго вячэрнія вяртанні дадому з нязменнаю «Каценькай-Кацюшаю», і калі

малыя спрабавалі бегчы за мужчынам з крыкам: «Каценька-Кацюша, Каценька-Кацюша! У цябе нос, як груша!» — дарослыя прыкрыквалі на іх, разганялі, але хутка і самі пачалі зваць мужчыну Каценька-Кацюша.

## 2

У суботу прыехаў у госці брат, і я зайшоў надвячоркам у магазін.

Там, акрамя Каценькі-Кацюшы і прадаўца, кульгавага інваліда вайны, нікога не было. Прадавец стаяў, абапёршыся на прылавак, Каценька-Кацюша сядзеў насупраць на парожняй скрынцы з-пад пячэння. Паміж імі на прылаўку стаяла напалову выпітая бутэлька, дзве шклянкі, ляжалі цукеркі.

Каценька-Кацюша не заўважыў мяне, ён расказваў. Прадавец кінуў убок мяне кароткі позірк, але не крануўся з месца, нібы прасіў пачакаць.

Я закурыў. Мне таксама хацелася паслухаць, пра што расказвае гэты дзівакаваты Каценька-Кацюша.

...Не, ён нядрэнна жыў, былы сын батрака. У яго была жонка, якая працавала медсястрою ў бальніцы, быў сын, і сам ён рабіў заўгасам у той жа бальніцы. У іх была свая хата ў мястэчку...

Было гэта да вайны. А потым... Ён быў сумленным і смелым хлопцам, і такія хлопцы патрэбны былі ў варожым тыле. Яму сказалі пра гэта прама: згадзіўся, бо ведаў, што застаецца не толькі ён.

Першыя дні яны не ведалі, за што брацца. Потым пачалі падбіраць параненых чырвонаармейцаў з навакольных вёсак, лячылі, даставалі дакументы, перапраўлялі праз сваіх людзей у лясныя схованкі медыкаменты. Гэтага здавалася мала. Захацелі знішчыць раённага каменданта. Невядома, ці данёс хто, ці самі немцы здагадаліся.

Бралі іх сярод белага дня, нібы мокрых курэй, ды і былі з іх яшчэ не падпольшчыкі, а куры мокрыя. І ўсё роўна наперадзе было Слуцкае гестапа, а адтуль адна дарога — за горад, у старыя гліншчы...

Ім пашанцавала, што слуцкія хлопцы чулі пра іх і падмянілі дакументы. У гліншчы паехаў, магчыма, той, хто нават і не чуў пра падполле, а яны паехалі ў Германію.

Пад Баранавічамі чатыры чалавекі на хаду выскачылі з эшалона. Гэта былі смелыя хлопцы, і паміж Радзімаю і чужынай яны выбіралі толькі адно — Радзіму.

Неяк так атрымалася, што ён камандаваў трыма гэтымі чалавекамі, можа, што быў старэйшы за іх, і яму аднаму не пашанцавала: калі скакаў з поезда, трапіў якраз на прыдарожны слуп, разбіў скіўіцу і зламаў ключыцу. Хлопцы знайшлі яго ў цемнаце, залітага крывёю і непрытомнага.

Два тыдні яны хаваліся на хутары, і нізенькая, бялявая і зморная на выгляд беларуска паіла яго малаком, якога не хапала нават яе траім дзяўчынкам, не тое, што каб заставалася яму. Ён не мог ісці, нават гаварыць, і жыў толькі малаком, і разумеў, што п'е малако дзяцей. Потым хлопцам удалося звязацца з партызанамі. І яго, хворага, не хацелі браць. Узялі толькі, калі хлопцы заявілі, што без яго не пойдуць.

А потым былі допыты. Яго дапытвалі больш, чым астатніх,— ён быў старэйшым з гэтай маленькай кучкі людзей. Ён не мог гаварыць, пісаў адказы на лістах пажоўклай разлінеенай канцылярскай кнігі і не разумеў, навошта гэта ўсё. Ён не мог ведаць, што за месяц да гэтага правакатар навёў на атрад паліцыю, і дванаццаць хлопцаў засталіся ляжаць ля бетоннага моста.

Той раз, калі канваір прыпыніўся ля зямлянкі, каб дакурыць самакрутку, і калі ён пачуў рэзкі голас камандзіра: «Калі ўпэўнены, што вораг — страляй! Я даю

табе права!» — яму стала страшна, страшна першы раз, што расстраляюць, нібы сабаку, свае.

Іх не расстралялі, адправілі ў шостую роту, і яны не маглі галавы прыкласці, што гэта за «шостая рота», калі ва ўсім атрадзе, на ваенны манер яшчэ, са штабам, ардынарцамі, пісарамі, сувязнымі, з цяжкасцю можна было наскрэбці роту байцоў.

Вялі іх два канваіры і начальнік штаба. Была восень, шэрае нізкае неба, нудная дробная імжа і пануры малады хвойнік абапал дарогі...

І ўсё ж шчасце хадзіла за імі, а так хіба сустрэлі б яны другі атрад, камандзір якога пазнаў таго самага мужчыну, што прывёз яго, савецкага лейтэнанта, з вёскі ў бальніцу і невядома як апынуўся тут, за дзве сотні кіламетраў з забінтаванаю галавою. І, як толькі заікнуўся начштаба пра «шостую роту», пабялеў і нервова перасмыкнуўся твар лейтэнанта:

— Што?!. У шостую? А там за шосты куст?..

— У мяне загад...

— Та-бе па-ка-жу загад, гніда!

У лейтэнанта «здалі» нервы яшчэ летам сорак першага, калі нямецкі танк на яго вачах «папрасаваў» братаў акоп, і цяпер лейтэнантаў буланы ўзвіўся на дыбы, плётка са свістам разанула па галаве начштаба, па яго кані...

Шчасце хадзіла з імі...

А жанчыну, што іх хавала — даведаліся потым,— немцы спалілі ў хаце разам з дзецьмі.

Ужо ў сорак чацвёртым, калі пачало брацца на вясну, падрыўная група замініравала палатно, і ён, камандзір, загадаў адпаўзаць з высечанае паласы ля дарогі. Адпаўзці не паспелі: патруль ублытаўся ў шнур — і рванула.

Ракеты...

Потым прастрэлка трасіруючымі з дзотаў і шэсць

чалавек ляжала на снезе, прыкрыўшыся ад куль аднымі маскхалатамі. Дваіх хлопцаў не стала. Яго параніла навылёт у грудзі.

Пасля шпіталя яго не ўзялі на фронт. І ён інструктарам райкома матляўся па раёне — трэба было аднаўляць калгасы. У яго не было дому, нічога не было, акрамя выцертага шыняля і трафейнага «вальтэра»...

Быў, праўда, брат. За вайну ён выбудаваўся і ў той вечар падліваў гарэлку, расказваў, як хаваў ад партызан двух кабаноў, і прасіў падмахнуць даведачку, бо вяскоўцы не даюць жыць...

І вымардаваны, аброслы рыжым шчаціннем чалавек з гарачымі вачыма, у адным шынялі, замест таго каб дапамагчы брату, ледзь не выпусціў у яго ўсю абойму і больш ні разу не зайшоў у хату.

А потым яны, арыштаваныя немцамі ў сорак другім, аказаліся «агентамі гестапа». З імі доўга не цырымоніліся. Хто быў на фронце, той трапіў у штрафбат, а астатнія — у Сібір.

3

Каценька-Кацюша змоўк. Твар яго, па-старэчаму маршчыністы, зямліста-шэры ад кароткага сівога шчаціння, нібы запылены пакамечаны бот, не змяніўся, быццам механічна перагортвалася дзесяткі разоў прачытаная кніга, якая ўжо нічым не можа крануць яго і ў якой ён усё не можа нешта зразумець; выцвіла-блакітныя вочы, здавалася, пасыпаныя попелам, глядзелі безуважна і невідушча.

Было непрыемна ціха, і было адчуванне, што гэтая цішыня вось-вось лопне.

— Пасля ж аднавілі... рэабілітавалі...— няўпэўнена прамовіў я, каб толькі больш не маўчаць.

Ён падняў на мяне вочы.

— Аднавілі. Аддалі медалі, паперы напісалі. Пра

тое, што было, параілі не надта. Каценьку-Кацюшу аддалі, як вы гаворыце, а ўзнагароджвалі камандзіра падрыўнікоў Паўла Грабца!.. А-а! — раптам нeяк хрыпла, як застагнаў, ускрыкнуў ён, махнуў рукою, глытнуў яшчэ паўшклянкі і, адварочваючыся ад нас, ірвануўся за дзверы...

— Кацю, жонку яго, у гэты дзень немцы расстралялі, семнаццатага... І сына. Казалі, прыгожая была, і доўга з яе глуміліся,— нібы між іншым заўважыў прадавец, падаючы мне пакупку.

Я выйшаў на двор. Ноч пачыналася цёплая, бяздонна зорная, з касымі росчыркамі знічак у мяккай жнівеньскай чарнаце неба, якое яшчэ чуць святлелася ў тым баку, дзе зайшло сонца. І першы раз пасля прыезду Каценькі-Кацюшы не было чуваць яго песні пра купецкую дачку, пра белы і блакітны ветразі.

4

Потым памяняўся ўчастковы. Маладзенькі лейтэнанцік з мякенькімі чорнымі вусікамі і тоненькай планшэткай у руцэ ўзяўся наводзіць парадак напаказ. Ён тройчы пры людзях папярэдзіў Каценьку-Кацюшу за «парушэнне парадку ў грамадскім месцы», а на чацвёрты раз завёз у аддзяленне. Як і абяцаў. Нечага было Каценьку-Кацюшу паблажліва ўсміхацца.

Больш на нашай вуліцы я Каценьку-Кацюшу не бачыў. Гаварылі, што перайшоў жыць у іншае месца. Не сустракаў яго я і ў горадзе. Але запомніліся і раптам ні з таго ні з сяго ўспамінаюцца радкі з яго наіўнай, простай песенькі, у якой гэтак ласкава паўтараецца жаночае імя:

Один парус белый, другой — голубой.
Катенька-Катюша, поедем со мной...

# ВЕЦЕР

Захаладала за ноч. Раніцаю вуліца пакрылася шэранькаю ледзяною скарынкай. Халодны і шчыльны, як вада, вецер збіваў з ног. Ен, быццам рачная плынь, пёр па вуліцы ў берагах устылых сцен.

Чалавек спыніў мяне і запытаўся, як прайсці да гастранома, таго, што ля трамвайнага прыпынку «Вуліца Берсана». Спачатку мне здалося, што ён п'янаваты: неяк шырока расставіў ногі, абапёрся на старэнькую чорную крывульку з гумавым наканечнікам, купленую ў аптэцы. У левай руцэ матлялася на ветры карычневая сумка, старая, але акуратная. І адзенне на ім было старое і старамоднае.

Мне здалося, што ён пачне прасіць капеек: тады і да Мінска дайшла мода ў алкаголікаў збіраць капейкі ў незнаёмых людзей на вуліцах.

— Я з Бараўлян, са шпіталя. Да сястры зайсці хачу. Мішку цукерак купіць трэба.

Мужчына нечакана ўсміхнуўся, пацяплеў ад усмешкі яго бледны, густа, навек ссечаны сінімі крапінкамі твар.

Я сказаў яму, што лепш перайсці на другі бок вуліцы і ісці да гастранома, дзе раней, пакуль хадзіў трамвай, і сапраўды быў прыпынак «Вуліца Берсана».

— Даўно не быў у Мінску,— вінавата прызнаўся мужчына.

Вецер трапаў полы расшпіленага пінжачка, пад якім была толькі шэранькая картовая рубашка. Відаць, калі ад'язджаў чалавек на лячэнне, не падумаў пра раннія асеннія халады. Матлялася на ветры сумка, і самога мужчыну хістаў вецер.

Нейкі час я стаяў, глядзеў, як чалавек асцярожна перайшоў цераз вуліцу. На адкрытым месцы яго неспадзявана маханула парывам ветру — упала на тратуар

сумка, высока ўскінулася ўгору палка. Здалося, што чалавек упадзе, але ён астояўся.

Апранутая ў чырвоную куртку з белай аблямовачкай на капюшоне, у джынсавых штанах жанчына абышла чалавека, скоса і падазрона зірнула на сумку на тратуары і болей не азіралася.

Мужчына паволі сагнуўся, падняў сумку і асцярожна і нязграбна пайшоў далей па вуліцы.

Ужо ў аўтобусе я не мог у думках адкаснуцца ад яго. Успаміналіся закасцянелыя, нейкія нязвыклыя наскі яго чаравікаў, і толькі тады я здагадаўся, што быў ён на пратэзах і ісці яму было цяжка нават тую невялікую дарогу, якую я паказаў.

Ад тае сустрэчы, мабыць запала ў душу незразумелая макавінка нейкай маёй вінаватасці за той вецер і холад на вуліцы, за маладую, як напаказ, прыгожую жанчыну, якая абмінула інваліда, бо ўсё гэта, здавалася, забытае, паўстала ў памяці праз многа год зусім нечакана.

Дзень раскашаваў пяшчотны, цёплы. Гэтакімі днямі прырода нібы хоча сагрэць і суцешыць усё жывое перад доўгімі халоднымі дажджамі, сіберным ветрам і, здаецца, такімі далёкімі і жаданымі маразамі, чыстым снегам. Ля ўвахода ў магазін прадавалі грушы і вінаград. У самім жа магазіне «Дары прыроды» — мне здаецца, што назву гэту прыдумаў нейкі цынічны жартаўнік — прадавалі развясны прывазны мёд, і па яго стаяла чарга на ўвесь магазін.

— Мёду больш няма, толькі што асталося ў бітоне,— не першы раз папярэджвала прадаўшчыца.

У гэтай цеснаце праўз чаргу праціснулася да прылаўка высокая дзяўчына з сумачкай на плячы і густымі залацістымі валасамі, якія лажыліся на плечы. З-за іх усе, мабыць, і звярнулі на яе ўвагу.

— Ты куды без чаргі? Я маю права і то!.. Назад!

Мужчына ў шэрым касцюме, дасюль нічым не адмет-

ны ў чарзе, ціхі пенсіянер, хапіў жанчыну за руку, вышэй локця. І гэта нечаканае «назад!» прагучала аднекуль з таго часу. І лютасць у вачах, якімі ён разануў, як аўтаматнай чаргой, вакол была сапраўдная, белая, як і шкло трохлітровага слоіка ў другой руцэ мужчыны.

Скаланулася ад нечаканасці прадаўшчыца, замерла на імгненне чарга, спалохана прагучаў голас дзяўчыны:

— Мне не мёд... Я арэхаў хацела глянуць сыну.

— Я не хачу арэхаў, мама, пайшлі! — хлопчык, дасюль не заўважаны нікім, цягнуў сваю маладую маму за палец і насцярожана глядзеў на людзей. Жанчына з палёгкай паслухмяна пайшла за сынам.

Толькі тады ўздыхнула, заварушылася чарга.

— А рукі нечага распускаць,— быццам ні да кога і да ўсіх сказаў шчупленькі мужчына ў спартыўнай куртцы і вынашаных джынсах.— Нікому.

Мужчына з трохлітровым слоікам азірнуўся, змераў яго позіркам зверху ўніз:

— Асмялелі, перастройшчыкі!..

Ён больш нічога не сказаў, толькі шумна ўцягнуў праз ноздры паветра і звярнуўся да прылаўка. Праз два чалавекі падыходзіла чарга, мёду яму хапіла, на ўвесь слоік.

Я выйшаў на вуліцу. Усё гэтак жа сонечна і ўтульна свяціўся вераснёўскі дзень. Але і на гэтым цяпле холадам павявала ад нядаўняга. І ўспомніўся той асенні дзень, інвалід на халодным ветры, мытыя не раз, вылінялыя стужачкі ўзнагарод на калодцы. І сённяшні дагледжаны твар, тлуста бліскучая пад слюдой калодка ўзнагарод, амаль цалкам юбілейных, і непрытворная ўладная лютасць, якая прарвалася на людзей з мінулага, калі ў пашане быў другі парадак, які спадзяецца на сваё вяртанне. І тады можна будзе аднесці пірагі за ўсе страчаныя мяды.

Над прылаўкам з залацістым вінаградам сыта кружыліся восы, і прадаўшчыца дабрадушна, ленавата адмахвалася ад іх рукой.

## БАГАМОЛКА

Усё выйшла да крыўднага проста і будзённа. Міхасёнак зусім не гэтага чакаў, калі думаў пра паездку ў мясціны, дзе некалі партызаніў. Пра паездку ён пачынаў думаць заўсёды, калі яму было цяжка і пачыналі мучыць сумненне і роздум. Паездкі гэтае ён чакаў, як ачышчэння, як свята. І вось цяпер, пакалыхваючыся на пыльным прасёлку ў аўтобусе, безнадзейна захіляючыся ад пылу ў стары пакамечаны плашч, успамінаў ён усё, што адбылося за гэтыя тры дні, свой ад'езд.

Устаў ён з шасці гадзін, доўга і старанна мыўся ля калодзежа, потым снедаў разам з Янакам. Потым яны ўдвух выйшлі ў канец вёскі, чакалі аўтобуса, які павінен быў ісці недзе а палове восьмай на Мінск і чамусьці спазняўся. Янак, абуты ў гумавыя боты, у фуфайцы паверх заношанае майкі, з непабрытым рыжабародым тварам, курыў махорку і неўпрыкмет пазіраў на гадзіннік. Міхасёнак ведаў, што Янаку не церпіцца, калі прыйдуць Антось і Казя. Тады ён зможа развітацца і бегчы збіраць касцоў — ехаць касіць балота на Шубіна, бо яго брыгада і так самая адстаючая.

— Ладна, Іван, давай. Я адзін пачакаю, можа, яны прыйдуць. Не забудзь мой адрас... Дарэчы, што гэта ўчора парываўся сказаць мне Антось? — запытаўся Міхасёнак.

— А... Так,— адмахнуўся Янак.

— Усё-такі,— настойваў на сваім Міхасёнак.

— Я напішу... лепш. Ладна? Усяго добрага! — развітаўся ён і пайшоў па вуліцы, разграбаючы нагамі пясок.

Міхасёнак кінуў плашч на пасівелую ад пылу прыдарожную траву, лёг. Яму адразу ж успомніўся ўчарашні развітальны вечар у Янакавай нізенькай хатцы з пачарнелаю столлю і такім жа пачарнелым ад старасці дзедаўскім сталом.

Казік і Антось прыйшлі адны, без жанок, хоць меліся сабрацца па-сямейнаму, як на госці. Міхасёнак уявіў, як бабы адмахваліся і бубнілі, што няма калі прадыхнуць за работаю, а яму — гэта пра Міхасёнка — госці ды гарэлка.

Закусвалі салам і смажанаю рыбаю, якую Міхасёнак лавіў з Янакам,— ад'ехаліся ў пушчу на матацыкле, кінулі зарад у затоку. Міхасёнак боўтаўся ў вадзе, збіраў аглушаную рыбу і з жахам думаў, што будзе, калі накрые ахова. Ён жа ўсё-такі работнік міністэрства.

Мужчыны цэлы дзень былі на сенакосе, і пасля другое шклянкі твары іх зачырванеліся, мужчыны загаманілі. Міхасёнак добра ведаў усё, пра што яны ўспаміналі: ён амаль два гады быў камандзірам іхняй падрыўной групы, сам вучыў іх сапёрнай справе. Памятаў ён і тыя суткі, за якія яны ўмудрыліся спусціць тры эшалоны, і тую ноч, калі іх заўважылі на высечанай паўз дарогу паласе лесу. Яны тады вярнуліся ў атрад, несучы мёртвых — Ваську-масквіча і веселуна-гарманіста Мікіту...

— Слухай, камандзір, я табе скажу. Пра Гудка скажу... Ты слухай мяне, камандзір,— паварочваўся да Міхасёнка Антось. У яго ўжо заплятаўся язык, і замест «камандзір» выходзіла «камдзір».

Але сказаць Антосю так і не ўдалося: Міхасёнак таксама захмялеў і не слухаў, да таго ж не маўчалі

і Янак з Казем. Пасля Міхасёнак спяваў разам з мужчынамі і не помніў, як трапіў у пасцель...

Аўтобус спазняўся на цэлыя паўгадзіны, і Міхасёнак нервова паглядаў на гадзіннік і думаў, што хацеў сказаць яму Антось пра Гудка, некалі самага маладога і ціхмянага, задумлівага, як цень, хлопца. Прыйшоў Гудок у іхнюю падрыўную пасля таго, як немцы застрэлілі яго старую маці. Яна хацела не даць ім падсвінка.

Янак расказаў, што Гудок запіў пасля вайны і ноччу, ідучы дадому, утапіўся ў балоце, дакладней, у восеньскай каляіне на балотнай дарозе.

Антось і Казя так і не прыйшлі праводзіць Міхасёнка, і ён, адзіны пасажыр з усяе вёскі, цяпер сядзеў на заднім сядзенні і ўспамінаў.

Аўтобус затармазіў, патануў у воблаку пылу, зарыпелі гумаю пярэднія дзверцы. У аўтобус увайшла маладая пара. Жанчына асцярожна трымала на руках спавітае немаўля. Следам увайшла нізенькая старая ў акуратнай чорнай сацінавай спадніцы, у такім жа чорным сачку і чорнай хустачцы.

Уперадзе адна з жанчын, што ехалі ў аўтобусе, пацiснулася да акна, пасадзіла побач старую.

— Куды ж табе ехаць, бабка? — спытала жанчына.

Старая азірнулася кругом, хуценька перахрысцілася некалькі разоў, паказала пальцам некуды за акно.

— Нямая?! Маліцца едзеш у Дзераўное? — услых здзівілася жанчына.— Позна ж ты едзеш, бабка: аўтобус ужэ пайшоў на Дзераўное. Гэна каб ты раней села, дык якраз бы на дарогу выехала.

Старая яшчэ некалькі разоў перахрысцілася, паказала рукою за акно.

— Ды ўжэ ж даедзеш, хоць на папутнай,— супакоіла старую жанчына і з уздыхам вымавіла балючае, яшчэ памятнае Міхасёнку з часоў вайны: — От долечка ж мая ты!

Міхасёнку добра была відаць старая. Ей не сядзелася. Яна неспакойна паглядвала за акно, павярнулася да жанчыны з дзіцем, паказала на малое пальцам, потым на мужчыну, што сядзеў побач з жанчынай.

— Не, не муж. Гэта брат мой,— адказала жанчына.

Старая заківала галавою, махнула ад сябе рукою, неяк ад твару — маўляў, не.

Міхасёнак раптоўна сцяўся ўвесь — ён успомніў...

Дажджы пайшлі дарэчы: брыгаду заціснулі блакадаю, партызаны рыхтаваліся да прарыву. Ноччу камбрыг выклікаў у штаб камандзіра лепшай падрыўной групы. Заданне было адказнае: трэба было адысціся за пяць кіламетраў ад прызначанага месца прарыву і ўзарваць мост, каб немцы не змаглі ўдарыць з флангу танкамі, пакуль брыгада ўвойдзе ў другое балота, дзе больш не страшны ні немцы, ні іх танкі.

— Ты зразумеў мяне, камандзір? Заўтра апоўначы мост павінен узляцець. Як бы ні было... Ты мяне зразумеў? Пра час прарыву ведаюць толькі ты і мой камісар. Хлопцам сваім скажы, што гэта проста дыверсія,— скупа гаварыў камбрыг і глядзеў сваімі чырвонымі ад бяссоння вачыма.— Ідзі, камандзір.

Праз гадзіну падрыўнікі выйшлі — пяць маладых хлопцаў, узброеных і нагружаных узрыўчаткаю. Ад іх цяпер залежаў лёс брыгады — змучаных, галодных і знясіленых людзей, з якімі былі абозы, параненыя, жанкі і дзеці з навакольных вёсак, якіх яны павінны былі абараніць, выратаваць. Гэта амаль без боепрыпасаў, без ежы.

Яны ішлі ў ноч, і толькі адзін камандзір ведаў, што, магчыма, ніхто з іх не вернецца назад.

Вёсачка, заціснутая лесам, угадвалася па агародах, па качанах капусты, што захрумсцелі пад нагамі.

— Завішняк, давай у крайнюю хату, уведай, дзе тут рэчка, дзе той мост,— загадаў камандзір, і чалавек

прапаў у начной цемені, толькі было пачулася, як зашоргалі халявы ботаў па бульбоўніку. Праз колькі хвілін адтуль, дзе знік партызан, коратка трэснуў аўтамат, з сярэдзіны вёскі шухнула ўгару ракета, пры спалоханым смяротным святле якой камандзір заўважыў за метраў сто і рэчку, і мост...

Яны цішком зніклі ў лесе. Аўтаматы яшчэ трашчалі ў вёсцы, потым пачуўся выбух, другі, і ўсё сціхла. Усе ўчатырох зразумелі, што партызан назад не вернецца і нікому нічога не прагаворыцца.

Камандзір загадаў абысці вёску з другога боку, перабрацца цераз рэчку і там перасядзець у лесе дзень, а ноччу выйсці на падрыў, з двух берагоў, дзвюма групамі, калі на мосце будзе ахова.

На днеўку яны затаіліся на ўзгорку ў густым кусцістым арэшніку, за якім чарнелася лясная глухамань, як думалася ім. З узгорка былі добра відаць падыходы з трох бакоў, і на ўсякі выпадак, было куды адступаць.

Мокрая імгла, якая церусілася ўсю ноч, к абеду перастала, але неба не праяснілася — вісела шэра і нізка.

І камандзір не паверыў вачам, калі ўбачыў пяцёх нямецкіх салдат. Яны ішлі проста на ўзгорак. Аўтаматы ў іх віселі за плячыма, а ў руках у аднаго была адабраная ў вёсцы карзіна. Немцы ішлі ў арэхі. Камандзір загадаў адпаўзаць да гушчару, і калі сам, апошнім, перамахнуў невялікую палянку перад гушчаром, пачулася кароткае нямецкае:

— Хальт!

Следам ударыла чарга, пачуўся тупат.

...Гушчар скончыўся нечакана. Яны выбеглі на дарогу. У нейкую долю секунды камандзір улавіў і трэск сучча ззаду ў гушчары, і заўважыў жанчыну, што ад нечаканасці ўпусціла на дарогу вязанку ламачча, і направа цераз дарогу гушчар, а налева рэдкія кусты на выжарыне і кінуўся туды. Хлопцы — за ім і ўпалі за

першымі ж кустамі, яшчэ не разумеючы, чаму так зрабіў камандзір.

Ім было добра відаць, як выбеглі на дарогу фашысты, як яны загергеталі да жанчыны, як яна махнула ад сябе рукою, ад твару, як нізенькі круглы фашыст тыцнуў жанчыне ў грудзі аўтаматам, і яна ўпала на дарогу, як яны білі яе ботамі...

— Не смець! Чуеш, Гудок? — загадаў камандзір партызану, які паціхеньку падымаў да пляча аўтамат. Яны бачылі з засады, як з-за вязанкі махнулася рука жанчыны і ўпала ў бок гушчару, як фашысты кінуліся туды, як адзін з іх азірнуўся і секануў па жанчыне дзвюма кароткімі чэргамі...

Ноччу падрыўнікі ўзарвалі мост і дагналі брыгаду.

Аўтобус павярнуў на гравійку, спыніўся.

— А можа, бабка, далей пад'едзеш? Там аўтобусы спыняюцца,— гучна запытаўся шафёр.

Старая адмоўна заківала галавою, махнула рукою ад твару — не, азірнулася на пасажыраў. Міхасёнак апусціў вочы. І ўжо, калі крануўся аўтобус, ён азірнуўся — на дарозе сіратліва варушылася цёмная постаць — усё аддалялася, меншылася...

Недзе праз месяц Міхасёнак атрымаў ліст ад Янака.

«Здравствуй, камандзір! Сабраўся напісаць табе, каб ты ведаў усё. Дык Гудок пасля партызан не піў, як ажаніўся. Добра з жонкаю жыў. Адале прыходзіць раз да мяне, п'яны, заплаканы. «Жыве,— кажа,— Янак, тая баба, што мы тады кінулі». Я ў яго пытаюся, якая там баба. Ажно ён пра тую, што тады немцы білі, як мы ішлі мост узрываць у блакаду. Якая нас не выдала. А Гудок наш зусім спетраў і ссох, і ўсё п'е, як на пусты канец. Сустрэліся неяк мы, цвярозы ён быў, Давай я яго ўгаворваць, каб кінуў піць, а ён мне ні з таго ні з сяго: «А яна пасля таго знямела. Немцы яе білі, каб гавары-

ла. Помніш, яна рукою ў другі бок махнула?» — «Кінь,— гавару яму,— інакш нельга нам было».— «Не магу»,— адказвае. І вочы ў самога балючыя такія, і ўсё ў адно месца глядзяць. Страшна мне за яго стала. Цэлую ноч заснуць не мог, усё думаў пра Гудка нашага. І згінуў у тую ж ноч Гудок. І мы цяпер з хлопцамі баімся з гэтаю нямою стрэцца. Трэба было нам тады ўсё роўна падысці да яе...»

У канцы пісьма былі прывітанні ад Антося і Казіка.

Міхасёнак невідушча глядзеў на спісаны алоўкам лісцік з вучнёўскага сшытка ў касую лінейку і бачыў маленькую постаць, якая ўсё аддалялася і знікала за едкім, як памяць, дарожным пылам.

# ПЛЫНЬ

## I

Барысаў чакаў і нават хацеў, каб нешта здарылася. Але на аўтавакзале аўтобус на пасадку падалі ў час, праз гадзіну ён прыбыў у аэрапорт, і, як толькі пасажыры ўвайшлі ў залу, пачалася рэгістрацыя. У зале прасторна, ні натоўпу, ні штурхання. Падпарадкаваны гэтаму рытму, Барысаў здаў у багаж чамадан, прайшоў перадпасадачны агляд. У гэтак званым накапіцелі пасажыраў таксама доўга не трымалі. Усё роўна як паслухаліся пяцігадовага хлопчыка, які капрызнічаў і патрабаваў у сваіх юных бацькоў: «Хацю ў самалёт!» Аўтобус адвёз да самалёта. Пасажыры размяшчаліся спакойна, прыйшлі пілоты і пачалі праграваць маторы. І месца Барысаву трапілася ля запаснога люка, там наперадзе не было сядзення, можна зручна выцягнуць ногі. Насуперак настрою ў душы Барысава праклюну-

лася лагоднасць. Сам сабе ён не хацеў прызнавацца, але да апошняга па-дзіцячы спадзяваўся, што палёт адменіцца, што адпачынак ён правядзе, як і раней, на дачы, пры доме. Цяпер, калі сама бурліць жыццё, можна будзе вечарам сазваніцца з сябрамі, абмяняцца думкамі, як гаворыцца. Хаця і ў час работы яны даволі часта «абменьваліся», да поўначы і болей, і ад гэтых абменаў назаўтра балела галава.

Побач з Барысавым сядзела пажылая пара. Ад жанчыны ішоў тонкі, амаль няўлоўны, прыемны водар духоў. Муж быў з густой сівай шавялюрай, з маршчыністым валявым тварам. Зусім нечакана ён пачаў трумкаць губамі ў лад пуставатай мелодыі, якую ўключылі сцюардэсы. Барысаў здзіўлена паглядзеў на яго. Ужо потым, калі перад пасадкай мужчына зноў затрумкаў пад музыку, Барысаў здагадаўся, што ён хвалюецца перад пасадкай і ўзлётам.

Барысаў аж наструніўся ўвесь, калі пасля ўзлёту адкрыўся яму нечакана яркі, шчодры малюнак жоўтых, чырвоных, барвовых, пахмурна суровых хвояй лясоў. У самай спелай восеньскай красе разгортваліся пад крылом самалёта лясы, асветленыя чыстым, празрыстым святлом ранішняга сонца. Барысаву нават здалося, што ён пачуў пах прыпрэлага лісця, суровай хвоі, верасу, і яшчэ бог ведае чаго, але таго своеасаблівага настою, якім толькі можа пахнуць восеньскі лес. Барысаў не адарваўся ад ілюмінатара, пакуль усё гэта не размыла вышыня і зямля не ператварылася ў геаметрычныя фігуры, расчэрчаныя белымі ніткамі дарог.

Можа, ад хвалявання ў грудзях зноў адчуў боль, на які ўжо колькі месяцаў не мог не зважаць. Потым наплыла неадчэпная, глухая стомленасць душы і цела, якім нагрузіла і не першы ўжо год гняло жыццё. У матэрыяльным свеце нічога за так не даецца, гэта, лічыў Барысаў, была расплата за бяссонныя ночы з маладых гадоў, калі ён не аглядаўся ні на што, працаваў суткамі

і месяцамі. «Кто раньше начал, кончит ране...» — любіў Барысаў паўтараць радкі паэта. І сёння ўсё, што адбываецца ў інстытуце, наогул у навуцы, яго непасрэдна датычыць, ад яго залежыць...

Успомнілася, як дачка паглядзела ў санаторную карту, потым на яго і пажартавала:

— Ты хоць у санаторыі жанчынам не паказвай сваё дасье, а то разбягацца будуць... Нашто ты сябе гэтак давёў? Ты ж не стары яшчэ мужчына...

Яна асеклася пад яго позіркам. Пабаялася, што скажа злоснае і крыўднае, як гаварыў маці. Яму даўно прывыклі змоўчваць, стараліся не чапаць. А пасля таго, як дачка выйшла замуж і ў яе нарадзілася маленькая Алёнка, усё жыццё ў сям'і закруцілася вакол яе. Ёй усміхаўся і радаваўся і ён, заўсёды злосны, адчужаны ад сям'і, якая яго не разумела і не цаніла, а толькі карысталася здабытым ім, яго галавой і працай.

Саракашасцігадовы дзед, доктар тэхнічных навук, загадчык сектара акадэмічнага інстытута Барысаў Антон Андрэевіч не любіў, калі яму пярэчылі не толькі дома, але і на рабоце. Проста пярэчанняў ён не прызнаваў, яму трэба было даказваць, а з доказамі ён згаджаўся... Ён не верыў і дактарам, якія запатрабавалі: альбо ў санаторый, альбо ў бальніцу, падазраваў, што іх падгаварыла жонка, і адзіны аргумент — боль у грудзях, аргумент істотны, для яго быў яшчэ не доказ.

II

Упершыню ў санаторыі ён быў у гэтым самым вялікім курортным горадзе. Даўно. Пасля таго, як здольны студэнт Барысаў напісаў дыпломную, якую залічылі за кандыдацкую. Усё адбылося раптоўна. Барысаў, цяпер ужо навуковы супрацоўнік, атрымаў адразу двухпакаёвую кватэру. У іх тады з Любай нарадзілася маленькая Валя. З'явіліся і грошы, бо зробленае Барысавым залічвалася як адкрыццё, мела прымяненне ў многіх галінах. Пуцёўку ён узяў таму, што прапанавалі.

3 Зак. 2732

Люба з маладой і наіўнай шчырасцю выпраўляла яго адпачыць, хаця ён тады не адчуваў ніякай патрэбы ў адпачынку ды і вялікага жадання ехаць на поўдзень не меў. Але ён паехаў. І яго ашаламілі мора, сонца, пальмы, пляжы... Гаспадаром жыцця адчуў ён сябе адразу, калі ў таксі, адзін, ехаў з аэрапорта.

З гадамі зніклі, растварыліся ў часе дэталі, і адпачынак зліўся ў нешта адно марское, зялёнае, да болю ў вачах асветленае белым паўднёвым сонцам. У пакоі, які выходзіў акном на мора, ён жыў з брытагаловым рухавым старым Міхаілам Іванавічам, які і ў свае даволі немаладыя гады бегаў раніцай, купаўся ў моры, паспяваў амаль на ўсе працэдуры, каб «зарадзіцца» на цэлы год. Ён раіў і Барысаву не марнаваць час, але яму хапала толькі мора, сонца і паветра.

Непрыкметна падабралася кампанія: журналіст Валера з маскоўскага часопіса, які хадзіў у чорным скураным пінжачку, нягледзячы на гарачыню, дзве ягоныя сяброўкі — дактары Марыя і Аня. Марыю, даўганогую, доўгавалосую бландзінку з павольнымі, нібы замаруджанымі рухамі, Валера называў «мая дзева Марыя». Незразумела, пры чым тут была «дзева», бо Марыя днявала і начавала ў Валеры. Аня ў адрозненне ад сяброўкі была невысокага росту, чарнявая, скуластая, з па-татарску касаватымі цёмнымі вачыма, у якіх раптам успыхвалі нейкія зялёныя, дзікія агеньчыкі. Калі Валера з Марыяй znікалі, Барысаву даводзілася неадлучна быць пры Ані, слухаць яе бясконцыя расказы пра трохгадовую дачку, пра свайго мужа, былога баксёра, цяпер кандыдата навук, пра тое, як нядаўна, калі на рабоце ў Ані праводзілі крос, ён сустрэў яе і на руках прынёс на фініш. А то раптам ні з таго ні з сяго шчырая сямейніца пачынала фантазіраваць пра тое, як Барысаў аднойчы ў Маскве пазвоніць ёй і прызначыць спатканне на плошчы Маякоўскага. Барысаў тады не разумеў, навошта яму трэба будзе прызначаць

тое спатканне... Урэшце Валера з Марыяй аднойчы выйшлі вечарам з пакоя, і Валера механічна замкнуў за сабой дзверы. А потым яны з Марыяй доўга сядзелі ў рэстаране і рашылі не турбаваць Барысава з Аняй, пераначавалі ў Марыіным пакоі. Усё гэта Валера тлумачыў назаўтра Барысаву, вельмі збянтэжанаму.

На шчасце, тэрмін пуцёвак у масквічоў канчаўся, Барысаў правёў іх да таксі раніцай, з палёгкай парваў лісток з тэлефонам і адрасам. І ўжо да канца адпачынку, навучаны вопытам, не ішоў на блізкае знаёмства ні з кім. Весяліўся ў кампаніях на танцах, у рэстаранах, што ў той час лічыліся мясцовымі знакамітасцямі, якія нельга не наведаць, бо ніхто не паверыць табе, што ты быў на курорце, калі не «гудзеў» у якім-небудзь «Каўказскім ауле»...

Самалёт прызямліўся, і Барысаў спакойна глядзеў праз ілюмінатар на паўднёвы лёгкі аэрапорт, нейкі раённы ў параўнанніі з вялікімі аэрапортамі, якіх Барысаў нагледзеўся за апошнія гады. Прывычна чакаў, пакуль выдадуць багаж, выйшаў з будынка, узяў білет на аўтобус, які адпраўляўся да горада праз пятнаццаць хвілін. Ласкава свяціла сонца, не было горача нават і ў касцюме. Барысаў ведаў, што праз гадзіну ён прыедзе ў горад на вакзал, возьме таксі, пад'едзе да прыёмнага пакоя. Там яму выпішуць санаторную кніжку. Ён зойдзе ў свой нумар ці, па-санаторнаму, палату, раскладзе рэчы і ляжа, упадзе ў чыстыя халаднаватыя прасціны і будзе спаць, спаць... Ад гэтай думкі ён і сапраўды раптам адчуў стомленасць, пра якую нават і ўявіць не мог тады, больш дзесяці гадоў назад. Цяпер Барысаў адчуў усім сваім нутром, усёй сваёй істотай цяжар гэтых апошніх дваццаці гадоў, які налёг на плечы, гнуў і ціснуў да зямлі з такой сілай, што ёй амаль немагчыма было ўжо і працівіцца, і трэба бегчы, каб не ўпасці і не быць раздушаным. А ён ужо не бег, а толькі змяняў ногі, як заведзены...

III

Певень крычаў па-вясковаму гарласта і знаёма. Барысаў прачнуўся ад ягонага крыку і выйшаў на балкон. Певень крычаў з патанулай у засені дрэў лагчыны збоч санаторнай тэрыторыі, дзе стаялі хаты, у якіх жылі людзі са сваімі простымі людскімі клопатамі, трымалі курэй, і певень выконваў свае абавязкі пры гаспадарцы.

Над вяршынямі двух кіпарысаў у лагчыне віднелася мора, роўнае і халоднае на ранішнім сонцы.

Барысаў надзеў трэніровачны касцюм, укінуў у поліэтыленавы мяшочак плаўкі і махровы ручнік, усунуў ногі ў гумавыя шлёпанцы. Хацелася ісці подбегам, лёгка, але тупы боль адразу ж даў знаць пра сябе. Барысаў асцярожна сышоў па прыступках у вестыбюль, выйшаў на двор. Сонца толькі дакранулася да вяршынь дрэў, ад мокрай у расе травы, ад бетонных плітак павявала холадам.

Па прыступках ён спускаўся да мора, успамінаў, як тады, у першы свой прыезд, яны бягом збягалі ўніз, а потым і наверх узбягалі, лічылі прыступкі, і іх аказвалася кожны раз на одну прыступку то болей, то меней. Барысава перагнала пара, ён, таўставаты, лысы, і жонка, круглая, але надзіва рухавая. Барысаў міжволі памкнуўся за імі гэтак жа спружыніста і лёгка, паморшчыўся ад болю.

Цень ад дрэў ляжаў на беразе і на моры аж да самых буёў. Тут яшчэ больш, чым на беразе, патыхала каменным холадам.

Пара, якая абагнала Барысава, ужо раздзявалася ля вады. Першай у ваду пайшла жанчына, мужчына следам. Па тым, як плыўцы энергічна ўзмахвалі рукамі, Барысаў здагадаўся, што вада халодная. У шлёпанцах ён падышоў амаль да самай вады, і як толькі ступіў босымі нагамі на гальку, яна апякла ступні холадам, можа, таму спачатку ў вадзе здалося цяплей. Барысаў

вярнуўся на бераг, але і тут, на бетоннай набярэжнай нават у шлёпанцах мерзлі ногі. Барысаў прысеў на дашчаты тапчан і глядзеў на мора. На ім плыў, патарахкваючы маторам, адзінокі чорны буксір. Барысаў прыглядаўся да яго, нібы хацеў пазнаць, ці той гэта самы.

...Мора ляжала надзіва роўна, не варухнулася, не калыхнулася, нібыта застыла, аплаўленае ранішняй сонечнай пазалотай. У вадзе было цяплей, чым на беразе. Барысаў няспешна выплыў у мора за буі, ляжаў на спіне, і сонца грэла ў твар. У вады сваё прыемнае цяпло, у сонца — сваё. Ранішнюю цішыню парушаў толькі роўны грукат матора чорнага буксіра з аўтамабільнымі пакрышкамі на бартах. На палубе людзі ў рабочым адзенні нешта крычалі Барысаву і махалі рукамі. Ён таксама прыветна памахаў ім у адказ.

Чаго крычалі, Барысаў зразумеў пазней, калі агледзеўся, што ён не супроць свайго санаторыя, а ўжо насупроць суседняга пляжа. Тады ён пачаў хутка грэбці да берага, але той не спяшаў набліжацца, а плыў міма. Барысаў знямогся. Сонца ўжо паднялося вышэй, і Барысаў бачыў на беразе людзей, якія гэтак жа, як і ён, выйшлі пакупацца. Барысаў цяпер зразумеў, што гэта спакойная вада нясе яго нябачнай магутнай плынню. Тады ён пачаў плыць да зямлі пад вуглом, упарта, эканомячы сілу. Па дрэвах ён бачыў, што пакрысе набліжаецца.

Знясілены, Барысаў выбраўся на бераг толькі перад самым марскім портам. Калі дабіраўся да санаторыя, на выратавальных станцыях ужо аб'яўлялі, што ў мора заходзіць небяспечна.

Пакуль Барысаў успамінаў, на набярэжнай збіраліся мужчыны і жанчыны, раздзяваліся да пояса, разміналіся. Гэтая размінка толькі дапамагала нагуляць апетыт, і Барысаў пасмейваўся з яе. Потым з'явілася

наверсе, на аэрарыі, жанчына з мікрафонам і запатрабавала:

— Прашу ўсіх выйсці з мора. Пачынаем ранішнюю гімнастыку. Пастроіліся, пастроіліся! А вы, малады чалавек, што прыселі, як сірата казанскі на вакзале? Станавіцеся, станавіцеся!

Барысаў спачатку не зразумеў, што малады чалавек, гэта ён і ёсць. На яго пачалі азірацца. Першае жаданне было агрызнуцца, пайсці назад. Але на вачах ва ўсіх уцякаць, як хлапчуку... І ён падняўся, пачаў пераступаць нагамі пад каманду крыклівай жанчыны з мікрафонам. Яму здавалася, што і тады яна крычала гэтак жа на пляжы кожнае раніцы. Потым Барысаў пачаў заўважаць, што стамляецца, што рухі яго гэтакія ж нязграбныя, як і ў «маладых людзей» побач, нават горш таго. Ён паспрабаваў выконваць практыкаванні спружыніста і лёгка, але адчуў, што не стае дыхання, што рукі і ногі скоўвае боль. Ён датрываў да канца зарадкі, потым доўга праходжваўся па беразе, аддыхваўся, прыслухоўваўся, як калоціцца, нібы авечы хвост, у грудзях сэрца. Назад да санаторыя Барысаў пайшоў не па лесціцы, а ўкруга, па дарозе, па якой на пляж можна пад'ехаць на машыне.

Над дарогай сыходзіліся вершаліны парадзелага на восень граба, падала на асфальт і ледзь чутна чокала сухое пакручастае лісце. І пахла тут па-асенняму прыпрэлай вільгаццю. Пах гэты памятны навек з дзяцінства, гэтак жа як і пах сакавіцкага, прыгрэтага на сонцы снегу, стылы пах мяцеліцы, што растае белым пылам на брывах, сіберны пах бясконцага асенняга дажджу, прапахлага гаркавым водарам размоклай вішнёвай кары ў садзе.

Барысаў прынюхваўся, прыслухоўваўся, прыглядаўся да гэтага суладдзя ў прыродзе, якое нязменна паўтараецца з усёй сваёй велічнасцю і значнасцю. Гэтакай жа, а можа, і большай за тыя высокія сферы і ма-

тэрыі, у якіх жыў і прападаў апошнія гады Барысаў. Уся глабальнасць свету ці і не існуе дзеля таго, каб вось гэтак вечна і пастаянна расхіналася з маладой радасцю вясной лісце і потым, ужо ў восень, велічна і мудра асыпалася долу?

Барысаў нагнуўся, каб адчуць яго пах, і потым азірнуўся — ці не бачыць хто? Але мудра маўчалі кіпарысы і піхты наперадзе, абапал алеі, пасярэдзіне якой стаялі пузатыя, як вялізныя матрошкі, бразільскія пальмы.

## IV

Прайшоў тыдзень, пачаўся другі. Барысаву не надакучыла санаторнае жыццё, і кожны дзень яго дарога пад дрэвамі не паўтаралася. Было ўражанне, што з кожным днём ён ішоў усё далей, далей, і з гэтае цяперашняе далечыні, нібы чужога, бачыў сябе самога і сваё жыццё, цэлае жыццё — два дзесяткі гадоў.

Усё на тым жа маладым узлёце Барысаў напісаў і абараніў доктарскую. Яна далася лёгка, быццам удача сама сабой разумелася. Яго прызначылі загадчыкам сектара. Тады гэтакіх маладых лічаныя адзінкі былі на кіруючых пасадах. Ён пачаў ездзіць і выступаць на сімпозіумах і канферэнцыях, дома і за мяжой, асабіста перазнаёміўся з многімі карыфеямі. Ён адкрываў цікавыя тэмы. Іх і не закрывалі, яны неяк павісалі ў паветры, не хапала альбо сродкаў, альбо таго, хто б укараніў іх, напльвалі другія, не менш цікавыя. Права пачынальніка належала яму, Барысаву... Праўда, за мяжой некаторым ягоным распрацоўкам далі дарогу, і потым за валюту мы самі закуплялі адтуль ужо гатовае абсталяванне. Усё гэта акружала Барысава не толькі славай удачніка, але і таго, каго «яны» хочуць прыціснуць, «з'есці». «Яны» — гэта кансерватары і ўсясільныя бюракраты ад навукі. Упэўнены ў сваёй праваце,

у тым, што не надышоў яшчэ яго час, Барысаў і сам адкладваў работу на потым, ваяваў за стварэнне «належных умоў»: удзельнічаў у бясконцых пасяджэннях і нарадах у розных інстанцыях, у спрэчках з калегамі, на робоце і пасля работы. Усё больш і больш гаварылі пра тое, хто куды перастаўляецца, высвятлялі, хто каго «піхае», хто каго «трымае»... Закручаны ў чадзе спрэчак, ілюзорнага чакання перамен, ён нават і ў адпачынак далёка не выязджаў, самае большае — на дачу, каб быць на месцы, пад рукой. І працягвалася звыклае — спрэчкі, чаркі, прагнозы, расстаноўкі і перастаноўкі. А для навукі ў лепшым выпадку за год выдаваў артыкульчык у акадэмічным весніку.

У сям'і ўсё павінна было, як і раней, служыць і нават прыслужваць Барысаву. Але з гадамі ў жонкі не стала таго ранейшага захаплення і пакорлівасці. Ён абвінавачваў яе ў тым, што не ведае меры ў сваіх прэтэнзіях, што зусім абмяшчанілася. А ён не з тых, каму кар'ера даражэй за навуку. У яго была ідэя, у імя яе ён і жыве, а астатняе нічога не значыць... Усё астатняе дробязь, цераз усё ён меў права пераступіць, у тым ліку і цераз самога сябе.

Ад успамінаў пра ўсё тое тут, пад вечнасцю дрэў, Барысаву здавалася, што яго доўга, бясконца доўга, везлі па расхлябанай, разбітай каляі ў грымучым, як парожняя бочка, і пастаянна п'яным вагоне. І ён аглух ад гулу доўгіх і аднастайных гаворак, у якіх чалавек куляецца, нібы клоун на пацеху ўсім. Стары, ацяжэлы, прыдурваецца, як малады, і маладыя бачаць і старасць, і недарэчнасць гэтага кулляння. Фокусы састарэлі, акцёр абшарпаны, верыць у апладысменты, у якіх невядома чаго больш — насмешак, горычы, спачування? А за акном вагона адплывае ў нябыт жыццё і, як на вар'яцтва, глядзіць на гэты грукатлівы шабаш...

Успомніўся даччын позірк перад ад'ездам, і нешта абрывалася ў грудзях, цёпла, забыта. І калі думаў пра

страчаныя гады, здароўе, хацелася заскрыгітаць зубамі ад злосці і бяссілля што-небудзь перамяніць, вярнуць назад...

А надвор'е цешыла. Стаялі сонечныя дні, нячастыя ў гэту пару, трымала цяпло мора. На ціхі, прасторны пляж штодня прыходзіў хударлявы, крыху ссутулены дзядзька. Акунаўся ў моры, грэўся на сонцы, рассцілаючы падсцілку проста на цёплы пясок, чытаў газеты, якія заўсёды насіў з сабой у поліэтыленавым мяшку разам з ручніком. Ён адпусціў вусы, і ад гэтага твар здаваўся яшчэ старэйшы і строгі. Вылучаўся ён тым, што любіў быць адзін, але гэта зразумела — вучоны. І яшчэ — амаль штодня мужчына званіў дадому, прасіў да тэлефона ўнучку, і твар яго ажываў, святлеў, як і ўдзень на пляжы, калі чуў магутны гул самалёта, які ўздоўж пабярэжжа набіраў вышыню, знаходзіў яго і доўга праводзіў позіркам.

## «ЕДУ Я І ПЛАЧУ...»

Ад хмар, якія густа захінулі неба за нейкі дзень, усё навокал зашарэла і засумавала, дыхнула восеннюю, яе пустэчаю і адзінотаю, яе вільготным халадком. І пад вечар густа запытляваўся дожджык. Аўтобусы і легкавічкі з жоўтым святлом у салонах, якія праляталі па шашы, весела заблішчалі, здаваліся святочнымі, цёплымі і ўтульнымі. Пад дожджык па-восеньску хутка і завечарэла. Акуліч, які ўжо некалькі гадзін «галасаваў» спадарожным машынам, затурбаваўся, што можа і заначаваць на восеньскай дарозе. А язды дадому было ўсяго дзве гадзіны.

Ён ужо шкадаваў, што адмовіўся ад машыны, якую яму прапаноўвалі. Акуліч нарадзіўся ў гэтай мясцовасці, у свой час — са студэнцкіх гадоў — папаездзіў па гэтай дарозе на спадарожных, а таму дарога ўяўлялася яму лёгкаю і простаю. Ды і адчуваць ён мог сябе незалежна: Акуліч прыязджаў з праверкаю, а не ў госці...

Грузавік замаргаў падфарнікам, з'ехаў на абочыну і спыніўся ля самага Акуліча, быццам прыехаў спецыяльна па яго. Адчыніліся дзверцы, і з кабінкі нязграбна вылезла жанчына ў тоўстай кофце, выцягнула ўслед за сабою пакаўную сумку, на якой паверх замка між ручак ляжаў вялікі букет астраў.

— Дзякуй, Пятрок, дзякуй! — падзякавала жанчына шаферу, і калі машына ад'ехала, пераключылася на Акуліча.— Як вы, дзядзька, даўно ўжэ стаіце?

— Даўнавата.

— Вой, і ніхто не бярэ? Каб хто падумаў, што гэтак на дождж перакруціцца. Мой жа мяне і так ледзьве выпусціў. Заўтра і дадому вярнуцца трэба. Гэта ж у мяне ўнучак нарадзіўся, а тут, за работаю, каб яна спрахла, і вырвацца няма калі.

Цётка гаварыла і па-піянерску бадзёра выстаўляла руку кожнай машыне, аж памахвала ёю. Дождж пагусцеў, асядаў на твар тоненькаю мокраю плеўкаю.

— Давядзецца, цётка, браць мяне на начлег,— пажартаваў Акуліч.

— Можа, даедзем як... Некалі і машын гэтулькі не было, а на дарогу выйдзеш і даедзеш. Усе бралі, абы месца было, а цяпер не...

Акуліч сутуліўся, павёў плячыма. У паношаным касцюме, са старым «дыпламацікам», на абочыне дарогі ён нічога агульнага не меў ужо з тым адказным міністэрскім работнікам, які яшчэ некалькі гадзін таму правяраў работу меліяратараў, якога вазілі на машыне і паслужліва прапаноўвалі яе да самае сталіцы. Цяпер



на дарозе стаяў звычайны спадарожны, якому толькі і спадзявацца было на літасць якога-небудзь шафёра. Акуліч ужо і рукі не паднімаў: цётка галасавала ўсім падрад, міжгароднім аўтобусам таксама, пакуль адзін з легкавічкоў не спыніўся. Цётка, як падмеценая, падхапіла сумку і пабегла да яго, паспрабавала адчыніць дзверцы, але не змагла, азірнулася на Акуліча. Ён адчыніў дзверцы, папытаўся:

— Падвезяце?

— Да Мінска? Садзецеся.

Мужчына за рулём коратка азірнуўся на Акуліча. Цётка адразу ж папхала перад сабою сумку, потым улезла сама.

— Вот дзякуй вам, а то хоць ты што хочаш рабі! — варушылася яна, умошчвалася на сядзенні.

Мужчына за рулём не абазваўся, засяроджана выехаў на асфальт, і цётка заціхла.

У машыне было цёпла, зеленавата свяціўся прыборны шчыток, асветлены фарамі асфальт, здавалася, сам плыў пад машыну, якую, нібы на хвалях, злёгку пагойдвала.

Акуліч прыплюшчыў вочы: гэтая ўтульнасць была ўзнагародаю за доўгае чаканне.

Мыжчына на пярэднім сядзенні побач з шафёрам маўчаў, пакуль ішла пасадка. Здавалася, што ён драмаў. Але як толькі машына набрала хуткасць, ён заварушыўся і працягваў перапыненую гаворку:

— Памаеш, еду я і плачу... Успомню бацьку, і плачу...

Голас расказчыка п'янавага асекся. Акулічу было відаць, як у мужчыны за рулём насмешліва тарганулися губы.

— За рулём пад мухай доўга не наездзіш,— нібы так сабе, без намёку, сказаў ён. Яго субяседнік як нічога і не было вёў сваю лінію.

— Памаш, Віця, успомню бацю і плачу. Помніш, як мы з табою разам з ім рыбу лавілі?

— Помню.

Той, каго мужчына назваў Віцем, зноў усміхнуўся аднымі губамі. У зеленаватым святле ад прыборнага шчытка твар яго здаваўся нейкім гіпсавым. Сур'ёзна-насмешлівая інтанацыя здалася Акулічу знаёмаю. Ды і ў сябеседніку Віктара было нешта даўняе і знаёмае.

— А помніш Аньку, якая прыязджала са Слуцка?

Мужчына забыўся пра жаль да бацькі, пра бацькаву машыну, якую маці прадала за бясцэнак.

Віктар нічога не адказаў яму, усё гэтак жа сур'ёзным і насмешлівым голасам паўтарыў сваё:

— Каб на машыне ездзіць, Коля, і не толькі на машыне, «чарнільца» па баку трэба!..

Коля не заўважаў яго інтанацыі, не заўважаў, што Віцька не хоча ўспамінаў і пра Аньку, якая некалі прыязджала са Слуцка. Коля быў шчаслівы, што сустрэўся з Віцем. Ён быў пад чаркаю, яму здавалася, што яны ўсё тыя ж — маладыя, вясёлыя, шчырыя.

Машына прыбавіла хуткасці і пайшла на абгон. Пранеслася збоч высокае святло аўтобусных вокнаў...

Акуліч ярка ўспомніў тую дзяўчыну, пра якую загаварыў Коля.

...Ноч была не чорная, а прасветленая тугою і халоднаю веснавою сінечаю. Блізка і буйна глядзелі зоркі. Падталы за дзень сакавіцкі снег шурпата працяла на ноч марозам, і пры месячным святле здавалася, што ён набрыняў сінечаю начнога неба. Пад нагамі востра пахрумствала, як можа пахрумстваць толькі вясною. Жаўтлява свяціліся вокны хат. І зусім блізка Акуліч бачыў бледны твар з глыбокімі, усё роўна як шчасліва здзіўленымі вачыма, пасмачку валасоў, усмешлівыя вусны, белую аблямовачку капюшона... Усё гэта было незвычайнае, загадкавае, трывожлівае, яно вабіла ад-

чуваннем нейкага недасяжнага і пакуль што незразумелага шчасця!..

Потым ён бачыў, як рука яе сама брала пад руку Віцю, ён чуў, як ціхенька і шчасліва смяецца дзяўчына. Потым ён бачыў, як яны цалаваліся, як яна пакорліва адкідала голаў, уся прытулялася да яго...

Акулічу тады здавалася, што ў яго ад болю, трывогі і незразумела якога гора разарвецца сэрца, што не зможа ён болей жыць са сваім балючым сэрцам!

Акуліч быў яшчэ хлапчук, і яна, вядома, не зважала на яго. Ён быў яшчэ не кавалер, ён нават чырванеў, калі яго так называлі. Яны ж — старэйшыя за яго і не саромеліся ўжо танцаваць, праводзіцца і нават цалавацца. Яна была незвычайная таму, што гарадская і не падобная на вясковых дзяўчатак. Віця таксама стаў ужо гарадскім, прыязджаў у кароценькім паліто, у вузенькіх штанах і ў вастраносых чаравіках, нават у мароз хадзіў без шапкі. Разам з ім прыязджаў Коля. Яны разам паступілі ў вучылішча, як браты, жылі то ў Віцевае маці, старое настаўніцы, то ў Колевых бацькоў. З Колевым бацькам яны хадзілі на паляванне, прыносілі ў вёску рыжых, з блакітнымі падпалінамі арэхавокіх забітых русакоў... І само гэта — стрэльбы, паляванне было вялікаю зайздрасцю ім, хлапчукам. Без Віці і Колі, здаецца, не абыходзілася ў вёсцы ніводная вечарынка ні зімою, ні летам...

Ад усяго таго ў Акуліча засталася толькі памяць. Памяць пра першую закаханасць, бо падыходзіла пара, што трэба было здзівіцца жаночай прыгажосці, трэба было, каб ад яе здрыганулася сэрца, каб засталося ў ім да самае смерці абяцанне і спадзяванне на нейкае незямное, несусветнае шчасце, на якое пашанцуе не кожнаму чалавеку...

Вобраз гэты, як і тая акварэль вясновае ночы ў памяці, астаўся сам сабою, асобна ад тае дзяўчыны, якая прыязджала гасціць у вёску, якую ён потым

сустракаў, раздабрэлую, спакойную жанчыну, дамавітую маму. Нічога не абяцалі тыя вочы, не было асаблівае прывабнасці ў стомленым і залішне круглаватым твары. Ды і сам Акуліч стаў даўно не тым. У яго ўжо не было бацькоў, зарасла для яго назаўсёды дарога ў тую вёску, адкуль усё пачыналася, і той пачатак нават часам здаваўся таксама ўспамінам пра тое, чаго і не было ў ягоным даўно гарадскім жыцці...

Цётка прыгрэлася і добрасумленна клявала носам, час ад часу спалохана прахоплівалася, глядзела спрасонку няўцямнымі вачыма і зноў драмала.

На нейкі час задрамаў і Коля на пярэднім сядзенні, звесіўшы на грудзі галаў. Віця пазіраў на яго і цяпер ужо не хаваўся: глядзеў звысака, як багаты сваяк на беднага, з адчуваннем свае перавагі і сілы.

Гэтае адчуванне годнасці і ўпэўненасці нават было ў тым, як ён кіраваў машынаю — у нейкай паказной нетаропкасці ў кожным руху, нібы запрашаў палюбавацца сабою.

Акуліч злавіў сябе на наіўным дзіцячым жаданні назваца, напомніць і гаспадару машыны, і яго быламу сябру пра сябе, сказаць, што яны сабраліся вось усе аднавяскоўцы. Цяпер тыя чатыры ці пяць гадоў розніцы ва ўзросце не мелі ніякага значэння. Але гэтая думка здалася крамольнаю тут, у машыне. Гэта было б усё роўна як зрабіць нешта непрыстойнае. Акуліч адчуваў гэта і толькі праз прыплюшчаныя павекі разглядаў Віктара.

Цяпер ужо ад Колі добра было чутно вінным перагарам. Віктар прыадчыніў ветравічок. У машыну ўварваўся востры свежы ветрык і шум колаў.

Нечакана Віктар коратка націснуў на тормаз. Колю кінула ўперад, на папругу, ён замармытаў і закруціў галавою. Віктар сядзеў за рулём, як нічога не было.

Цётка таксама прахапілася, лыпала адным вокам — другое скарэлася і не расплюшчвалася.

— Ну, а грошы за машыну маці табе аддала ці сабе забрала? — Віктар працягваў распытваць, але пытаўся ён так, нібы загадзя ведаў адказ.

— Мамаша на кніжку паклала. Пасля мяне, кажа, як пахаваеш, табе ўсе цэлыя будуць...

Віктар з разуменнем паківаў галавою.

— Памаш, гэта і правільна. Яна ўсё палічыла, і каб на памятнік пасля асталося,— Коля гаварыў сур'ёзна, нібы сам пераконваў сябе ў тым, што гаворыць.

Акуліч падумаў, што маці Колева мабыць ужо зусім старэнькая — яна старэйшая была за ягоных бацькоў. Уявіў яе адну, якая і сыну не давярае грошай на тое, каб пахавалі яе.

Віктар не мог не ведаць гэтага. Але ён пытаўся далей:

— А робіш цяпер дзе?

— Там жа, на аўта... Слясару. А ты? Чуў, за граніцу ездзіў. Адкуль прывёз? — Коля паляпаў рукою па панелі машыны.

— Адтуль, адтуль...

— На старой рабоце? — дабіваўся свайго Коля з п'янаю шчыраю добразычлівасцю.

— Не, я цяпер у снабе.

— Во! Там лахва! Што каму раскідаеш. Цяпер гэта во работка!

— А ты адкуль знаеш? — Віктар дабрадушна засмяяўся, але сказанае спадабалася яму.

— Канечне! Гэта не ў нас. Укалвай цэлы дзень, а расцэнкі пазрэзвалі. Мне за месяц гразнымі тры кускі набягала... А цяпер дзвесце з хвосцікам... Гразнымі! Парадак, парадак! Прыйшоў-пайшоў мінуту ў мінуту. А там стой паўдня! Парадак! Парадак папарадку наводзіць трэба! Прыйшоў я на работу — давай яе мне! А то парадак, за плотам угледзяць і пайшлі пісаць!..

Коля ўжо сварыўся са сваім начальствам на поўным сур'ёзе.

— Што, прышчамілі хвост чарнільшчыкам? Так яно даўно трэба было, гегемон! — упэўнена перабіў яго Віктар.

Але Коля неяк ябмяк, глядзеў на дарогу, быццам нешта не мог успомніць.

Акуліч заўважыў, што ён п'янее ў машыне, яго разбірае ад цяпла і сядзець яму цяжка.

— Слухай, а праўда, што маці твая памерла? Мне мамаша гаварыла, што чакала цябе, чакала... Сабралася і пайшла на аўтобус. Мароз, мяцеліца была... Помніш, як мы ў вас начавалі? Яна нас кажухом ночы накрывала, каб не змерзлі. Помніш? — Коля ўжо заплакаў п'янымі слязьмі, яны не давалі яму гаварыць.— Памаеш, прыеду, схаджу на могілкі... Яна мне як другая маці была, Віця... Памаеш?..

— Памаю! — коратка абарваў яго Віктар. На твары ў яго нішто не здрыганулася. Ён нахіліўся, уключыў прыёмнік. Цішыню пракалола вострая мелодыя пазыўных «Маяка». Потым дыктар чытаў паведамленні, а пасля спявалі модныя песні.

Коля спрабаваў яшчэ нешта гаварыць, але за музыкаю яго дрэнна было чуваць. Віктар ківаў яму галавою, глядзеў на дарогу, і твар яго быў халодны. Пакрысе Коля звяў, галава павісла на грудзі, і толькі тады Віктар паменшыў гук прыёмніка.

Акуліч заплюшчыў вочы. Яму падумалася, што не вядома, калі ён яшчэ пападзе ў сваю старану, што ён бы і не паехаў сюды, каб не камандзіроўка. Магілы ягоных бацькоў у горадзе, дзе яны дажывалі век у яго на кватэры, а іхняя хата, ашаляваная сіняю вагонкаю, дача на яго садовым участку за горадам, куды ўсяго дваццаць хвілін язды на электрычцы... Потым яму мроілася нейкая старая ў пустой і выстуджанай хаце, а потым і незнаёмы дзядок на завейнай дарозе, які ніяк не можа дайсці да аўтобуснага прыпынку, баіцца, што аўтобус пройдзе. Дзядок гэты — быў ён сам, Акуліч... Скрозь

сон ён разумеў, што вярзецца спрасонку недарэчнасць, урэшце ачнуўся і ўсю астатнюю дарогу глядзеў у цемру за аконнае шкло, дзе нябачна праляталі аголеныя ўжо ветрам прысады...

Цётка раскатурхалася, паправіла хустку ля самага горада, нават зазірала ў люстэрка, якое дастала з сумкі. Коля прачнуўся у самым горадзе, пасля таго, як машына пачала спыняцца перад светлафорамі на перакрыжаваннях.

— А ты кудэю паедзеш? — папытаўся ён у Віктара.

— Куды табе трэба? Цераз вакзал. Хочаш, каб к жонцы на цёплыя ногі завёз? — пажартаваў Віктар.

— На... яна мне нужна! Я рашыў — падам заяву, і няхай коціцца.— Коля рашуча і п'яна махнуў рукою.

— А можа, ты ёй не патрэбны, гегемон? Піць менш табе трэба

Коля злосна сцепануў плячыма. Горад ляжаў пустынны, халодны ад скразнякоў, якія гулялі на тратуарах, закручвалі лісцем і пылам. Віктар заехаў на прывакзальную плошчу і спыніўся.

Цётка, рассыпаючы як гарох сваё «дзякуй», сунула грошы і выпхалася з машыны, ледзь не подбегам пашыбавала да прыпынку таксі.

Акуліч глядзеў, як Коля выцягнуў з-пад пярэдняга сядзення сваю абшарпаную, амаль парожнюю сумку, пашукаў у кішэні і падаў Віктару рубель.

— Ты што?

— Як што? На бензін... Што, я не панімаю?

— Перастань!

— Ну, а як жа! Бяры.

Віктар узяў грошы, асцярожна, двума пальцамі, нібы паперка была мокрая, і сунуў у кішэню скуранное куртачкі. Куртка прыгожа сядзела на ім.

— А ты на старой кватэры? — усё не мог развітацца з ім Коля. Віктар зачыніў сам за ім дзверцы.

— На старой, на старой...

Акуліч здагадаўся, што ён абманвае.

— Перадавай прывет Таісе.

— Перадам, гегемон.

Віктар сеў у машыну, і яна адразу скранулася з месца. Коля падняў з асфальту сумку. На ім была гэтакая ж абшарпаная і расшпіленая балоневая куртка, пакамечаныя і выцягнутыя на каленях штаны, чаравікі з наўскос збітымі абцасамі. Цераз плошчу ён пакіраваў да аўтобуснага прыпынку.

Акуліч усё стаяў. Да яго толькі цяпер дайшло, што яны так і не загаварылі адзін да аднаго ўсе ўтрох, і не загавораць ужо. Успомнілася ўся дарога ў цёплай машыннай утульнасці і два пальцы, якія апускалі грошы ў кішэню. У Акуліча ўзнікла адчуванне, што перад ім і з ім адбылося нешта такое, чаго не магло быць у жыцці і мабыць, ад гэтага яму стала холадна ў плечы паміж лапатак...

Холад гэты не прайшоў і ў цёплым аўтобусе, у які ўскочыў Акуліч... Усё роўна як на нешта спадзеючыся, ён яшчэ азірнуўся — ззаду аставалася выстуджаная гарадская вакзальная плошча.

## БЯРОЗЫ НАД ЗЯМЛЁЙ

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

*Р. Барадулін*

Раніцою ў хаце было холадна, і ён доўга не хацеў вылазіць з-пад коўдры, ступаць па фарбаванай, настыласлюдзяной падлозе. І трэба было ехаць назад, у горад.

У хату ўвайшоў бацька — у зашмальцаваным, латаным белымі суровымі ніткамі кажушку, у чорных бітых валёнках, на якія былі нацягнуты чырвоныя гумы,— паставіў на пачарнелы і слізкі ад вільгаці ўслончык вёдры з вадою.

— Можа, уставай ужэ. Павел. Я заходзіў к Антосю. Ён запрагаць пайшоў. Падвязе да Грэзка.

Бацька затаптаўся на месцы, нацягнуў няўклюдна пашытыя з абрэзкаў аўчыны рукавіцы і зноў пайшоў на двор.

Павел доўга мыў твар халоднаю вадою, расціраў яго ручніком, каб выглядаў не такім адутлаватым. Есці не хацелася, і ён толькі выпіў кубак халоднага ўчарашняга ўзвару, які стаяў у чыгунку пад услонам.

Павел прайшоўся па хаце, сеў да стала, закурыў. Перадавалі апошнія паведамленні, і дынамік, які ніколі не выключаўся, глуха пахрыпваў на покуце пад іконамі.

Бацька ўвайшоў у хату, распрануўся, затупаў ля печы.

— Ты б мо з'еў чаго? Я сала распёк,— запытаўся ён.

Павел адмоўна паківаў галавою. Ён з усмешкай глядзеў, як бацька выцягнуў на прыпечак чыгун з бульбаю, спрытна перахапіў яго зверху анучаю, сцадзіў у вядро чорную ваду, высыпаў затуманеную парай бульбу ў рашку, паставіў чыгун на падлогу, падышоў да стала і сеў насупраць Паўла, паклаў на стол рукі — парэпаныя і выпацканыя ў сажу.

— Мацеру дачакаюся? — запытаўся Павел.

— Мабыць, не. Яна цяпер і сваіх і Надзіных свіней даглядае. Пакуль управіцца...— уздыхнуў бацька.— Ты грошай нам не шлі... Мы цяпер не менш за цябе зарабляем. І сябе больш глядзі. Пастарэў ты неяк... З твару асунуўся,— гаварыў ён і глядзеў на свае рукі.

Павел адчуваў, што бацьку нялёмка вось так наказ-

ваць, што ён, дабрадушны і ціхмяны, сядзеў бы і толькі ўздыхаў, каб не маці загадала «награзіць троха на хлапца».

— Ну, то мо я пайду да Антося,— устаў Павел, апрануў паліто, нацягнуў пыжыкавую шапку, узяў з-пад лавы чамадан.

Бацька выйшаў за ім на парог. Павел затрымаў яго руку ў сваёй:

— Ну, калі заеду,— напішу. Глядзеце тут адно аднаго, а калі што якое, не шкадуйце на тэлеграму.

У веснічках ён агляну́ўся: бацька яшчэ стаяў на парозе, і вецер варушыў яго рэдкія сівыя валасы.

## II

Антось падвёз Паўла да самага аўтобуснага прыпынку — нізенькае, аселае хаты, палавіну якой займала цырульня, а другую — аўтобусная каса і пакойчык чакання з нізенькімі лаўкамі паўз сцяны.

Павел занёс чамадан у пусты пакойчык чакання, паставіў пад лаўку. Да аўтобуса заставалася больш дзвюх гадзін, і трэба было недзе прабавіць час. Павел спачатку зайшоў у сельмаг, дзе за прылаўкамі неахвотна перакідаліся словамі нязграбныя, як кулі, прадаўшчыцы ў чорных халатах паверх паліто, потым у новую невялічкую кнігарню і доўга бяздумна перабіраў на паліцах кнігі, пакуль не натрапіў на знаёмае імя — Эрнест Хемінгуэй. За апошнія два гады ён прачытаў толькі адну кніжку. У ёй расказвалася пра старога чалавека, аслабелага і галоднага, пра вялікае бязлітаснае мора, якое адабрала ў старога ягоную вялікую рыбіну. Павел чамусьці верыў, што пісьменнік расказваў пра сябе, і запомніў яго імя.

Павел купіў кніжку, выйшаў з кнігарні. Больш ісці не было куды. Ён спыніўся, закурыў.

— Павел! Павел! Гэта ты? Няўжо?

Ён агляну́ўся на голас, на смяшлівую жанчыну ў чырвонай шапачцы, якая працягнула яму руку ў ружовай рукавічцы, і не мог успомніць, хто гэта.

— Няўжо не пазнаў? Эх ты! — усё смяялася жанчына.

— Таня?.. Я не сасніў? — разгубіўся ён і ў разгубленасці доўга і моцнаціснуў яе руку, цёплую нават скрозь рукавічку.

— І не пазнаў,— дакарала жанчына.

— Не дзіва. Цябе пазнаць... Ты куды едзеш? — запытаўся ён.

— Не, да мацеры прыехала. Гасцюю. А ты куды?

— Да Слуцка, а адтуль на Мінск. А пакуль будзе аўтобус, перада мною Грэзак з усімі яго славутасцямі,— пажартаваў ён.

— Пайшлі ў сталоўку, там можна пасядзець, пагаварыць.

— Пайшлі. Ты, здаецца, некалі рабіла ў гэтай сталоўцы? — запытаўся Павел.

— А, было,— коратка кінула яна, і Павел зразумеў, што больш пра работу ў сталовай не трэба ўспамінаць.

Яны змоўклі.

Паўлу ўспомнілася, як ён, яшчэ школьнік-старшакласнік, трапіў у Грэзак, дзе кожную суботу вечарам у парку былі танцы. Ён тады пазнаёміўся з нізкаю смуглявую дзяўчынаю, з рэзкімі мужчынскімі сківаіцамі і чорным пушком на верхняй губе. Ён праводзіў яе некуды на ўскраіну, у ціхую вулачку. Яны ішлі аселіцаю, праз агароды ў сад. Дзяўчына спынілася пад яблыняю, і ён доўга цалаваў яе. Яна адкідала назад галаву, адхілялася, і ён адчуваў яе пругкае цела...

Пад раніцу ён прачнуўся ў тым жа садзе, у будане, прпахлым старою запыленаю саломаю. Побач спала яна. Ружовая байкавая коўдра спаўзла набок і агаліла невялічкія, белыя на загарэлым целе грудзі, на якія падаў праз шчыліну вузкі пыльны праменьчык.

Пасля таго ён больш не ехаў у Грэзак, пакуль аднаго разу выпадкова не сустрэў яе ў суседняй вёсцы на вяселлі. Яна ўсміхалася яму, пыталася, чаму больш не прыязджае, падморгвала і трымала пад руку высокага рыжага хлопца, якога ўжо пачынала разгойдваць выпітая за дзень гарэлка...

— Пра што задумаўся? — запытала Таня. Яму здалося, што яна здагадалася, пра што ён думаў.

— А так... Думаю, што падрос парк, і старых ліп многа выразалі,— сказаў ён.

— Больш табе і думаць няма аб чым,— усміхнулася яна.

У сталовай толькі за адным столікам сядзелі мужчыны і цягнулі піва. Гаварылі яны гучна пра каленвалы і падшыпнікі, на кухні смяяліся афіцыянткі.

Павел з усмешкаю глядзеў, як буфетчыца паўбакала напампоўвала з бочкі звычайнай аўтамабільнай помпай і далівала бакал з чайніка, які стаяў на ўключанай электраплітцы.

Яны селі за столікам у кутку, пад фікусам.

— Павел, гавораць, ты пакінуў інстытут? Ты ж хацеў стаць гісторыкам. Помніш?

— Помню. Крыху не разлічыў. Думаў ад жыцця пад саламяную страху схавацца, за комін на бацькавай печы,— неахвотна адказаў ён. Падумаў, што Таня сустрэнецца дзе-небудзь з аднакласніцамі і будзе шчабятаць, чаму ён з тропу збіўся.— Скажы лепш, як ты сама жывеш. Я ж нічога не ведаю. Ты хацела стаць настаўніцаю, пасяліцца ў вёсачцы... А цяпер, чуў, ткачыха, жывеш у Баранавічах.

Яна ўсміхнулася проста і шчыра, і ён падумаў, што яна за гэтыя гады неяк папрыгажэла і памаладзела.

— Не прайшла па конкурсу. Усе раз'ехаліся, а я афіцыянткаю ў гэтым Грэзку... З адчаю кінулася на тэкстыльшчыцу. Там з Віцем пазнаёмілася. Цяпер кватэра свая... Ён у нас майстрам, і «мы на фабрику вдвоем

утром рядышком идем». У тэхнікум паступіла...

— Педагагічны?

— Ну што ты! У тэкстыльны,— па-дзіцячы наіўна здзівілася яна.

Павел успомніў, як яны з Таняю на ўроках перакідваліся запіскамі. Яна называла яго «гісторыкам», а ён яе «мамкаю». Ён тады быў нават закаханы ў яе, і яны разам рыхтавалі да маскараду касцюмы мушкецёраў.

## III

І ўжо едучы ў аўтобусе, глядзеў Павел на аснежаныя палі ў нізкай зімовай шэрані і не думаў пра сустрэчу, стараўся не думаць. І было шкада сябе. Вось Таня смяецца, шчаслівая, хоць і не стала настаўніцаю і не жыве ў вёсачцы, як марыла, а працуе ткачыхаю. А ён, выпускнік-медаліст, праз паўгода кінуў інстытут, паспрабаваў застацца ў вёсцы, зноў уцёк у горад, чацвёрты год аціраецца кампрэсаршчыкам, жыве ўсё ў тым жа абшарпаным інтэрнацкім пакоі. І ён нічога не хоча мяняць, нешта ўсё яшчэ не дае яму забыцца, як забылася Таня, нешта мучыць яго, як некалі мучыў сумны позірк маці, калі яна прыводзіла яго на экзамены ў інстытут — нібы і цяпер яна глядзіць яму ўслед.

Успомнілася. Іх, чатырох вясковых хлопцаў-абітурыентаў, на час экзаменаў пасялілі ў новым інтэрнаце, у трынаццатым пакоі. Адзін з іх паступаў на геаграфічны факультэт. Ён быў нізкі прыгожы хлопчык з сінімі вачыма і зачэсаным набок, як на малюнку ў піянера, роўным бялявым чубком. У яго было прыгожае ласкавае прозвішча — Галубок. Ён з першага дня сядзеў на паласатым матрацы, падкурчыўшы па-турэцку ногі, і чытаў.

Другога называлі Мішэлем за тое, што ён вучыў у школе французскую, а яны былі «немцамі». Мішэль насіў даволі элегантны касцюм і надзіва тупаносыя

чаравікі з перастрочанымі ўпоперак наскамі, Мішэль ужо два гады працаваў у школе — вёў фізкультуру і спевы; ён быў упэўнены, што ў яго неблагі голас, часта вечарамі спяваў сумныя аднатонныя песні.

Ні Галубок, ні Мішэль не паступілі. Павел даведаўся пра гэта пасля. Сам ён за тры дні атрымаў дзве пяцёркі і як медаліст быў залічаны без конкурсу. Пра няўдачу хлопцаў расказваў Паўлу чацвёрты жыхар іхняга пакоя Віцька Саўка. Павел ніколі не думаў, што гэты піжанаваты хлопец у вузенькіх штоніках і ў чаравіках на тоўстай, як падшыты біты валёнак, падэшве паступіць у інстытут, не думаў, што дапаможа Віцьку і бацькаў знаёмы журналіст, які разам з Віцькам хадзіў на экзамены,— з першага дня Віцька толькі і ведаў, што прападаць з «кадрамі», як ён называў дзяўчат. Праўда, Віцьку з інстытута ўсё ж выгналі, праз год.

Выклік на вучобу Павел атрымаў за тры дні да пачатку заняткаў. На дзвярах дэканата вісеў куцы спіс першакурснікаў, якім далі інтэрнат. Паўла ў спісе не было, і ён стаў у чаргу на прыём да дэкана. Стаяць давялося доўга: падфуфыраныя клапатлівыя мамы выскоквалі з дэканата са слязамі на вачах, а інтэлігентныя таты з чырвонымі ад злосці тварамі залішне гучна зачынялі за сабою дзверы. Яны забіралі чамаданы і вандзэлкі і разам з дзеткамі шыбавалі па калідоры да дзвярэй.

— А вам што? — злосна запытаўся з-за стала худы і стомлены чалавек з вялікімі сінімі кругамі пад вачыма.— Што я вас дадому ўсіх забяру, у сваёй кватэры інтэрнат зраблю? Няма месц!

Ён, відаць, стрымліваўся, калі гаварыў з паважанымі татамі і мамамі, а на Паўла крычаў. Павел разгубіўся і пачаў адыходзіць ад дзвярэй. А чалавек усё крычаў:

— Ідуць і ідуць, як непісьменныя! Якога чорта, каб хто запытаў?

Павел ужо быў за дзвярыма, а чалавек усё крычаў у кабінеце, і ніхто больш не адважваўся зайсці туды.

Павел завёз чамаданы на вакзал, у камеру захавання і да вечара хадзіў па вулачках з прыватнымі дамамі. Кватэры былі або занятыя ўжо, або наогул не здаваліся. К вечару ў яго пачала балець галава ад непрывычнага гарадскога шуму і ногі быццам сабакі рвалі. Ён забраў чамадан і паехаў да нейкай далёкай сваячкі, якая жыла ў горадзе.

Сваячка была жанчына гадоў пад сорак. Замуж яна выйшла позна, і праз год муж пакінуў яе. У яе нарадзілася дачка, якой было ўжо гадзікаў тры. Яны так і жылі ў маленькім пакойчыку з адным ложкам, шафаю і сталом у куце. Паўлу паслалі на падлозе, нагамі пад стол.

Кватэру ён так і не мог знайсці і жыў у сваячкі больш за месяц, спаў на падлозе на старым матрасе нагамі пад стол. Потым разам са сваячкаю прыйшоў лысы мужчына ў двухбортным пінжаку і маленькімі рыжымі вусікамі пад самым носам. Мужчына быў чыста паголены і пах трайным адэкалонам. З сабою ён прынёс бутэльку віна. Сваячка намякнула Паўлу, што можа б ён схадзіў у кіно...

Пасля гэтага вечара яна пачала часцей пытаць, калі Павел знойдзе кватэру. Ён усё разумеў.

Праз тыдзень Павел занёс у дэканат заяву «па асабістаму жаданню».

І калі ехаў у аўтобусе дадому, з радасцю думаў, што больш не будзе сядзець на лекцыях з хлопцамі, якіх не ведае, не будзе па гадзіне стаяць у чарзе, каб паабедаць, не будзе балець галава ад шуму, не трэба будзе шарахацца на вуліцы і аглядвацца на машыны. Вось будзе працаваць ён трактарыстам, будзе зімою прападаць на паляванні, праседжваць вечары ў клубе... І нават у галаву не прыходзіла, што яму не паверацць, быццам ён пакінуў інстытут, што маці будзе чакаваць яго, як госця, што клуб адкрываецца толькі раз у ты-

дзень, калі прывозяць кіно, што ён праз два тыдні ўцячэ назад у той самы горад, уцячэ з радасцю і палёгкаю...

За акном аўтобуса хістаецца замецены луг, над якім толькі зрэдку чарнеюцца вярхі лазовых кустоў. Павел падумаў, што хутка павінен быць паварот на Слуцкую шашу, і ўсміхнуўся з таго дзівака-студэнта, якога спалохаў горад і ад якога ён захацеў схавацца ў вёсцы. І толькі непрыемна крыху стала ад думкі, што знайшоў ён у горадзе.

Аўтобус павярнуў на шашу, і за акном прамільгнула адвечная бяроза з пасівелым, у чорных трэшчынах камлём, з абпаленаю маланкаю галавой, абломленымі ветрам магутнымі рукамі-галінкамі, з якіх цягнуліся ўверх маладыя бярозкі — нібы старая згорбленая маці трымае на руках сваіх дзяцей, якія адарваліся ад зямлі і цягнуцца ў халоднае і невядомае неба.

## КАЛІНА Ў ЖЫЦЕ

Ужо два тыдні Баравец жыў у леснічоўцы старога Язэпа. Цэлыя дні ён блукаў у асеннім спустошана светлым лесе, а доўгія асеннія вечары і ночы праседжваў над рукапісамі. Баравец прывык да парыпвання шашалю ў сценах, да настольнай газавай лямпы з адбітым і закопчаным зверху шклом, прывык да глухое асенняе цішыні і быў рады, што вырваўся з горада.

У гэты вечар работа не ладзілася, і Баравец пачаў злавацца і нервавацца. Ён скамячыў і шпурнуў пад ногі пакрэслены лісток, якім заўтра Язэп падпаліць у печы, закурыў і ўключыў транзістар, неяк безуважна слухаў, як той па-змяінаму шыпеў — награваўся. Потым аднекуль здаля, скрозь шум і патрэскванне, пачаў набліжацца чысты жаночы голас:

Стоит, пригорюнясь, калина во ржи,
Калина, где юность, где цвет твой, скажи...

І голас, з ледзь улоўным трымценнем, напоўнены такім горкім чалавечым болем, перамог пашлаватае транзістарнае шыпенне, запоўніў пакой.

Баравец адчуў, што ў грудзях стала горача і цесна,— ён успомніў, дзе і як упершыню пачуў гэтую песню.

...Яны тады крыху спазніліся з Вераю, але вечар яшчэ не пачаўся. На сцэне за апушчанай заслонай паспешліва грукалі, расстаўляючы сталы і крэслы, на праходах у зале мітусіліся піянеры,— яны, як павялося, павінны былі дарыць гасцям кветкі.

Потым выступалі і самі госці, былыя выпускнікі інстытута: дырэктары школ, інжынеры, вучоныя — усе яны расказвалі адно і тое ж: як цяжка было вучыцца пасля вайны, як яны аднаўлялі корпус і гэтую самую актавую залу,— здавалася, што ўвесь час за нешта папракаюць тых, што сядзяць перад імі...

Апладзіравалі ўсім ім роўна, і ўсім піянеры ўручалі кветкі.

Канцэрт быў звычайны, студэнцкі, наспех падрыхтаваны, і за гэту паспешлівасць павінен быў «адыгрывацца» нядаўна створаны эстрадны аркестр.

Баравец, які наогул недалюбліваў джаз за яго залішнюю крыклівасць, цярпліва слухаў завыванне саксафона і трэск ударніка,— калі б не было Веры, ён выйшаў бы пакурыць і на калідоры перачакаў бы, пакуль скончыцца канцэрт.

Песні былі толькі модныя, чымсьці падобныя адна на адну.

І калі на сцэну выбегла невысокая, кволая дзяўчынка ў белай, нібы выпускніца, сукенцы, Бараўцу стала шкада яе, чысценькай, светлай, відавочна, першакурсніцы, і балюча ад думкі, што і яна зараз пачне па-эстраднаму выгінацца, прытупваць нагою ў такт якой-небудзь зацяганай мелодыі «ай-я-яй, тебя люблю я!..».

Але дзяўчына нечакана і для настроенай на эстраду

залы, і тым больш для Бараўца неяк ціха, глыбокім і чыстым галасам, здавалася, немагчымым для яе, спявала:

Свистели, хлестали стальные пески,
Калина, скажи, где твои лепестки...

У яго сціснулася і да знямогі соладка зашчымела сэрца. І было не толькі жытнёвае поле і адзінокае хісткае дрэўца, не толькі далёкія і недасягальныя за сіняю смугою горы. Не, была маладосць, якая выпала на пару ліхалецця і якой не было калі красавацць... А потым вырасла другая моладзь, і чалавек агледзеўся, што яго вясна прыйшла, і зрабілася балюча за ранкюю сталасць, за адзіноту перад старасцю:

Нежданно-незванно ударит мороз,
И сердце калины сожмется до слез.
Мороз не остудит в том сердце тепла:
Ведь сердце вам, люди, она отдала.

І так хочацца, каб маладосць паўтарылася, каб хоць жыла кволая надзея на гэта:

Весеннею ночью и ей не до сна,
Весеннею ночью калина одна...

А голас, чуць дрыготкі ад пачуцця і болю, і саромеецца падманваць марнаю надзеяй, і суцяшае:

Спят крутые горные отроги,
Не грусти, калина, у дороги,
Не грусти, калина, у дороги,
не грусти,

і плыве недзе туды, за сінія горы — і растае...

Баравец не чуў ні апладысментаў, ні крыкаў «біс». Ён бачыў толькі спявачку, якая знямогла рванулася за заслону, і быў упэўнены, што яна плача...

Пасля ў агромністым, бітком набітым вестыбюлі былі танцы.

Баравец чамусьці не мог штурхацца ў разагрэтым

цесным натоўпе, не мог глядзець на маладых хлопчыкаў з напушчанымі на лоб і на каўнер валасамі, на тое, як яны з блазнаватымі, бліскучымі ад поту тварамі «ламалі» твіст, трэплючы расшыранымі калашынамі штаноў, якія толькі ўваходзілі ў моду, і яшчэ падпярэзваліся шырокімі папругамі — пад каўбоеў. І віною былі не толькі тыя дваццаць гадоў, на якія ён быў старэйшы за гэтых, што сабраліся на танцы, не толькі тое, што ён вымесіў нагамі не адно беларускае балота разам з сябрамі-партызанамі, што застаўся без бацькоў і сясцёр, якіх карнікі спалілі, калі даведаліся, што ён з партызанамі і што, пакуль канчаў універсітэт, а потым выдаваў першыя свае кнігі, не заўважыў, як стаў старым халасцяком,— не, недзе ў глыбіні душы Бараўца дрыжаў плакучы голас, і трапятала ў сэрцы тоненькая абарваная струна — і калолася, і крывавіла.

Усё-такі ён быў адзін, прывык па-мужчынску затоена насіць у сабе і радасць, і горыч, і спадзяванні, і ўжо каторы год, як партызан у далёкім пераходзе, жыве натомлены, асцярожны і рашучы, спадзяваецца толькі на сябе. А гады бяруць сваё, і ён стаміўся адзін, і адчуваў, як бы гэта добра было б: сям'я, дзеці, жанчына, якая разумее і шануе яго, яе ласка.

Баравец сказаў Веры, што хоча курыць, і павёў яе за сабою.

У пустой, цёмнай і халоднай аўдыторыі яна цярпліва чакала, пакуль ён дакурыць цыгарэту, хоць ведала, што ён хацеў проста пабыць з ею. Баравец таксама разумеў, што ёй з ім сумна, што ёй хочацца чым хутчэй у залу, дзе пашлавата іграюць на матыў танга «Цёмную ноч». І ён правёў Веру да сябровак, а сам зноў хадзіў па сіратліва-гулкім калідоры, пасвечваў у цемнаце палахлівым чырвоным агеньчыкам цыгарэты, безуважна думаў, што знаёмы з Вераю больш як тры гады і што яна ўжо больш чым паўгода сустракаецца з незнаёмым яму хлопцам, які прыязджае на спатканні

на «Яве«, а ён, Баравец, чамусьці маўчыць, нібы нічога не ведае.

Пазнаёміўся ён з Вераю, калі прыходзіў у інстытут браць інтэрв'ю ў першакурснікаў. Ен тады працаваў на радыё. Сярод нясмелых дзяўчынак Веру вылучала нейкая самавітасць, спакойная жаночая ўпэўненасць у сабе. І ён падышоў да яе. Якраз скончыліся заняткі, і яны пайшлі ў двор, у скверык, закіданы свежым кляновым лісцем. Ен не ведаў, як пачаць гаворку, разгубіўся: неяк не так было, як звычайна, калі браў інтэрв'ю,— афіцыйна, дзелавіта. А тут асляпляльна велічна ляжала ля ног восень, сядзела побач дзяўчына. Ен сказаў, што восень надзіва цёплая, і падумаў, што смешна гаварыць дзяўчыне пра надвор'е, але яна ахвотна загаварыла: як прыгожа ў лесе гэтаю пароюю, колькі грыбоў, расказвала пра сваю лясную вёсачку, і яму ўспаміналася даўно забытае, што было ў дзяцінстве, вёску, якое больш няма, бо і людзей, якія там жылі, няма...

І пасля, як правёў Веру дадому, думаў, што вось яна, немаладая ўжо дзяўчына, якая папрацавала і даяркаю ў калгасе, і піянерважатаю, зможа зразумець яго, і з ёю будзе спакойна і добра яму, і будзе жыць ён, як усе людзі.

Вось і жыве, як у тумане прывіднага шчасця, і яму падабаецца гэтая прывіднасць, і гэтая душэўная інертнасць. І жыць проста і лёгка, як сыходзіць з узгорка. Але ёсць жа ў жыцці нейкая вечная трывожлівасць, і чыстая і нязвыклая! І нашто марна мітусіцца вакол сваёй асобы! Можна зрабіць на зямлі столькі добрага, толькі трэба забыцца пра сябе, аддаць людзям усё шчодра і светла, як гэтая дзяўчынка сваю песню!

Заставацца на вечары Баравец больш не мог.

Ля гардэроба ён сумеўся ад нечаканасці: у гурце

студэнтак,дзяжурных па гардэробу, смяялася спявачка. Чамусьці менавіта яна, смеючыся яшчэ, падбегла да яго, узяла нумарок. І ўжо калі прынесла куртку, ён разгледзеў яе чысты прыгожы тварык, сінія наіўна-шчаслівыя вочы з ледзь прыкметнаю наміткаю суму...

Невядома чаму дзяўчына разгубілася пад яго позіркам, апусціла вочы і, забыўшыся, гладзіла яго пыжыкавую шапку, неяк пакорліва і вінавата зірнула на яго спадылба, апамятаўшыся, успыхнула чырванню, хуценька падала шапку і кінулася да сябровак...

Песня скончылася, і якісьці модны сталічны джаз аглушыў Бараўца. Ён паспешліва выключыў транзістар, здзіўлена агледзеўся і адчуў, як невыносна душна і накурана ў лесніцоўцы, і, не апранаючыся, у адным світэры выйшаў на двор, прытуліўся спіною да сцяны, закурыў.

Недзе ў вышыні, над яго зацішкам, шалёна мучыўся ў вершалінах вецер, нібы хацеў расшматкаваць гэтую глухую чарнату і непрагляднасць ночы,— і захліпаўся ад бяссілля...

Баравец успомніў, як у самотным блакіце вулічных ліхтароў асуджана роўна калыхаўся густы рахманы снегапад, як у белым мроіве няўмольна прападалі барвовыя зрэнкі стоп-сігналаў таксі, і як, ужо дома, ён варочаўся з боку на бок, невядома чаму мучыўся незразумелаю трывогаю, злаваўся на самога сябе.

Прайшло нямала год, і ён рабіў сваю работу на поўную выкладку, і ўжо заспакоіўся, бо быў упэўнены, што пражыў па-сапраўднаму чэсна і правільна.

І вось цяпер ён, Баравец, пра якога гаварылі больш чым з павагаю, якому зайздросцілі, гэты самы Баравец з такою выразнаю адчайнасцю зразумеў, што ў нечым ён памыліўся, што не заўважыў нечага такога ў жыцці і назаўсёды прайшоў міма. І Баравец не мог ніяк сабрацца з думкамі, разабрацца, і ў галаве недарэчна круціўся даўні ўспамін: стомлены мужчына давер-



4 Зак. 2732

ліва драмаў на плячы жонкі, і яна ўсміхалася, і лёгка шумеў коламі па асфальце аўтобус...

І як светлы сон быў гэты ўспамін тут, у лясной адзічэлай глушэчы, у бясконцай, як восеньскія ночы, адзіноце, ад якое пачынае надоўга балець сэрца.

## КАЛІ
## ІДУЦЬ ДАЖДЖЫ

Панавала сцішанасць і журботнасць. Нявесела і асуджана чарнеліся ў скверыках і парках мокрыя клёны.

Нічога не змянялася за гэтыя трое сутак — пакуль ішлі дажджы, роўныя і бясконцыя. І толькі цяпер, на ноч, пачынаўся вецер, шастаў недзе ў вышыні па дахах, ляпаў адарваным лістом бляхі і ганяў хвалямі дождж.

У інтэрнат ісці не хацелася: калі не паснулі хлопцы, пачнуць прабіраць і падколваць.

Арнольд уявіў, як Валодзька, нізкі, хударлявы, з зачэсанымі набок жорсткімі чорнымі валасамі, будзе злосна глядзець праз вузкія шчылінкі сваіх мангольскіх вачэй, пагардліва расцягваць ва ўсмешцы губы і гаварыць рэзка, злосна нешта падобнае:

— Вы паглядзіце: ад усіх навук вызвалены прыйшоў! Заўтра, мабыць, пакажацца на філфаку... Гнаць цябе, золатца, к чорту, а не няньчыцца! — узрываецца ён, камсорг курса.

Пасля садзіцца на ложак, кладзе на калені папку, пачынае перабіраць рукапісы.

Арнольду смешна і крыху шкада Валодзьку за тое, што ён так перажывае, смешна, што Валодзька не прызнае сярэдніх пісьменнікаў — падавай яму геніяў або няўдачнікаў, а сам піша пасрэдныя вершыкі.

Валодзьку змяняе Міша. Ен лічыць сябе вялікім

знаўцам людзей. Да ўсяго, ён яшчэ і зямляк Арнольда, а таму падколваць не будзе. Будзе па-бацькоўску ўгаворваць.

Пачне ён здалёк:

— Слухай, Арнольд, я знаю, што ты не такі, як прыкідваешся. Ты ж страшна начытаны. Няма чаго дурня валяць, зразумей: тут, як у тралейбусе — залезеш — даедзеш да дыплома. Кірыліцу і глаголіцу і розныя там латыні можна за трыццаць рублёў у месяц вучыць...

Міша сярэдняга росту, поўны, акруглы, з гладка прычэсанымі назад валасамі, чыстым высокім ілбом — хоць зараз саджай на месца дырэктара васьмігодкі.

Арнольд адчувае, што яму становіцца моташна ад гэтай разумнай банальнасці і ён можа не стрымацца і запусціць у Мішу тапачкам.

— Слухай, Міша, ты і сваёй Маньцы так па-салаўінаму выспеўваеш?

— Ідзі ты!..

Міша злосна чырванее — яго Марыйку назвалі Манькаю.

— Ты супакойся, сядзь, напішы яшчэ адно разумнае пісьмо дадому,— дабівае яго Арнольд і здзіўляецца, што Міша не адчувае, як ён ненавідзіць яго.

Міша дэманстратыўна ляпае дзвярыма.

Больш за тры месяцы Арнольд не ходзіць на заняткі. Хутка павінен быць загад рэктара аб выключэнні яго з універсітэта.

...Маці будзе хадзіць, абвязаўшы галаву мокрым ручніком, падумаць толькі, каб яе сыночка-медаліста выгналі! Што ж на вёсцы скажуць? Хоць не выходзь на людзі.

...Бацька будзе злосна чмыхаць у нос — такая ў яго звычка.

Ну і хай чмыхае!

* * *

У той вечар — праз дзень пасля выпускнога — ім заняліся па-сапраўднаму, двое клапатлівых байцоў сваім адзіным сынком. Такой падрабязнай і добротнай лекцыі ад бацькі ён ніколі не чакаў. Так безапеляцыйна і грунтоўна яму яшчэ ніхто не даказваў, што геалогія і розная там рамантыка — чысцейшая выдумка. Што няма нічога ў жыцці цяплей і выгадней за дырэктарскае крэсла, пад якім і свая хатка, і сорак сотак пляцу. А дырэктарам школы можна стаць і пасля філфака, дзе хапае знаёмых выкладчыкаў і куды можна паступіць без усялякай рызыкі: правалу не будзе. А Арнольду, сыну дырэктара, медалісту, нельга «засыпацца».

Арнольд, здаецца, тады больш разгубіўся, чым раззлаваўся, і знайшоўся толькі едкавата заўважыць, што вучням варта было б паслухаць «паважанага дырэктара» не на ўроку...

За гэту рэпліку закаранелы прыхільнік гуманных метадаў выхавання заляпіў сыну такую аплявуху, што па хаце пакаціўся пошчак. Маці з крыкам кінулася з кухні да іх.

Ён тады выбег з хаты, прайшоў у сад — не хацелася слухаць грызню бацькоў.

Крыўды за аплявуху не было. Было толькі прыкра і — якая недарэчнасць! — хацелася вярнуцца ў хату, глядзець, як сварацца «старыя», і рагатаць дзіка, з'едліва...

Аднак пасмяяліся з яго. Пасля таго вечара бацька ні разу не заікнуўся пра паступленне, а цішком аформіў дакументы і паслаў ва універсітэт на філфак.

Чаму ён паехаў здаваць экзамены? Не, не таму, што збаяўся запярэчыць бацькам. Была яшчэ не адна ноч з Вераю, і яна гладзіла яго валасы, ціхенька ціснула пальцы, шаптала з болем у голасе, што ён яе разлюбіў, што не хоча быць з ёю...

І станавілася шчымліва-балюча ад гэтае ласкі, ад папрокаў.

Цяпер усё так, як хацела Вера: яна вучыцца ў тым жа універсітэце, на філфаку. Ен сёння быў у яе...

І зноў абарвалася і зашчымела сэрца. Ен ужо не помніў, як і калі пачалі прыходзіць у галаву гэтыя недарэчныя думкі. І самае страшнае, што ён не змог пасмяяцца з іх, адагнаць. І кожны раз, калі быў у Веры або ішоў ад яе, яны ўсё больш і больш не давалі спакою, і ён пачынаў успамінаць, калі яна апошні раз цалавала яго, калі ён быў у яе далей за адзінаццаць гадзін — і не мог успомніць.

Ад гэтага было трывожна і страшна, а часамі рабілася злосна — яшчэ невядома на каго і за што.

Было адчуванне, што ён, хлапчук яшчэ, выбег на двор, на мяккі і чысты першы снег, пачаў, забыўшыся пра ўсё, ляпіць снягурачку, а потым доўга любаваўся на яе, і толькі калі вярнуўся ў хату, адчуў, як страшна змёрз, як ныюць рукі, што адзервянелі і зайшлі з пары...

* * *

У апустошаным, вышматкаваным ветрам скверыку было крыху зацішней. Арнольд успомніў, што паблізу павінна быць тэлефонная будка і там можна схавацца ад непагадзі, пакурыць.

Ен ужо працягнуў руку адчыніць дзверцы, калі заўважыў, што ў будцы двое, і што яе рукі бялеюць у яго на шыі.

Больш не было дзе прыпыніцца. Трэба было ісці па апусцелай вуліцы да самага інтэрната.

Ен глыбей нацягнуў на лоб раскіслы капялюш.

У вестыбюлі інтэрната, нібы яйкавы жаўток, тлела адзіная лямпачка, і стары вахцёр дагледжваў свае сны.

Арнольд доўга падымаўся па цёмнай гулкай лесвіцы міма закаханых парачак, што шапталіся і туліліся на лесвічных пляцоўках. І ад цемнаты, і ад шапатлівай сцішанасці была нейкая абыякавасць да ўсяго, нібы ён зусім размок на гэтым дажджы.

У пакоі не было святла.

Ён марудна здымаў і вешаў у шафу паліто, доўга развязваў мокрыя і слізкія шнуркі чаравікаў, вешаў на батарэю шкарпэткі.

Потым ужо сядзеў на падаконніку і курыў.

Ніколі яму не было яшчэ так дрэнна, як у гэты вечар, ніколі ён не адчуваў сябе такім непатрэбным і лішнім, як непатрэбным і недарэчным было там, унізе, у вузкай шчыліне завулка, адзінокае таксі, якое цяжка кідалася назад, уперад — і не магло вырвацца з ліпкае гразі на асфальт, які блішчэў за некалькі крокаў наперадзе. Машына задыхалася, застывала на месцы, і тады толькі нявесела свяціўся блакітны агеньчык у кабіне і адчайна ўспыхваў жоўтым святлом падфарнік — нямая просьба павароту.

Потым машына раптоўна адкінулася назад, ірванулася наперад — і вылецела на магістраль.

Арнольд шумна выдыхнуў паветра і з ціхаю, лагодліваю радасцю глядзеў, як шчасліва моргаў нявыключаны задні ліхтар павароту...

Заснуў ён моцна і адразу, і яму сніўся чысты, марозны ранак, і зіхоткі добры снегапад.

## НАВАСЕЛЛЕ

Вось яна і ехала. І ўсё выйшла прасцей, чым думалася, звычайна неяк. Паштурхалася ў чарзе па білет, выйшла халодным, белым ад кафелю тунелем на платформу. Тоненька пасвістаў на развітанне акуратненькі

цеплавозік і пачаў паціху выцягваць вагоны з лабірынту станцыйных стрэлак. Людзей у вагоне было нямнога, і было сцішана, як у прасторнай вясковай хаце, калі не сабралася яшчэ сям'я.

Яна сядзела ля акна, глядзела на стромкія, голыя ў тумане прыдарожныя асіны, на якіх вяла вісела апошняе вільготнае і рэдкае, як сумны ўспамін, лісце. І яна скрозь непрывычны пах вагона, здавалася, чула, як вільготна і густа пахне мокрым галлём і высахлым і цяпер адсырэлым палыном. Яна любіла гэтую пару восені, калі ўжо спустошаны палі, калі наплываюць бясконцыя, нібы роздум, туманы і зрэдку марасяць сівыя рахманыя дажджы. І цяпер здавалася смешным, што яна не хацела ехаць да брата, быццам бы вельмі далёка, быццам бы нездаровы маленькі Паўлік. Проста баялася выбрацца ў дарогу адна. І не выбіралася б, каб маці аж не заплакала ад крыўды. Данік атрымаў новую кватэру і адбіў тэлеграму, каб хоць хто з іх прыехаў на ўходзіны. У тэлеграме ён напісаў і свой адрас. Тэлеграму, хрумсткую, у чатыры складзеную паперку, яна везла з сабою. І ўсё ж баялася, што не знойдзе брата ў горадзе, і дала яму телеграму, каб стрэў.

— І вы на нараду? — перапыніў яе роздум вёрткі, нізенькі мужчына ў шэрым касцюме і прысеў насупраць. У яго была буйная лысая галава, раздзеленая напалам вузкім прамым, як росчырк, шрамам ад ілба да макаўкі. Жывыя шэрыя яго вочы чакалі адказу.

— Вы з якое раёнкі? — зноў запытаўся мужчына, не прычакаўшы адказу.

— Я не з раёнкі. Я свінарка,— адказала яна і ўсміхнулася. Мужчына разгублена паглядзеў на яе: на лацкане яе пінжака вісеў юбілейны значок «Звязды», які і звёў яго ў зман. Гэты значок ёй пакінуў Данік, калі быў дома летам.

— Прабачце.

Мужчына яшчэ раз агледзеўся на яе. Вельмі ж не

падобна яна была на свінарку, як здавалася яму, у элегантным цёмна-сірэневым касцюме, у чорных лакіраваных «шпільках», з «атамным узрывам» на галаве, падфарбаванымі пазногцямі і падведзенымі чорным вачыма.

Яна зноў глядзела за акно на сумны бярозавы пералесак за рэчкаю, што цямнелася на парыжэлым, як выцертае галянішча, лузе сярод голых, павіслых над вадою карэннем альховых кустоў. У беразняку бялеліся цынкавымі дахамі нудна стандартныя дачы, цяпер, мабыць, пустыя і непрыветныя.

Захацелася піць. Яна ўстала і пайшла ў буфет, боязна ступаючы на грымучыя і хісткія пераходы з вагона ў вагон.

Ля прылаўка стаяла чарга. Мужчыны тут жа пілі шклянкамі піва, перагаворваючыся і гледзячы за акно.

Маладая жанчына ў спартыўным трыко і блузцы з кароценькімі рукавамі і каратка падстрыжанымі валасамі, якія яна адкідала назад грацыёзным кіўком галавы ці па-мужчынску рукою, расчэсваючы пальцамі, вылучалася сярод іх. Яна была па-дамашняму прыгожая, гэтая жанчына ў тапачках, яна нібы абяцала вось гэтакі ж дамашні зацішак і ўтульнасць і смяялася, белазуба і смела, высокаму мужчыну, што стаяў перад ёю:

— Вы ж ап’янееце! Хто вам дазволіў піць віно?

Мужчына нічога не адказаў. Узяў шклянку з віном, бутэльку з півам і піў тут жа ля прылаўка.

— Яшчэ і піва! Пашкадуйце сябе,— не адставала жанчына.

Мужчына паглядзеў на яе. У яго быў бледны хударлявы твар, перарэзаны складкамі лоб і стомленыя, запалыя вочы з чырвонымі ад бяссоння павекамі. Ён быў не з тых, у каго хапае часу на дарожныя раманы. І жанчына зразумела гэта. Усё яшчэ ўсміхаючыся, узяла свой напітак і грацыёзна паплыла па калідоры.

Яна ўзяла напітак, шклянку, піла, стоячы ля акна, і думала, што, мабыць, і яе Васілю вось гэтак жа недзе ў поездзе навязвалася такая абяцаючая і адкрытая, а ён не змог адмовіцца ці хоць глянуць, як гэты мужчына, каб зразумела. І вось Паўлік без бацькі, яна без мужа. І ёй нічога не трэба, яна больш не падманецца. Пражыве і адна, выгадуе сына... А мужчын яна, слава богу, ведае. І маці праўду кажа, што мужчына, як той воўк, хоць булкамі, не то што хлебам кармі, глядзіць у лес. Лепш верыць сабе.

II

Брат не сустрэў яе. Дарэмна яна аж два разы прайшлася па пероне — ніхто не чакаў яе. Змерклася. Фіялетава свяціліся круглыя агеньчыкі на стрэлках. Трывожна неяк крычалі ў прыцемках паязды. Яна паволі па рыплівых прыступках паднялася на пераходны масцік, выйшла на плошчу, па якой шустра слізгалі таксі, час ад часу спуджана квакалі сігналамі, цяжка паварочваліся няўклюдныя, як сланы, аўтобусы з утульна асветленымі салонамі. Яна прайшла да будкі даведачнага бюро. На пытанне, як знайсці вуліцу Баўмана, жанчына ў будцы пачала нешта размашыста пісаць на лістку паперы, коратка кінуўшы:

— Дзве капейкі.

Ехала яна трамваем, новенькім, бясшумным, і думала, што вось і трамваі навучыліся рабіць па-людску — плывеш, як у люльцы. Людзей было няшмат. Малая, мабыць, дачка вагонаважатай, паўтарала ўслед за маці назвы прыпынкаў, забаўна блытаючыся, а на адным з прыпынкаў перш за маці пад дружны смех вагона аб'явіла:

— Станцыя Беразай, каму трэба, вылязай!

Выйшла з трамвая яна на ўскраіне горада, сярод новых высокіх камяніц. Дзе-нідзе жаўткамі свяціліся

над трамвайнымі пуцямі лямпачкі. У цемнаце яна доўга блытала паміж дамоў па перакапанай бульдозерамі і заваленай абломкамі дошак і абрэзкамі труб зямлі, пакуль убачыла патрэбны ёй пяты нумар дома, які быў напісаны на сілікаце нечым чорным. У пад'ездзе яна выцерла паперай выпацканыя ў зямлю туфелькі і стомлена, прытрымліваючыся за поручні, паднялася на чацвёрты паверх, пастаяла крыху, каб аддыхацца і супакоіцца, потым націснула маленькую белую кнопачку званка.

Дзверы адчыніліся адразу. Яны не былі замкнёны, відаць, яе чакалі. У дзвярах стаяў незнаёмы мужчына, апрануты ў касцюм, пры гальштуку.

— Заходзьце. Я чакаў вас,— запрасіў ён і саступіў набок, каб даць ёй прайсці.

Яна прайшла і спынілася ў чыста прыбраным пакойчыку з круглым сталом пасярэдзіне, канапай-ложкам ля сцяны, шафай з кнігамі на ўсю сцяну, тэлевізарам у куце. У другім вуглу стаяў невялічкі пісьмовы столік, над якім блакітна свяціўся таршэр.

Гаспадар быў яшчэ малады. У яго былі модныя калючыя вусікі, зачэсаныя набок і доўгія на патыліцы валасы. Ёй стала не па сабе. Ён спакойна разглядваў яе.

— Я нічога не разумею! Хто вы? — запыталася яна.

— Затое я ўсё разумею. Вы прыехалі да свайго брата. Так? Я атрымаў вашу тэлеграму, але, прабачце, сустрэць не мог: быў на рабоце. І, паміж іншым, я чалавек. Што вас яшчэ цікавіць? — адказаў ён.

— Як да вас папала тэлеграма?

— Не ведаю. Мабыць, памыліліся тэлеграфісткі, калі запісвалі тэлеграму вашага брата. Заўтра мы будзем ведаць усё. Канапу раскладаць умееце? — ён паглядзеў на яе.

— Умею,— разгублена адказала яна.— А што?

— Бялізна і падушка вось тут, у шафе, знізу. Пліту запаліце? — працягваў дапытвацца ён.— Добра.

У буфеце каўбаса, яйкі, хлеб. Прыгатуйце, пад'ешце. Можаце ўключыць тэлевізар, на падаконніку магнітафон таксама да вашых паслуг. Спіце спакойна. Дарэчы, дайце я запішу год нараджэння вашага брата. Заўтра я заеду да вас у гадзін дзесяць і скажу, дзе ён жыве,— прадаўжаў распараджацца мужчына і, улавіўшы яе недаверлівы насцярожаны позірк, дадаў: — Я згодзен, што вы сімпатычная жанчына. Калі не давяраеце французскаму, можаце замкнуцца на звычайны і пакінуць ключ у замку. Спакойнай ночы.

Ён усміхнуўся і знік за дзвярыма. Суха пстрыкнуў замок.

Яна разгублена азірнулася, прысела на крэсла да стала. Вельмі ж нечакана атрымалася ўсё. Неверагодна неяк. Мужчына, кватэра... Устала, уключыла тэлевізар. Ішоў спектакль. На экране круцілі мазурку пышнагрудыя дамы і танканогія ў панталонах кавалеры. Потым яны ўсе гуртам павалілі ў другую залу за прыбраныя сталы. Яна адчула, што хоча есці — так нічога і не ела з раніцы, пакуль дабралася на аўтобусе ў горад, узяла там білет на поезд.

У буфеце яна сапраўды знайшла яйкі, спякла два. Акрамя гэтага, знайшлася каўбаса, памідоры.

На ноч яна не замкнулася на другі замок і заснула адразу.

Прачнулася раніцай, як і прывыкла дома, у пяць гадзін, памкнулася было ўстаць, але ўспомніла, што сёння ёй нікуды не трэба, і заснула зноў. Устала а дзевятай гадзіне, памылася, знайшла шчотку, падмяла пакой. Уключыла магнітафон. На плёнцы былі запісаны трывожныя і ласкавыя песні пад гітару. Ёй спадабалася адна, якую спяваў добры, мяккі мужчынскі тэнарок.

Пад песні яна памыла посуд, нарэзала на талерку гару каўбасы, сваёй, дамашняй, сала, наладзіла вазачку мёду і злавіла сябе на думцы, што чакае гаспадара, рыхтуецца вось і што ёй прыемна такая работа,

рыхтаваць мужчыну снеданне, і ў той жа час было неяк няёмка.

Прыйшоў ён, як абяцаў, роўна ў дзесяць, пазваніў і запытаўся, стоячы на парозе:

— Можна?

Нібы прыйшоў у госці, а не дадому. Распрануўся, зайшоў у пакой.

— О, вы тут пагаспадарылі! Навошта ж было? — здзівіўся ён, калі ўбачыў прыбраны стол.

— Трэба. Вы ж не снедалі. Сядайце, сядайце. Ці вы не хочаце выпіць са мною ваш каньяк? — перапыніла яна яго і здзівілася сваёй смеласці.

Яны сядзелі супраць адзін аднаго. Ён глядзеў на яе, усё ўсміхаўся, потым запытаў:

— Дзе вы робіце?

— У калгасе. Свінарка. А вы? — пацікавілася яна.

— Токар. На аўтамабільным нашым.

Елі моўчкі. Яна нічога не пыталася пра брата, маўчаў і ён.

— Дзякую вам за снеданне. Каўбаса ў вас выдатная,— устаў ён з-за стала.

— Я ў буфеце пакінула вам яшчэ кружочак,— адказала яна і забразгала талеркамі.

— Брат ваш жыве цяпер па вуліцы Даўмана. Не Баўмана, а Даўмана. Быў такі бальшавік. Пахаваны тут у нас у парку. Нумар дома і кватэра такія ж, як мае. Памыліліся тэлеграфісткі. Сядзеце на дваццаць пяты аўтобус і выйдзеце на прыпынку Даўмана,— супакоіў ён яе.

Правёў ён яе на лесвічную пляцоўку. Яна ўсё дзякавала яму. Ён усміхаўся, няёмка і сарамліва. І ўжо ў аўтобусе яна падумала, што нават і не запыталася, як яго завуць.

Брат сустрэў яе разгублены і шчаслівы. І ўсё распытваў, як яна знайшла яго, і здзіўляўся, і ўсё ўздыхаў, што так нядобра атрымалася. А яна ўспаміналা муж-

чыну і думала, што ўсё не так дрэнна атрымалася, як гэта думаецца брату, што, можа, выйшла вельмі нават добра.

А брат глядзеў, як яна прывычна бралася за анучу, каб памыць пасля ўчарашняга заляпаную гразёю падлогу, пакуль прыйдуць пахмяляцца госці, і ўсё ўсміхаўся сам сабе.

## ВЕЧАР

У яго не было славы. Быў час, калі ён многа пісаў і часта друкаваўся. Тады толькі яшчэ ішлі ў літаратуру маладыя хлопцы. Яны пачыналі пісаць і лічылі яго мэтрам, бо ён выдаў ужо некалькі кніжак, працаваў у рэдакцыі тоўстага часопіса. Ён запрашаў пачынаючых да сябе на кватэру, у цесны і халодны пакойчык, які меў асобны ўваход; гаспадыня ж была тугаватая на слых, і іхнія спрэчкі не перашкаджалі ёй. А спрачаліся яны многа, амаль кожны раз да ранку, часам сварыліся нават. Ён любіў гэтыя спрэчкі, любіў выступаць і сам, як настаўнік і аўтарытэт, любіў паслухаць, як часам марылі хлопцы, што напішуць. А напісаць усім хацелася нешта такое...

Цяпер ён не памятае і абліччаў хлопцаў, і пра што тады спрачаліся. І яму шкада, што не запомніў іх, што глядзеў звысака на іх са сваёй «мэтраўскай» велічнасці,— хлопцы амаль усе не дажылі да ягоных год, хоць былі і маладзей за яго. Адны з іх загінулі яшчэ да вайны, другія на вайне і пасля вайны, а яго абмінулі ў партызанскіх лясах кулі, абмінулі паклёпы, за якія так жорстка расплаціліся хлопцы...

Пасля вайны ён пісаў яшчэ нейкі час. Потым у літаратуру прыйшла цэлая кагорта маладых. Яны паважалі

яго, але не лічылі «мэтрам». Яны пісалі добрыя рэчы, і ён, калі чытаў іх, бачыў, што яму далёка да гэтых хлопцаў. І было крыўдна, што вось пражыў ён цэлае жыццё і амаль цэлае жыццё пісаў, а прыйшлі нейкія малакасосы і пішуць лепш. Хацелася напісаць нешта такое, каб адразу паказаць, што значыць старая гвардыя...

Ён пакінуў работу ў часопісе, затаіўся дома, але так нічога і не напісаў «такога», а апошнія чатыры гады і зусім нічога не пісаў, толькі яшчэ ў нейкай зласлівасці на маладых сабраў і выдаў том выбранага. Кніжку ён рыхтаваў доўга, адбіраў для яе самае лепшае, самае дарагое і думаў, што дасць перцу, калі паспрабуюць правіць яму, «рэзаць» ягоныя рэчы. Думаў зласліва і ўяўляў, як будзе прабіраць гэтых маладых інтэлігентных пісьменнікаў!.. Ён нават хацеў, каб яны пачалі правіць яму, хацеў паспрачацца, даказаць... Ён не ведаў, што хацеў даказаць.

Але ніхто яму нічога не правіў. Наадварот, клапатліва прыносілі на дом карэктуру і без яго дазволу не выкінулі ніводнай коскі. Яму тады здалося, што цацкаюцца з ім, як з музейным экспанатам. Ды і ўсе гэтыя чатыры гады ён адчуваў сябе, як за шклом вітрыны. Толькі аднойчы схадзіў у школу на сустрэчу з вучнямі. Каб не сусед настаўнік, ніхто не падумаў бы запрасіць яго. Ды і вучні ведалі яго толькі па зборнічку для школ, дзе было надрукавана яго даўняе апавяданне, пра якое ён і сам ужо забыўся...

Што ні дзень, усё мацней і мацней паціскаў мароз, і дрэвы ў скверыках не пахлі ўжо мокраю вільгаццю пачарнелых галін, не было туману, і неба было чыстасінім і далёкім. І што ні дзень, ён адчуваў, як усё мацней і мацней пачынаюць балець грудзі, як нешта сціскае іх, не хапае паветра дыхаць.

Пачалося гэта ўсё з адной ночы, калі прысніўся яму

вялікі рыжы кот. Той самы кот, што жыў у яго да вайны і з якім любіў гуляць яго сын. Ціхенька гэцнуў кот з падлогі на пасцель і пайшоў, памаленьку ступаючы па нагах, узлез на грудзі, палажыў халаднаватыя лапы, выпусціў кіпці і ўсадзіў у скуру і ўсё мурлыкаў, мурлыкаў, а кіпці балюча нізалі грудзі глыбей і глыбей, вочы ў ката загарэліся, вушы прылеглі, ён дзіка мяўкнуў і ашчэрыў вялізны, з жоўтымі зубамі рот...

Ен закрычаў ад жаху і прачнуўся. Махнуў нават рукою, каб прагнаць ката. У пакоі было цёмна і глуха. І ля ложка на круглым аксамітным дыванчыку, аб які ён выціраў ногі перад тым, як класціся ў пасцель, сядзеў, скурчыўшыся, рыжы кот. Ен з ліхаманкаваю паспешнасцю запаліў настольную лямпу: побач з дыванчыкам стаялі ягоныя шлёпанцы.

— Чорт ведае што! — вылаяўся ён.

Але заснуць больш не мог. Балелі грудзі. Ен ахіліўся піжамаю, сунуў ногі ў халодныя шлёпанцы, запаліў люстру, у кішэні знайшоў пачак цыгарэт з фільтрам, закурыў.

Было чуваць, як далёка ўнізе, на вуліцы, бразгалі на стрэлках сваімі жалезнымі павадамі тралейбусы, у кухні з незакручанага да адказу крана нудна плюскалі кроплі.

Ен зацягнуўся прагна, некалькі разоў запар, але лягчэй не стала, не пераcталі балець грудзі. Ен пастаяў, прыслухаўся да сябе і раптам адчуў, што скончылася яго жыццё! І амаль нічога не засталося яму ўжо, толькі хіба ўспаміны, доўгія і невясёлыя. І пахаваюць яго, і некралог у газеце надрукуюць, і вянкі пакладуць ад установ, купленыя на мясцкомаўскія грошы. І нічога ад яго не застанецца, і будуць ісці гады, вякі, і ніхто не будзе ведаць, што вось жыў ён! У яго на вачах аж навярнуліся слёзы ад гэтага адчування сваёй мізэрнасці, нікчэмнасці — і захацелася крычаць, біць нагамі

і рукамі ад гэтай несправядлівасці, ад жаласлівасці да сябе!.. І быць вечна, назаўсёды на гэтай зямлі!

Назаўтра ноччу яму зноў сніўся рыжы кот, які ўсё лазіў на кухні, бразгаў талеркамі, тупаў па падлозе, чамусьці гулка, як вожык, і сын Алёшка ў адной кашульцы басанож пабег туды лавіць ката. І адтуль з кухні пачуўся крык і завыў воўк, хрыпла і доўга...

Ён зноў не спаў цэлую ноч. Усё ўспаміналася Алёшка, як ён прасіў яго, каб прынёс салдацкую зорачку... Успомнілася Лена, маленькая, худая, як яна ўсё зашляла шыю каўнерыкам сукенкі, нібыта ёй было холадна, і як яму тады стала сорамна, што крыўдзіў і не любіў яе. Ён павярнуўся і пайшоў, а калі азірнуўся, убачыў, як ішла яна, усё гэтак жа захіляючы шыю каўнерыкам, а Алёшка цягнуў за сабою за хвост свайго неразлучнага рыжага ката, які расстаўляў лапы і не мог учапіцца кіпцюрамі за асфальт. Алёшка, мабыць, быў упэўнены, што бацька прынясе яму праз тыдзень сапраўдную салдацкую зорачку...

І боль у грудзях, і адзінота, і ўспаміны сталі невыноснымі.

І ён, калі атрымаў запрашэнне на вечар, узрадаваўся, што пойдзе з кватэры, што не будзе адзін. Звычайна запрашэнне ён толькі чытаў і выкідаў, а цяпер яно радавала яго, аддрукаванае на добрай паперы, пахучае друкарскай фарбай.

Чырвоны з холаду, у сваім светлым двухбортным пінжаку, ён лёгка ўзышоў на другі паверх. У залу яшчэ не заходзілі. Пісьменнікі курылі ў калідоры, жартавалі, нібы і прыйшлі сюды толькі дзеля таго, каб пажартаваць, пасмяяцца, пакурыць і пагаварыць весела і бесталкова.

Ён маладцавата вітаўся за руку, спрабаваў жартаваць. Але яго жарты мабыць былі не смешныя ці не

модныя, на іх толькі скупа ўсміхаліся і, як бы дамовіўшыся, усе пыталіся пра здароўе. Яму здалося, што ад яго ў гэтым маладым здаровым гурце пахне нафталінам, як ад старамоднай футры, што вынялі пагля-дзець, ці не рассыпалася яшчэ ад молі, каб зноў пакласці назад у шафу. І яму захацелася пайсці назад, дадому. Потым нехта прапанаваў яму выступіць з успамінамі. Ён разгубіўся ад нечаканасці, пачаў адмаўляцца, што не рыхтаваўся, а сам думаў, як узыйдзе на сцэну, пачне гаварыць, і яго будуць слухаць!.. І яму ўжо было шкада, што адмовіўся.

Пасля званка ён зайшоў у залу і прымасціўся ў кутку, на самым апошнім радзе. Крэсла было высокае, ногі не даставалі да зямлі і цяжка звісалі, нібы чаравікі важылі на пяць кіло.

Ён слухаў прамоўцу, намагаўся ўспомніць таго, пра каго гаварылася, і не мог. Толькі пад канец доўгай прамовы ўрэшце ўспомніў худога і бледнага юнака з русымі раскошнымі валасамі і як яны нават аднойчы ішлі разам па вуліцы, бадай, добра выпіўшыя, бо юнак абнімаўся і ўсё гаварыў:

— Мы з табою напішам, братка! Мы, братка, такое напішам! — і цiснуў рукамі за плечы.

Ён і сапраўды многа напісаў за свой кароткі і няшчасны век.

Потым выступіў з успамінамі лысы, чырвоны і прэнткі дзядок. Ён гаварыў паволі і ўсё больш аб сабе. Ён быў некалі паэтам, гэты дзядок, і празаікам, і крытыкам, а цяпер вось піша ўспаміны. Смяюцца, што ў яго ўжо і на жывых напісаны ўспаміны, чакаюць. Дзядка амаль ніхто не слухаў. У зале перагаворваліся. А дзядок гаманіў, гаманіў, нібы яму і справы не было да гэтага нецярплівага патрэсквання крэслаў.

У заключэнне быў канцэрт. У яго зацяклі ногі. Хацелася ўстаць, пайсці. І ён амаль не глядзеў на сцэну. Запомнілася толькі, што ў беленькае маладзенькае ба-

лярыны адно вуха было чырвонае, нібы перад выхадам на сцэну яго накруцілі.

Ён так і не вытрываў, не дагледзеў да канца, ціхенька выбраўся з залы, апрануўся, выйшаў у вестыбюль, закурыў. Цяпер ён ужо радаваўся, што не згадзіўся выступаць з успамінамі. Стала аж горача ад думкі, што і ён, як дзядок, плёў бы свае ўспаміны, а ў зале пазяхалі б або пасмейваліся і чакалі, калі ён, нарэшце, кончыць.

Калі зашумелі, загаманілі на лесвіцы, ён хуценька выйшаў на двор. Нечаму не хацелася, каб бачылі яго. Ён прысланіўся плячамі да сцяны і курыў, непрыкметны ў сваім доўгім чорным паліто з шэрым каракулевым каўняром, слухаў, як разыходзіліся па дамах маладыя, здаровыя людзі, якім нават і ў галаву не прыходзяць думкі аб смерці і якім ніякай справы няма да таго, што ён адзін, што яму цяжка, што ў яго баляць грудзі і што яму ўжо цяжка дыхаць.

Ужо прайшлі першыя снегапады, нясмелыя і пяшчотныя. А боль у грудзях усё мучыў, усё не даваў спакою. І з кожным днём станавіўся мацней.

Была нядзеля. Зранку ішоў снегапад. Буйна і густа. І ад гэтага стаяла нейкая прыцемкавая сцішанасць, нібы і дрэвы, і дамы слухалі, як ідзе снег.

Ён напіўся чаю, прайшоўся ўздоўж кніжнай шафы, пацiраючы далонню грудзі. Праз шкло глядзяць на яго пераплёты кніг, якія ён купляў пакрысе ўсё жыццё. На ніжняй паліцы, у куце, ляжалі клапатліва перавязаныя цюкі. Гэта былі ягоныя рукапісы, чарнавікі, пісьмы яму і чарнавікі ягоных пісьмаў. Падумалася, што вось памрэ ён, а нехта будзе перабіраць гэтыя паперы, будзе друкаваць у часопісах яго апавяданні ці незакончаныя аповесці ў раздзеле спадчыны. А можа, і яго пісьмы. Стала неяк не па сабе, што нехта будзе перачытваць яго пісьмы, перакопваць усё яго жыццё...

Ён пачаў выкідваць на падлогу цюк за цюкам, разразаў шпагат і, седзячы на падлозе ў піжаме, пачаў перабіраць паперы, адкідаць у кут чарнавікі, пісьмы...

Было па абедзе, калі ён скончыў сваю работу. Пасля «рэвізіі» ён сабраў і перавязаў шпагатам толькі невялічкі пакунак. У ім былі партызанскія дзённікі і пісьмы ад сяброў. Потым ён доўга корпаўся ў шафе, пакуль не знайшоў стары чахол на коўдру, сапхаў у яго паперы.

Пасля абеду ён занёс іх у падвал, у качагарку.

І калі ішоў назад, на лесвічнай пляцоўцы, перад самымі дзвярыма, грудзі працяў востры боль. Ён ледзь не крыкнуў ад нечаканасці, але стрымаўся і толькі застагнаў скрозь зубы, адчыніў дзверы і не распранаючыся прайшоў у пакой і знясілена адкінуўся на крэсла.

Сядзеў доўга і нерухома. З чаравікаў на падлогу сцякала чорная вада, а на рукавах паліто на валасінках блішчэлі кроплі ад расталых сняжынак. Ён глядзеў на пустую паліцу, дзе нядаўна яшчэ ляжалі яго паперы, слухаў свой боль і думаў, што ўсё скончана. Думаў неяк спакойна, нібы пагаджаўся з тым, што нікому не будзе ніякай справы да ягонай смерці, што і без яго будзе ісці снег, будуць стыць сінія марозы, будуць дыхаць белым парам у палях разагрэтыя коні з абінелымі ласкавымі пысамі, а потым на сонцы будуць выгінаста блішчэць сляды ад палазоў!.. Ён не памятаў, дзе і калі бачыў гэтыя заінелыя конскія пысы і бліскучы след палазоў. Ці гэта запомнілася яшчэ з дзяцінства, ці гэта ўспамін партызанскіх дзён. Яму здавалася, што ў пакоі запахла марозам, канём, настылаю на холадзе адзежаю. І ён, чалавек, які лічыў, што досыць пажыў, досыць пабачыў, якому ўжо можна і паміраць, усёю сваёю істотаю адчуў, як не хочацца пакідаць гэтую зямлю, над якою ідзе снег, кружацца вішнёвыя пялёсткі, ідуць «сляпыя», як шчасце, дажджы і потым за ўсю сваю зялёную радасць разлічваюцца восеннюю золатам лясы!

Яму думалася, што вось, калі паедзе ў вёску, будзе

выходзіць кожны дзень у лес, дыхаць чыстым паветрам, боль у грудзях пройдзе, ён будзе жыць яшчэ доўга-доўга.

І ён суцяшаўся гэтым, забыўшы, што яго вёскі ўжо няма на свеце і ехаць яму няма куды.

## АНТРАКТ

Яны сустрэліся нечакана праз многа-многа год у тэатры. У час антракту сядзелі насупраць адно аднаго за маленькім чырвоным столікам у буфеце. На століку паміж імі стаяла груваcтая сіняя шкляная ваза, карнаваная белымі зубчыкамі папяровых сурвэтак. Яны моўчкі, сілком жавалі бутэрброды з чэрствай каўбасой. Гаворка не выходзіла.

Яму ўспомнілася, як яны ў студэнцкія гады разам прыходзілі ў гэты тэатр і як ён, адразу ж пасля званка на антракт, бег у буфет, браў сітро і два бутэрброды з каўбасою, і яны прагна і весела з'ядалі іх і смяяліся адно аднаму вачыма. Вазу звычайна адсоўвалі ўбок.

Маўчанне зацягвалася, трэба было нешта гаварыць, пра нешта распытваць.

— Валасы ў цябе парадзелі, пасівелі. Ты ўсё пішаш? — загаварыла першаю яна.

— Старэем, што зробіш. Сям'я, дзеці і несямейныя клопаты, таму і валасы вылазяць,— паспрабаваў пажартаваць ён і адчуў, што жарт не атрымаўся. Ён крадком паглядзеў на яе.

За час, што не бачыліся, яна амаль не змянілася, толькі неяк падабрэла, паспакайнела з выгляду ды пад вачыма і ля куточкаў губ, якія яна фарбавала цяпер густа і ярка, легла тоненькая сетачка маршчынак...

Празвінеў званок. І яна з нейкай радасцю хуценька ўстала.

— Вазьмі, калі хочаш, адрас. Можа, зойдзеш калі?

— Нявaрта, і муж яшчэ што-небудзь нядобрае падумае,— замяўся ён.

Яна пакорліва схіліла галаву.

— А ты не змяніўся...

Яна павярнулася і пайшла — разгубленая, задумлівая, нават забылася развітацца.

Некалі даўно ў яго, як і ў кожнага чалавека, была свая казка і свой маленькі казачны свет, які потым называюць дзяцінствам. І ў гэтым свеце была яго вёска, за ляском, на ўзгорку,— суседняя і за пяць кіламетраў школа, у якую хадзіў вялікагаловы блакітнавокі хлопчык, пад камандаю якога былі ўсе вясковыя хлапчукі і які быў гаспадаром усіх буданоў, пабудаваных у густым хвайняку, і камандзірам усіх гульняў «у вайну», а пасля выпадкова прачытанае кніжкі пра Дэрсу Узала — нязменным начальнікам таежных экспедыцый. Хіба ж мог такі чалавек прызнаваць дзяўчынак за людзей, вадзіцца з імі, і хіба можна было горш абразіць яго, чым пасадзіць з дзяўчынкаю за адну парту, што зрабілі ў пятым класе? І да ўсяго дзяўчынка, гэтае белавалосае чарцянё, любіла падурэць і паскубнуць яго. Ён аднойчы ўдарыў яе за гэта, і іх доўга мірыла класная — дабрадушная, тоўстая жанчына.

...Убіралася ў сілу восень. Стаялі густыя непраглядныя туманы, за якімі не было відаць, калі ўзыходзіць сонца, калі заходзіць,— толькі журботная восеньская вільготная шэрань і ў лесе шамаценне ападаючага лісця, і прадчуванне сонечных, аслепленых дагараннем асенняга лісця дзён.

Яны, дзевяцікласнікі, ехалі тады на экскурсію ў далёкі Ленінград. Ехалі на грузавых, крытых брызентам машынах.

Раніцаю ў хісткім сівым паўзмроку машына ўехала

ў Падліпаўку. Яе ўжо чакалі, і калі Марыся — у паліто, у завязанай пад бараду хусцінцы — улезла ў кузаў і азіралася, дзе сесці, ён пасунуўся і прытуліў далонь да лаўкі, паказваючы на вольнае месца. Яна прайшла да яго і села побач...

А пасля былі каляіністыя прасёлкі да школы, апошнія наказы дырэктара і шаша, доўгая шаша аж да самага Ленінграда цераз усю Прыбалтыку.

Ён не мог заснуць ноччу ў цёмным кузаве — хлопцы знарок пабілі лямпачку, каб можна было цалавацца з дзяўчатамі,— слухаў, як напружана звоняць колы на асфальце, слухаў сваю адзіноту, прыемную важкасць яе галавы на сваім плячы, пасмачку валасоў, што казытала яму вусны і шчаку, і горш за ўсё баяўся, што засне, не ўтрымае яе галаву, і яна прачнецца, і не мог зразумець, чаму баіцца.

Ён адзін не спаў на світанні, адзін бачыў, як туманная завіcь на ўсходзе засвяцілася лёгенькім фіялетавым водсветам, які падаў на вільготны пасля ночы асфальт, і той таксама свяціўся казачным незвычайным святлом.

Ён не спаў ні адной ночы за ўсю дарогу і не хацеў спаць, і толькі адчуваў, як запалі і сталі сухімі і гарачымі яго вочы, і яна сілком прымушала яго класці галаву ёй на плячо і драмаць...

У Ленінград яны прыехалі вечарам. Свяціўся агнямі ілюмінацый Неўскі — якраз надыходзіла свята Кастрычніка, і ён упершыню адважыўся пацалаваць Марысю. Яна пакорліва адхіліла галаву і заплюшчыла вочы... І ў той жа час нехта ўпусціў за борт пустую бутэльку, і яна глуха трэснула аб асфальт, дробна зазвінела асколачкамі. Ён здрыгануўся ад нечаканасці, і Марыся толькі ўсміхнулася яго спалаху і ласкава пагладзіла рукою па шчацэ.

Жылі яны ў невялічкай гасцініцы на Кіраўскім базары, і дабрадушная жанчына-адміністратар дазваляла

ім вечарамі глядзець у Чырвоным кутку тэлевізар і рабіць танцы. Яна любіла сама прыйсці, стаць ў дзвярах, склаўшы рукі на грудзях, глядзець на баяніста і ўслых пагаварыць, што аніяк не можа ўладкаваць сына ў музычную школу.

Ён танцаваў цэлыя вечары з Марысяю. І яму чамусьці тады вельмі прыгожаю здавалася прымітыўная песенька пра тое, як капітан сустрэў дзяўчыну, пра тое, што закаханым ніколі не быць разам, таму што дзяўчына — «гэта місіс з багатай сям'і і англійскага лорда нявеста».

Здаралася, яны з Марысяю ўцякалі з танцаў, замыкаліся ў яе пакоі, елі ў цемнаце вінаград і бясконца цалаваліся... А за акном незвычайна і хораша свяціліся ліхтары.

І ўжо шмат гадоў пасля, калі яму ў рукі трапіла старая фатаграфія — ён і трое сябрукоў на фоне помніка Пятру І,— ён быў незвычайна і прыемна ўражаны: на яго глядзеў высокі і прыгожы ў сваёй юнацкай хударлявасці хлопец. І Ленінград успамінаўся яму лёгенькім пацыскам яе тоненькіх пальцаў, ціхай, шчаслівай і крышку трывожнай радасцю, што поўніла яго сваёю вільготнай самотнасцю. Ён так і застаўся для яго, і палюбіўся горадам ціхай і вялікай радасці.

Другі горад, горад іхняга студэнцтва, таксама радаваў, пакуль не надакучылі і тэатры, і кіно. Ён ужо ведаў, што ў нядзелю пойдзе да яе на кватэру, потым яны пойдуць у сталовую, потым у кіно, вечарам, магчыма, сходзяць у кафэ або на танцы, і ён правядзе яе да аўтобуснага прыпынку, і яны разыдуцца прывычна раўнадушныя. А ён адзін будзе ісці па горадзе і ненавідзець сваю жаўтасценную шпакоўню — пакой у інтэрнаце. Ён заўважаў, што і Марысі сумна і што спатканні ператвараюцца ў абавязак.

Ён уладкаваўся працаваць у рэдакцыю, перавёўся

на завочнае аддзяленне, наняў утульны прыватны пакойчык і пра гэта пакуль нічога не гаварыў Марысі.

...У пакойчыку, дзе кватаравала Марыся з сяброўкаю, былі яшчэ дзве дзяўчыны з іхняга курса; адна з іх сядзела на табурэтцы, і ёй у чатыры рукі ўзбівалі прычоску. Да яго ўжо прывыклі і не звярнулі ўвагі.

Марыся была ў чорнай бліскучай сукенцы з глыбокім дэкальтэ, з аголенымі па плечы рукамі, падфарбаванымі вачыма, накручанай і зацягнутай у сетачку касою...

Яна разгублена заўсміхалася яму, неяк паспешліва пасадзіла на ложак, прысела сама, і калі ён сказаў, што жыве на кватэры, што яны пойдуць да яго і яна больш не вернецца ў гэты заціснуты новымі кварталамі завулак, у гэты паўцёмны пакойчык, яна яшчэ больш разгубілася, неяк са шкадаваннем аглянулася на дзяўчат, пачала гаварыць, што ёй няёмка будзе перад імі не пайсці на вечар, ён з жахам адчуў, што яна не зразумела або проста не захацела зразумець, што ён зваў яе назаўсёды, што ён хацеў зрабіць гэты вечар вечарам шчасця.

У галаве плыў нейкі звон, нібы недзе далёка-далёка, за вякамі, званілі ў званы...

Ён правёў дзяўчат да аўтобуснага прыпынку. Марыся трымала яго пад руку, гаварыла, што адчувае сябе вінаватаю за тое, што ідзе на вечар без яго, і яму хацелася сказаць, што добра, што ёсць хоць гэтае адчуванне, і ён баяўся, што атрымаецца балюча, здзекліва і бездапаможна.

І калі яны гуртам дружна рвануліся да аўтобуса, ён разгублена прыпыніўся, потым успомніў, што і яму можна пад'ехаць гэтым аўтобусам колькі прыпынкаў, кінуўся бегчы, спыніўся, махнуў рукою.

Было пуста на вуліцы, паціскаў восеньскі марозік, пачынаў дзьмуць пранізлівы вецер, прапахлы ледзяністым халадком снегу. Суха бялеліся тратуары, і вецер

парывіста заграбаў з іх пясчаны пыл, закручваў яго, нібы лютаўская завея дробны сняжок, сек у твар.

Уперадзе пасярод вуліцы ішла адзінокая парачка — ён у капелюшы і модных расклёшаных штанах і яна, стройна перацягнутая пояском, з высокай прычоскай, закручанай у шарф. Рука яго ляжала ў яе на плячы, і ён час ад часу туліў яе да сябе і цалаваў. Яе рука толькі лёгенька гладзіла яго па плячах, і ў святле ліхтароў на пальцы ў яе пабліскваў пярсцёнак.

Успомнілася, як ён чакаў Марысю, каб ехаць разам дадому — у яе сесія канчалася на тры дні пазней. Яны ішлі ў кіно. Ціха і туманліва высцілаўся густы снегапад, і ён жартам сказаў, што яны пойдуць начаваць да яго. Хлопцы ўжо раз'ехаліся на канікулы, і ён заставаўся адзін у пакоі. Яна тады толькі ціхенька прашаптала:

— Не трэба, дурнецькі.

І гэтае «не трэба» прагучала ласкава і сарамліва, як згода. Ён не падаў выгляду, што зразумеў яе.

Парачка завярнула ў пад'езд, і ён застаўся адзін на вуліцы. Стала яшчэ больш адзінока і няўтульна на гэтым калючым ветры, ад якога нікуды нельга было схавацца, і ўсё ж не хацелася ісці на кватэру, дзе стаяў прыбраны стол на дваіх. Нейкім болем разанула думка, што гэты вечар, вечар шчасця, прайшоў раней, зімою, закалыханы снегападам. А ён не набраўся смеласці, не здагадаўся па-мужчынску ўзяць сваё шчасце.

Ён ведаў, што яшчэ прыйдзе да Марысі, што яны будуць хадзіць яшчэ ў кіно і што ўсё ўжо скончана: яна не вернецца да яго...

Праз месяц ён паехаў на Палессе загадчыкам сельгасаддзела ў раёнку.

...У пальцы прыпякло, і ён схамянуўся, што ў буфеце нельга курыць, вінавата агледзеўся: буфетчыца стаяла, абапёршыся на прылавак і падпёршы руку, спачуваль-

на глядзела на яго. Яму стала няёмка, быццам гэтая спагадлівая буфетчыца падгледзела ўсё тое маладое, што ўспомнілася яму, старому. Спектакль працягваўся, ішла другая дзея. Ён расціснуў недакурак аб абцас, разгублена сунуў яго ў кішэню і пайшоў да выхада па мяккім дыване, які глушыў крокі і пад якім, нібы яму было балюча, коратка і суха патрэскваў паркет.

## СЛЯПАЯ СІЛА

Ішоў Дабаш да Антона пяшком, цераз новы мікраraён. Ля дамоў нязвыкла стаялі аблатошаныя дзятвою яшчэ з вясны старыя яблыні, што засталіся ад былое вёскі, і на яблынях зрэдку пажаўцела лісце.

Цёпла, нават горача свяціла сонца, і неба было высокае, з белымі кучаравымі воблакамі, зрэдку свежа праходзіўся вецер, і тады на рабінах тоненька трапятала вузенькае лісце і злёгку пагойдваліся светла-чырвоныя гронкі — гэта ўжо ад невясёлай і яркай прыгажосці недалёкіх перадасенніх дзён.

У двары Антонавага дома, ля пад'езда, стаяў аўтобус. Пад бляшаным грыбком на нізенькіх лавачках, зробленых дзецям, сядзелі жанкі. Дабаш не прыглядаўся да іх. Яны здаваліся нечым падобныя адна на адну: засмучана маўклівыя, пакорлівыя пагляды, прыцішаная гаворка, быццам маглі падслухаць, а гэтага не хацелася...

Дабаш пастаяў, закурыў.

Антона яшчэ не прывезлі.

...Сярэдняга росту, шчупленькі, з круглым, чыстым, як у дзяўчынкі, тварам і блакітнымі вачыма, Антон любіў насіць спартыўныя куртачкі, чаравікі на тоўстай падэшве, берэцік, а пад восень замест кашнэ — касы-

начку на шыі. Яму падабалася, калі гаварылі, што ён — як парыжанін... Пасля войска сышліся яны з Дабашам на адной кватэры ў старым прыватным струхлелым доміку на Лодачнай вуліцы, якую пачалі зносіць; абодва шафёры, толькі што звольненыя з войска, як жартаваў Антон, наганялі ўпушчанае за два гады службы... Потым, калі пачаліся позні я халады і ў затопленай у рацэ лодцы браўся раніцой тоненькі лядок, шарэў прымаразак на заржавелым ланцугу і замку, які невядома колькі гадоў не адмыкаўся, тады пустэльная была іх вуліца, абмялелая каламутная рака, тады Дабаш каяўся, што не паехаў, як і збіраўся, на Поўнач — зарабіць грошай, каб потым не туляцца па чужых кутках, пабудаваць сабе кватэру і пражыць маладосць, як і належыць — весела, забяспечана... Ен марыў паехаць да радні багата і шыкоўна, каб нікому і не ўспаміналася, што ён сын анучніка, які п'яны памёр на возе. Нават у войску і на рабоце адчуваў сябе няёмка, быццам усе ведаюць пра гэта, пасмейваюцца за вочы.

Антон таксама засумаваў, згаджаўся паехаць з Дабашам на Поўнач, хоць абодва ведалі, што да лета няма чаго і думаць пра гэта...

А зімою Антон нечакана ажаніўся, нават распісваўся не ў горадзе, каб не чакаць чаргі, а ў вёсцы, пераехаў жыць да жонкі, а потым жончыны сваякі ўладкавалі яго на работу — міжгароднія перавозкі.

Дабаш застаўся адзін зімаваць, паўтараў матэматыку, паступіў на завочнае ў політэхнічны, перайшоў жыць у інтэрнат.

З Антонам зноў сышліся пасля, калі Дабаш кончыў вучобу, ажаніўся, атрымаў кватэру. Аказалася, што жонкі іх некалі вучыліся ў адным класе. Зачасцілі сем'ямі адны да адных у госці на выхадныя — з танцамі пад магнітафон, летам з шумнымі выездамі на пляж — усе чацвёра маладыя, здаровыя, задаволеныя.

Антон ужо тады папаўнеў, жонка забараніла яму

насіць куртачкі і берэцікі, грошай выстачала і на добры гарнітур, як у людзей, хоць у ім Антон здаваўся яшчэ меншы і непаваротны, нібы плюшавы мядзведзік...

Потым пайшлі дзеці, сустракацца пачалі радзей. Антон яшчэ больш раздабрэў, раздаўся і піў многа больш, чым раней. Ірына скардзілася, што зусім адбіўся ад рук, што даўно мае грошы, каб купіць кацер, і не збярэцца, што і яму трэба вучыцца, як Дабашу, каб не круціць цэлы век баранку. Тады чарнабровы далікатны твар Ірыны рабіўся завостраны, вочы глядзелі на Антона прыжмурана, і яна ненавідзела яго, таўставатага, падпітага. Ён не аскірзаўся, усміхаўся, толькі вочы глядзелі безуважна, пуста, і да куточкаў губ збягаліся горкія складачкі. Але «ўкалваць» Антон прадаўжаў гэтак жа зацята, як і раней, з рэйса ў рэйс, і ўдзень і ўночы. І не ўбярогся, заснуў за рулём.

Дабаш адзінока таптаўся на двары. Людзей было мала, нікога са знаёмых. І ён каяўся ўжо, што прыйшоў, бо можна было і не ісці, і ніхто нічога не сказаў бы, нікому няма да яго ніякае справы, а галоўнае, не было б гэтае непатрэбнае турботы, неспакою на душы. Смерць чалавек тады адчувае, калі яна пройдзецца зусім побач, забярэ каго-небудзь знаёмага, з кім нядаўна вітаўся за руку, гаварыў. Ад ледзянога холаду сціснецца сэрца і падумаецца, што на яго месцы мог бы ляжаць ты сам, а ён прыйшоў бы адведаць!..

Распараджаўся жалобаю кульгавы рушны мужчына з посным шэрым тварам і зачэсанымі з патыліцы на лысіну валасамі — бывалы мясцкомаўскі старшыня, які ўмее наладжваць усё.

Труна стаяла на засланых чырвоных сталах, абстаўлена навокал вянкамі з чорнымі стужкамі і белымі, халоднымі літарамі, кветкі здаваліся яркімі і непатрэбнымі, моцна пахла свежаю, толькі сарванаю мятаю...

Абапёршыся на край труны, стаяла Іра, і за людзьмі Дабаш бачыў толькі да жаўцізны схудалы яе твар, чорны плюшавы шалік на галаве. Яна не магла ўжо ні крычаць, ні плакаць, толькі цяжка дыхала, і тоненькая фельдшарыца ў белым нячутна падыходзіла збоку, працірала руку вышэй локця, калола.

Антон ляжаў у чорным касцюме, моцныя пальцы сашчэплены на грудзях — цяпер сухія, касцістыя, жоўтыя, і твар выцягнуўся, абазначыліся сківіцы, завастрыўся падбародак, тонка падціснуты вусны і тыя, знаёмыя, складачкі да куточкаў губ. Было нешта балючае і злоснае ў гэтым некалі дабрадушным твары, мабыць, яму моцна балела перад смерцю, і пра гэта ніхто не ведаў.

І пакой пусты, як на смерць прыгатаваны — старую мэблю толькі прадалі, не паспелі завезці новую.

Дабаш скора абышоў вакол труны, у дзвярах пачуў, як зноў тонка і слаба закрычала Ірына, скора пайшоў уніз, на двор.

Яго перагнаў мясцкомаўскі старшыня, пастаяў ля пад'езда, паглядзеў угору, нават зморшчыў востранькі носік, нібы хацеў нюхам распазнаць, ці пойдзе больш дождж, бо неба неўпрыкмет высока зашарэла, і дождж церусіўся дробненька і лагодна.

Дабаш прысеў на лавачку.

Шафёр аўтобуса падняў капот, шырока расставіў на буферы ногі і калупаўся ў маторы.

Дабаш устаў, азірнуўся, з палёгкаю падумаў, што ніхто не бачыць і не ведае пра тое, што ён быў знаёмы Антону, нават блізкі. Пайшоў прэч спачатку нетаропка, потым хутчэй, з палёгкай уздыхнуў.

Неўпрыкмет жыццё ўвайшло ў прывычны лад, зноў па даўняй завядзёнцы Дабаш перад канцом работы абыходзіў гаспадарку, як гаварылі рабочыя — «сам» абход робіць. Высокі, у меру поўны, у вузкаватых, але добра

падагнатых штанах, у белай рубашцы з закасанымі рукавамі, з гальштукам, слаба зацягнутым на вузел — верхні гузік заўсёды расшпілены, ён быў такі, як і раней. У меру карэктны, у меру гаспадарлівы, наогул добры інжынер, якога паважала за работу начальства, якога недалюблівалі, але пабойваліся, часам і паважалі рабочыя і да якога прывыклі за многа год. Толькі незаўважны для старонніх клопат пасяліўся ў яго ў душы: нібы сам ён забыўся пра нешта такое простае, ніяк не можа ўспомніць. Калі заставаўся адзін, часам здавалася, што нехта зрабіў з яго двух чалавек, ажывіў яго цень, і гэты другі невядома чаго пасміхваецца з першага, з яго ўваротнасці рабіць работу і не надта думаць пра яе, з яго адмысловае кватэры, дачы, з яго такога грунтоўнага, упэўненага жыцця.

А таму мулка рабілася часам, калі лавіў сябе на думцы, што ўсё тое, чаго хацеў ён некалі на Лодачнай і на што патрачана маладосць, не зусім тое, быццам у спякотны дзень улез у стаячую ваду, якая зарастае раскаю, заплывае тванню.

У Дабаша хапала цвярозага разумення, каб абарваць такія думкі — гэта проста нервы, трэба толькі заняцца чым-небудзь, разварушыцца, а то зусім адбіўся ад рук, на мыйку машын так і не зайшоў, хоць абяцаў навесці там парадак.

Мыйшчыца сустрэла Дабаша на падыходзе, усміхнулася вінавата і насцярожана, усё азіралася па баках.

— Добры дзень! — прывітаўся Дабаш, усміхнуўся.— Ну, як тут у вас?

— Усё чысценька, Міхаіл Іванавіч, прыбрана.

Жанчына ішла збоку і чуць наперадзе, быццам хацела зазірнуць Дабашу ў вочы. І ён успомніў, як яшчэ вясною заходзіў на мыйку і яна, стройная, даўганогая, у меру прыкараткай і вузкаватай спадніцы, у бліскучых гумавых боціках, з сінімі «ценямі» пад вачыма, як у

дзяўчынкі, усміхалася яму прыветна і какетліва, дастала з сеткі вялікі апельсін, працягнула, і ён засмяяўся ўголас:

— Пакінь, Клава, другому. З мяне жонкі хапае!

Бачыў, як сцялася яна, зялёныя вочы бездапаможна і спалохана паглядзелі навокал — ці не чуў хто? — і рука ніяк не магла патрапіць, каб пакласці назад у сетку апельсін.

Яна не заплакала, толькі прашаптала: «Нашто вы? Бога ў вас няма, Міхаіл Іванавіч!..»

Дабаш недзе пасля ў мужчынскім гурце расказваў пра гэта, смяяліся.

— Вы, Клава, самі не надта... Напішыце мне дакладную, калі хто смецце выкіне на мыйцы. Я яго на дзень здыму з рэйса і прымушу тут прыбіраць. Шафяроў я папярэджу.

Жанчына згодна ківала галавою, і Дабаш ведаў, што ніякай дакладной ні на кога яна не напіша, а чыста на мыйцы будзе.

Настрой зноў сапсаваўся, Дабаш вярнуўся ў кабінет, патаптаўся вакол стала і сабраўся ісці дадому.

Дзверы былі адамкнёны, Дабаш увайшоў у прыхожы пакой і спыніўся: ён пазнаў, што з жонкаю гаворыць Антонава Ірына. І першым жаданнем было — ціхенька выйсці назад, прэч! Ён стрымаўся, зазірнуў у прачыненыя дзверы пакоя: жанкі сядзелі на канапе. Яго Зоя ў стракатай, з вялікімі пышнымі малюнкамі сукенцы і ў жабо здавалася яшчэ таўсцейшай. Ірына была яшчэ бледная з твару, схуднелая, пад лёгенькаю сукенкай азначаўся жывот. Яна роўна, як вывучанае, расказвала:

— Антон нас на вакзал праводзіў, пацалаваў малога. А Андрэйка на мяне: «А ты, мама, пацалуй папу». Ну, кажу, людзі бачаць. І так не памятаю, калі мы з ім цалаваліся, а то яшчэ на людзях... Заўтра павяду малога ў садзік.

— А з гэтым як? — Зоя кіўнула ў бок сяброўкі, і Дабаш спачатку не зразумеў, пра што яна пытаецца.

— Была ў галоўнага акушэра. Даў дазвол. Заўтра мэблю прывязуць, і пайду ў бальніцу. Нашто другое малое цяпер. Мы ж думалі, што кватэру нам большую дадуць...

Потым Ірына гаварыла, што трэба грошы на мэблю, што катэр, які Антон успеў купіць перад смерцю, цяпер ёй не патрэбны, што яна прадала б яго ім, Дабашам, нават і дзешавей. А шукаць пастаронняга пакупніка не хоча. Гаварыла Ірына хутка, быццам нешта жавала. Цяпер толькі да Дабаша дайшло, пра каго трэцяга гаварылі спачатку жанчыны. Але галоўнае было — мэбля, катэр. Важней за ўсё на свеце — і за яго, і за Антона...

Ён інстынктыўна адступіўся назад, да дзвярэй, і толькі на лесвічнай пляцоўцы з палёгкаю падумаў пра тое, што не трэба таргавацъ катэр, і навошта ён яму? Сыходзячы па прыступках, ён раптам успомніў, як расказвалі пра смерць Антона, і, здалося, убачыў, як на павароце, з высока паднятае дарогі падала вялікая нагружаная машына, кулялася лёгка і страшна, ламала прысады кволых ніцых верб, а там, дзе ўпала,— кабіна асобна, прычэп асобна,— дробна і чыста, як душа, рассыпалася бітае шкло. І Дабаш раптам усёю істотаю адчуў тую дзікую, сляпую сілу, якая несла машыну да павароту, і ў яго тоненька, салодка заныла пад сэрцам, быццам і ён ляціць з таго ж адхону, на тым жа павароце!..

Вяртаўся дадому ён прыцемкамі, супакоіўся. Крыху і прыкра адчуваў сябе за тое, што распусціў нервы. Жывому жыць, а катэр з гаражом на беразе возера, не так гэта проста дастаць зараз... Тут нечага і думаць...

І аформіць гэта трэба да адпачынку. Адпачываць ён сабраўся на поўдні, і ад прадчування гэтага будучага адпачынку Дабаш ужо забыўся на той тоненькі халадок, які так і астаўся пад сэрцам.

# ЧУЖАЯ ПЕСНЯ

— Чаго гэта ты ўстаў неўпару?

Ен сцепануўся ад нечаканасці, разгублена аглянуўся: Настася стаяла ля ложка басанож і адзявала спадніцу.

— Што гэта цябе зранку да акна прыляпіла? — зноў запыталася сястра, спраўна закруціла вакол стану спадніцу і, збочыўшыся, пачала зашпільваць аплікі.

— Выспаўся. Перад смерцю і сну няма.

Сястра нічога не адказала: зусім слабым і нядужым здаваўся ён тут, у вёсцы, па-старэчаму сухенькі і чысценькі самаўпэўнены гарадскі дзядок. Дзе ўжо ў яго пытацца здароўя! І як гэта ён надумаўся ў такую слату ехаць у гэту глуш? І пісем жа не пісаў — маці толькі некалі бывае ўспомніць, што недзе Паўлік яе «вялікім» чалавекам стаў, жыве з панамі. Настася ўжо і не думала, што жыў ён яшчэ недзе, гэты невядомы яе брат, а ўчора ўвечар, у дождж, заявіўся. Брата пытаўся, а пра яе не ведаў!..

Павел зноў завярнуўся да акна. Ля пачарнелага ад вільгаці плота стаяла рабінка, і на яе чырвоных ягадах віслі цяжкія кроплі.

Было чуваць, як Настася мылася ў мыцельніку, потым пачала падпальваць у печы, выйшла на двор, мабыць выпусціла з хляўчука курэй, бо раптам на варотах з'явіўся залацісты вялікі певень, залопаў крыламі, коратка кукарэкнуў і нечага спужаўся, саскочыў на зямлю, азірнуўся, выцягваючы шыю...

...Вялікі чырвона-залацісты певень са скрываўленым і звіслым набок грэбенем кінуўся біць яго, і ён закрычаў спуду. На крык з хаты выбегла маці з хвартухом у руцэ і пачала адганяць пеўня, лупцуючы паскамі, а той не хацеў здавацца, і толькі калі маці добра такі даняла

яго, закудатаў ад болю і кінуўся ўцякаць на вуліцу.

Маці выцірала яму слёзы, і па руцэ яе з ранкі буйна каціласся крывінка...

Як гэта было даўно! І маці тады была ўдвая маладзей, чым ён цяпер.

— Ты б малака хоць пакуль выпіў,— паклікала Паўла з кухні сястра.

Яна змахнула хвартухом табурэтку, але ён не сеў, стоячы выпіў паўлітровы эмаліраваны кубак сырадою.

— Дзякуй, Насця,— падзякаваў ён, сумеўся гэтай сваёй далікатнасці і выйшаў у чысты пакой, у задуменні абышоў вакол круглага стала, зазірнуў у лёстэрка, што стаяла на ім, паправіў гальштук, які з'ехаў набок.

Позірк яго ўпаў на рамкі з фатакарткамі, якія віселі над вокнамі. Ён падышоў бліжэй, пачаў углядацца. То хлопцы недзе на танцах, ля плота на вясковай вуліцы,— у шырачэзных штанах і кашулях з закасанымі рукавамі... Лупатае немаўля на дыванчыку старанна кусае палец на назе... Насцярожана застыў на фатаграфіі юнак у новым касцюме, з гальштукам-лапаткаю на грудзях. Ах, як няёмка і нязвычна яму ў гэтым убранні!

А вось пажоўклы здымак: мужчына ў дабротным галіфэ, у доўгай, чуць не да калень, гімнасцёрцы, перахопленай камсастаўскаю папругаю, стаіць, паклаўшы руку на спінку крэсла. Аж свяцяцца наглянцаваныя боты!.. Два дзядзькі ў кажушках, пры зброі,— аўтамат у аднаго на каленях, у другога — за плячыма вінтоўка,— кураць самакруткі і, мабыць, не здагадваюцца, што іх здымаюць.

Здымкі ў большасці старыя, цьмяныя. І рамкі абклеены палоскамі белай паперы ў зубчыкі. Папера пажаўцела і пасохла.

І нешта адно няўлоўнае ў рысах твару і гэтых дзядзькоў, і юнака: неяк аднолькава глядзяць іх вочы,

аднолькава акрэслены падбародкі... Надта падобныя.

«Няўжо гэта Настасін такі? — падумаў ён пра юнака.— А то мо браты?»

— Уключы радзіва, Павел! — папрасіла з кухні Настася.

Ён уключыў невялічкую пляскатую радыёлу, ад якой паўз бэльку вілася расцягнутая залацістая спружынка антэны. Ігралі скрыпкі, і мелодыя была лёгкая і балючая, як даўні, прыглушаны часам успамін.

Павел падышоў да ложка, выцягнуў з-пад яго свой чорны лакіраваны чамадан з жоўтым замком-«маланкаю», паклаў яго на ложак, расчыніў. Усміхнуўся — падарунак вёз толькі аднаму брату, адрэз на касцюм...

...Братава калыска вісела ля печы, над палком, насланым з дошак. На адной з вяровак быў раскудлачаны вузел. Ён, калі хацеў паглядзець на брата, станавіўся на палок і чапляўся рукою за гэты вузел, цягнуў да сябе калыску. Калі толькі маці бачыла гэта, хапалася за хвартух, хлёсткія паскі якога ён добра ведаў.

— Куды пабраўся? А каб табе кроўная доля! Дзіця выкінеш!..

Стала горача ад думкі, што Настасі нічога не ўзяў. Ніколі б і не падумаў, што ў яго ёсць яшчэ і сястра, і другі брат яшчэ быў. І ў самога яго прозвішча другое, не бацькава,— Ляткоўскі.

А ўчора ішоў ад шашы ў дождж, па гразкай восеньскай дарозе, і яшчэ нейк радаваўся, што адважыўся паехаць у гэту глуш, але добры настрой праходзіў: было цёмна, гразка, мокра ў ногі і неспакойна ад думкі, што яшчэ — не дай бог! — захварэе. Ды ён нікому не сказаў, куды і чаго едзе. Ці мала што падумаюць, калі хопяцца яго. І ён раскайваўся, што паддаўся таму незразумеламу, раптоўнаму жаданню — паехаць... Ён, стары, спрактыкаваны, захацеў нейкіх прыгод, як хлапчук, хоць па-

вяло на гэта нешта другое, нейкая незразумелая прыцягальная сіла, пра якую ён нічога не ведаў, не здагадваўся нават, хоць за век свой і багата пабачыў свету... Можа б, ён і завярнуў назад, каб мог здагадацца, што няма ні тае хаты, ні брата, што вясковы хлапчук прывядзе яго, мокрага і збянтэжанага, да незнаёмай жанчыны, якая і акажацца яго сястрою!..

Настася затупала да стала. Прынесла на талерцы горку блінцоў, яешню і печанае сала, гуркоў, бульбы, якая густа парыла, потым пачала насіць кілбасу, сырое сала, нібы збіралася на добрыя госці.

Павел глядзеў на яе, і зноў пачала быццам прыходзіць заспакоенасць і лагоднасць — і добрым быў шэры восеньскі дзень за акном, рабінка, далёкі лес...

— Нашто гэтулькі? — здзівіўся ён.

— А то ж шкадаваць буду! У мяне ж есці няма каму. Хіба Шура з сям'ёю ў госці наедзе,— адказала яна і паставіла на стол гранёныя стограмоўкі.

Ен паглядзеў на яе, мажную, поўную, са спакойным круглым тварам, нібы не было за плячыма больш шасцідзесяці год, на яе вялікія рукі...

— То садземся, паснедаем.

Яна скінула хустку, павесіла на біла ложка. Яе густыя пасівелыя валасы былі роўна зачэсаны і закручаны на патыліцы.

— Ну давай, брацік, за ўсё, што пражылося і каб яшчэ жылося! — падняла яна чарку.

Ен глядзеў, як яна спраўна выпіла гарэлку, і падумаў, што калі вып'е, то ап'янее. Адпіў ён некалькі глыткоў. Яна толькі глянула на яго і нічога не сказала.

— А я Антосю на касцюм прывёз,— пачаў ён.

— Дзе яму той касцюм! Мо і касцей ужэ німа. Яны ж са Сцяпанам разам і леглі.

— Пра цябе і Сцяпана я не ведаў... А дзе іх пахавалі?



— Хто яго ведае. Іх, казалі, ранілі, як на дарогу хадзілі, немцы жывымі пабралі. Замучылі недзе. За гэту вайну тут уся зямля магілаю стала. Столькі палажылі!

Сястра гаварыла проста, спакойна, як пра будзённае.

— Мне ўжэ после іх картачку людзі перадалі, пасля вайны.

Настася паглядзела на рамку з фатаграфіямі:

— А гэта мой стаіць. Яшчэ як прадсядацелем сельсавецкім быў. Год толькі і пабыў, адале і злёг. Збіты быў, зранены...

— А сем'і братоў?

— Спалілі. Тады ж тут усіх палілі. Акружылі і запалілі. Гэта ўсё пасля вайны адбудавалі. А ты што робіш там? — запыталася сястра.

Павел разгубіўся.

— Спяваў... некалі. А цяпер нічога.

— З нашага роду ўсе галасістыя. А грошы як зарабляў?

— Спяваў...

— А-а! Дак гэта як арціст?

— Так. А пра цябе, прабач, нічога не ведаў. Адрэз хоць хлопцу свайму вазьмі.

— Нашто ён яму! Ён і сам інжынер, хватае ўсяго.

— Не павязу ж я назад! Пакладзі хоць...

— Да ўжэ ж... Ну, то дзякуй, Павел!

Паўлу не хацелася больш есці. Ад выпітага забалела галава.

— Астаўся б ты ў мяне. Пагуляў бы, патаптаўся ля дому, пад'еў усмак, паспаў, а то — што цень, як ветрам не паваліць,— зноў загаварыла сястра, і ў голасе яе была спагада. Хацеў адказаць, што нельга яму, але падумаў, што смешна гаварыць ёй пра нейкія там візы. І што ён рабіў бы тут сярод гэтага лесу, гразі? Увесь век пражыў у горадзе, пры грашах усё-такі, прывык да раскошы. А для Настасі і праўда ён жаласлівы ў сваім шчыгульным убранні, па-гарадскому выкаханы і кволы.

— Няма як, Настася,— адказаў ён і ўстаў з-за стала. Нечаму зрабілася так балюча і маркотна, што ўваччу навярнуліся слёзы, і каб не заўважыла сястра, ён нахіліўся над чамаданам, пачаў вымаць пакупкі.

— Якія гэта ў цябе пласцінкі?

— А, гэта мае арыі,— адказаў ён.

— А я думала: вальцы. Вольчыны пабілі маю пласцінку. «На сопках Манжура». Вот я ж любіла яе слухаць! Казалі адкупяць, да ўсё не збяруцца.

Павел прамаўчаў і сунуў пакунак назад у чамадан. Гэта былі яго любімыя арыі, і запісаны яны ў даўні час, калі ён «грымеў» і не ўспамінаў пра далёкую лясную вёсачку, з якое забраў яго пан Ляткоўскі, даў сваё прозвішча і вывучыў за спевака ў светлай Італіі. Яго і цяпер памятаюць у розных краінах...

— Мо пайду, запрагу каня? Куды ты з чамаданам пойдзеш?

— Не трэба! Правядзеш мяне лепш,— запярэчыў ён. Яму не хацелася заставацца аднаму ў пустой хаце, захацелася хутчэй пайсці.

Па вуліцы ішлі побач. Настася ў новай ватоўцы, у гумавых ботах, ступала збоку паўз сцежку на рэдзенькай гразі.

Павел уцягваў галаву ў каўнер плашча і шкадаваў, што не ўзяў шалік. Ступаў ён па старых слядах на сцежцы — было сушэй. Чаравікі, якія Настася была паставіла ноччу на печ, ссохліся і ціснулі ногі. Капялюш Павел нацягнуў на лоб — каб не сагнаў вецер, думаў, што трэба пра нешта загаварыць да сястры, але не ведаў, пра што, і толькі яшчэ больш уцягваў галаву ў каўнер паліто.

За вёскаю, цярэспаля, да самае шашы, вілася бліскучая ад вільгаці, выбітая нагамі сцяжынка, па якой дзеці бегалі ў школу.

Настася спынілася, паставіла на вытаптаную прыдарожную траву чамадан.

А Павел усё думаў, што б сказаць, адчуваў, што нешта яшчэ забыўся — і не мог успомніць. Ён не заўважыў, калі спынілася сястра, і ўсё ступаў, панура ступаў наперад.

— Павел! — абазвалася Настася.

Ён разгубіўся і вінавата падышоў да яе. Твар сястры быў спакойны, як і тады, калі яна падавала на стол і калі пакавала яму ў чамадан і кілбасу, і яблыкі,— навошта яны яму, калі хапае і грошай? Але ён не адмаўляўся: баяўся пакрыўдзіць.

— Ну, то хай цябе бог сцеражэ! — спакойна сказала Настася, паклала рукі яму на плечы і тройчы пацалавала. Шчокі і вусны ў яе былі халодныя.

— Настася, а Настася! — паклікаў ён.

Яна павярнулася да яго.

— Маці дзе, Настася? Я думаў, ты мяне зводзіш...

— Парцізан на могілках акружылі былі. Танкамі ўсё зраўнялі...

Яна яшчэ нешта гаварыла сваім сумным, спакойным голасам, але ён не чуў, ішоў чужы па сцяжынцы, якая мякка гойдалася ўваччу, ішоў туды, дзе застаўся для яго на зямлі толькі беленькі двухпавярховы катэдж у зялёных прысадах і любімы чорны бульдог Джэра.

## ЗЯЛЁНЫ ДОЖДЖ

Дождж ішоў роўна і лагодна. Ад яго ў пакоі стаяў ціхі шэпт. Было крышку пахмурна і туманліва ў далечыні за гайком, які зеленеўся лёгка і чыста. На яго фоне дождж здаваўся зялёным. «Зялёны дождж»,— падумаў Антонаў, і яшчэ пра тое, што праляцелі гусі, што экспедыцыі выехалі «ў поле»...

У сталоўцы, дзе кожную раніцу снедаў Антонаў, ні-

кога не было, і маладая касірша смачна пазяхала і пацірала вочы. Есці не хацелася. Антонаў пакляваў відэльцам мяккі шэры шніцэль, выпіў шклянку кампоту і пайшоў да дзвярэй.

Дождж ішоў усё гэтак жа роўна, блішчалі асфальтавыя тратуары. На ўскраіннай вулачцы было звыкла ціха і пустынна. Антонаў пастаяў, паглядзеў на зарослы бэзавымі кустамі гародчык перад вокнамі, на стары пахілены плоцік. У кватэры яго чакала зноў адзінота. Ён не думаў, што за некалькі гадоў гэтакім чужым стане горад яго студэнцтва. На рабоце новых знаёмых няма, і былых аднакурснікаў таксама не можа знайсці, ды не надта і шукаў...

Антонаў завярнуўся і пайшоў да трамвайнага кальца. У горад ехаў проста так. Па твары сцякалі цёплыя дажджавыя кроплі. Вільготны пах дажджу нагадваў пах прамоклага і пачарнелага брызенту палатак... І роўнае пахістванне трамвая закалыхвала, пачынала ўспамінацца мінулае...

У горадзе было гэтак жа пуста, барабаніла ў сцёкавых трубах вада. Антонаў завярнуў да кінатэатра — агромністае аляпаватае будыніны, на сценах якой віселі вялізныя палотны рэкламы, фарбы на якіх расплыліся ад дажджу.

Ля касы стаялі тры дзяўчынкі, відаць, школьніцы-старшакласніцы ці студэнткі, якія збеглі з заняткаў. Антонаў узяў білет, выйшаў у двор кінатэатра, у буфеце пад брызентавым дзіравым дахам купіў пачак цыгарэт.

Фільм быў знітаваны сумнаю музыкай. На экране праплывалі апошнія дні вайны, там разлучаліся, каб ніколі больш не сустрэцца, людзі. А чалавек, які вярнуўся дадому і ўбачыў накрыты на дваіх стол, зноў пайшоў на вакзал. Ён не ведаў, што жанчына чакала яго, што цэлы тыдзень накрывала на стол на дваіх.

Антонава ўразілі вочы жанчыны, вялікія, на ўвесь экран, поўныя адчаю і гора, пакорліва-вінаватыя, цяж-

кія ад слёз. Гэтыя вочы глядзелі на Антонава, калі ён вярнуўся дадому. І звінеў на падлозе, круціўся асколачак чаркі, якую салдат ненарокам скінуў са стала.

Антонаў не заўважыў, як выйшаў да рэчкі, схамянуўся, калі ўбачыў дзве парэпаныя і пакручаныя вербы над вадой. Ён міжволі ішоў да таго ціхага доміка, дзе жыла Галя. Антонаў усміхнуўся сам з сябе, завярнуўся і пайшоў назад.

Жанчына, якая спяшала насустрач, зачапіла Антонава плячом, і накінуты на яе дажджавік шамотка ўпаў долу. Жанчына нагнулася, падхапіла яго.

— Галя? — не стрымаўся, запытаў Антонаў, хаця і пазнаў яе.

— Ты? — Галя шчыра здзівілася.

Ён стаяў збянтэжаны, быццам яго заспелі за нечым непрыгожым.

— Ахініся, прамокнеш.

Галя ахінулася, вочы яе засвяціліся радасцю.

— Пайшлі да нас. Паглядзіш, як я жыву,— запрасіла яна і ўзяла за локаць.

Антонаў пайшоў побач, хаця думаў, што трэба знайсці прычыну і адмовіцца.

У калідоры ён доўга і старанна выціраў ногі аб саматканы дыванчык.

Галя цярпліва чакала яго.

— Праходзь,— яна адчыніла дзверы.— Вася, ідзі сюды!

З суседняга пакоя выйшаў невысокі хлопец з чорнымі валасамі і смяшлівымі вачамі.

— Пазнаёмцеся. Гэта Сярожа. Я табе расказвала пра яго. Правядзі ў тую хату, а я пагляджу чаго-небудзь.

У «той хаце», чыстым прасторным пакоі з тэлевізарам у кутку і сталом пасярэдзіне, было цеснавата.

— Ты дзе робіш? — запытаўся Вася неяк весела і па-свойску.

— Геолаг.

— Нафту шукаеш?

— Не, так... А ты дзе?

— На нашым, на аўта, токар.

Гаворка не выходзіла. Чуваць было, як цмокаў спрасонку ў сваёй калясцы малы, грукала на кухні талеркамі Галя.

— Пайду памагу Галі...

Гаспадар выйшаў з пакоя.

Праз хвілін колькі ён з'явіўся з бутэлькай, за ім з талеркамі Галя. Селі да стала. Пасля чаркі засяроджана і доўга елі, потым Галя запыталася:

— А ты не паехаў у поле?

— Не, я цяпер тут, ва ўпраўленні.

— Правільна. Трэба абжывацца,— заўважыла Галя. Антонаў коратка і пільна паглядзеў на яе — яна не прытваралася, гаварыла шчыра. Хаця ён некалі расказаў ёй і яна адна, лічыў Антонаў, ведае, што значыць для яго сапраўдная работа, «у полі».

— Ты еш, Сяргей,— запрасіла яна.

— Дзякуй, але мне трэба ісці. Не хацеў гаварыць табе гэта адразу...

— Рабочы ж дзень... Ты заходзь яшчэ.

На двары ўсё ішоў дождж. Галя выйшла правесці Антонава.

— Чаму ты так скора? Пасядзелі, пагаварылі б яшчэ...— сказала яна.

— Другім разам,— адказаў Антонаў, хаця абое яны ведалі, што другога разу не будзе.

Антонаў падумаў пра тыя, з кіно, вочы, пачуў, як аднекуль здаля зазвінеў, закруціўся на падлозе, зіхатлівы, як шчасце, асколачак шкла.

Галя стаяла побач, спакойная, і па дажджавіку яе гучна лопаў дождж. Ён падаў руку і пайшоў.

Гаспадыня яшчэ не вярнулася з работы. Як і раней за акном ішоў дождж, за якім цяпер ужо невыразна

віднеўся той самы бярозавы гаёк. А здалося, што задрамаў толькі на хвілінку. На сцяне цьмяна паблісквала стрэльба. Яна зноў нагадала Антонаву пра экспедыцыі, пра тое, што ён цяпер калека, хворы чалавек, што воля ягоная кончылася, што да смерці яму перапісваць паперы за сталамі ў канторах і быць папяровым геолагам.

Антонаў падышоў да сцяны, зняў новенькія акуляры матацыкліста, выйшаў на двор, доўга круціў ключом у заржавелым замку, пакуль адамкнуў хляўчук. «Ява» драпежна паблісквала ў прыцемку нікелем выхлапных труб.

Матацыкл, запраўлены і падрыхтаваны да першага выезду, завёўся адразу. Антонаў слухаў, як роўна і плаўна працуе матор, насунуў на вочы акуляры, адчуў, як яны мяккім капронавым халадком прылеглі да твару, уключыў перадачу...

Насустрач пругка ўдарыў вецер, закалолі ў твар дажджавыя кроплі...

З Галяй яны падружыліся на экскурсіі ў Маскве. Тады таксама ішлі дажджы. І сябравалі два гады. Потым ён скончыў інстытут, паехаў на работу. Калі вярнуўся, даведаўся, што Галя некалькі разоў хадзіла ў кіно з хлопцам-аднакурснікам. Яна не таілася ад яго. Антонаў тады сказаў, што між імі ўсё скончана, хаця сам верыў, што Галя будзе абавязкова чакаць, пакуль ён вернецца... Потым ён даведаўся, што Галя выйшла замуж і зусім не за таго хлопца...

Антонаў успомніў яе сённяшнюю, добрую і спакойную, усміхнуўся з сябе самога за ўсе тыя выдумкі, за сваю наіўнасць. І адчуў палёгку, нібыта пад дрыгвою адчуў цвёрдае, тупкае дно. З задавальненнем прыбавіў хуткасці, прыслухаўся, як пяе матор і ўсяго яго маладзіць, радуе гэтая хуткасць.

Чалавек на мокрай і пустой загараднай шашы з зайздрасцю заўважыў белы шлем, які мільгнуў у вачах, пачуў пах бензіну, спыніўся і глядзеў услед беламу святлу фары, якое неслася ў вечаровую цемру, туды, дзе павароты і пагоркі, дзе незнаёмая вясновая далячынь.

Чалавек пастаяў, уздыхнуў, ямчэй нацягнуў на галаву капюшон дажджавіка і рушыў далей.

Ні ён, ніхто болей не ведаў, што ў той дзень ішоў на зямлі зялёны дождж.

## ПАНСКІЯ КНІЖКІ

*(Расказ дзеда)*

Цяпер у Янаўцы дзед Васіль бывае рэдка: не тыя гады, сем кіламетраў вялікая дарога для яго ног. Але калі даводзіцца закіраваць дзеду ў Янаўку, калі пройдзе паўз школу, што стаіць пад старымі кашлатымі ліпамі і клёнамі, пад якімі бегаюць, як узбунтаваныя мурашкі, школьнікі, успамінаецца дзеду кожны раз даўні выпадак з яго жыцця. І бывае, стаіць ён, успамінае, аж пакуль не зазвініць школьны званок і дзеці гуртам не кінуцца на ганак. Тады спахопіцца дзед, азірнецца, ці не бачыў хто, як ён без дай прычыны стаяў пасярод вуліцы.

А ўспамінаецца дзеду, як на гэтым месцы быў панскі двухпавярховы маёнтак з белымі вокнамі, з балкончыкам з балясамі, з альтанкаю, зялёнай ад хмелю, з газонамі вакол, са сцяжынкаю у стары цяністы сад.

Здарылася гэта летнім надвячоркам, цёплым, душнаватым. Васілёк толькі што прыгнаў з выгана вялікую рабую свінню і двух падсвінкаў: аднаго гэтакага рабенькага, як маці, рахманага, другога — несусветную зброду, якая толькі і пільнуе, каб зазяваўся Васілёк і

нарабіць шкоды. За гэта вечарам пападае пастуху ад маці паскамі хвартуха, у горшым выпадку перападзе і бацькавай папружкі, гэта калі падсвінак добра завінецца ў шкодзе.

Бацька ўжо вярнуўся дадому. Ён разам з мужчынамі ездзіў вазіць каменне на новую брукаванку. Работа была і дома, але прыязджаў у вёску дзядзька ў скураной паддзёўцы, сабраў мужчын і загадаў. Дзядзька быў новы начальнік з раёна.

Адпрэжаная Муха з вераўчаным путам на шыі стаяла ля плота, апусціўшы галаву, і калі Васілёк ласкава пагладзіў яе па шыі, не павярнулася — стамілася за дзень.

— Ты не лашчся там! Ідзі перакусі чаго і павядзеш пасвіць каня разам з хлопцамі,— гукнуў Васілька з сянец бацька.

Васілёк быў самы старэйшы з дзяцей у сям'і, і таму бацька калі-нікалі дазваляў яму ехаць на начлег, хоць да начлежніка хлопец не дарос.

Васілька не паспеў пасярбаць як след вараных буракоў, як з вуліцы свіснуў Адэльчын Вінцэсь. Вінцэсь ужо сядзеў на буланым, ашчаперыўшы чарнапятымі нагамі белыя бакі. Васілёк схапіў у руку кавалак хлеба са стала і кулём выкаціўся на двор.

— Паехалі, пячкурыкі! Пакуль хлопцаў збяром. Сёння ў панскі сад паедзем.

— У панскі? — перапытаў Васілёк.

— А што? Паноў прагналі. Цяпер усё народнае.

— Дык наш жа не ўцёк.

— Ну і што! Сядзіць, як мыш рудая,у адным пакойчыку. Ён зараз нас і пальцам не кране.

— А я і не баюся.

Ды і чаго было баяцца зараз пана, старэнькага, немагушчага, якога ніхто не чапаў пакуль што, хоць чырвоныя і выгналі палякаў.

Варотцы і вароты ў панскі сад і на двор былі

парасчыняны, вытаптаны газоны і трава ў садзе некім.

Хлопцы злезлі з коней, спуталі іх.

Васілёк патупаў па садзе, які пааблмвалі, да часу паабрывалі яблыкі янаўскія хлапчукі. З саду Васілёк пакіраваў да маёнтка. І на сцежках, і на ганку валялася папера і смецце. Дзверы былі расчынены. У пакоях было пуста, насмечана, ступана нагамі. Васілёк спачатку азірнуўся наўкруга, потым асмеліўся, штурхануў дзверы ў другі пакой, меншы, з двума вялікімі, бліскучымі, цёмна-чырвонага колеру шафамі, якія крывава блішчалі ў водсветах заходзячага сонца. Васілёк пратупаў да акна, дзелавіта цыркнуў скрозь зубы на падлогу, а калі азірнуўся, убачыў, што ў дзвярах стаяў пан. У адной рубашцы, у хромавых ботах, лысы і маленькі. Ён сабраўся быў уцячы разам з палякамі, але янаўскія мужчыны адабралі коней у пана — пан не патрэбен быў ім, шкада толькі было коней. Старога пана, зусім нядужага, пакуль што не чапалі і чырвоныя — было клопату і без яго.

— Што гэта ты робіш тут, хлопча? — спакойна запытаўся пан, але Васілёк усё роўна азірнуўся — куды ўцякаць. Уцякаць не было куды.

— Коней пасом.

— Адкуль жа вы?

— З Пераходаў.

— А чаму ты плюешся ў пакоях, хлопчык?

Васілёк яшчэ раз азірнуўся — куды падацца?

Пан расчыніў шафу, дастаў аж цэлых шэсць кніг у цвёрдых цёмных вокладках.

— Ідзі сюды, хлопчык. Я табе дам кнігі, каб ты чытаў іх, не пляваўся ў панскіх пакоях больш. Гэта разумныя кнігі.

— Мне няма як везці...

Пан азірнуўся па баках, падумаў і потым закамандаваў:

— Давай папружку.

Васілёк паволі зняў сваю новую папружку — з белай сырамяці — якая прытрымлівала яго палатняныя штаны, падаў пану і адступіўся назад — невядома, што стукне ў галаву пану, яшчэ і лізгане. Але пан не збіраўся лізгаць Васілька, сам звязаў і падаў хлопчыку кнігі.

— На. А хто гэта навучыў вас пасвіць коней на газонах?

— Ніхто. Самі.

— Ты самы маладзенькі, мабыць?

— Ага,— адказаў Васілёк і падаўся хутчэй да дзвярэй.

Кніжкі Васілёк прывёз дадому.

А пад восень ноччу пачалася страляніна, некуды паспешна імчалі чырвоныя коннікі.

Васількоў бацька вярнуўся ад Аўхіма-сакратара і сказаў да мацеры:

— Зноў палякі наступаюць, каб на іх пранцы!

— Няўжо? — успляснула рукамі маці.

— Ты не божкай, а паглядзі, дзе мая бравэрка, і есці сабяры. Пайду я на Востраў з Мухаю, а то каня палякі нам не пакінуць. Трэба хавацца ў балота.

Ноччу перадавыя часці палякаў прыйшлі ў вёску, і бацька раніцою вярнуўся з балота, але каня не прывёў дадому. Маці расказвала яму навіны:

— Пазабіралі ў людзей коней. Аўхіма расстралялі. А ў Янаўцы загадалі ўсё вярнуць пану ў маёнтак і за патраву з людзей грошы забраць. Таго, хто што-небудзь узяў у маёнтку, легіянеры шомпаламі б'юць. Старому пастуху Януку за мяккае панскае крэсла так шомпалаў далі, што нават стоячы есць. Кажуць, любімае панскае крэсла было.

— Бо не трэба было шкадаваць яго. А то пашкадавалі. Зараз зноў гэты клешч уп'ецца.

Васілёк толькі прыгнаў з выгана свінню і сядзеў на

ганку, вырэзваў новае пукаўё з ядлоўцу ціха, моўчкі.

Васілёк яшчэ здалёк пачуў, як стукаюць па дарозе конскія капыты і грукаюць колы. Два конныя легіянеры з карабінамі за плячыма і панскія бегункі спыніліся ля Васільковай хаты.

Пан саскочыў на зямлю і з бізуном у руцэ пакіраваўся да Васілька.

— Гэта ты той хлопчык, якому я некалі даваў свае кніжкі? — запытаўся ён.

— Я,— нясмела прызнаўся хлопчык.

— Ну чытай іх, маладзец.

Пан працягнуў Васільку цукерак.

— Я забыўся толькі, як гэта ты тады папаў у мой маёнтак?

— А мы коней пасвілі ў вашым садзе.

— Дык ты мо мне пакажаш, дзе жывуць тыя, з кім ты тады пасвіў коней? — ужо зусім ласкава запытаўся пан і нецярпліва стукнуў бізуном па халяве запыленага бота, на ёй застаўся чорны пісяг.

Нешта нядобрае пачулася Васільку ў панскіх словах.

— А іх няма...

— А дзе яны? Можа, з бацькамі ў полі?

— Не. Яны вялікія, і чырвоныя, як адступалі, разам з сабою ў войска забралі.

— Ты праўду кажаш, хлопчык?

— Праўду, нашто мне хлусіць?

Пан яшчэ раз расчаравана ляпнуў па халяве бізуном, завярнуўся і пайшоў, нешта злосна сказаў легіянерам, сеў у вазок і шлягануў жарэбчыка ляйчынаю па баку.

— Чаго-та пан ад цябе хацеў, сынок? — выбегла з хаты маці, якая праз акно бачыла ўсё.

— Пытаўся, з кім я тады коней пасвіў у садзе, як ён мне кнігі даў.

— А ты сказаў? Зрэжуць жа на горкае яблыка шампаламі! Скалечаць дзяцей.

— Не. Я сказаў, што хлопцаў у армію забралі. А цукерак яго выкінуў.

— От маладзец! Хай яму кроўная доля!

І маці пайшла ў агарод, на ходу клянучы пана, а Васілёк кінуў рабіць пугаўё, дастаў з куфра панскія кнігі, вынес іх на выган, запаліў і падварушваў палкаю, пакуль не засталася толькі кучка чорнага попелу...

У вайну згарэў разам з вёскаю і панскі маёнтак. І ліп і клёнаў многа ссеклі на дровы. Ужо пасля вайны пабудавалі новую школу, насадзілі маладых ліп. Там, дзе былі панскія газоны,— зараз градкі прышкольнага ўчастка. І вучням не верыцца, што тут некалі стаяў маёнтак. Толькі дзед Васіль часта расказвае дзецям пра тыя дні, пра панскія кніжкі, бізун і шампалы, пра тое, як ён некалі спаліў панскія кніжкі, каб потым, пасля вызвалення, вучыцца па новых, савецкіх.

## НА ДАЗОРНАЙ СЦЯЖЫНЕ

Радавы Калюгін спачатку нічога не зразумеў, спрасонку не пазнаў нават голасу памочніка начальніка каравула, але каманду пачуў дакладна:

— Каравул — у ружжо!

Калюгін падхапіўся і праз некалькі секунд ужо стаяў з аўтаматам у страі, убачыў, што ў каравульным памяшканні стаіць дзяжурны па часці і глядзіць на гадзіннік.

Як толькі каравул пастроіўся, дзяжурны па часці даў уводную — нападзенне на каравульнае памяшканне. Калюгін кінуўся да зараней вызначанага яму акна, пры якім была яго пазіцыя...

Дзяжурны коратка разабраў дзеянні каравула па камандзе «ў ружжо», ацаніў іх на «добра».

Пасля пад'ёму Калюгін не заснуў. Хутка было заступаць на пост.

Сяргей Калюгін ведаў, што рана ці позна, а давядзецца трапіць яму на пяты пост, пра які расказвалася ў салдат шмат страшных гісторый: то быццам — адразу пасля вайны — з паста бясследна знікалі вартавыя, то прыходзіла на пост рысь і аднойчы скочыла на вартавога. Таго ўратавала, што карабін з прымкнутым штыком вісеў на плячы, і рысь сама напаролася на штык. А то панадзіўся быў на пост мядзведзь. Ходзіць услед за вартавым па кустах. Вартавы спыніцца — мядзведзь таксама стане. Вартавы далей — і мядзведзь назіркам, бытта выбірае, калі зручней кінуцца... Не вытрымае вартавы, стрэліць па ім, а калі прыедуць на пост паднятыя па трывозе каравульныя, няма ні забітага мядзведзя, ні ягоных слядоў...

Калюгін прыкмеціў, што салдаты другога года службы пасміхваліся з жахлівых расказаў пра пяты пост, і таксама не надта верыў пачутаму. Калюгін разумеў, што салдацкі фальклор, які ёсць у кожным падраздзяленні і які памнажаецца кожным вайсковым наборам, мае мараль на розныя выпадкі ў салдацкім жыцці, падцвярджае, як патрэбны і дысцыпліна, і вытрымка, і пільнасць, і знаходлівасць, і салдацкая вывучка.

Урэшце, чаго было палохацца Сяргею Калюгіну, дужаму маладому хлопцу, які да войска працаваў у бульбаводчым звяне трактарыстам, гуляў нават у футбольнай зборнай камандзе раёна?

За год службы Калюгін стаў прызнаным кулямётчыкам, якога камандзіры не раз ставілі ў прыклад іншым. Ды і да заступлення ў каравул Калюгін падрыхтаваўся як мае быць, дасканала вывучыў табель паста, пастрыгся, памыў форму, адпрасаваў яе — хоць на спатканне ідзі.

Першыя дні, як трапіў у войска, Калюгін, калі меў вольны час, прыходзіў паглядзець і паслухаць развод каравула.

Каравул на плац выводзіў камандзір падраздзялення, яшчэ раз правяраў гатоўнасць да нясення службы, рабіў інструктаж, пакуль не паказваўся здалёку дзяжурны па часці. Начальнік каравула даваў каманду каравулу, аркестр пачынаў іграць «Сустрэчны марш».

Дзяжурны правяраў падрыхтоўку каравула, падцягнуты, сабраны, дакладны ў кожным руху, і гэтая ягоная сабранасць перадавалася каравульным, яны таксама стараліся адказваць коратка, дакладна.

Пасля праверкі каравула дзяжурны камандаваў аркестру іграць «Збор».

Нешта суровае, мужнае ёсць у разводзе каравула, у замёрлых падобных адна на адну салдацкіх постацях. Незвычайнасць і трывожнасць чуваць у пругкай, мускулістай музыцы духавога аркестра, у глухіх ударах барабана, па якім б'е нечакана маладзенькі і стройны выхаванец аркестра. І разам з тым нешта няўмольнае ёсць у барабанных ударах, якія адбіваюць такт страявому кроку, калі адыходзіць з плаца строй каравула, калі сціхае ў вечаровай цішыні трубны голас медзі і чуваць толькі моцны, роўны салдацкі крок.

Строй каравула спыняецца перад каравульным гарадком. Потым абодва каравулы, стары і новы, строяцца адзін перад адным, абменьваюцца рапартамі начальнікі каравулаў:

— Таварыш лейтэнант, новы каравул на змену прыбыў. Начальнік каравула лейтэнант Гладышаў.

— Таварыш лейтэнант, стары каравул да змены гатовы. Начальнік каравула лейтэнант Міцькін.

Развод і змена каравула, музыка, строгасць і дакладнасць каманд неяк супакойвалі, надавалі ўпэўненасці. З гэтаю ўпэўненасцю ў самім сабе Калюгін правёў дзве гадзіны перад адпачынкам, яшчэ раз схадзіў

на каравульны гарадок да макета пятага паста. Нічога незвычайнага на макеце не было: няправільны пяцікутнік з агароджы калючага дроту ў два рады, між якімі пралягаў маршрут патрулявання. Вакол агароджы, усярэдзіне яе,— лес, які на макеце абазначаны сухімі галінкамі і мохам. Невялічкія гурбанкі абазначалі склады.

Калі надышоў час адпачываць, Калюгін адразу ж заснуў моцным сном...

Калюгін ляжаў на тапчане ў ціхім і цёплым пакоі для адпачынку, што, як і ўся каравулка, прапах тым асаблівым духам, якім пахнуць усе вайсковыя памяшканні, якія не пустуюць, але і не маюць пастаяннага жыльца. Калюгін уявіў увесь пакой, дзе адпачывала змена каравула, якой заступаць на пасты.

Ля дзвярэй вешалка: пафарбаваная прыбітая да сцяны дошка, на якой шмат кручкоў, каб хапіла на ўсе кажухі, якія віселі тут зімою, а летам на брызентавыя плашчы з капюшонамі. Уздоўж сцен, такім чынам, што заставаўся шырокі праход пасярэдзіне, стаяць тапчаны, зробленыя з металічных вугольнікаў і тоўстае фанеры, абцягнутае дэрмацінам, востры пах якога перабіваў трывалы і даўні пах кажухоў, якім назаўсёды прапахла каравулка, які стаяў тут нават і цяпер, калі на вешалцы віселі пабялелыя ад дажджу плашчы.

Калюгін, мабыць, выспаўся, а таму не засыналася. Пачаў муляць падсумак з магазінамі, які саслізгнуў пад бок і цёпла там прыгрэўся.

На жорсткім шыракаватым тапчане Калюгін адчуваў сябе вялікім і дужым, як ніхто на свеце, нейкім асаблівым, лепшым за іншых. З адчуваннем упэўненасці ў самім сабе Калюгін і падняўся па камандзе, слухаў, стоячы ў страі, інструктаж заступаючым на пост.

На ноч аціх вецер, які звечара гнаў па надвячоркавым небе лёгкія, як цені, воблакі, і не было глухое

чорнае цемры, як гэта здараецца ў першыя верасвёвыя ночы, калі кончылася і пара зоркападаў, і жніўеньскага цяпла, калі адвячоркамі чужым шэрым колерам глядзіць ужо на зямлю неба, з-за чаго і пачынае здавацца, што хутка пачнецца холад. Холаду яшчэ не было, не было і глухое цемры. Месяцава святло, мабыць, аднекуль звысака клалася на неба, і хоць не было відно самога месяца, але яно не давала запанаваць непраглядпасці над зямлёю.

Ля асветленага куляўлоўнага шчыта каравульныя, якім ісці на пасты пешшу, пад наглядам начальніка каравула, і па камандзе заражалі зброю, прымыкалі штык-нажы і далучалі магазіны да аўтаматаў.

Разводзячым чацвёртага і пятага паста быў сяржант Галубок, белавалосы, крыху павольны, маўклівы камандзір другога аддзялення першага ўзвода. Ён прыпыніўся, паглядзеў, як зараджаюць зброю, потым скамандаваў:

— Шагам марш!

Ля варот каравульнага гарадка стаяў «газік» з брызентавую будаю над кузавам.

— Да машыны! — коратка загадаў Галубок, пачакаў, пакуль Калюгін і каравульны чацвёртага паста, салдат другога года службы Садыкаў, сталі ля задняга борта.— На месцы!

Калюгін і Садыкаў селі пры самай кабіне побач, заціснуўшы аўтаматы між каленяў.

— На пяты пост? — запытаўся Садыкаў.— Харошы пост. Ніякіх праверак. Харошы.

Садыкаў яшчэ не разварушыўся пасля сну. Калюгін стрымаўся, не пачаў распытваць пра службу на пятым пасту, хаця цяпер, адзін на адзін, перад самым заступленнем і закарцела распытацца падрабязна. Калюгін толькі ўсміхнуўся сам з сябе і прыадчыніў брызентавае акенца.

Машына выехала за тэрыторыю часці, імчала па

сухой белаватай сыпанцы, скіравала ўлева і неўзабаве выехала да стрэльбішча, дзе над участковымі пунктамі кіравання свяціліся адзінокія ліхтары.

Машына спынілася, не даехаўшы да першага пункта, грукнулі дзверцы, і сержант Галубок спакойна скамандаваў:

— Да машыны!

Пачакаў, пакуль яны злезуць.

— Направа! Справа па аднаму — зараджай!

Садыкаў ступіў крок наперад, зняў з пляча аўтамат, спачатку прымкнуў штык-нож, далучыў магазін, паставіў аўтамат на засцерагальнік і далажыў:

— Зброя зараджана і пастаўлена на засцерагальнік.

Калюгін таксама зарадзіў аўтамат.

— Налева! За мной — шагам марш!

Як прайшлі метраў сто, пачуўся вокліч вартавога:

— Стой! Хто ідзе?

...Калі вярнуліся да машыны, разрадзілі зброю ужо ў кузаве, зменены з паста яфрэйтара Бабкоў, чарнявенькі, шустры механік з трэцяга аддзялення запытаўся:

— На пяты пост? Даўно пара цябе туды, а то ўсё хваляць — Калюгін ды Калюгін... На пятым пасту і Калюгін першую змену прастаіць з патронам у ствале.

Бабкову хацелася пагаварыць. Ён намаўчаўся за дзве гадзіны. Калюгіна раззлавала, што Бабкоў нібыта загадзя радуецца таму, што Калюгін спалохаецца і што гэта выкрыюць. Бабкову быццам лягчэй стане ад гэтага.

— Ты па сабе мераеш? Ты мо і на чацвёртым пасту з патронам у ствале ходзіш? — сekануў яму Калюгін.

Бабкоў як і не пачуў, гаварыў сваё, насмешлівае і здзеклівае.

— Галінка як шарганецца ці птушка шалпане — аж

валасы на галаве заварушацца, здасца, што падкрадаецца нехта да цябе. Рука сама затворную раму назад шмаргане. Пакуль дзве гадзіны праходзіш — усе страхоцці пра пост успомніш, наробішся, як вагон разгрузіш. Толькі пад канец не забудзь патрон са ствала дастаць, а то Галубок такі служака, што не прамоўчыць, даложыць памначкару.

Бабкоў і думкі не дапускаў, што на пятым пасту першы раз хоць хто стаіць без патрона ў ствале. Але толькі некаторыя, хто забыўся перад зменаю патрон дастаць, папаліся. Усе роўныя смельчакі.

— Не, Бабкоў, я не твайго заводу.

— Заўтра пабачым.

Бабкоў здзекліва змоўк.

Калюгін з прыкрасцю падумаў, што нанесла на ягоную галаву перад заступленнем на пост такога чалавека.

Машына неўзабаве з'ехала на лесавую дарогу, зашоргалі па брызенце галіны. Потым машына спынілася. Гэтак жа спакойна, як на стрэльбішчы, Галубок даў каманду спешыцца.

Машына стаяла на невялікай палянцы, на якой можна было завярнуцца. Адразу ж ахінула здароваю лесавою вільгаццю. У лесе было цямней, цішэй, чым у полі, толькі недзе высока, слаба шумелі верхавіны, як не ад ветру — а дыхалі магутныя дрэвы.

Галубок загадаў зарадзіць зброю, павёў змену за сабою. Калюгін азірнуўся на машыну: з-за дрэў толькі слаба свяціліся два маленькія агеньчыкі падфарнікаў.

Сцяжынка завярнула ўправа. Наперадзе засвятлелася, стала бачна агароджа з калючага дроту. Лес не падступаўся да самае агароджы.

Як толькі выйшлі на светлае, пачуўся воклiч:

— Стой! Хто ідзе?

— Развадзячы са зменаю,— адказаў Галубкоў.

— Развадзячы да мяне, астатнія на месцы!

Галубок пайшоў да вартавога. Вартавы, які быў прытуліўся да слупка агароджы, выйшаў насустрач развадзячаму.

Потым па камандзе Галубка і Калюгін рушыў да паста.

Вартавы ўзяў аўтамат «на рэмень», калі падышоў да яго Калюгін.

Галубок скамандаваў:

— Смірна! — І да Калюгіна: — Радавы Калюгін, на пост шагам марш!

Вартавы саступіў са свайго месца крок управа, і Калюгін стаў побач з ім.

— Вартавы, здаць пост!

Вартавы, павярнуўшы галаву да Калюгіна, зрабіў славесную здачу паста.

Калюгін павярнуўся тварам да развадзячага:

— Таварыш сержант, радавы Сямёнчык пост нумар пяць здаў!

— Таварыш сержант, радавы Калюгін пост нумар пяць прыняў!

— Радавы Сямёнчык, з паста шагам — марш!

Калюгін пастаяў, паглядзеў услед змене, якая паволі, у калоне па аднаму пайшла па сцяжынцы і знікла за паваротам.

Вартавы Калюгін узяў аўтамат напагатоў, падышоў да варотцаў, памацаў, як яны зачынены, і паволі памераў па маршруце, не зважаючы на тое, што нешта здрадліва зашчымела ў грудзях ад таго, што застаўся адзін, агароджаны з двух бакоў калючым дротам, за які нельга выйсці, што б не здарылася, пакуль не прыедзе змена.

Удалечыні заціхаў матор машыны.

Лес быў яловы. Толькі мясцінамі яліны расступаліся, давалі месца асінніку і бярэзніку. Асіннік мякка і лёгка шумеў. Пад восень, як упалі першыя сухія лісцікі,— дрэвы шумяць без перастанку ўдзень і ўночы,

ёсць ці няма ветру. І прашумяць гэтак журботна, пакуль не ападзе долу аплаканая дажджамі, цяжкая іхняя прыгажосць. Тут, ля бярэзніку і асінніку, здавалася не гэтак панура.

На тэрыторыі, якая была абгароджана дротам, рос малады густы ельнік. За ім не відаць было складоў, ахова якіх называлася нават у гэтую мірную ноч суровымі словамі — выкананне баявое задачы. На час варты Калюгін быў асобаю, недатыкальнасць якое ахоўвалася законам. У мірны час ён меў два магазіны з баявымі патронамі.

Далей сцяжына пайшла ў лагчыну. Стала цямней, здалося, што лес падступіўся бліжэй да агароджы. Гэта табе не макет, дзе лес абазначаны мохам і наўтыканымі сухімі галінкамі. Ды і маршрут здаўся бясконца доўгім. Калюгін прыпыніўся ля варот, праз якія быў уезд на склады, праверыў замок і пломбу, пайшоў шпарчэй.

Калі вярнуўся да таго месца, дзе заступаў на пост, зірнуў на гадзіннік: ішоў зусім мала часу, але ў плечы аж цёпла стала.

На другі круг Калюгін пайшоў павальней. Не было ранейшае ўпэўненасці і спакою. Міжволі ён прыглядаўся да лесу і меркаваў, адкуль лягчэй падкрадацца да вартавога. Аказалася, што хоць і выцерабleны лес абапал, а мясціны такія былі. Сям-там падняліся на высечцы кусцікі, за якімі можна было прытаіцца.

Калюгін нават прыпыніўся і прыгледзеўся да высакаватага крушынавага куста. Таму, што доўга прыглядаўся, здалося, што куст варухнуўся, нават не сам куст, а адна галінка — як хто адхіліў яе рукою і неасцярожна адпусціў.

Калюгін аж здрыгануўся, што гэтак гучна пстрыкнуў у цішыні засцерагальнік аўтамата, які рука сама сабою пераняла на «агонь». Перавёў дыханне, азірнуўся і стрымаўся, не адвёў затворную раму і не даслаў

патрон у ствол. Не здымаючы руку з аўтамата, пайшоў наперад, бліжэй да куста. За кустом нікога не было. З палёгкаю ўздыхнуў і пайшоў далей. Крыху лягчэй і смялей стала, што перамог сябе.

Пасля трэцяга круга Калюгін адчуў сябе зусім упэўнена. І па баках ён пачаў пазіраць ленавата — не дарэмна верылася, што ён не такі, як астатнія.

Ля варот Калюгін пастаяў, прыслухаўся. Роўны лесавы пошум цяпер не перашкаджаў слухаць. На шашы, быццам здалёку, з-за свету, шумелі машыны, толькі зрэдку, як перагаворваліся, коратка абзываліся сігналамі. Машынны шум быў нядоўгі, усё роўна, як марская хваля накочвалася і адкочвалася з камяністага берага. Гэтыя жывыя гукі супакойвалі, пачынала думацца пра казарму...

Калюгін аж сцепануўся ад кароткага блізкага шоргату галін, зноў пстрыкнуў засцерагальнікам, прыпаў на калена за слупком агароджы. Усім целам адчуваў, які тонкі слупок, як нельга схавацца за ім. Вочы тым часам напружана глядзелі ў лес, туды, дзе нехта шаснуў галлём, як гэта бывае, калі чалавек перабягае ад куста да куста. Нічога не відаць было за яловымі шатамі.

Калюгін староннім вокам адтуль, з цемры, зірнуў на сябе, вялікага, асветленага ліхтаром. Як непатрэбна было гэтае святло! Але асвятленая паласа і не давала зараз нікому падкрасціся да дроту. На гэтай паласе вартавому можна каго хочаш спыніць аўтаматным агнём. Аўтамат у руках цяпер здаваўся самаю блізкаю жывою істотаю.

Калюгін нарэшце заўважыў слабы подсвет у цемры, як бытта нечае вялікае вока глядзела на яго, цікавала за кожным рухам. Мякка, горача апала ў грудзях сэрца. Дакладным рухам Калюгін наставіў аўтамат туды, правёў пальцам па засцерагальніку — ці на аўтаматычны агонь пастаўлены, але затворную раму было страшна адцягнуць, каб загнаць у ствол першы патрон,—

здавалася, на ўвесь лес кляцне яна. Хацелася, каб першым варухнуўся той. Прыйшло нейкае паляўнічае супакаенне, якое бывае, калі высачыў звера. У душы нават успыхнула ўрачыстае прадчуванне перамогі.

Невядома, колькі гэтак праседзеў Калюгін. Здранцвелі рукі, перасохла ў роце. Калюгін апусціў аўтамат, расслабіў рукі. Невядомае вока гэтак жа роўна глядзела на яго з-за куста. Ніякага руху там не прыкмячалася. Калюгін паварушыўся, устаў. Страляць пакуль што не было прычыны, але і стаяць на месцы больш нельга. З жахам Калюгін падумаў, што, пакуль ён сядзеў тут, можна было з другога боку даўно пранікнуць на склады!..

Калюгін ступіў наперад.

Пад кустом нешта шорхнула. Мяккі абрыс птушкі слізгануў паўз лес і знік.

Больш нішто не варушылася ў кустах і ніхто не кідаўся ні на Калюгіна, ні наўцёкі. Цяпер Калюгін ведаў, адкуль быў той шоргат, але ўсё роўна не спыняўся, шпарыў па маршруце, спыніўся толькі, як абляцеў наўкруга. Дрыжалі рукі і ногі, нават усё ўсярэдзіне трымцела.

Калюгін пачаў прыглядацца да таго месца, адкуль на яго глядзела невядомае вока. Ступіў крок наперад, убок, крыху нахіліўся — і пад кустом зноў бліснула, толькі не гэтак грозна і не гэтак таямніча: магчыма, пад кустом адсвечвала ў святле ліхтара парожняя кансервавая бляшанка.

Цяпер Калюгін пачаў яшчэ ўважлівей прыслухоўвацца да лесу. Акрамя ягонага роўнага пошуму, жылі ў начы і карацейшыя гукі. Нешта тоненька піскала, а то незнаёмым голасам і ўскрыквала ў лесе. Нават спаважныя ніжнія яловыя лапы ні з таго ні з сяго раптам пагойдваліся, і Калюгін ведаў, што гэта не звер ці чалавек кратае іх, а нячутны вецер завіхраецца на высечку. Пасля перажытага страху лес здаваўся раднейшым.

Во было б, каб усчаў страляніну! Калюгіна аж у жар кінула ад думкі, як ён мог «праславіцца». Такое ў салдацкім гурце не забываецца. Ды крыху і прыкра было ад тае свае самаўпэўненасці, ад пераканання, што ён не такі, як усе, лепшы. Цяпер прыйшла другая, сталая мужчынская ўпэўненасць. І нават пра Бабкова, які некалі быў напалохаўся на гэтым пасту і зычыў гэтага Калюгіну, не думалася звысака. У чымсьці Калюгін разумеў яго і спачуваў, хоць і не мог даравацць тое зласлівасці, з якою Бабкоў радаваўся, што і яшчэ нехта спалохаецца.

Насупраць асінніку Калюгін пастаяў, прыслухаўся: нешта капашылася ў лісці. Калюгін не ўтрываў, падняў камень і запусціў туды. Птушка выхапілася на крыло, паляцела ўздоўж высечкі, шырока раскінуўшы крылле і звесіўшы доўгую дзюбу. Такіх птушак Калюгін бачыў аднойчы дома, у калгасным садзе восенню.

Яшчэ здалёку Калюгін зразумеў, што змена чакае яго, зірнуў на гадзіннік — гэтак хутка праляцеў час!

Роўным і спакойным, нават крыху стомленым голасам ён здаў пост, паволі пайшоў апошнім у калоне да машыны. Потым па камандзе Галубка нетаропка разрадзіў зброю — хай ведае развадзячы, што ў ствале няма патрона! Але Галубок, як і звычайна, уважліва праверыў, ці разраджана зброя, даў каманду садзіцца ў машыну.

Толькі ў машыне, прытуліўшыся плячыма да борта, Калюгін адчуў, што стаміўся, што, як дадому, хочацца ў каравулку, дзе цёпла і светла, дзе сябры-салдаты і дзе перад заступленнем на пост ёсць такія мяккія, абцягнутыя па фанеры новым дэрмацінам тапчаны.

# ЭЦЮДЫ ВЯРТАННЯ

## ЗІМОВЫЯ ЛЕБЕДЗІ

Мы сядзім з дзядзькам Адамам на яловых лапках ля невялічкага цяпельца на ўзлеску, дзе невысокія замеценыя кусты ядлоўцу і рэдка параскіданыя елачкі.

Ужо амаль поўдзень, і поле пад снегам свеціцца невыносна чыста і ярка, як і вясновыя снягі адсвечваюць пад сонцам вясною. І толькі на далёкіх лагчынках прыпала да снегу, не знікла яшчэ тоненькая, шэрая, як і дымок ад дзедавае самакруткі, марозная смуга. І не адчуваецца сонечнай цеплыні за гэтым халодным паветрам, якое быццам застыла ад марозу і стала нябачным празрыстым ільдом.

Мы «вытупалі» аднаго шарака ў полі, на замеценым снегам лужку з парыжэлаю зімоваю асакою. Шарак выскачыў вялікі, мацёры, і збіў дзядзька яго на бягу не так ужо і зблізку.

Дзядзька курыць самакрутку — доўгую і тоўстую, на цэлую гадзіну хопіць, каб дыміць. У самасад ён расцёр цыгарэту, якою я частаваў яго. Ен састарэў, згорбіўся, высах і стаў зусім маленькім і лёгкім. Яшчэ мінулыя гады ён чыста галіўся, а зараз твар яго пакрыты густым, сівым, як густы іней, шчаціннем, якое ён голіць толькі па святах. Але апрануты лёгка, у адну куфаечку, у якой расшпілены верхні гузік, і на худой жылістай шыі няма шаліка.

Дзядзька глядзіць удалечыню, і вочы яго слязяцца ці то ад сонца, ці то ад дыму, ці то ад старасці.

— Скора пачне гуляць заяц. Пайшлі на балотцы, а зараз будуць выбрыкваць на полі па дваіх.

І з нейкім шкадаваннем пагладзіў мёртвае цельца звярка, які ляжаў побач на снезе, выцягнуты і непрыгожы.

Дзядзька паглядзеў удалечыню, у высокае і чыстае неба.

— Гадоў мо восем назад было. Ат якраз гэтая пара недзе была, марозік яшчэ мацнейшы ціснуў, іней быў, такі марозны туман над зямлёю, ад якога аж застые ў грудзях. Раніца. Сонца толькі пачало падымацца, і туман быццам крывёю чуць адсвечвае. Ціха, мёртва, і я ў гэтым тумане, і поле, толькі далёка засыпаны снегам лес, і на ім таксама барвовыя водсветы.

І раптам нібы заблудзіўся хто і ўсё далёка гукае ў тумане «оу-ля-я!», «оу-ля-я!». І голас такі адзінокі, прастуджаны, і нібы не з зямлі чуваць, а аднекуль з неба. «Оу-ля-я!», «оу-ля-я!» — толькі больш хрыплы і з гэтакаю роспаччу і адчаем.

У мяне аж мурашкі па спіне прабеглі, стаю на ўзгорку якраз, па баках азіраюся, а нікога не відаць, толькі гэтыя адзінокія галасы і цішыня, холад.

І раптам, зусім недалёка, нізка над зямлёю вынырнулі з туману чатыры вялікія белыя птушкі, стомлена, павольна варушаць крыллем. Заўважылі мяне, шарахнуліся ўбок, крыху падняліся вышэй і неўзабаве прапалі ў тумане. А я і зараз памятаю, як цяжка было ім махаць крыллем, якія яны былі нетутэйшыя, чыстыя. Нібы чалавечыя душы праляцелі над зямлёй.

Дзядзька дакурыў цыгарку і кінуў недакурак у вогнішча.

— А што далей?

— Нічога. Што можа быць далей. Дома пацягнула за язык сказаць старой, а тая напала на мяне, што надумаўся смяшыць людзей, як у таго Палікара Бараноўскага, за Азярною гарою арабскія коні пасуцца. І праўда, адкуль тут тыя лебедзі? А што чалавечыя душы, то зусім скажуць, што здзяцінеў чалавек на старасць год.

Недзе праз тыдзень выйшаў я на Імшанцы, дзе адзін плёсік не замярзае. Там нікога не было, толькі белы пух прыцярушаны снегам валяўся, далёка яго раздзьмула

па чырвонай асацэ... Лісу тую, што там прамышляла, я тады дабраў усё-такі, злосць мяне ўзяла. Не думаю, што яна ўсіх там заглуміла, можа, аднаго, а можа, адну пару — яны, гавораць, адно без аднаго не могуць жыць... А жывыя, мабыць, яшчэ доўга-доўга ляцелі ў холадзе і марозе, пакуль не прапалі.

Дзядзька моўчкі падняўся, закінуў за плечы здабычу, пачапіў на плячо ствaламі ўніз сваю старэнькую стрэльбу.

— Ты пахадзі яшчэ, можа, таксама вытупаеш, а я не буду замінаць табе, пакуль дадому дацягнуся.

— Ды што там! Пойдзем разам!

Мне і на самай справе нечаму не хацелася больш ісці, каб застрэліць, гэта раптам перастала мець усялякі сэнс — здабыча, тое, што табе будуць зайздросціць. І ўсё ж я застаўся, засыпаў снегам шэрае і цёплае вуголле нашага агеньчыка, паклаў у ствалы набоі. Калі адышоўся ад лесу, бачыў з узгорачка, як паволі ішоў па бясконцым сонечным полі чалавек, і самым лепшым успамінам з усяго пражытага жыцця былі вялікія і чыстыя, як чалавечыя душы, птушкі, якіх ён бачыў толькі адзін раз.

## ЖЫТНІКІ

Падняўся Дзямідчык на пачатку шостай гадзіны, ціха апрануўся.

У горадзе было нязвыкла ціха і пустэльна, мокрыя ад начной вільгаці тратуары, бязлюддзе на аўтобусным прыпынку. І аўтобус амаль парожні, кандуктарка не на сваім высокім сядзенні, а на заднім, дзе цяплей і можна прыдрамаць. Яна толькі адным вокам глянула на Дзямідчыка. На пярэднім сядзенні старэнькі ў выгарэлай да шэрага старой чыгуначнай форме, з пасудзінаю — таксама па грыбы; пажылая жанчына ў квяцістай шырокай сукенцы прытрымлівала нагою плецены кошык,

прыкрыты зверху хустачкаю, побач на сядзенні сумка з хлебам і батонамі,— недзе начавала ў знаёмых, не паленавалася на першы рэйс.

Дзямідчык паглядзеў на старога. Той, пэўна, не першы раз па грыбы.

За горадам пайшла пустая ад машын шаша, прамільгнулі адна за адною дзве вёсачкі, прыціхлыя і сонныя, за вёсачкамі пачаўся лес, спачатку малады няроўны ельнік, потым сасоннік, а далей абапал дарогі пайшоў гонкі беразнячок у перамешку з асіннікам, запахла вільгаццю, здароваю і свежаю, тонкім водарам лістоўнага лесу, спелае роснае травы.

Стары заварушыўся, пачаў углядацца ў акно, хуценька ўстаў, нешта сказаў шаферу, і аўтобус пачаў збаўляць хуткасць. Дзямідчык таксама падаўся на выхад. Кандуктарка жыва паднялася:

— А за праезд?

Дзямідчык падаў грошы і не чакаў рэшты — аўтобус спыніўся, і стары шуснуў на дарогу, хуценька пайшоў у лес, не азіраўся, толькі глуха зашастаў веццем.

Дзямідчык падаўся ўслед назіркам. Густое бярозавае вецце адразу ж абдало холадам расы, стаў мокры плашчык, зачмякалі пры кожным кроку кеды.

Стары нечакана знік. Дзямідчык пастаяў, прыслухаўся — нічога не чуваць. Затаіўся стары. Падмывала па слядах знайсці старога, потым успомнілася, як некалі сам не любіў, калі хто спрабаваў увязацца следам. Ды і запамінаць трэба, у якім баку дарога, а то назад не выйдзеш.

На першы грыб ён ледзь не наступіў — чорнагаловы, на тоўстай моцнай ножцы, ён сядзеў амаль на самай сцяжынцы, захілены папараццю, здавалася, навідавоку — і непрыкметны сярод сухога дубовага лісця, у неглыбокім зялёненькім імху. Дзямідчык радасна прысеў, расхінуў мох, акуратна, нізенька падрэзаў ножку, пачаў таропка расхінаць мох вакол і засмяяўся з

6 Зак. 2732

сябе — не было больш грыбоў на гэтым лясным месцы.

Яшчэ раз паглядзеў на грыб — чысты, з гладзенькаю шапкаю, раздзеленаю напалам беленькім тонкім шрамам,— не давала падняцца ад зямлі травінка.

Больш ён не памятаў пра час, не падымаў галавы — кружыў і кружыў па лесе няспешна, пільна, і каб не даўні навык, не памятаў бы, з якога боку зайшоў у лес. Вочы хацелі бачыць толькі адно — карычневую шапачку над імхом. Тады ён асцярожна разгортаў сапрэлае лісце, вызваляў доўгую крамяную ножку ад сырое, пакрытае грыбною цвіллю зямлі, і там туліліся два або тры маленькія грыбкі-дзеці, беленькія і мякенькія, якія ні разу не бачылі ні сонца, ні папараці, ні доўгае травы. Дзямідчык акуратна закрываў іх мохам у цёплай іхняй калысцы.

Ён не заўважыў, калі выйшаў да густога, нестарога ельніку, суха высланага ігліцаю, якую нават не кранула ранішняя раса. Пастаяў, усё ж рашыў праверыць. Прыкрыў вочы сагнутаю ў локці рукою, асцярожна праціснуўся між абламаных сухіх і вострых галінак.

Пад ельнікам узяў толькі два белагаловічкі — чашчавікі. Не пара на іх, не прамачылі летнія дажджы зямлю пад яловымі шатамі. Пойдуць яны ў рост, калі задажджыць, цёпла, надоўга затуманіць восень.

Зноў Дзямідчык хадзіў, кружыў па бярэзніку, дубнячку, па тых самых мясцінах, дзе быў,— і знаходзіў грыбы. Некалькі разоў праходзіў і не заўважыў, як сіліліся адсунуць убок старую лясіну тры баравікі, уперліся спаднізу плячыма, аж не вытрымалі, прыгнуліся з натугі таўсматыя ножкі, два выбіліся да сонца, пакалечаныя і моцныя, прыгожыя сваёй велічынёй і сілаю, як спрацаваныя рукі старога чалавека. А трэці падпёр лясіну ўсёй спіною, узяў на аднаго непасільны цяжар. І не паднялася яго галава да сонца, зраслася разам з ножкаю ў адзін мускулісты камяк — цяпер калі даць



і сонца і прастору — не хопіць сілы выпрастацца і жыць.

З асцярогаю і павагаю брау Дзямідчык грыб.

Ён не заўважыў, калі паднялося сонца і раса засталася толькі ля самае зямлі, у цяньку ад травы, не заўважыў, што даўно стала горача, і высах балоневы плашчык на плячах, і пад ім прамокла ад поту кашуля, спыніўся, калі не было больш куды класці грыбы. Зірнуў на гадзіннік і адчуў, што баляць ногі, хочацца піць, стукае ў скронях ад стомленасці, і лес звініць тонкімі і чыстымі птушынымі галасамі.

Сеў у цяньку пад маладым дубам.

Дадому не спяшаўся, паволі брыў лесам, прывычна пазглядаў пад ногі. Дарогу не выбіраў, выйшаў да шашы напрамкі, на абочыне прысеў і акуратна пераклаў грыбы, на самы верх большыя і прыгажэйшыя, падумалася, як добра ў горадзе яны будуць пахнуць лесам.

Людзей у аўтобусе, як і раніцою, ехала нямнога — на работу ад'ехалі, а з работы не пара.

Ён толькі ступіў на прыступку, як дзверы зачыніліся і аўтобус крануўся, і ўсё ж за гулам матора Дзямідчык пачуў ціхае, як здзіўленне: «Ой!»

Кандуктарка, пажылая поўная жанчына ў вішнёвай шарсцяной кофтачцы з дробным, бледным тварам у вяснушках, збянтэжана ўсміхнулася Дзямідчыку, працягнула руку і лёгенька дакранулася да грыбоў. Ён падаў ёй верхні, самы прыгожы, і бачыў, як засвяціліся зялёным агеньчыкам вочы жанчыны, молада і весела, нібы падарыў ён ёй шчасце. Яна пагладзіла рукою аксамітна-халаднаватую шапачку грыба лёгенька і асцярожна, як дзіця па галоўцы, усміхнулася і быццам апамяталася — сышла з твару ўсмешка, патухлі вочы, збегліся да іх маршчынкі. І вочы глянулі на Дзямідчыка журботна, удзячна. Яна паклала грыб назад у кошык, і ён заўважыў, што пальцы ў яе тонкія і ласкавыя.

Уперадзе, на тым ранішнім сваім месцы, сядзеў

знаёмы дзядок. Прымасціўся бачком і вочкамі хітравата касавурыў на Дзямідчыка. На падлозе стаяла знаёмая бліскучая бляшанка з-пад аліфы, прыкрытая пінжаком, падсунутым пад вусілку. Дзямідчык ведаў, што бляшанка поўна грыбоў, і стары не хоча, каб іх бачылі людзі, не па душы яму, што выставіў напаказ свае Дзямідчык — мясціна тут у старога свая.

Дзямідчык толькі ўсміхнуўся, а ў галаве ў яго спяваў тонкі і светлы ранішні птушыны звон лесу...

# АПОВЕСЦІ



# ЧОРНЫ ПАВОЙ

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ —

пра тое, як журналіст выязджае на расследаванне.

Туманоўскі не любіў уставаць рана. Засынаў ён запаўнач, а то і пазней — чытаў дэтэктывы. Сёння ноччу яму сніўся шкілет вялізнага ката з зялёнымі, як фары, вачыма. Кот ганяўся за Туманоўскім, не цяперашнім, а малым яшчэ хлопчыкам Янкам, па ўсёй кватэры, пакуль не загнаў на антрэсоль у калідоры. Ён так ушчаміўся з перапуду на тую антрэсоль, што нават паварухнуцца не мог, не тое што выбрацца назад. А каціны шкілет тым часам прысеў на заднія лапы, смачна ашчэрыўся і скочыў...

Туманоўскі прахапіўся і спрасонку няўцямна глядзеў на будзільнік, які на поўную катушку трашчаў на століку ля ложка. Спачатку будзільнік здаўся зялёным вокам кацінага шкілета.

Туманоўскі ляпнуў рукою зверху па будзільніку, скінуў з ложка ногі, працёр вочы, узяў са століка акуляры і толькі тады ўстаў — высокі, худы. З пакоя ён адразу ж пакіраваў у кухню, паставіў на пліту чайнік, каб закіпела вада,— зварыць каву. Потым выйшаў у калідорчык, паглядзеў на антрэсоль, куды загнаў яго зялёны каціны шкілет, гмыкнуў сам сабе.

Тонка блюмкнуў званок над дзвярыма. Туманоўскі разгублена азірнуўся, крыкнуў: «Адну хвілінку», вярнуўся ў пакой, знайшоў халат, сунуў ногі ў шлёпанцы. Халат быў кароткі яму, вышэй каленяў.

На пляцоўцы стаяла паштальёнка, нафарбаваная і напудраная, як з вокладкі часопіса мод.

— Вам заказное.

Яна смела глядзела на Тумаоўскага сінімі вачыма.

Туманоўскі працягнуў руку па канверт, халат расхінуўся, каб паказаць паштальёнцы-манекену ўсю зграбную кастлявую постаць у шырокіх сямейных трусах.

— Выбачайце...

— Распішыцеся,— паштальёнка ўсміхнулася і падала пакамечаную кнігу ўліку і перавязаную сіняй ізалентай шарыкавую ручку. Потым з гонарам завярнулася і няспешна пайшла па прыступках уніз.

Туманоўскі вярнуўся ў пакой, разрэзаў канверт. У ім быў звычайны аркушык пісьма.

«Дарагі дзядзька Янка!

Я не магу супакоіцца і паверыць, што няма больш жывога бацькі. Мінулы год быў у адпачынку, і бацька так лёгка і весела ўпраўляўся з гаспадаркаю. Маці піша, што павёў прыпінаць цялё, упаў і памёр у алешнічку. А я не веру, што ён проста так упаў і памёр. Якраз жа дождж быў, навальніца. Чаму ў гэты час? Маці піша, што і заключэнні там ёсць, усё, а я не магу паверыць. Напішыце вы мне самі...»

На пахаванні сябра Туманоўскі не быў таксама. Ведаў, што памёр, бо тэлеграму атрымаў толькі пасля вяртання з камандзіроўкі, на пятыя суткі. Збіраўся заехаць у Рудню, але ўсё не даводзілася быць у тым баку. Пісьмо прыйшло з Далёкага Усходу, ад Міхаілавага сына, капітана рыбалоўнага траўлера. Туманоўскі ўсміхнуўся: капітан успамінаўся яму амаль заўсёды ў шорціках і бруднай маечцы. Ён стаяў перад сваім дарослым сябрам і, не зважаючы на тое, што ў хаце былі жанчыны і тая, да каго Туманоўскі тады заляцаўся і меў сур'ёзныя намеры, сур'ёзна дапытваўся:

— Янка, а ты пілаз калошку пісаць умееш?

Туманоўскі расшпіліў свой стары партфель з раман-

таванаю ручкаю, укінуў туды пісьмо. У першым аддзяленні ягонага халасцяцкага спадарожніка ляжалі паперы, а з другога павявала прыемным водарам хлеба — партфель служыў Тумано́ўскаму і гаспадарчай сумкай. Потым схадзіў, адчыніў краны, каб нацякло вады ў ванну, выпіў на кухні кавы, забраў з паштовай скрынкі газеты.

Але не чыталася. Успамінаўся Міхаіл у апошнюю іхнюю сустрэчу. Сівы, нізкарослы, шустры, як хлапчук, ён смяяўся на ўсе новыя ўстаўленыя зубы, расказваў, як яны, ветэраны, ездзілі на прафілактычны агляд у раён.

— Ну, сабіраюць нас, вецеранаў, у бальніцу нашу ўчастковую. А адтуль ужо ў раён разам з медсястрой, ага. А сама вясна, пусціла ўжо. Туман, макрэча. Ждом мы. А таго аўтобуса ўсё няма. Пайшлі мы ў сталоўку. Ну, мы і селі, ці ўжо абедаць, ці і снедаць. Я з Куляшом разам, помніш яго? Ён франтавік. Малады быў, здаровы, возьме качалку ў рукі і зломіць. Пытае ў мяне: як ты яшчэ, Міхаіл? Кажу, нічога. А ясі як, пытаецца. Ну, добра, кажу. А скавараду печанага сала з'ясі з блінцамі? Гледзячы якая скаварада, гавару. З'ем. І я, брат, кажа, вялікую скавараду сала напяку, з'ем усё, кубкам халоднае вады зап'ю — і хоць бы што. Ну, а калі так, то нашто нам правярацца, пажывём яшчэ. А тут ужэ з бальніцы прыбягае Абрамаўна, вецеранаў шукае. Калгасны аўтобусік, што дзяцей у школу возіць, на раён ідзе. Мы з Куляшом так і асталіся. А Васіль, сусед, тры дні яшчэ ў сына ў раёне сядзеў, ледзьве дабраўся дадому, так дарогу пусціла...

Праз паўгадзіны рослы сівавалосы чалавек ў шэрым пінжачку і карычневых штанах, з пацёртым партфелем бадзёра тупаў да трамвайнага прыпынку. Ад яго свежа пахла цыгарэтай, кавай і адэкалонам.

Неўзабаве пасля прыходу на работу Тумано́ўскага ў кабінеце рэдактара ішла наступная гаворка.

— Ну і што гаворыць гэтае пісьмо? Нічога не гаворыць. Пушчу на дзень, з'ездзі на магілу сябра.

Рэдактар сядзеў за сталом круглатвары і лысы, як і належыць быць рэдактару. Равеснік Тумаnoўскага, ён выглядаў намнога старэйшым.

— Мне там трэба пабыць дзён колькі, прыгледзецца.

— Знаеш, Янка, ты нядаўна прыгледзеўся, а шыю мылілі мне.

Рэдактар меў на ўвазе нядаўнюю паездку Тумаnoўскага па пісьму маляршы з будоўлі. У выніку быў напісаны артыкул пра махляроў. Сярод іх быў і сёй-той з абласнога начальства, таму на першым часе шыю мылілі рэдактару за тое, што пусціў матэрыял у друк. Праўда, потым усё ж махляры за сваё атрымалі.

— Не бойся, Павел Нічыпаравіч, я ў нашу газету пісаць не буду. Дабудзеш ты да пенсіі.

— Як ты мне надаеў!

— Нічога, ты цярплівы, пацерпіш.

— Я пацярплю, а ты нікуды не паедзеш.

— Гэта ўсё?

— Усё, гаворка кончана.

Рэдактар пачырванеў ад злосці.

Тумаnoўскі моўчкі паглядзеў на яго з-пад акуляраў і выйшаў з кабінета. Калі ішоў у кабінет да шэфа, ён яшчэ не меў цвёрдага намеру ехаць. Цяпер жа быў перакананы, што не паехаць нельга.

Пасля абеду Тумаnoўскі моўчкі пакінуў рэдактаравай сакратарцы заяву з просьбай даць яму дадатковы адпачынак як ветэрану вайны.

Адвячоркам ён садзіўся ў аўтобус са сваім неразлучным партфелем, у якім ляжаў новы дэтэктыў.

Выйшаў Тумаnoўскі з аўтобуса на перакрыжаванні шашы з гравійкай. Тут жа, у паднавесіку-прыпынку, прачытаў расклад і ўпэўніўся, што апошні аўтобус, якім можна было даехаць да Рудні, пайшоў больш чым

паўгадзіны назад. Цяпер аставалася спадзявацца на якую-небудзь познюю калгасную машыну.

Тумаоўскі стаў на ўзбочыне пры сваім бывалым партфелі. Змяркалася. Машын не было. Зрэдку толькі праносіліся матацыклісты, пакідаючы за сабой пылок і ядавіты смурод. Толькі калі добра ўцямнела, Тумаоўскі згадзіўся з тым, што нідзе не падзенешся, кіламетраў дванаццаць трэба адтупаць пяшком. У гэтым вялікага страху не было. Узышла поўня, вялікая, чырванаватая, невысокая, стала відно, як удзень. Гравійка бялелася, быццам пасыпаная алюмініевымі апілкамі. Пасля змяркання апаў халадок, ішлося лёгка.

Праваруч гравійкі вільготна, у нізкі туманок сплываў вялікі капусны агарод — асушаныя калектары. Злева браўся ў колас ячмень. Цяпер і самому не верылася, што некалі тут былі балоты і прабіраліся па іх толькі па кладках. А немцы не адважваліся да іх цераз гэтае балота нават зімой. Цяпер часам пачынае здавацца, што ўсё перажытае і не з ім было. Вайна асталася за плячыма як нешта вялікае, жудаснае, чаго, здаецца, на свеце і не можа быць.

Не стала і балот, усё менш і менш тых, з кім разам партызанілі. Ён маладзейшы, яму тады было толькі семнаццаць. Тады і Кухта здаваўся яму дзядзькам, хаця быў старэйшы гадоў на дзесяць.

Гравійка пайшла пад узгорак. Тут некалі сярод балота быў грудок — палянка,— парослы лесам. Ён так і астаўся, гэты лясок, рассечаны напал белым нажом гравійкі.

Заняты ўспамінамі, супакоены летняй палявой цішынёй, пахам збажыны, палынку збоч дарогі, Тумаоўскі ішоў спорнай хадой, рады забытай радасцю ўсяму гэтаму. У гэтай радасці было нейкае спадзяванне на будучае такое светлае жыццё, якое толькі пачнецца, якое ўсё яшчэ наперадзе. Спадзяванне было адтуль, з

юнацтва яшчэ, якое пачыналася з лютасці партызанскіх дзён і начэй, з жаху і знішчанай карнікамі сям'і...

Тумаяоўскі аж схамянуўся ад нечаканасці: за метраў трыццаць наперадзе з-за кустоў выйшаў чалавек, стаў пасярод дарогі і чакаў. Чалавек рослы, шыракаплечы, сінтэтычная скураная куртка паблісквала чарнатою пры месяцавым святле. Ён стаяў цвёрда, расставіўшы ногі. Інстынктыўна, толькі на пару крокаў, Тумаяоўскі прыцішыў хаду, чамусьці падумаў, што ў кішэні няма нават складанага ножыка. З белае дарожнае паласы нельга было ўцякаць. Тумаяоўскі ўжо бачыў, што на дарозе не мужчына, а хлопец, з цяперашніх акселератаў.

— У Стараселлі музыка чутна? — папытаўся хлопец.

— Чутна.

Туманоўскі ўспомніў, што чуў музыку, калі праходзіў паўз вёску.

— А вы куды?

— У Рудню.

— Мо падвезці?

— Не, дзякуй, ісці добра.

— Як хочаце, а мы на танцы.

Туманоўскі цяпер заўважыў, што за кустамі ляжаў не адзін матацыкл і там былі яшчэ людзі. Хлопец пайшоў да іх.

Калі Туманоўскі выходзіў ужо з ляска, ззаду рванулі цішыню матацыклетныя маторы. Матацыклістаў было трое, з пасажырамі на задніх сядзеннях.

Ён не заўважыў, што міжволі прыбавіў ходу.

Праз хвілін сорак Туманоўскі звярнуў на Рудню. Вёска спала. Толькі ў драўляным кароўніку на краі вёскі свяцілася акно. Дзверы будыніны былі адчынены, каровы ляжалі ў загарадзе на двары. Не гарэў над вуліцаю ніводзін ліхтар. Пад месячным святлом густою

купаю над хатамі стаялі прысады — старыя раскідзістыя клёны і вязы. Ад іх нават у самую спякоту на вуліцы быў цень і халадок.

ТумаНоўскі спыніўся перад Кухтавай хатай пад разложыстым клёнам. Злавіў сябе, што не верыць у тое, што не Міхаіл адамкне яму дзверы. Варотцы зашчэпленыя. Прасунуў руку між штыкецін, зайшоў на двор, пастаяў. Пад месячным святлом холадна адсвечвалі шыбы вокан. Усё роўна як хата запуставала. Але пры дарозе стаяла вядро з вадой, карытца. Толькі ля парога Туманоўскі здагадаўся, чаго не хапае,— сабакі. Міхаіл заўсёды трымаў сабаку, і той першы абзываўся, калі хто заходзіў на двор.

Туманоўскі пастукаў ціха, потым мацней, пастаяў, паслухаў. Цішыня панавала такая, што было чутно нават, як адчыніліся дзверы з хаты ў сенцы.

— Вера, адамкні, гэта я, Туманоўскі.

— Ты, Іванка?

Шахнула за́мыкла.

Вера першая вярнулася ў хату, пратупала цераз кухню ў зал і выйшла адтуль да Туманоўскага ўжо ў сукенцы.

Гэта была вясковая старэнькая бабка з цёмным маршчыністым тварам, сівымі валасамі.

— Бач, як састарэла я. Даўно мы не бачыліся.

— Не маладзець, а старэць і далей будзем,— толькі і знайшоўся адказаць Туманоўскі.— Маю тыдні два. Думаю, прыеду, пагасцюю. На Міхаілаву магілу зайду.

— Зараз я табе перакусіць чаго гляну. Ты ж з дарогі.

— Не трэба.

— На газе хутка, ты прысядзь.

Туманоўскі прысеў на табурэтку, выцягнуў ногі. З непрывычкі яны аж гудзелі ад хадзьбы.

Потым Туманоўскі вячэраў, а Вера ціха расказвала яму пра сваё:

— Пчол прадала: няма каму глядзець. Хаджу пакрысе на работу. Карову дзяржу, хоць цяжка, але дзяржу. Думаю, можа, хлопец сюды з арміі вернецца меншы. Хай бы тут аставаўся, не ехаў у гэты горад.

Паслала спаць Вера Туманоўскаму на ложку пры акне. Цела гуло ад стомленасці, халодная бялізна прыемна студзіла яго. Але не засыналася. Замінала цішыня. Ён усміхнуўся, рады гэтай разгадцы, і адразу ж пачаў нібы апускацца ў цёплы малочны туман... Але апусціцца так да канца і не змог, прахапіўся ад утробнага рову на вуліцы, зірнуў у акно: пры месячным святле мільгнулі белыя шлемы. Матацыклісты кучаю праляцелі па вёсцы, падняўшы пылу, як чарада кароў, і маторы доўга былі яшчэ чутны за вёскай у палявой цішыні, нудныя, як цыркулярная піла.

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ —

### пра здарэнне ў горадзе, якое не мае пакуль што дачынення да Туманоўскага.

Малодшы сяржант Іванчык паволі ішоў па набярэжнай. У гэтым раёне ён апынуўся выпадкова, не па службе. Тут ён хадзіў, калі патруляваў разам з дружыннікамі. Але то была работа. А цяпер ён глядзеў на высаджаны паўз рэчку сквер. За скверам, цераз вуліцу, стаялі новыя дамы, а ў двары ў іх пааставаліся старыя сады, якія прыгожа цвілі вясной.

Раён ціхі, на ўсю вуліцу адзін бар. Публіка збіралася ў яго не тая, што круціцца ля розных там «гадзючнікаў».

Пайсці ў міліцыю Іванчыка ўгаварыў пасля арміі сусед. Ён служыў у ДАІ і пераконваў, што лепшай работы, чым служба ў міліцыі, быць не можа. Ён і дапамог Іванчыку. Пакуль што Іванчык жыў на кватэры ў цёткі, чакаў месца ў інтэрнаце. Пасля строгае ваеннае дысцыпліны ён цешыўся сваёй самастойнасцю, вялікім

горадам, які быў для Іванчыка прываблівым і загадкавым.

Калі прызнацца шчыра, то Іванчыка цікавілі і гэтыя гарадскія хлопцы ў туга абцягнутых на сцёгнах джынсах, рослыя, дагледжаныя, якія цэлымі вечарамі маглі сядзець у барах, нібыта гэта была ў іх галоўная работа. І дзяўчаты былі пад іх — гэтакія ж выгледжаныя, з аголенымі рукамі і спінамі. Яны адчувалі сябе гаспадарамі і на міліцэйскі нарад не звярталі ўвагі, толькі злёгку касавурыліся. Прыходзілі і кампаніі дзяўчатак па дзве-тры, сядзелі цэлыя вечары за столікамі, пастрэльваючы вачыма. Да іх падсядалі таксама джынсавыя, але ўжо лысаватыя і таўставатыя, нібы крыху пакамечаныя, кавалеры і заказвалі кактэйлі... І хоць розніца ў гадах у паненак і кавалераў была дабраватая, але перад закрыццём бара дзяўчаткі выходзілі разам з новымі кавалерамі пахіхікваючы. Праз некалькі дзяжурстваў Іванчык заўважыў, што дзяўчаткі былі прыкладна адны і тыя ж і што кавалераў яны мянялі даволі лёгка і ўсё пахіхіквалі...

Але найбольш уразіла Іванчыка барменша. Не пажылая, стомленая жанчына, пры якой у бары не адважваліся курыць, не грымела з магнітафона музыка, якая «забівала» залу так, што хоць крычы, як у лесе, а маладая, белавалосая, якую многія проста звалі Валечка. Яна быццам не чула гэтае «Валечкі», зеле́наватыя вочы глядзелі спакойна і роўна, крышку скрозь цябе. Толькі маглі варухнуцца вусны, як у царыцы.

Часам яна выходзіла з-за стойкі, і то, здавалася, дзеля таго, каб паказаць сваю царскую паходку. Іванчыка яна запомніла, віталася, калі ён заходзіў у час дзяжурства, але вочы глядзелі паўз яго, не заўважалі, не бачылі.

Адна з дружынніц, якая жыла ў гэтым раёне, пажаноцку раўніва і зайздросна фыркнула:

— Каралева з рыбінымі вачыма! На таксі на рабо-

ту пад'язджае, дык думае, што сапраўдная каралева.

Дзяўчына была таўставатая, непрыгожая, і ёй, мабыць, таксама хацелася прыязджаць на работу на таксі.

Іванчык не хацеў прызнавацца, што з-за гэтае барменшы ён і зараз, нібыта гуляючы, ідзе да бара. У вымытай адпрасаванай новенькай рубашцы, ён падабаўся сам сабе, калі, выходзячы з дому, зазірнуў у люстра.

У зале ў кутку сядзелі дзве падпітыя красуні і пры іх два цвярозыя хітраватыя кавалеры. У другім канцы залы, дзе былі дзверы ў пасудамыйку, за столікам сядзела беленькая худая дзяўчынка з ярка падфарбаванымі губамі, у светла-ружовай сукенцы, вузенькія шлейкі якой цудам не спаўзалі з плеч. Сукенка ледзьледзь прыкрывала маленькія грудзі. З краю сядзеў сярэдняга росту таўсматы малады хлопец з каротка астрыжанай, «вожыкам», галавой, падобны з выгляду на баксёра. Ля дзяўчыны чуць адкінуўся на спінку крэсла малады мужчына з роўнаю лысінай і доўгімі, вычасанымі на вушы і на плечы валасамі, паверх рубашкі вясёлкава ляжалі на плячах падцяжкі. І барменша бачком прысела да гэтага століка, перад ёй таксама стаяў бакал.

Іванчык падышоў да стойкі, Валя толькі раз коратка зірнула на яго, нават не на яго, а некуды вышэй і збоку, як заўсёды, больш нават і вокам не павяла, працягвала гаварыць, потым устала, адчыніла дзверы і хутка была за стойкай, не спыталася, а толькі падняла галаў на Іванчыка. Вочы глядзелі недзе паўз плячо і не бачылі яго. Не, не прывычнае раўнадушша было ў гэтым паглядзе, а пагарда.

Калі не да яго асабіста, то да такіх, як ён, па другі бок стойкі, якая, як барыкада, аддзяляла іх. Іванчык адчуў, што ў грудзях у яго пачынае падымацца злосць.

Злосць не прайшла і пасля таго, як ён сядзеў за сталом, пакрысе адпіваў з бакала шампанскае. Яно было занадта халоднае і не мела смаку. Тоненькае шкло за-



шарэла ад холаду. Цяпер толькі Іванчык адчуў, што ў бары душнавата, пахне цыгарэтным дымам, і яму захацелася хутчэй пайсці адсюль.

Валя з-за стойкі раптам наструнілася, яе халодныя зялёныя вочы ажылі. Іванчык перахапіў яе позірк і быццам працягнуў яго на вуліцу — там павольна ехаў, уключыўшы левы паварот, сіні «жыгуль».

Іванчык не заўважыў, што кінулі вока на сінюю машыну і лысы мужчына ў падцяжках, і «баксёр».

Невядома, што павяло Іванчыка, але ён устаў і выйшаў на двор, завярнуў за вугал дома. Машына стала ў двары ля металічнай прадаўгаватай скрынкі, у якой дворнікі звычайна хаваюць свой няхітры рыштунак. На двары ні дзяцей, ні дарослых, прыцемна.

Мужчына якраз адамкнуў скрынку, адкінуў цяжкае вечка і з багажніка адна за адною хутка пераставіў тры вялікія сумкі. Іванчыку здалося, што ён пачуў, як глуха стукнула шкло.

У гэтае ж самае імгненне сяржант улавіў лёгкі шоргат чалавечага кроку ззаду, памкнуўся азірнуцца, але нешта цяжка абрынулася яму на галаў, нібы з даху ўпала цагліна.

Мужчына ля машыны нічога гэтага не заўважыў. Ён замкнуў скрынку, сеў у машыну, матор якой працаваў, і паволі, без агнёў выруліў на вуліцу.

П'янаватыя дзяўчаты не заўважылі, калі выйшаў з залы Іванчык, не звярнулі ўвагі і на «баксёра», і на тое, што пасля таго, як той вярнуўся ў залу і нешта сказаў лысаму, той пачаў падганяць сваю беленькую сяброўку, у якой шлеечкі ўжо ніяк не хацелі трымацца на плячах. Кампанія пакінула бар.

Недзе праз паўгадзіны барменша пазваніла ў міліцыю і паведаміла, што ў двары ляжыць міліцыянер. Яна заўважыла яго пасля таго, як зачыніла бар і ішла дадому.

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ —

### пра тое, як ТумаНоўскі пачынае распрацоўваць свае версіі.

Туманоўскі прачнуўся, калі толькі засвятлелася неба. Адчуванне было, што і не засынаў. Стомлена і горача гудзелі ногі. Дзіўна, але за многія гады журналісцкай работы ён не прывык спаць на новым месцы, як гэта ўмеюць людзі, якія часта бываюць у раз'ездах.

Вобмацкам знайшоў на падаконніку акуляры, сеў на ложку, звесіўшы ногі. Гэта была прывычка.

Вера спала яшчэ ў суседнім пакоі. Туманоўскі ўзяў у зубы цыгарэту, але не прыкурыў. Адзеўся і ціха выйшаў на двор.

Рукамыйнік вісеў на плоце, і па саску ў яго капала вада. Туманоўскі злосна паглядзеў на рукамыйнік — мыцца давядзецца халоднай вадой, нікуды не дзенешся, а гэтага ён не любіў. Прыкурыў цыгарэту, прайшоў да варот. Вёска спала, але з нечыйга коміна павявала ўжо гаркавым дымком.

Туманоўскі вярнуўся ў хату, узяў ручнік, збольшага памыўся сапраўды халоднай вадой. Вада, аднак, надала бадзёрасці, і пакуль смактаў другую цыгарэту, ён успомніў, дзеля чаго ехаў сюды і што трэба даказаць упартаму рэдактару. Успамін пра рэдактара надаў бадзёрасці і рашучасці дзейнічаць неадкладна.

Цераз вуліцу, потым па суседскім, зарослым дзядоўнікам і лебядою двары ён пайшоў да выгану. Ён ведаў, што сюдэю на свой агарод хадзіў Міхаіл, і таму прыпінаць бычка ён вёў гэтаю дарогаю, не інакш.

Туманоўскі сам не прыкмеціў, калі перайшоў на прысадзісты бясшумны крок. У брызентавай штармоўцы, турысцкіх чаравіках, ён адчуваў сябе паляўнічым, які ідзе па следзе.

Лёгкі ранішні туманок засцілаў лагчыну. Над ім, як купіны, віднеліся верхавінкі альховых купчастых кусцікаў.

Рудня забудавалася некалі на грудку між балотаў. Яе аточвалі з усіх бакоў зараснікі дрэў, кустоў, і таму, калі яшчэ ў час вайны выходзілі з лесу да Рудні, то здавалася, што яна затулілася, схавалася за дрэвамі. Цяпер перад Тумаоўскім ляжалі роўныя, як сталы, абшары, парэзаныя на калектары канавамі. Гэтыя альховыя кусцікі, уяўлялася, толькі і ацалелі тут, пад самай вёскай. Пацягнутыя туманком палі здаваліся халоднымі і мёртвымі. Толькі зрэдку на беразе канавы стаяла дрэва альбо кусцік. Тумаоўскі паспрабаваў уявіць сябе сярод гэтых палёў зімой, у завіруху, калі на дзесятак кіламетраў навокал ні вёсачкі, ні прыкметы жытла, толькі безаблічныя дарогі паўз магістральныя канавы. Тады, калі ў час блакады на гэтых балотах па партызанах білі нямецкія танкі, здавалася, што можна схавацца за кусцікамі, і ад гэтага было крыху лягчэй, нейкую надзею давалі яны.

Тумаоўскі ступіў насустрач гэтай балотнай пустэчы па разорцы між бульбоўніку. Яму нельга было спяшаць, трэба было ўсё запамінаць і ўсё бачыць. Хаця што заўважаць? Бульбоўнік як бульбоўнік, мокры ад расы, і ад яго прамоклі калашыны. За бульбоўнікам грады з капустаю, а за імі і поплаў. За градамі Тумаоўскі агледзеўся і рушыў далей, да кустоў, дзе павінна быць болей травы і дзе можна цяляці схавацца ад гарачыні ў цень.

Абыходзячы кучы смецця, якую нехта вывез туды, Тумаоўскі зачапіў чаравікам парожнюю бляшанку, і яна загрымела, здалося, як парожняя цыстэрна з гары.

Тумаоўскі прыглядаўся, адкуль можна было высачыць Міхаіла. У кустах пад нагамі слізка ад расы, і торф наліпаў на чаравікі. Тут жа ляжала ўтаптанае ў гразь ламачча, далей, мабыць, зусім пачыналася гразь ад крынічак, якія яшчэ варушыліся ў гэтай лагчыне пад кусцікамі.

Тумаоўскі пачуў, што ззаду, гэтак жа, як у яго пад

нагою, бразнула бляшанка, скочыў уперад, рэзка завярнуўся, але нагу працяў боль, і ён ляпнуўся вобзем.

Нейкі час ляжаў нерухома, прыслухоўваўся, расплюшчыў вочы — зірнуў. Адно шкло акуляраў было залеплена граззю, другім вокам Тумаsucceeded ноўскі ўбачыў сівае барадатае стварэнне, якое спачувальна глядзела на яго сумным спагадлівым вокам, нахіліўшы галаў.

— Гэта ты!..

Туманоўскі гэтак падхапіўся насустрач свайму ворагу, што той спалохана мэкнуў ад нечаканасці і крыўды, гэцнуў убок і даў дзёру.

Пасля Туманоўскі доўга выціраў сваю фацэтную штармоўку ад балотнае руды, чысціў штаны, і толькі пасля, накульгваючы на падвярэджаную нагу, цераз пляцы падаўся дахаты.

Вера, як угледзела яго, аж рукамі ўспляснула.

— А божачкі, што з табой, Іванка?

— Нічога, вот паслізнуўся...

— Раздзявайся... Вой, вой... Я перапаласну, пакуль не засохла руда гэтая.

Толькі за снеданнем Туманоўскі адважыўся запытацца:

— А хто гэта ў вас коз дзяржыць?

— Коз? А, гэта Аляксандр канцавы. Каб жа хоць казу, а то казлішчу. Ён, каб здох, за ім следам цэлы дзень, як сабачка, бегае, а ноччу, як чорт які, сноўдаецца. І ваўка на яго няма. Прыстроіцца ўслед за чалавекам, адале як мэкне, утрупець можна. Цябе не напужаў?

— Не,— пакруціў галавой Туманоўскі, але бачыў, што Вера яму не паверыла і старалася, каб не засмяяцца.

Усё ж пасля снедання настрой у Туманоўскага палепшаў. Дзень устаў ясны і сонечны. Памытае Верай адзенне сохла на плоце, чаравікі на ганку. Туманоўскі ў прыкараткіх Міхаілавых штанах і ягонай сарочцы

спачатку падправіў плот ад вуліцы, а потым заняўся рамонтам веласіпеда. Тэхніка яму магла спатрэбіцца, бо да цэнтра калгаса сем кіламетраў.

Палуднаваў Тумаоўскі наварыстым маладым баршчом і пасля абеду не ўтрымаўся, задрамаў на пару гадзінак, а вечарам з Вераю позна глядзеў тэлевізар. Пра далейшы росшук думак ніякіх пакуль што не ўзнікала. Назаўтра ён зрабіў самае элементарнае — пайшоў да аўтобуса, каб з'ездзіць у райцэнтр, паглядзець медыцынскае заключэнне.

Новенькі «пазік» прывёз Тумаоўскага ў райцэнтр недзе праз гадзіну. У гарадскім пасёлку была асфальтаваная цэнтральная вуліца, а хаты патаналі ў раскошных садах. Усё былое мястэчка хораша аглядалася з цэнтральнае плошчы, якая якраз і ляжала на самым большым узгорку. Але мястэчка было і тое, якое памятаў Тумаоўскі, і не тое, якое яны штурмавалі перад вызваленнем да прыходу армейскіх падраздзяленняў.

Тумаоўскі прыпыніўся перад невялікім атынкаваным шэрай тынкоўкай двухпавярховым будыначкам з шыльдамі абапал дзвярэй. Тады домік гэты быў, здавалася, самы большы і галоўны на плошчы, з чырвонае цэглы, старое, купецкае яшчэ кладкі. З гэтага доміка на Тумаоўскага вочы ў вочы зірнула смерць. Ён потым спазнаў франтавыя дарогі, ляжаў паўгода ў шпіталях пасля мінамётнага ранення, і апошні асколак яшчэ не выйшаў з параненае нагі,— а смерць ніколі не бачыў гэтак блізка, ва ўпор. Яна глядзела на яго аўтаматным ствалом, потнаю і круглаю шчакой і востра прыплюшчаным вокам. Ён толькі адчуў, што не ўспее падняць карабін — аўтаматная чарга перарэжа напал. Ён міжволі заплюшчыў вочы, калі пачуў трэск першага стрэлу.

Стрэліць немец не паспеў. Стрэліў Міхаіл Кухта. Тумаоўскі пачуў, як бразнуў аб брук аўтамат. Потым ён прыходзіў паглядзець на таго немца.

Вяртаўся Тумаnоўскі з райцэнтра адвячоркам, пасля таго, як абышоў, агледзеў пасёлак. Заключэнне было кароткае, лаканічнае, сумнявацца ў ім не выпадала — інсульт, які даўно наспяваў у бадзёрым, але старэчым ужо арганізме. Цяпер толькі і сам Тумаnоўскі ўспамінаў, што Міхаіл жаліўся на тое, што часта баліць галава.

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ —

### пра сышчыкаў, якія загараюць.

Лейтэнант Камар зняў трубку і пачуў насмешлівы, як некалі ў студэнцтве, вясёлы голас Семежава:

— Прывет, Камар! Звініш? Я тут на выхадныя выбраўся ў сталіцу, забягу да цябе. Дасі прытулак аднакурсніку?

У час студэнцтва Камар не быў надта блізкі з Семежавым, ды і той з ім таксама. Аднак пасля, калі Камар астаўся ў абласным упраўленні, а Семежава размеркавалі ў раённы цэнтр, Семежаў часам пазваньваў Камару.

Стройны і чарнявы Паша быў з тых студэнтаў, у якіх клопат узнікаў толькі два разы на год — «пераЖыць» сесію. Астатні час ішоў весела, па-студэнцку. Камар жа з тых, якія не толькі акуратна наведвалі заняткі, але сур'ёзна канспектавалі ўсе лекцыі, пунктуальна рыхтаваліся да ўсіх семінараў. Выкладчыкі лічылі іх сталымі і сур'ёзнымі людзьмі, многім з іх прарочылі надалей навуковую кар'еру, а наконт переваг і пры размеркаванні не ўзнікала і сумнення.

Паведамленне Семежава пра тое, што ён прыедзе на выхадныя, вялікага энтузіязму Камару не надало. Ён знаў кіпучую дзейнасць Семежава пры арганізацыі выхаднога адпачынку, але адмовіць не выпадала.

Камар апрануў светлы адпрасаваны пінжак, які вісеў на спінцы крэсла. Ён ходзіць у касцюме, акурат-

ным, адпаведна пасадзе і званню. Потым прыбраў са стала ў сейф да крыўднага тоненькую папку. У ёй былі матэрыялы пра крадзеж у людзей з хлявоў падсвінкаў, цялят і нават гусей. Перадушылі ноччу ў цёткі гусей і вывезлі на машыне. Цяпер у яго — Камар лічыў, з насмешкай — перапытваліся: «Ну, як там твае гусі?»

Наогул Камар пачынаў падумваць, што яму не так ужо і не пашанцавала. Застаўся ў горадзе, нават кватэру атрымаў, на зайздрасць аднакурснікам, якіх размеркавалі па раёнах. Камар падумваў, што яны прытвараюцца, калі крыўдзяцца на свой лёс, бо пасля запрашалі і на рыбалкі, і па грыбкі, адчувалі сябе там, «дома», гаспадарамі. Ён жа тут быў адзін са следчых у абласным упраўленні, прытым малады следчы. Сур'ёзнае справы яму за чатыры гады так і не траплялася, відаць, прайшлі тыя часы, калі з калгасных кантор выносілі сейфы з грашыма. Ды каб такое і здарылася, наўрад ці даверылі б такую адказную справу маладому следчаму. А так вось гусей шукай, якіх падпіўшыя жулікі ці хуліганы даўно з'елі.

Камар выйшаў з упраўлення. Сонца прыпякала, і не пашкодзіла б праехаць дзе-небудзь да вады, пакупацца. Але ехаць дадому пераадзявацца і тады дабірацца да возера не ставала часу. Выезд за горад Камар планаваў на выхадныя.

Ля пад'езда дома Камара чакаў Семежаў, і Камар падумаў, што планы ягоныя рухнулі.

Назаўтра Камар прачнуўся як звычайна. Праз акно шчодра свяціла сонца. Ён памкнуўся, каб рыўком ускочыць на ногі, але ўгледзеў Семежава, які хораша і нявінна спаў на раскладанцы пасярод пакоя.

Семежаў учора ўсё ж выцягнуў Камара вячэраць у «Ягадку» — параджэнне сучаснае архітэктуры і сучаснага рэстараннага густу. Зала хутчэй нагадвала танцпляцоўку, на якой наставілі столікаў. На пятачку гры-

меў электрычнай магутнасцю аркестр, выгіналася і абцалоўвала мікрафон салістка. Праўда, у зале курыць было забаронена, і курыльшчыкі выходзілі курыць на першы паверх, у хол. Але ўвесь дым падымаўся сюды, у залу.

Семежаў узяўся камандаваць, заказаў вячэру. За суседнім столікам жаночая кампанія адзначала дзень нараджэння сяброўкі. Кіравала імі белазубая, грудастая Вера Іванаўна. Пакрысе жанчыны расхрабрыліся, загудзелі, і Семежаў падабраў момант, запрасіў на танец чарнявенькую сімпатычную імяніннiцу Наташу. Ён, мабыць, нешта нашаптаў Наташы ці жанчынам, бо на адзін з наступных танцаў Вера Іванаўна гулліва выцягнула танцаваць Камара і нават пачала пакрысе «спакушаць». Камар, танцуючы, паказваў кулак Семежаву, але той толькі пасміхаўся. Праўда, пад канец вечара было з чаго пасміхацца і Камару — калі падышла пара разыходзіцца дадому, кабеты неяк надзіва ж хутка працверазелі і ніякіх праважатых мецць не хацелі, у тым ліку і Наташа.

Камар папхнуў раскладанку. Семежаў лыпнуў вачыма:

— Уставай, Наташа званіла.

— Якая Наташа?

— Тая, што не ваша.

— Ану іх!

— Чаго ты так?

— Курыцы сямейныя.

— Ладна, певень, калгасны, пад'ём. Сёння на возера, бяром лодку і загараем.

— Ідзёць, Камарык!

Прапанова спадабалася Семежаву. Прыехалі яны на мора электрычкай пазнавата. Лодкі напракат разабралі, але Паша сумеў прарвацца «да мясцовага кіраўніцтва», і лодка знайшлася, са сцяжком выратавальнай службы.

Першую гадзіну адрабляў на вёслах Семежаў, і Камар зайздросціў і ягонаму загару, і тугім мускулам.

Камар цешыўся вадою, якая цурчала паўз барты лодкі, любаваўся возерам, стракатым пляжам і цішынёй, бо ведаў, што потым Семежаў не змоўкне да канца дня.

Потым на вёслы сеў Камар, а Паша адразу ж пачаў каменціраваць пляжную публіку, у асноўным жаночую. «Коля, глянь, як хораша ляжаць, як галубочкі!.. Якая каралева!» На шчасце, Семежаў не дамагаўся, каб Камар абавязкова глядзеў туды, куды хацелася яму. Гадзіна здалася Камару бясконцай — пот засцілаў вочы, а на руцэ ўсхапіўся і лопнуў мазоль. Але толькі праз гадзіну Семежаў дазволіў Камару прычаліць да невялікага астраўка пасярод возера.

І пакуль той адсопваўся, выцягнуў на бераг лодку, разаслаў на траве коўдру. Потым яны «смажыліся», плавалі, абедалі, зноў плавалі і проста драмалі, нібы зліваліся з травой, востравам, пахам травы, вады, возера...

Праўда, пасля другога перакусвання Семежаў не вытрымаў больш, перабраўся ў цянёк і соладка засоп.

Дадому выбраліся адвячоркам, калі спала гарачыня. Цела прыемна пашчыпвала, але яно было лёгкае, пругкае, памаладзелае ад вады і сонца.

Камар нават ужо не звяртаў увагі на тое, што тараторыць Семежаў, і не здзівіўся, калі ён пацягнуў яго да дзвюх дзяўчат, якія стаялі на абочыне дарогі, чакалі спадарожную машыну.

На здзіўленне Камара, старэйшая з дзяўчат, прыгожая, загарэлая, усміхнулася Семежаву, нават першая здалёк працягнула руку. І на твары яе была шчырая радасць, жаданне бачыць яго:

— Пашка! Адкуль ты тут?

Яна нават прытулілася да яго на нейкае імгненне.

— Валька. Каго я бачу!

— А ты не мог знайсці мяне?
— Я пісаў у тваю школу. Там ніхто не ведаў, куды ты прапала. Дзе ты цяпер? У школе?
— Ну ты што? Потым раскажу.
— А жывеш як? Замуж выскачыла?
— Паглядзіш, як жыву. А замуж?.. Цябе чакаю,— пажартавала яна.
— Знаёмся, аднакурснік мой былы, Мікола. Грозны сышчык Мікола Камар.
Валя падала руку Семежаву, назвала сваю напарніцу:
— Алёна, разам робім.
Алёна была маладзейшая за сваю сяброўку, не гэтакая выгледжаная, але па-свойму прыгожая той натуральнай маладой прастатой, якой не трэба яшчэ прыхарошвацца, умець паказваць сябе.
— Ну што, у горад, дзяўчаты? А на вечар «Свіцязь» асвоім ці яшчэ што? — прапанаваў Семежаў і падхапіў Валіну сумку. Камару не асталося нічога, як узяць сумку Алёны.
— Адстаў ты, Паша, у правінцыі. Рэстаран — пройдзены этап, там як на базары. Больш далікатна цяпер весяляцца, у інтэлектуальнай кампаніі. Я запрашаю цябе ў госці, думаю, твой сябар не пакрыўдзіцца?
Валя ўсміхнулася, але на нейкае імгненне Камару здалося, што ў яе проста таргануліся вусны.
— Пра што ты, Валя?! — замест адказу ўсклікнуў Семежаў.
І Камар адчуў палёгку ад таго, што ніякія мерапрыемствы Семежава яго сёння не захопяць.

Аднак ён памыліўся. На вакзале Валя ўзяла таксі, паказвала шафёру дарогу, разлічылася з таксістам і паперадзе пайшла ў двор, абгароджаны цаглянаю агароджай. У двары ляжалі кучы цэглы, заляпаныя цэментавым растворам дашчатыя шчыты, абрэзкі рэек,

водаправодныя трубы. Добра натаптанаю сцяжынкай між усяго гэтага Валя падышла да пафарбаваных карычневай фарбай дзвярэй, націснула кнопачку званка.

За дзвярыма нібы стаялі і чакалі — яны адразу ж адчыніліся. Чарнявы, хлюсткі хлопец з рэдзенькімі вусікамі мазнуў вачыма па ўсёй кампаніі, павітаўся з Валяй, і яна кіўнула — заходзьце.

Яны апынуліся ў невялікім пакойчыку, ашаляваным вагонкай. На сцяне замест вешалкі былі паўбіваны ў дошкі драўляныя кіёчкі. Вільготна пахла лазняй...

Алёна зайшла апошняй і зачыніла за сабой дзверы на шпінгалет. Яны апынуліся ў невялічкім пакойчыку, ашаляваным вагонкай.

— Валя, што гэта за падземнае царства?

— Гэта не царства. Гэта сучасны рай. Прашу паглядзець, як жыве просты савецкі чалавек. Раздзявайцеся, а мы пакуль што паплаваем у басейне. Вы будзеце плаваць потым.

Дзяўчаты выйшлі з пакоя, зачынілі за сабой дзверы.

Камар паглядзеў на Семежава.

— Павел, што гэта абазначае?

— Амаралку. Лазня разам з бабамі.

— Пайшоў ты! — агрызнуўся Камар.

— Тады раздзявайся. Выпарымся як людзі.

У наступным пакойчыку іх чакаў самавар, прасціны і махровыя палаценцы. У перадбанніку ляжалі на лаве прыгатаваныя венікі, у куце стаяла вялізная дубовая балея, напоўненая халоднай вадой.

— Во, гэта банька!

Калі праз дзве гадзіны Семежаў і Камар дачакаліся дзяўчат у двары, Валя не ўтрымалася:

— Вось так гегемон жыве. Гэта заводскі воднааздаравіцельны комплекс.

Камару захацелася папытацца, а якія адносіны яна мае да гэтага комплексу.

Семежаў на хаду шапнуў Камару:

— Ты правядзі Алёну дадому.

Камар правёў дзяўчыну да аўтобуснага прыпынку і развітаўся.

## РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ—

### пра тое, чым займаўся ў выхадны дзень Міхаль Руды і што здарылася з ім ноччу.

Міхаль спаласнуў касу ў канаве, вылез на бераг. З выгляду гэта быў не дзед, а пажылога веку дужы мужчына з сівымі, коратка астрыжанымі, густымі, як шчотка, валасамі. З касою на плячы ён прайшоў на беразе, па свежаскошанай і разбітай траве, дастаў з-пад травы прыкрытую ад сонца старую гаспадарчую сумку, замест адной ручкі ў якой прывязана аборка. У сумцы ў яго пастаянна ляжаў малаток, запасны клін, банька, мянташка. Паверх сумкі — закручаная ў анучу запасная каса. У сумку з сабою Міхаль браў літровую бутэльку малака, кавалак хлеба і сала.

Берагам канавы Міхаль выйшаў на высыпаную, высакавата паднятую дарогу, якая вяла да самае вёскі. Дарогу зрабілі меліяратары. Яны далі Міхалю апошнія гады і работу — рабіў раманцёрам на каналах, цяпер, хоць і на пенсіі, на адхонах канаў накошваў сена на карову. Рабіць сена на адхоне — гэта не на роўным месцы. Але Міхаль прывык да гэтае работы. Наогул, ён прывычны быў да любое работы і рабіў яе ўдзень і ўночы.

Ішоў Міхаль цвёрда, шырока расстаўляючы ногі. І лад у ягоным жыцці быў гэтакі ж цвёрды і пастаянны. Спаўна сваё адрабіў у калгасе, узяў добрую пенсію. Потым пабыў на канавах — цяпер мае дзе пастаянна касіць сена. Ён не хадзіў у перадавіках, але ніхто ніколі не папракнуў яго. Дома ён меў дастатак і багацце. Заслужана. І гэтым ганарыўся.

Цяпер, калі выйшлі новыя законы, Міхаль заняўся гаспадаркай. Кожнага году ён гадаваў альбо цялушачку, альбо бычка на здачу, двух кармлякоў на сябе і на дзяцей, а двух — на здачу. Дзяржаў яшчэ гусей і курэй. Здаваў многа малака ў калгас — была выгада, меў за гэта камбікорм. Да ўсяго прыкупляў мукі, падкідаў сын на машыне з горада мяшкоў колькі круп. Сын атабарыўся ў Салігорску, не так і далёка, рабіў электрыкам. Міхаль пабудаваў яму кааператыўную кватэру і дапамог купіць машыну. Сярэдняя сама добра ўстроілася — выйшла за ваеннага, мела і кватэру, і добрыя грошы, але гаварыла, што муж гуляў і піў, разышлася з ім. Не прапала адна, працавала ў магазіне і добра зарабляла. Праўда, дадому паказвалася мала, другі раз замуж не выходзіла, і гэта не падабалася Міхалю. Але яна не зважала на ягонае незадавальненне, і ён збіраўся паехаць сам да яе, ды ад гаспадаркі не гэтак лёгка адарвацца. І самая маладзейшая зачапілася ў горадзе, у сталічным. Праўда, не паступіла ў тэхнікум, але ўстроілася на заводзе апаратарам на машынах, якія лічаць. Казала, што завочна паступіла ў тэхнікум. Вялікае навукі ад яе Міхаль і не патрабаваў. Цяпер не той добра жыве, хто вялікую навуку мае, а хто добрую работу сабе знойдзе і ўстроіцца жыць. Гэта ён прыкмеціў. На добры лад, сама лепш цяпер і жыць і зарабляць дома, на вёсцы, але на гэта трэба быць нейкім спецыялістам. Ды ў вёсцы, як ні круці,— гэта не ў горадзе, тут зямля, бруд былі і будуць. А дзеўцы трэба добра выйсці замуж. Алёне ў яго былі гатовыя грошы на кааператыўную кватэру, а да таго часу кончыць і навуку. Дзеўка яна ў яго з віду нічога, доўга не заседзіцца.

Міхаль думаў пра гэта, ідучы з балотаў. Яшчэ ён адчуваў стомленасць. Пахла скошанай прывялаю травой, вадой і ўсё роўна крышку балотам. Гэты пах з'яўляўся заўсёды, калі нізка на захад схілялася сонца. Ад балотнага духу не магла пазбавіцца зямля. Міхаль лю-

біў гэты пах, цішыню, як і сваю дамоўку,— пры гэтым ён вырас, гэтым жыў. Ен ведаў, што ў горадзе ён не вытрываў бы і тыдня. Там не было прастору. Але не шкадаваў, што дзеці пайшлі ў горад.

Хата Міхалёва стаяла з краю. На двор ён пайшоў сцежкаю ад агарода, па пляцы.

У тым, што хата стаяла з краю, была свая выгада,— воля на выган і гусям, і курам. Яны не псавалі дома агарод.

— Каб вы падохлі! Аўсь, лезеце сляпіцаю! — пачуў ён голас жонкі, якая крычала на свіней. Потым было чутно, як пацягнула адну з іх кіем і тая аж віскнула.— Каб вы паздыхалі! Як вы мне надаелі! У магілу мяне загоніце! Аўсь!

Міхаль зайшоў у хляўчук, дзе трымаў запасы камбікорму, павесіў на цвік касу, паставіў сумку. Гэты хляўчук ён збіў на сынаву машыну, пакуль той пабудаваў гараж. Пабудова спатрэбілася ў гаспадарцы.

— Ног за дзень не чую, як калоды сталі! Каб яна здохла, плойма гэтая!

Жонка села на парог, правяла рукою па нагах.

— А я, па-твойму, гуляю,— кінуў Міхаль і, каб не сварыцца, пайшоў з двара: па цялё, якое пасвілася, прыпятае, на выгане.

Потым ён выкасіў у садзе травы карове. Пакуль жонка даіла карову, паналіваў у вёдры халоднае вады з калодзежа, каб было куды паставіць на ноч малако. Перад тым як зайсці ў хату, праверыў, ці зачыненыя хлявы, зашчапіў варотцы на вуліцу.

Вячэралі з жонкаю моўчкі пры ўключаным тэлевізары, скупа перакідваліся словамі. Абое ведалі, што рабіць заўтра, а заўтрашні дзень будзе доўгі, гэтакі, як і сённяшні.

Спаць Міхаль лёг на ложку ў сенцах — там здаравей дыхалася. Заснуў ён адразу — за кароткую летнюю ноч трэба ўспець адпачыць.

Ён і сам не мог зразумець, што пабудзіла яго. Быццам нехта штурхануў пад бок. Міхаль здзіўлена прыслухаўся і пачуў, што на двары нехта ходзіць. Потым свіння рохнула.

«Я ж, здаецца, добра зачыніў дзверы»,— падумаў ён і ўстаў з ложка, выйшаў у веранду і адтуль пачуў, што за хлявом нешта нібы грукнула.

Ужо без усякіх думак ён круцянуў у замку ключ, выйшаў на парог. Свіння хадзіла па двары, дзверцы хлеўчука адчынены. За хлявом на выгане чутна ціхая мітусня.

Міхаль схапіў прыслоены да веранды кій, кінуўся туды. Ён не ўспеў вытыркнуцца за вугал хлява, як пачуў, што нешта храснула, і востры боль так працяў яго ад галавы да пят, што ён зароў немым голасам.

Ачнуўся ён ад таго, што нехта гаварыў да яго і холадна тыцкаўся ў шчаку. У галаве гудзела і трэскалася, нечым клейкім заляпіла ўвесь твар. Міхаль павярнуў галаву, і ад гэтага, здалося, у галаве заварушыліся і стукнуліся два камяні.

Адно вока не глядзела. Другім ён убачыў, што ля яго ходзіць свіння. Міхаль паспрабаваў устаць на рукі, але яны зрабіліся ватныя, і кожны рух тупа аддаваўся ў галаве. Павольна ён папоўз назад на двор, да парога ў хату, успоўз на першую прыступку і адчуў, што далей паўзці не стае сілы.

Рукою Міхаль намацаў гузыр мяцёлкі і колькі ставалася сілы загрукаў у дзверы — разам з фанерай ў філёнкі была ўстаўлена бляха, якая павінна грымець бубнам. Кожны рух аддаваўся ў галаве болем, і хутка ён зноў праваліўся ў чорную яму забыцця...

Ачнуўся Міхаль сярод усяго белага, доўга глядзеў у столь і не мог зразумець, дзе ён і чаго.

— Колькі іх было? Вы пазналі хоць каго? — пачуў ён і ўгледзеў над сабою маладога чарнявага мужчыну

ў белым халаце, нечым падобнага на ягонага Сяргея, успомніў, што з ім здарылася, паспрабаваў адкрыць рот, але ні сківіцы, ні губы яго не слухалі... І апошняе, што асталося ў свядомасці, гэта што мужчына падобны на ягонага Сяргея.

Семежаў выйшаў з палаты разам з доктарам.

— Калі можна яшчэ прыйсці да яго?

— Не ведаю. Цяжкі ўдар. Дзядзька дужы, але ж гэта галава. Усякае можа быць.

— Пазваніце мне, калі з'явіцца такая магчымасць.

Пасля абеду Семежаў калаціўся ў міліцэйскім «козліку» ў Забалацце. Семежаў не ведаў сам, чаго ён яшчэ раз едзе туды. Апытваць болей там не было каго. Знайшоў параненага пастух, калі ішоў выганяць калгасных кароў. Угледзеў, што свіння рыецца ў агародчыку, зайшоў на двор і ўбачыў скрываўленага гаспадара.

Семежаў спыніўся на дарозе, выйшаў з машыны і пайшоў уздоўж дарогі. Яна тут была падсыпана вышэй, і недзе з'езд тае машыны павінен застацца. Хаця даць ён нічога не мог. На сухой зямлі следу ад пратэктара не асталося. З'езду ён так і не знайшоў, бо тут ужо з'язджала некалькі машын, у тым ліку і тая, якая прывозіла аператыўную групу. Ён шукаў месца, дзе магла спыніцца машына. Бліжэй да хлява, але не пад самым ім.

Чырванаватая пляма крыві на траве не знікла яшчэ. Свінню падганялі бліжэй да машыны, значыць, яна стаяла недзе тут, ля гэтае плямінаы. Пасля, калі тушу загрузілі, святла ўключаць нельга было. Машына ехала цёмначы, туды, дзе ўначы відна белая палоска дарогі, напрасткі, каб хутчэй выехаць. Семежаў пайшоў па гэтым уяўным следзе і хутка паклікаў шафёра:

— Васільеў, падыдзі сюды.

Калі шафёр падышоў, папытаўся:

— Што ты мне скажаш пра ўсё гэта як шафёр?

— Машына выязджала на дарогу, што ж тут такога.



7 Зак. 2732

— «Жыгулі» ці «Волга»?

— Не, гэта і не «жыгуль», і не «Волга». Мой «козлік» так след зрабіць можа.

— Чаму так дарогу развярнула коламі?

— А нé — на вялікай хуткасці выскокваў на дарогу, а нé — газануў пры выездзе. А што такое?

— Нічога. Гэта тая машына выязджала.

— А-а, ясна.

Шафёр таксама пачаў прыглядацца да дарогі, але яна больш нічога не магла сказаць яму.

Ужо па дарозе назад Семежаў думаў пра машыну, не пра легкавічка, якіх цяпер хапае ў людзей. Калі «козлік», то машына хутчэй за ўсё належыць нейкай арганізацыі. Як і чаго яна аказалася тут ноччу? Аднак гэта практычна нічога не давала і нікуды далей не выводзіла.

Успомніўся ранішні званок ад Камара. Семежаў пачаў, як заўсёды, жартам:

— Што, Камар, зноў ідзём у баньку з масажам?

Семежаў са студэнцтва не мог прайсці міма Камаровай сур'ёзнасці і правільнасці ва ўсім. Ён памятаў, як на першым годзе Камар амаль паўгода ўсіх папраўляў, калі называлі ягонае прозвішча. Яму хацелася называцца больш сур'ёзна — Комарам.

— Банька будзе. Цяпер і табе, не толькі мне.

— Што, табе нагарэла? У цябе ж, гавараў, гэтыя гусі ў папцы ляжалі. Умець трэба.

— Вось, вось, Семежаў, умець трэба. У мяне гусі, а ў цябе разбітыя чалавечыя галовы, і ніякіх слядоў не знайшоў. Пяткевіч прасіў пазваніць табе і перадаць, што мы чакаем ад цябе...

— Будзе новае — далажу.

— Будзь здароў.

— Будзь здароў.

Семежаў успамінаў гаворку і яшчэ са злосцю падумаў пра Камара — знайшоўся ўмелец, толькі што шта-

ны праціраe ў абласным упраўленні. Хаця яму, відаць, нагарэла сапраўды болей, чым Семежаву.

Трэба ўмець... Семежаў аж схамянуўся: зразумеў тое, што не давала спакою і чаго ён ніяк не мог вылучыць — чаму не крычала свіння? Каб забіць яе гэтак, трэба ўмець.

Але ўсё гэта не факты і не рэчавыя доказы. І не выхад на след злачынцаў.

А наогул, чым прападаць тут у раёне, ці не сапраўды атабарыцца дзе ў горадзе? Ажаніцца з тою ж Валяй. У яе неблагая кватэра, знайсці работу дзе-небудзь, як Камар, збіраць звесткі і перадаваць даручэнні па тэлефоне. Але Семежаў ведаў, што з гэтага ў яго нічога пакуль што не будзе, ды і з Валяй яшчэ ў студэнцкія гады знаёмы быў не толькі адзін ён...

Трэба шукаць злачынцаў, гэта яго работа.

## РАЗДЗЕЛ ШОСТЫ —

пра тое, як Тумаnoўскі міжволі пачынае займацца журналісцкай работай.

Пра сваю паездку Тумаnoўскі нічога не сказаў Веры. Раніцаю ён выйшаў прайсціся за вёску і доўга прыглядаўся да абшараў былых балот. Па-летняму квола слаўся мясцінамі над імі туманок, і, можа, ад гэтага балоты здаваліся яшчэ больш неабсяжнымі. Над імі прывідна ўсплывалі груды́, парослыя бярэзнікам, алешнікам, зараснікамі крушыны, маліны, ажыны. Здавалася, што нешта таямнічае хаваюць у сабе гэтыя пустыя абшары. Можа, таму, што памятаў ён балоты, парослыя рэдзенькай рудаватай асакой, залітыя вадой, памятаў з часоў вайны, ведаў, што і былыя сцежкі, і былая багна пахавалі ў сабе назаўсёды шмат людскіх таямніц і смерцяў. Пасля таго, як спусцілі з балот ваду, як асела багна, таямніцы не пакінулі зямлю, яны ўвайшлі ў яе, залеглі спрасаваным торфам і чакаюць

свае пары пад дзірваном травы. І начамі з гэтых балот, мабыць, прыходзяць да мясцовых людзей успаміны.

У час снедання Вера паведамляла Туманоўскаму навіны. Адкуль і калі, па якім тэлетайпе яна атрымлівала іх, Туманоўскі не ведаў. Здаецца, нікуды і з двара не выходзіла.

— Чуў, што ў Рудні ноччу было? Старога Міхаля амаль забілі.

— За што?

— За што? Кармляка прыехалі красці. Ночы з хлява выгналі, закалолі і на машыне павезлі. Ён, мабыць, пачуў, выбег. Яго па галаве калом гэ́так трахнулі, што наўрад ці выжыве, кажуць. Дзіва што, цяпер гэтых матацыклаў і машын. І к нам панаязджала ў калгас з усяго свету. Некалі адзін аднаго ведалі. І сваіх лайдакоў хапае, але свае чалавека б не білі.

Удзень Туманоўскі папраўляў плот. Гэта спачатку яму здалося, што толькі ў адным месцы трэба некалькі калоў прыбіць, але як зачапіў, то па парадку і правіць давялося. Туманоўскі рабіў работу з задавальненнем, адчуваў сябе майстрам і нават спрабаваў убіць цвік трыма ўдарамі. Праўда, цвікі не зусім хацелі прызнаваць ягонае майстэрства і весела выгіналіся пад малатком.

— Іванка, ты адзенься, а то абгарыш,— папярэдзіла яго Вера, але Туманоўскі не паслухаў яе і вечарам, пасля таго як памыўся халоднай вадой да пояса, адчуў, што дарэмна,— плечы гарэлі.

Пасля вячэры ён бадзёра круціў педалі да цэнтральнае сядзібы, бліжэй паглядзець на тых, хто прыехаў і хто жыве цяпер у калгасе. Па дарозе ля меліярацыйных канаў абдавала прыемным халадком, затое за ўзгоркам абдыхвала цяплом, як з добра напаленае печы. І пахла збажыной, полем.

Насыпаная высакаватая гравійка да цэнтральнае сядзібы ішла з вясковымі агародамі. На цэнтральнай

мясцілася майстэрня і машынны двор, па другі бок дарогі новая калгасная кантора, за ёй Дом культуры, магазін, прыёмны пункт бытпаслуг, а далей роўна выстройваліся двухпавярховыя катэджы. І кантора, і Дом культуры, і магазін, і ўся вуліца былі абгароджаны акуратным штыкетнікавым плотам. Не ў самім Доме культуры, а на яго́ных прыступках размясціўся, відаць, мясцовы эстрадны аркестрык з апаратурай, аблытанай правадамі. Двор Дома культуры быў забіты моладдзю. Пакуль Тумаоўскі даехаў да клуба, яго абагнала некалькі матацыклістаў. З уключанымі фарамі, яны ляцелі, як на гонках. За машынным дваром, далей, па другі бок вуліцы выходзіла пляцамі да гравійкі вёска, нібы адвярнулася ад гэтай моднай музыкі.

Ля платоў паблісквалі нікелем матацыклы. Некаторыя з іх гыркалі маторамі, перакрываючы нават і музыку, вырываліся з двара. Пад'язджалі новыя паненкі і кавалеры. Веласіпед Тумаоўскага сіратліва прытуліўся побач.

Вакол танцораў, на лаўках, якія павыносілі з Дома культуры, сядзелі старыя і пажылыя жанчыны. Мужчыны тоўпіліся кучкамі і нечага чакалі.

Туманоўскі прыкурыў цыгарэту, прайшоўся. Нікога ён тут не пазнаваў, ды і яго ніхто пазнаць не мог. Моладзь танцавала, лашчылася адно да аднаго. Цяпер гэта нікога не здзіўляла, ды і моладзь была з усяго наваколля. Маладым весела, яны мелі інтарэс да танцаў, пра якія ўжо забыўся Туманоўскі.

Пасля кароценькага перарыву адзін з аркестрантаў узяў у рукі мікрафон і аб'явіў, што па жаданню госцей, якія прыехалі на вяселле, выконваецца вальс, і сам спяваў з асаблівым пачуццём:

А я лягу-прылягу
Край гасцінца старога...

— У каго гэта вяселле, цётка? — папытаўся Туманоўскі ў жанчыны, якая сядзела з краю. Цёткі заўсёды

і ўсё ведалі, і галоўнае, ім хацелася расказаць пра тое, што ведаюць.

— У Мікалая. Дачку замуж аддае.

Цётка была недзе аднаго ўзросту з Тумаоўскім.

— А кім яна робіць?

— У Мінску. Нейкая там фабрыка-кухня ёсць...

— Гэта з Мінска гасцей гэтулькі наехала?

— Цэлы аўтобус. Цяпер менш не прыязджае. А на матацыклах з усяе акругі. І студзенты тут, і шэфы на рабоце, і свае, калгасныя. Каб толькі хоць біцца не пачалі. Хіба студзентаў пабаяцца, бо ў тых тут цэлы атрад, і здаровыя хлопцы, кажуць, спарцмены...

— Давайце, цётка Алена, выпіце чарачку!

Тумаоўскі азірнуўся. Малады мужчына, перавязаны ручніком, падаў жанчыне чарку.

— Вой, Колечка, нашто ты мне так многа наліў? — цётка, аднак, узяла стограмоўку.

— Бяры, дзядзька. За здароўе маладых...

Сваха, якая несла за сватам сумку з пірагамі, падала гарэлку і Тумаоўскаму.

— Што вы,— разгубіўся ён ад нечаканасці.

— Бяры, дзядзька. У магазіне такое не прадаюць. За маладых выпі.

— Дзякуй табе, Колечка. Хай здаровенькія маладыя будуць, дзеткам хай цешацца. Выпівайма, дзядзька,— жанчына стукнула сваёй стограмоўкай у шклянку Тумаоўскага.

Яму спачатку здалося, што рот і горла апякло кіпнем, і пакуль дапіў шклянку, на вачах аж выступілі слёзы. Сваха сунула ў руку кавалак хлеба з мясам.

— Ну як, дзядзька? Яшчэ мо кроплю? — папытаўся сват.

— Не-е, дзякуй,— прамармытаў Тумаоўскі.

— Балбочаш лішне, гэта ж той карэспандэнт, што прыехаў,— пачуў Тумаоўскі, як сваха ўшчувала свата.

— Ну і што? Цяпер і без карэспандэнтаў усе пісаць умеюць.

Сват разносіў пачастунак па крузе. Цяпер Тумаоўскі разумеў, чаго чакалі мужчыны.

Пасля выпітага Тумаоўскаму здалося, што музыка пачала іграць цішэй. І ў гэтым тлуме цяжка было адрозніць, хто гарадскі, хто свой, вясковы. Потым заявіліся і ўчастковы з сумкай-планшэткай, і трое хлопцаў з чырвонымі павязкамі. Усё было, як у горадзе, хіба толькі што там не разносяць пачастунак.

Калі аб'явілі гасцям запрашэнне на каравай і танцы перапыніліся, Тумаоўскі выправіўся дадому.

...Аркестр пілаваў, як толькі мог, і Тумаоўскі адчуваў, што не можа спыніцца, што ногі ягоныя самі падскокваюць. Ён разумеў, што яму, саліднаму чалавеку, тут, у вёсцы, няма чаго падскокваць, як козліку, што пра гэта заўтра будуць ведаць усе, і тады паспрабуй пакажыся ў канторы, скажы, што ты пішаш сур'ёзны матэрыял у газету, аналізуеш з сацыяльнага боку, хто ён, сягоннящні вясковы працаўнік. Яму самому было незразумела, чаму ён думае гэтак, як звычайна гаворыць іхні рэдактар.

> Выбери меня, выбери меня,
> Птица счастья завтрашнего дня...

Не пераставаў, драўся саліст ансамбля, і яму падпявала, наступала на Тумаоўскага, адкрыта пасміхалася маладая гладкая дзяўчына ў штанах у абцяжку і кофтачцы навыпуск. Яна гарцавала бадзёра і горача, як кабылка, якая пачула дарогу. І наступала на Тумаоўскага. «Выбери меня, выбери меня...» Яна даставала Тумаоўскага вялікімі грудзямі, і ён паціху хоць і падскокваў, але стараўся адступіцца. Дзяўчына не ўнімалася, напірала на яго, і ён заўважыў, што яе рука слізганула па кофтачцы і тая пачала расхіляцца.

Краем вока Тумаоўскі з жахам угледзеў, што напоўп расступіўся, што ён з дзяўчынай засталіся адны ў крузе і ўсе глядзяць на іх... Тумаоўскі рвануўся бегчы...

— Іванка, а Іванка! Прачніся! Ці не захварэў ты?

Калі Тумаоўскі расплюшчыў вочы, яго штурхала ў плячо Вера.

— Хіба сасніў што? Гэтак стагнаў і крычаў.

— Ага, ага... Дзякуй, што пабудзіла.

Тумаоўскі ўсё яшчэ не мог ачомацца ад сну і не мог зразумець, што ён не на танцах, што ён у ложку і што пачынае ўжо світаць.

## РАЗДЗЕЛ СЁМЫ—

пра тое, як кончылася спакойнае жыццё інжынера Клімакіна.

«Жыгулі» мякка, па інерцыі, з'ехалі з дарогі і спыніліся ля высокага, шчыльнага дашчанага плота, пафарбаванага ў блакітны колер. Мужчына ў сетачцы-тэнісцы з кароткім рукавом і ў белых адпрасаваных штанах вылез з машыны, перайшоў на другі бок, выпусціў з машыны «бананавую» дзяўчыну ў празрыстай кофтачцы.

— Прашу!

Ён адчыніў варотцы, прапусціў дзяўчыну наперад. Яна адкінула льняныя лёгкія валасы, паправіла на носе вялікія акуляры.

Мужчына ішоў збоку, прытрымліваў дзяўчыну пад руку. Старэйшы за яе, але дагледжаны, гладкі і чысты з твару, з вялікім лысым загарэлым лобам. Доўгія валасы спадалі на плечы. Абвіслыя вусы пад цяперашніх модных эстраднікаў рабілі і яго падобным на іх. Шэрыя красоўкі ступалі лёгка.

Мужчына ішоў па-гаспадарску, упэўнена. Ля прычалаў ускінуў руку, прывітаўся:

— Прывет байцам падводнага фронту! Здароў, То-

ля! — ён персанальна паціснуў руку каржакаватаму, сухому, як таран, і жылістаму мужчыну ў шапачцы і ў плаўках. Ён загарэў да чарнаты, і далоні здаваліся ненатуральна белымі супраць усяго ягонага цела.

— Прывет, шэф,— мужчына хуткім, але пранізлівым, як рэнтген, позіркам акінуў дзяўчыну. Яна не збянтэжылася ягонага позірку.

— Як жывеш, стары? Даўно мы з табою не бачыліся.

— Нармальна.

— Медаль за выратаванне не зарабіў яшчэ? — усміхнуўся мужчына.

Толя нічога не адказаў, чакаў.

— Там мой запас яшчэ астаўся?

— Астаўся

— Прынясі, калі ласка. Які мне?

— Бяры крайні,— кінуў Толя на крайні ля прычала катэр і пайшоў у будынак выратавальнай станцыі.

Мужчына прытрымліваў сваю сяброўку за локаць, правёў яе на прычал, раздзеўся, паклаў адзенне на карму, ускочыў у катэр сам. Дзяўчына следам за ім зняла модныя блакітныя штаны, падала руку кавалеру.

Вярнуўся з будынка Толя са спартыўнаю сумкаю, падаў мужчыну. Той моўчкі ўзяў і адразу ж завёў матор. Толя зняў з прычала вяроўку, кінуў мужчыну, паглядзеў услед катэру, які спаважна, ганарліва выходзіў на азёрную прастору і браў кірунак да астраўкоў, якія далёка абазначаліся на гарызонце. Потым Толя смачна плюнуў на ваду, усё роўна як услед катэру, і пайшоў пад стрэшку, дзе стаяў другі катэр з адкрытым маторам, у якім калупаўся малады хлопец.

— Каго ён праводзіў? — запыталася дакторка, якая сядзела ў белым халаціку ў шэзлонгу ў цяні пад грыбком.

— Каго? А, гэтага песняра лысага,— рыжы даў-

ганогі аквалангіст адарваўся ад дэтэктыва, які ён запойна чытаў цэлы дзень, не звяртаючы ўвагі на тое, што дакторцы было сумна, што яна хацела пагаварыць.

— Гэта яго кліент. Толіка з другога курса за вялікія здольнасці...— аквалангіст красамоўна паказаў рукою.— А гэты давучыўся. Цяпер інжынер, экспарт вядзе, па заграніцах шастае...

— Гэта дачка яго?

— Гэтакіх дачок тут прайшло!..

— А як жа жонка?

— А нашто яму жонка?

Аквалангіст зноў скасавурыўся ў кнігу, але дакторка не спынялася:

— Да гэтага Толіка без фігі да носа не падлазь, а тут служыць, як сабачка ў цырку.

— Тут нос яшчэ вышэйшы, не з Толікавую фігаю лезці. За адну такую прагулянaчку на астравок Толік мае чырвонец. Куды тут да гонару.

Аквалангіст зноў чытаў свой дэтэктыў, і дакторка з сумам уздыхнула, паглядзела ўслед катэру, які ўжо быў далёка ад будынка выратавальнай станцыі.

Арнольд Восіпавіч Клімакін накінуў на сябе халат, захінуўся ў яго, зазірнуў у люстра. Валасы скамячыліся, і твар быў нейкі пакамечаны і запухлы. Клімакін паморшчыўся, узяў расчоску, расчасаў валасы, якія клаліся на каўнер і на плечы, і тады лысіна высвечвалася па-прафесарску салідна.

Клімакін азірнуўся на ложак. Новая знаёмая спала раскрыўшыся, з прыадкрытым ротам, і Клімакін паморшчыўся — яна многа піла. Пакідаць на ноч яе ён не хацеў.

Клімакін выйшаў на двор, спаласнуўся вадой да пояса, расцерся ручніком, адзеўся, схадзіў на кухню, паставіў каву.

— Пад'ём, мая дарагая,— патрос за плячо дзяўчыну.

Спрасонку яна пацягнулася да Клімакіна. Ад яе дыхнула перагарам, Клімакін адвярнуўся, штурхануў мацней.

— Пад'ём. Пара ехаць, красотка!

— Куды ехаць?

— Мяне на работу вызываюць. Прыехалі з-за мяжы, сустракаць трэба.

— Ну і едзь! Я цябе тут дачакаюся!

Дзяўчына капрызна завярнулася, паспрабавала зашыцца пад коўдру. Клімакін нібыта жартам, але дабравата прыклаўся далонню ніжэй спіны.

— Уставай, а то, пакуль дажджэшся мяне, памрэш з голаду.

Ён узяў дзяўчыну за руку. Клімакін ведаў такіх. Ад іх потым, як ад кошак, не адагнацца. Ён умеў адкарасквацца.

— Мне там трэба будзе памагаць. Пазнаёмлю цябе з імі. Ты ніколі не сустракала замежных? Во, пабудзеш і паглядзіш. Варушыся, цялушачка!

«Цялушачка» заварушылася. Клімакін скоса пазіраў на яе. Яна ўжо не падабалася яму. Сапраўды, вясковая цялушачка, як бы ні адзявалася ў самыя модныя «шмоткі», на якія пруць ёй грошы з вёскі, думаючы, што тут дачка «выбілася ў людзі». На такіх у Клімакіна было вока, і браў ён іх проста, з ходу.

У прыцемках Клімакін знарок даўгавата пятляў па вулачках садова-агародніцкага таварыства. Домікі тут былі амаль усе аднолькавыя, вулачкі таксама. Ягоны нічым не вылучаўся.

У горадзе Клімакін таксама зрабіў кругаля, каб ягоная паненка, якая ўсё шабуршылася побач і расчэсвала валасы — рыхтавалася да сустрэчы з замежнымі гасцямі,— не надта і запомніла, у якім напрамку ад горада дача.

Непадалёку ад прахадной, у скверыку, Клімакін спыніў машыну, высадзіў дзяўчыну:

— Пачакай тут, забягу даведаюся, як там і што.

Паехаў ён быццам да будынка заводскага кіравання, але не прыпыніўся, адтуль на прамую выехаў на вуліцу, і ягоная машына прапала ў плыні гарадскога транспарту.

У скверыку «цялушачка» зазірала ў люстэрка і прыхарошвалася перад сустрэчай замежнай дэлегацыі.

Машыну Клімакін пакінуў на двары ў святле ад ліхтара, каб была відаць з акна. Ён ведаў законы гэтых старых, зарослых кустамі і прысадамі двароў. Машыны ў іх «разувалі» спрытна. Святла ў вокнах не было. «Не спяшае» пляменніца»,— нядобра падумаў ён. Дастаў ключ, адамкнуў кватэру, запаліў святло, завесіў акно, уключыў тэлевізар. «Жыве, як графіня»,— ён падціснуў губы. Дзіўна, але злосць на Валю была падобна на рэўнасць. Чамусьці думалася пра тых, з кім яна бывае тут. Яго апошнім часам яна не падпускала, а калі ён паспрабаваў «павучыць» і ўзяць сілай, яго ненарокам перастрэлі на цёмнай вуліцы два хлопцы. Не надта каб, але далі зразумець, што распускаць рукі небяспечна. «Глядзі тады, Кныр!» Гэтак звала яго толькі яна пасля таго, як заспела на дачы з «цялушачкай». Клімакін разумеў, што цяпер яна незалежная ад яго. Адно, што іх звязвала, гэта ягоны тавар, які яна брала. Болей нічога. Яна забылася ўжо, што гэта дзякуючы яму выбілася ў людзі. І ён не спадзяваўся, што «пляменніца» акажацца такою здольнай вучаніцай, што ў яе такая хватка будзе. Ён адчуваў, што яна «справу» мае салідную.

Тады ён аднекуль ехаў у горад. Канец лета быў цёплы. У вёсцы ён звярнуў з дарогі, каб напіцца вады. Піў проста з вядра, доўга, смакуючы. Вада была як крынічная ўсё роўна. І калі сагнаў смагу, пачуў, што нехта

плача, азірнуўся. Плакала дзяўчына на зарослым травою двары старога школьнага будынка. Сядзела на лаўцы пры сцяне і плакала.

— Што з вамі?

Дзяўчына нічога не адказала.

У школьным будынку свяцілася адно акно.

— Чаго вы тут?

Дзяўчына кінулася ў вока Клімакіну.

Потым яна расказвала яму, ужо ў машыне, пра тое, што прыехала па накіраванню ў школу. Прыйшла. Адправіў дырэктар кватэру шукаць. Абышла хаты. Ніхто не ўзяў. Выдалі ёй пасцель, пасялілі ў старым школьным будынку, які перарабілі ў жылы дом для настаўнікаў. Адна. Страшна. За шпалерамі пілуюць мышы. Сядзела чытала, транзістар слухала. Потым захацелася ўстаць, ногі ў тапачкі, а там нешта халоднае — падрубніца туды ўлезла!.. Вылецела на двор і ў хату больш зайсці не магла.

— Плюнь на ўсё. Я найду табе работу, будзеш зарабляць не менш, чым за настаўніцтва...

— Я ж па накіраванню... Дыплом у райана астаўся.

— Забяром.

«Якая зялёная яшчэ!» — думаў сам сабе Клімакін і ўяўляў, як павязе яе на дачу.

Яна і пажыла ў яго на дачы. Трэба было ж уладкоўваць на работу. На першым часе згадзіўся ўзяць яе да сябе «на точку» стары Дворкін, Лазар Міхайлавіч. Сівы, стройны, заўсёды ў белым халаце і ветлівы, як дыпламат. Час ад часу збываў у яго свой «тавар» і Клімакін. Не пастаянна, не той маштаб быў... Лазару Міхайлавічу спадабалася маладая памочніца. Клімакін прапісаў яе, не без яго дапамогі, Валя ўклінілася ў чаргу на кватэру і атрымала яе ўжо, калі Лазар Міхайлавіч паехаў, як гавораць, далёка і надоўга. Лазар Міхайлавіч быў чалавек магутны. Пра гэта Клімакін ведаў. Яго і баяцца трэба было. Таму Клімакін не падаў

і выгляду, што здагадваецца, чаму Валя раптам наляцела на дачу да Клімакіна. Гэта ад Лазара Міхайлавіча прынесла Клімакіну мянушку. Лазар Міхайлавіч меў слабасць яшчэ і разглядваць пікантныя фотаздымкі. Клімакін тады падзарабляў у яго і на гэтым. Перабіраючы карткі, Лазар Міхайлавіч прыгаворваў: «А ты не злодзей, ты кныр...»

Пагарэў Лазар Міхайлавіч як адзін з удзельнікаў прадпрыемства, вынікі якога кваліфікаваліся як «крадзеж у асабліва вялікіх памерах». Пасля гэтага на яго месцы ў бары не знаходзілася чалавека, падмяніла яго Валя, а потым месца ягонае заняла і ўжо пра дыплом, які недзе астаўся ў райана, не ўспомніла. Гэта было даўно. Клімакін ужо на парнаграфіі не падзарабляў, але і на асабліва буйныя маштабы не замахваўся. Жыць і так мог на шырокую нагу. Валя згадзілася браць у яго гарэлку, але працэнт заламала, не зрабіла скідкі «дзядзьку» за тое, што ён вывалак яе з вёскі, прывёз у горад.

І насуперак усяму «пляменніца» вабіла яго.

Клімакін пачуў, як адамкнуліся дзверы, устаў, выйшаў у прыхожую.

— А ты не спяшаеш сустрэцца з дзядзькам. Я каву пастаўлю?

— Апячэшся, дзядзечка!

Валя на хаду скінула басаножкі, адчыніла бар, наліла паўфужэра каньяку і выпіла, потым адкрыла бутэльку з «Байкалам», запіла і моўчкі пасунула бутэльку Клімакіну.

— Што?

— Гаварыў мне Міхайлавіч, каб цябе адшыла! Кныр ёсць Кныр! Тавару не было. А сёння ў мяне на складзе нюхалі!

— Ну?

— Чыста. Вось так, дзядзечка! Пазваньваць мне, заязджаць болей не смей! І твая хеўра каб больш на-

гою ў маім бары не была! А то, глядзіш, у групавое ўляпаешся... інжынер! Пра мяне забудзь! А не сумееш, ад Лазара Міхайлавіча табе памогуць! Яны ўмеюць. Памятаеш?

Клімакін памятаў тых дваіх, толькі ён не ведаў, што і гэта ад Лазара Міхайлавіча.

Валя працягнула руку. Клімакін недаўменна глядзеў на яе.

— Ключык, дзядзя.

Клімакін пачаў здымаць ключ з бірулькі. Рукі ў яго лёгенька дрыжалі. Валя пагардліва ўсміхнулася. Яна глядзела на яго, быццам на дробнага жуліка, якому рабіла паблажку і якога прыйшоў час выгнаць вон.

— Запомні, дзядзя, пра мяне ні слова! Што б ні было і як ні было б! А інакш...— яна не дагаварыла.

Ён не даслухаў, выйшаў і амаль подбегам заспяшаў да машыны.

Першае жаданне было паехаць туды, да Гарбуза,— даведацца, ці дома ён. Але ехаць туды нельга. Ужо спакойна ён узважыў усё і пакрысе супакойваўся: Гарбуз нічога не ведае. Яны сустракаліся у горадзе... У твар ведаў, а больш нічога. Маршрут да бара. Гарбуз прыязджаў да бара. Міліцыянера там скалечылі, а цяпер і гэтая рэвізія... Залішне для супадзення. Добра, што «баксёра» справадзіў у вёску.

Праз гадзіну недзе ён паставіў машыну на стаянку. Прайшоў два кварталы, падняўся на пяты паверх, у аднапакаёвую кватэру, сціпла, нават болей чым сціпла абстаўленую.

## РАЗДЗЕЛ ВОСЬМЫ —

### пра здарэнне, якое ўстрывожыла многа людзей.

Інжынер Корбыт усё яшчэ чакаў, пакуль падыдзе чарга на гараж. Чарга падышла ў мінулым годзе, грошы ён заплаціў, але будаўніцтва ўсё яшчэ не кончыла-

ся. За час чакання яго новенькі «Масквіч»ператварыўся ў добра такі ўезджаную машыну, якую можна было смела пакідаць нанач у двары, дзе побач надзейна «ахоўвалі» яе новенькія і зайздросныя з выгляду «Жыгулі». Ды і прывык ездзіць з работы і на работу, канец квартала, часу не ставала ні на рабоце, ні дома.

Паволі ён узышоў на трэці паверх, паленаваўся даставаць з кішэні ключы, пазваніў.

— Хто? — папыталася жонка, адчыняючы дзверы.

— Я, хто ж яшчэ к табе.

— Ты? А чаго ж машына наша толькі што ад'ехала? Я думала, ты яшчэ куды...

Корбыт не даслухаў жонку, выскачыў на балкон. Машыны як і не было на сваім месцы. Ужо спакойна пайшоў да тэлефона, набраў нумар, прадыктаваў дзяжурнаму свой адрас, нумар машыны, потым зірнуў на жонку, якая разгублена глядзела на яго. Яму хацелася легчы паляжаць.

— Ну, чаго стаіш? Давай вячэраць. Як знойдуць — пазвоняць.

— Як гэта?

— Сеў чалавек і паехаў. Дурань, пад суд заедзе!

Пакуль інжынер вячэраў, дзяжурнаму ўжо дакладвалі:

— Сіні «Масквіч» заўважаны на Садовай. Дакладвае дзевятнаццаты.

— Дзевятнаццаты, працягваць пагоню. ПМГ блакіруюць выхады з квартала, на праспект і на кальцавую дарогу.

Дзяжурны гаварыў і глядзеў на карту. Цяпер машына нідзе не дзенецца. Выхад у горад і за горад ёй перакрыты. Злодзей нявопытны. Ад дома, дзе ўкрадзена машына, можна было вулачкамі адразу выскачыць да кальцавой. Што яму спатрэбілася на Садовай?

Патрульная машына тым часам не выпускала з поля зроку «Масквіч». На прамым адрэзку не было ві-

даць сустрэчнага трамвая, і «козлік» выйшаў на сярэдзіну вуліцы. Завыла сірэна, сінім сполахам мігаў «маячок».

— Загадваю спыніцца! Спыніцеся!

Сяржанту Васільеву здавалася, што ягоны голас чуваць усяму гораду. Адна рука трымалася за ручку дзвярэй — каб адразу ж адчыніць і выскачыць.

Старшына Сівец, тоўсты, жывот, здавалася, дастае да самае баранкі, увесь падаўся наперад — каб успець да трамвайнага «астраўка» падрэзаць «Масквіч» і спыніць яго.

Васільеў сцяўся — калі на нейкія долі секунды спозняцца, «Масквіч» выслізне, і зноў трэба будзе даганяць яго. І тут жа заўважыў, як з завулка выскачыў «жыгуль», угледзеў міліцэйскую машыну і тармазнуў. Старшына Сівец націснуў на тармазы, і як толькі машына спынілася, амаль упрытык ля «Жыгулёў», Васільеў выскачыў з машыны.

«Масквіч» стаяў. Перад яго ўлез у багажнік «Жыгулёў». Ад «Масквіча» кінулася доўгая постаць, і Васільеў ірвануўся ўслед. Чуў, што крыху ззаду цяжка гопае чаравікамі Сівец. Чалавек перабег цераз вуліцу, кінуўся пад арку ў двор. Калі ён паспее пераскочыць цераз бетонны плот, якім быў абгароджаны гаспадарчы двор лазні, яны не дагоняць яго. Там парк, а далей...

— Стой, страляю!

Васільеў нават не адчуў, як таргануўся ў руцэ пісталет. І хоць стрэл быў угору, чалавек, які дабег ужо да самага плота, прысеў, нібы куля прайшла над ім. Гэтага хапіла, каб даскочыць да яго.

Толькі калі вялі затрыманага да машыны, Васільеў разгледзеў, што гэта юнак ці, можа, нават падлетак, па-цяперашняму рослы.

— Даездзіўся, дурань,— Сівец цяжка соп.

Пакінутая міліцэйская машына так і стаяла пасярод вуліцы з расчыненымі дзверцамі, уключанай сірэ-

най і мігалкай. На месцы здарэння ўжо сабраўся натоўп. Васільеў выключыў сірэну, коратка далажыў дзяжурнаму і папрасіў выклікаць ДАІ.

Сівец тым часам абышоў пабітыя «Жыгулі». Пад імі нацякла лужына, але пахла не бензінам, а гарэлкай. Сівец націснуў на замок. І скарэжаны багажнік з палёгкай адчыніўся, як стрэльнуў усё роўна. У ім стаялі гаспадарчыя сумкі, поўныя бутэлек. У тых сумках, па якіх прыйшоўся ўдар, толькі шкляны друз пабліскваў. Сівец прысвіснуў, паспрабаваў зачыніць багажнік, але ён не зачыняўся. З натоўпу нехта гукнуў:

— Хлопцы, падстаўляй шапкі! На разліў бясплатна!

Сівец хутка ступіў да гаспадара машыны, які разгублена, неяк утрупела стаяў і трымаўся за ручку пярэдніх дзверцаў.

Невысокага росту, лысы, круглатвары, ён глядзеў на міліцыянера і нібы не верыў, што гэта наяву, а не сснілася.

— Дакументы!

Мужчына дастаў з нагруднай кішэні дакументы і падаў старшыну. Той сунуў іх у кішэню курткі, нават не разгарнуў і моцна ўзяў за руку вышэй локця.

— Вам давядзецца праехаць з намі.

Мужчына паслухмяна пайшоў да міліцэйскае машыны, угнуўшыся, улез у яе, сеў побач з хлопцам і толькі тады так вылаяўся, што хлопец аж адхіснуўся ад яго,— мог жа ён, пакуль бегалі міліцыянеры, ехаць сваёй дарогай. Толькі цяпер гэта дайшло да яго.

## РАЗДЗЕЛ ДЗЕВЯТЫ —

пра тое, як Туманоўскі набліжаецца
да сваіх будучых герояў на небяспечную дыстанцыю.

Туманоўскі сядзеў насупраць сакратара партарганізацыі з блакнотам і занатоўваў з самым сур'ёзным

выглядам усё тое, што той гаварыў. Наогул, Тумано́ўскі не прызнаваў гэтакай журналісцкай практыкі — сядзець з блакнотам над чалавекам. Тады і ён нічога не бачыць, акрамя гэтага блакнота, і гаворыць усё гэтак разумна і правільна, што потым паспрабуй зрабі матэрыял да друку з такое гаворкі.

Але сёння яму хацелася пераканаць, што толькі пытанні аб тым, як папаўняецца рабочая сіла калгаса, яго цікавяць, а болей нічога.

— Скажыце, Іван Спірыдонавіч, людзі самі прыязджаюць ці вы, як гавораць, вярбуеце іх да сябе?

— Ну, мы не такая яшчэ гаспадарка, каб пра нас ва ўсіх газетах пісалі і па тэлебачанні паказвалі... Таму мы выязджаем у тыя раёны, дзе яшчэ ёсць на вёсцы людзі. А потым ужо, як гаворыцца, ланцуговая рэакцыя. Пачынаюць і самі прыязджаць. А таму натуральна, што гэта ў асноўным маладыя сем'і, якім трэба кватэра, заробак...

— Вы даяце ім кватэры?

— Бачыце, будуем домікі. А таксама хаты, якія пустуюць, калгас купляе на вёсках і аддае прыезджым...

— А вы сам?

— Разумею... Я таксама не мясцовы, ды і наогул нават старшыня і ўсе спецыялісты не мясцовыя. Гэта не толькі ў нас у калгасе...

— Колькі вы гадоў тут?

— Я пяты год.

— А ў мінулым годзе колькі памянялася галоўных спецыялістаў?

— У мінулым? Інжынер па будаўніцтву і механік... І ўсё.

— На павышэнне пайшлі ці на лепшае месца пагналіся?

— Ну, як вам сказаць? Інжынер у райцэнтр пайшоў, па спецыяльнасці. Механік на рамзавод...

— А як з жыллём?

— Пабудаваліся.

— А дзе прыезджыя робяць у вас?

— Самая наша бяда — даяркі, свінаркі, механізатары. Каму ж хочацца лезці ў гной?

— Зразумела,— Тумано́ўскі ўсміхнуўся: усе пакойчыкі канторы заселены, як вулей, напарфумаванымі маладзіцамі. У большасці сваёй гэта жонкі галоўных спецыялістаў.

Сакратар усміхнуўся. У кабінеціку было душна, пякло сонца, і Тумано́ўскаму хацелася на паветра.

— Ну што ж, дзякуй, Іван Спірыдонавіч, на першы раз. Адрываю вас ад работы.

— Што вы, што вы. Мне загадана правезці вас, паказаць нашы палі. Вы ж, гаварылі, партызанілі ў гэтых балотах?

— Так, было.

— Дарэчы, калі што трэба жонцы Кухты, то скажыце, няхай заходзіць да мяне. Дапаможам. Дзед ён быў талковы. І на работу, калі што, выйдзе, выручыць. Больш бы было такіх дзядоў, можа б, і маладыя другія былі... А то хлопцы, васьмі-дзесяцікласнікі, здаравенныя лбы, на бацькоўскіх матацыклах лётаюць, хуліганяць, а на работу ў жніво не надта ідуць. Як не тут выраслі...

Сакратар змоўк, быццам спахапіўся, што гаворыць не тое. Потым невядома, што ён там напіша пра тое, на якім узроўні ў калгасе выхаваўчая работа, якую ўвагу ёй аддае кіраўніцтва калгаса, а ў першую чаргу ён, сакратар партарганізацыі, клопаты пра духоўнае выхаванне, пра «задавальненне духоўных патрэб» калгаснікаў. Цяпер пра гэта стала модна пісаць, пра клопат пра чалавека, хаця справаздачу ў раёне патрабуюць і шыю мыляць, як і мылілі не аднаму ягонаму папярэдніку, за графікі пасяўной і жніва, за нарыхтоўку кармоў...

— Я думаю, Ян Данілавіч, дагаворым у машыне.

Каб не траціць часу, давайце праедзем, паглядзім, што мы маем на полі, як мы жывём.

Гэта быў не новы, але надзейны спосаб.

«Пачынаецца»,— кіўнуў галавой і ўсміхнуўся сам сабе Тумаyоўскі.

«Ніва» бадзёра ўзяла з месца. Іван Спірыдонавіч таксама нібы адчуў палёгку, калі выйшлі з кабінета, з задавальненнем кіраваў машынай і тлумачыў:

— Наш пасёлак. Толькі пачынаецца. Калі будзе расці, месца выбрана тут добра, на цэлы гарадок хопіць.

Праз адкрытыя шклы вецер пругка хадзіў усярэдзіне машыны, і Тумаyоўскі слухаў, што гаварыў сакратар.

З машыны прыемна было глядзець на палі. Яны разлягаліся паабапал дарогі запалавелым, пасвятлелым разлівам збажыны: яшчэ чырванаватыя, густыя фарбамі аўсы, крыху святлейшая — пшаніца і за ўзгоркам зусім пасвятлелае, пабялелае, нібы пачало выгараць, жыта. Як аблямоўка, паўз дарогі беглі блакітныя кветкі валошкі, белыя, з жоўтымі, густымі вачыма рамонкі. Густа ляжаў пыл на жылістым лісці трыпутніку.

Лёгка гаварылася пад імклівы бег машыны, лёгка слухалася пра тое, што ўраджай маецца быць добры.

— Ну, а вось тое, што стала на месцы балот, што дае нам малако і мяса.

Сакратар спыніў машыну на пагорку. Унізе пачыналіся роўна падзеленыя на калектары канавамі ўтравянелыя плошчы. Трава шаўкавіста выгіналася пад ветрам, і ад яе павявала цёплым лугавым пахам.

— Мы ў асноўным не аром балота. Усё адпусцілі пад траву. Ды ў нас яшчэ і грудавое зямлі хапае ў калгасе, яе абрабіць як след...

Тумаyоўскі стараўся ўявіць замест гэтых выраўняных плошчаў тое, спавітае туманком, парослае лазою і алешнікам балота, ад якога нават улетку патыхала

тванню і нечым халодным, металічным. І чамусьці не ўспаміналася балота пры сонечным святле: ні асенняе, ні вясновае, ні шэра-снегавое, устылае.

Іван Спірыдонавіч тым часам называў тоны будучага ўкосу.

За ўзгоркам, пры ляску, у невялікай лагчынцы ўтульна стаяў дамок. Ля дамка зроблена невялікая запруда, і перад ёй стала азерца.

— Ну, а гэта наша рэзідэнцыя, дзе мы прымаем шаноўных гасцей,— крыху скавана пажартаваў сакратар.

— Што, лазня? А цікава...

— Міласці прашу!

Сакратар павесялеў, узяў з машыны саквояж. Тураноўскі не заўважыў, як і калі саквояж апынуўся ў машыне.

Лазня была зроблена ў два паверхі. На другім стаяў стол і крэслы, буфет — усё зроблена з дошак, толькі пацягнута аліфай. Адсюль можна было сысці на першы паверх, у фінскую парылку. З яе адразу можна шухнуць у азерца. Усё на сучасным узроўні і ў сучасным духу.

— Іван Спірыдонавіч, не трэба,— спыніў сакратара Тумаоўскі.— Парыцца я не надта люблю, ды цяпер і на дварэ парылка.

Сакратар разгубіўся.

— Заязджайце як-небудзь да мяне, да Кухты, вечарком, рады буду сустрэцца з вамі.

— У нас тут яшчэ бярозавік ёсць,— сакратар хуценька зачыніў саквояж і сышоў на першы паверх, неўзабаве вярнуўся адтуль з меднай квартай халаднаватага бярозавіку. Ён быў падкіслы, у меру халаднаваты, і Тумаоўскі цадзіў кварту паволі.

— Здорава!

— Там халадок. А бочку ячменем засыпалі. Ён закусціўся, закрыў бочку зверху,— не плесне, не перакісае.

Сакратар падвёз Тумано́ўскага дадому і нават паабяцаў, што заедзе ў госці.

Назаўтра раніцай Тумано́ўскі бадзёра круціў педалі веласіпеда, ехаў на пошту паведаміць рэдактару «прыемную навіну»: ён затрымаецца на тыдзень.

У той дзень выбралася на пошту і старая Міхаліха. Пошту перанеслі на цэнтральную сядзібу, і дабірацца да яе трэба сваім ходам, бо адзін толькі бог ведае, калі ў брыгаду завінецца якая-небудзь машына ці трактар. Зранку не пойдзеш, трэба выгнаць карову, пакарміць свіней, вытурыць з двара гусіную чараду, прыняць на поплаве цялё, прыгатаваць усё на дзень скаціне, бо калі яна прыпаўзе з тае пошты назад.

За раніцу Міхаліха стамілася. Адчувала, што кружыцца і туманіцца ў галаве, нібы імгла наплывае на мазгі. Асабліва натаміла і нашморгала цялё, пакуль завяла яго. Павалі́ла нават. А яно не адбеглася — стаіць і глядзіць, як дражніцца ўсё роўна. Міхаліха азірнулася: ці не бачыць хоць хто з людзей? У галаве закружылася. Устала, адышлася да валуна, села і заплакала ад бяссілля. Ад злосці на Міхаля, які не можа разлучыцца з гэтай гаспадаркай, хоць яна каторы год просіць яго, бо не мае здароўя. Самога за гэтых свіней чуць не забілі. А ўся работа перавалілася на яе рукі. Яшчэ плакала ад крыўды на дзяцей — што асталіся на старасць адны. Рая дык і зусім воч не паказвае, хоць адна, часу павінна мець.

Пасля таго як адпачыла крыху, прайшла і крыўда. Але з гаспадаркай невядома як упраўляцца. Пачакаць, пакуль у сына водпуск, няхай прыедзе, паможа пазбываць усё гэта.

Таму і трэба было ісці на пошту. Даць тэлеграму Раі, няхай прыязджае, пабудзе дома і паможа ёй. Вольная, адна.

Так думала Міхаліха і паўзла па дарозе з кійком, сагнутая ў крук ад работы і ад пражытых гадоў.

Калі пачула трэск матацыкла ззаду, загадзя саступіла з дарогі, каб прапусціць яго. Але матацыкл не абмінуў старую.

— Куды, цётка?

— На пошту. А што табе?

Міхаліха пазнала Мачанкавага хлопца, якога дражнілі заторам. Кудлаты, белазубы, у расхрыстанай нагрудзях рубашцы, ён пасміхаўся са старое. За ім на матацыкле быў яшчэ адзін, коратка астрыжаны, круглагаловы і гэтакі ж расхрыстаны — горача ўжо стала.

— Да вечара ісці будзеш, цётка.

— Ну і што?

Што гэта за цаца, Мачанкаў узрэз, старая ведала, і зачапіўся ён да яе не так сабе.

— Пазалаці ручку — мігам падкіну.

Міхаліха яшчэ думала, што рабіць. Грошай шкода было і лезці на матацыкл страшна. Але яшчэ больш боязна, што не дай дабром, дык вытрасе ўсе, якія ўзяла з сабой. Яна на ўсякі выпадак азірнулася, спадзявалася, што, можа, хоць каго ўгледзіць на дарозе. Але ў акрузе — ні жывое душы. І дадому трэба ўспець, пакуль прыгоняць кароў на ранкі.

— Не жміся, цётка!

Затор не думаў адпускаць старую. Адчуваў, што яна баіцца яго.

— Два рублі толькі дам.

— Садзіся, прамчу, як у космасе!

— А гэта каб не смеў! Добра вязі, а то ўпаду, заб'юся, цябе пасадзяць! — прыгразіла Міхаліха, узабралася на сядзенне і ашчаперыла хлопца рукамі.

...— Але ж і пёр мяне, як той чорт! Як на мятлу села! А я добра за яго ўплялася, думаю, трасцы страсеш! А некалі, як дзеўкаю была, не гэтак на конях лётала.

Паштальёнкі, якія ўжо сабраліся і чакалі машыну з поштай, і сама начальніца, мажная жанчына ў акуля-

рах, рагаталі да слёз. Старая смяшыла і паштальёнак, і начальніцу.

— А вам, цётка, трэба было перахрысціць яго,— стрэліла вачыма на старую чарнявая маладзіца.

— Каго?

— Затора Мачанкавага.

— Або ж гэтага чорта крыж возьме? Яго міліцыя колькі ўжо хрысціць, а зрабіць нічога не можа.

— Трэба было грошай не даплаціць.

— А каб на яго пранцы! Яшчэ і пераплаціла. Рублёў у мяне не было, а я замест траячкі пяцёрку дастала. Ён хваць за яе і зубы выскаліў. Здачы, кажа, прывязу. Задушыся ты з гэтай здачай! Яшчэ прытаўчэш, як старога прытаўклі.

— Не трэба, цётка, грошай многа збіраць, і баяцца не будзеш.

— Я, Танечка, грошай не збіраю. Я іх дзецям аддаю. З сабою мы іх у зямлю не панясём. Дома мы не дзержымо, Веры прыносім на кніжку,— старая кіўнула на начальніцу.

Старая ўстала з крэсла.

Чарнявая Танька ўсё не магла супакоіцца:

— Дык мо Затор вас і назад павязе? Вы ж у два канцы заплацілі. Мы хоць выйдзем глянем.

— Скула яму ў бок, каб я больш села да яго! Пакуль карова на ранкі, я і сама дайду. Ты ж глядзі, Верачка, каб целеграма дайшла. А то задушаць мяне гэтыя свінні. І да старога трэба паехаць.

— Сёння дойдзе, цётка.

— То бывайце здаровы.

Тумаоўскі сядзеў за столікам і моўчкі глядзеў і слухаў. Ён чакаў тэлефоннага званка, каб паведаміць «прыемную навіну» — што застаецца.

— Хто гэта? — папытаўся ён у паштальёнкі, якая сядзела бліжэй да яго.

— Міхаліха з Забалацця. Гэта яе старога скалечы-

лі, як вепрука кралі. Нахальны на работу стары.

— А хто гэта яе вёз?

— Вырас тут у нас. Бацька і маці свету не бачаць на свінарніку. Меншы быў, чаргу кароў адпасе толькі, калі заплаціць бацька. Прывучылі рубель яму змалку даваць. Смяяліся. А цяпер і на вінішча даюць. Хай папрабуюць не даць! Раз у хляве запёр і суткі трымаў. Міліцыя яго хацела ў калонію забраць. Чакаюць, што, можа, армія яго трохі абразуміць. Ды каб адзін ён такі. Усе цяпер і на матацыклах, і на гэтыя джынсы давай. Мой прыставаў да мяне. Кажу, ідзі, зарабі ў жніво... Пойдзе і заробіць. Альбы толькі з гэтымі Заторамі не звязваўся.

Зазваніў тэлефон, начальніца падняла трубку.

— Не адказвае тэлефон.

Тумановскі зразумеў, што шэфа няма на месцы і не хутка будзе, калі знікла і Лідачка.

— Здыміце заказ.

Тумановскі ўзяў чысты бланк і напісаў кароценькую тэлеграму.

Па дарозе дадому Тумановскі думаў пра старую і пра невядомага яму Затора. Успомніліся матацыклетныя хлопцы, якія перастрэлі яго на дарозе. Гэта сёння нахабна адабраў у старое грошы, і яна рада, што шчасліва размінулася з ім. А рабочую сілу ездзяць вербаваць у калгас здалёку. Куды ж дзенуцца гэтыя «бясцэнныя» кадры, калі нават і выедуць яны з вёскі? Тут яшчэ ў сваіх людзях, і то... Вось вынік выхавання, а правільней, занядбання выхавання, які Тумановскі разгорне, цераз яго гляне на праблему кадраў у сённяшняй вёсцы. Гэта быў той рэальны, жывы матэрыял, які ён можа вывучаць.

Захоплены сваімі думкамі, Тумановскі шпарка імчаў з узгорка і не заўважыў, што пад гарой мнагавата пяску.

Спахапіўся ён толькі тады, калі парэдняе кола кру-

цянулася ў пяску, і праз некалькі секунд Туманоўскі адчуў у роце знаёмы ўжо не першы раз за гэтыя дні смак пяску і дарожнага пылу. Ён доўга адплёўваўся, выціраўся, атрэпаўся, потым працёр акуляры. Ён нават азірнуўся, ці няма паблізу таго Аляксандравага казла. Але казла нідзе не было. Туманоўскі падняў веласіпед і пакуль што павёў яго ў руках.

Ён не чуў здаровага маладога рогату, які суправаджаў ягонае вяртанне ад мар на зямлю. На ўзгорку пад кусцікамі Затор і яго стрыжаны круглагаловы сябрук пілі купленае на грошы старое Міхаліхі «чарніла» і пацяшаліся з начаканага відовішча, не падазравалі нават, на які шырокі свет праз некаторы час выставіць іх гэты несамавіты чалавек у брызянтоўцы і акулярах, які зараз папіхаў перад сабой па пяску веласіпед.

## РАЗДЗЕЛ ДЗЕСЯТЫ —

### пра тое, як слесар Гарбуз здзівіў нават вопытных следчых

— Што, Андрэй Дзям'янавіч, так і будзем гуляць у жмуркі? — следчы насмешліва паглядзеў на Гарбуза.

— Я гаварыў, што пагнаўся на дармаўшчыну! Прападзі яна пропадам, гэтая гарэлка! Ну, не п'ю ж я яе і век не ганяўся!

— І тых, што прадалі вам вынесеную з завода гарэлку, вы першы раз бачылі?

— Першы! Маладыя мужчыны...

— І везлі вы гарэлку дадому?

— А куды ж яшчэ!

— Ну што ж, давайце тады разам з'ездзім да вас дадому.

Следчы заўважыў, што Гарбуз наструніўся.

— Пакажыце, дзе вы дома гарэлку хавалі.

— Паедзем.

Гарбуз не ведаў, што следчы не меў ніякіх фактаў.

Ён не верыў, што гарэлка трапіла да Гарбуза выпадкова, але гэта — не доказ. Затрыманы, згодна характарыстыцы, якую дало домакіраўніцтва, быў чалавек самастойны. Мае прыватны дом, жыве ў дастатку. Збіраць у свой дом дабро любіць, таму мог пагнацца на дармавую гарэлку, якую «несуны» ўкралі з завода. Усё сыходзілася, але калі ўзяць пад увагу дарогу на завод і тое месца, дзе адбылася аварыя, то дарога вяла зусім не дадому, а ў супрацьлеглы бок. І бутэлькі не магазіннай, прыватнай задзелкі. У асабістай справе значылася, што ў свой час Гарбуз працаваў на лікёра-гарэлачным, праўда, нядоўга, але было такое. Таму не выключалася, што ў яго маглі астацца знаёмыя, тыя, хто пастаянна «здабывае» спірт і гарэлку. Яны і трэба былі следчаму.

Калі вобшук нічога не дасць, Гарбуза давядзецца выпускаць.

Жыў Гарбуз у раёне, які забудоўваўся пасля вайны і да якога яшчэ не дабраліся новабудоўлі. Дом пабудаваны з цэглы, аляпавата, з пакоем пад дахам і вузенькім балкончыкам. Ужо потым да доміка прылялілі шырокую веранду — расшыраліся. На ўчастку пры доме раскошна ўзяўся сад.

— Хату адамкнуць? — следчы заўважыў, што той цень трывогі, які спачатку быў на твары ў падследнага, прапаў. На сваім двары ён адчуў сябе гаспадаром, і ўсім сваім выглядам паказваў панятым — суседзям,— як яго занівошта крыўдзяць.

— Давайце спачатку ў гараж зазірнём.

— Давайце.

Гараж як гараж, нават не лішне захламлены. Інструменты на сцяне, на стале, веласіпед, у кутку каністры. Не было тут ніякіх слядоў прыбору, адчувалася, што пасля таго, як выехала з гаража машына, тут ніхто не гаспадарыў.

— Пайшлі, глядзіце ў хаце.

Гарбуз амаль з радасцю адмыкаў дзверы: цяпер ён пераканаўся, што нічога знайсці дома ў яго нельга. Як чула душа, ён ніколі не трымаў дома парожніх бутэлек.

— А што ў вас у садзе?

— У садзе? А-а, будка. Яблыкі якія скласці ці што. Там спачатку будзеце глядзець?

Гаспадар патупаў наперадзе.

У буданчыку, збітым з дошак, пахла пылам, ляжалі скрынькі, старыя кашы.

Следчы зразумеў, што дарэмна ехаў сюды, дарэмна выпрошваў у пракурора ордэр на вобшук.

Трэба было зайсці ў хату, для прыклёпу. Следчы падфутболіў камяк паперак, які ляжаў у траве ўзбоч дарогі, і той рассыпаўся на меншыя камякі. Адзін з іх следчы падняў, разгарнуў. З малюнка паперы на яго ваяўніча пазіралі віцязі.

Гаспадар таксама, як зачараваны, глядзеў на рукі следчага, на камячкі паперы, якія рассыпаліся па траве, потым перавёў позірк на будан, ад якога адышліся толькі што, потым ужо спалохана зірнуў на следчага...

...Паўторны агляд будана даў следчаму торбу з бляшанкамі, якімі звычайна закрываюць бутэлькі з гарэлкай, цэлую кардонную каробку з-пад чаравікаў новенькіх гарэлачных этыкетак. У каністры, якія былі ў гаражы, бензін не залівауся ні разу.

Усю дарогу назад Гарбуз спалохана глядзеў на следчаго, і ў яго дрыжала ніжняя губа.

— Не спяшайцеся, усё па парадку, Андрэй Дзям'янавіч,— следчы сам не паверыў таму, што пачуў ад Гарбуза. Ён займаўся вось ужо гадоў пяць рознага роду спекулянтамі і перакупшчыкамі. І тут чакаў, што раскрые групу дробных зладзеяў, якія выносілі і прадавалі гарэлку. А тут...

Андрэй Дзям'янавіч любіў пасядзець з вудачкай.

Летам, калі цёплыя надвячоркі, калі доўгі дзень. І часу было на гэта. Вуды ў яго стаялі на рабоце, у бакавушачцы, дакладней, і не вуды, а адна, тэлескапічная. З ёй зручна было ездзіць па горадзе, і не кідалася яна ў вочы. Рыбалцы спрыяла і тое, што дома ў хаце было каму пыніцца — маладзейшая дачка выйшла замуж, нарадзіла ўнука, на работу не хадзіла.

У яго, колькі памятае сябе, не было вольнага часу. Калі прыехаў з вёскі на завод, яшчэ хадзілі з хлопцамі на вячоркі гуляць, нават біліся з мясцовымі. Але пасля таго, як ажаніўся, часу не аставалася. Трэба было думаць, дзе жыць, як зрабіць, каб вырвацца з барака. Выхад падказаў цесць: будаваць свой дом, не чакаць, пакуль будзе тая дзяржаўная. Цесць і дапамагаў будавацца, бо рабіў на машыне, меў у руках тэхніку. Каб мець вольны час, Андрэй Дзям'янавіч пакінуў завод, уладкаваўся ў домакіраўніцтве, а потым яшчэ і на паўстаўкі пайшоў падзарабляць. Работа давала і вольны час, і грошай можна было абабіць намнога болей, падкалыміць. А падкалымліваць даводзілася — будаўніцтва нямала каштуе.

Заняты работай і клопатам, ён не паўтарыў лёс тых, хто заставаўся жыць падоўгу ў бараках. Яны бытта і чавыйгралі, гатовую дамоўку атрымалі, але многія, чакаючы ўсяго гатовага, не ўдаючыся ў работу, раздурэлі. Перавага свайго доміка была яшчэ і ў тым, што на потым і пра гараж клапаціцца не давялося, і бульбы, і сваёй гародніны на зіму амаль што хапала, і сад вырас...

Таму нічога дзіўнага ў тым, што слесар Гарбуз пасля таго, як заходзіў на сваю работу ў паліклініку, дзе падзарабляў ужо многа год па сумяшчальніцтву, выходзіў пасядзець пад ракітавым кустом з вудачкай — рэчка тут якраз рабіла крутую луку і ўтварала вялікую лугавіну, зарослую кустамі, травой. Тут нават машын не было чуваць, а вербы на другім на крутым беразе,

старыя, пакручастыя, хіліліся сваім нізкім веццем амаль да самай вады.

Паўз самы бераг, у плюшніку і зарасніку асакі, вывела качанят крыжанка, і ўсе пяць маленькіх качачак зрэдку чародкай выплывалі побач з мамай, якая насцярожана азіралася па баках. Калі палохаліся, птушаняты разам ныралі пад ваду, і відаць было, як яны стараюцца як мага найхутчэй схавацца ў траву, пад засень куста. Часам качка адважвалася, пераводзіла сваю чародку па вадзе да гэтага берага, на якім звычайна рыбачыў Гарбуз, і не толькі ён, і дзеці ў ваду падкідалі і хлеба і прыманкі.

Гэтая качка і завярнула ўсё жыццё Гарбузова пад адхон — ён быў у гэтым перакананы. Гледзячы на качыную чародку, і заўважыў ён пад кустом, у вадзе, водаправодны кран. Жоўты водаправодны кран, а таму не змог не падысці і не паглядзець на яго бліжэй. Кран у вадзе астаўся не сам па сабе, ім канчаўся шланг. Каб назаўсёды не зніклі пад вадой, кран і шланг былі прывязаны за корань куста.

Кран Гарбуз пакруціў, і з яго не пакапала, а добра пацякла чыстая — не вадзіца, а гарэлка. Гарбуз аж спалохаўся і не паверыў сабе. Але з крана цякла гарэлка. Таму ён хуценька закруціў яго і зноў апусціў у ваду. Цяпер крана і не відаць стала.

Гарбузу ўжо было не да рыбалкі. Ён усё пазіраў на куст і чакаў, што нехта да яго падыдзе. Але так і цямнець пачало, а ля куста ніхто не паказваўся, калі не лічыць маладую парачку. Праўда, ёй было зусім не да крана, іх другі клопат займаў.

Назаўтра Гарбуз зноў лавіў рыбу і цікаваў на той куст, дзе быў кран. Нікога і нічога. Ён нават плюнуў быў на гэты кран і два дні наогул не хадзіў на рэчку.

Гарбуз здагадваўся, што гарэлка цякла ў поліэтыленавы шланг не сама сабою, на тым беразе рэчкі, за плотам, на беразе карпусы лікёра-гарэлачнага завода.

А таму толькі адчайны чалавек адважыўся на такое, каб адтуль вывесці гэты шланг па дне рэчкі. Калі шланг вывелі, то тыя, хто вывеў, і пільнаваць яго павінны.

І ўсё ж ён не вытрымаў, прыехаў на рыбалку на машыне, з каністраю, калі прыцямнела, утаптаў каністру пад берагам у гразь, і праз некалькі хвілін яна была поўная. І ніхто нічога. Падкінуў спачатку здабытага братавым, свату, потым жончынай сваячцы, якая прымала пустую шклатару ў іхнім шклапункце.

Тая выпытвалася, адкуль бярэ, сказаў, што п'яніцы выносяць, купляе па дзяшоўцы. Яна і навучыла: каб ён у бутэлькі разліваў...

Усё гэта ў следчага не выклікала ніякага здзіўлення, акрамя крана.

Фантастыка пачалася з таго вечара, калі Гарбуз прыехаў з дзвюма каністрамі. Набіраў спакойна, бо колькі разоў рабіў заметкі — ці будзе хто падыходзіць да крана. Сакрэтныя заметкі паказвалі, што да крана ходзіць толькі ён. Гарбуз супакоіўся — мабыць, тыя, хто арганізоўваў гэты «водаправод», ужо папаліся.

Гарбуз паставіў каністры ў багажнік машыны, адамкнуў дзверцы, апусціўся на сядзенне і толькі тады заўважыў, што ў машыне ён не адзін. Першым жаданнем было выскачыць, але на плячо легла рука.

— Чаго так, дзядзя? Заводзь матор, і паехалі. Чаго ты так спужаўся? — голас нічога добрага не абяцаў. Побач з Гарбузом сядзеў чалавек у цёмных акулярах, у белай веласіпедысцкай шапачцы.

Выехалі за горад завулкамі і вулачкамі. Прымусілі спыніцца збоч дарогі, у нейкай лагчыне. Смярдзела звалкаю. З машыны не вылазілі.

— Нельга, дзядзя, браць чужое. Вас так мама некалі вучыла?

Гаварыў той, што сядзеў ззаду. У Гарбуза заняло мову. Спачатку падумаў, што міліцыя. Пасля таго як

везлі за горад, здагадаўся, што гэта не міліцыя, а тыя. І ад гэтага стала яшчэ страшней.

— Я ж, хлопцы,— пачаў быў Гарбуз, але ў роце перасыхала.

— Ты краў, дзядзя. Не толькі ў дзяржавы, а і ў нас.

— Я аддам вам, хлопцы, грошы, аддам. Я ўсяго чатыры каністры.

— Сем, дзядзя. І хлусіць мама не вучыла.

Гарбуз вывез пятнаццаць каністраў.

— Я заплачу, колькі скажаце.

— Не трэба нам грошы, Андрэй Дзям'янавіч, не трэба. Мы не пра грошы прывезлі вас сюды гаварыць!

«Усё ж міліцыя!» — абарвалася душа ў Гарбуза.

— Мы багатыя людзі. Слухайце і запамінайце. Мы там у машыне паклалі вам наклеечкі і пробачкі. Тару дастанеце самі. Паслязаўтра вы на работу на машыне пад'едзеце. Малады чалавек у шапачцы, яго так вы і зваць можаце, малады чалавек, падсядзе ў яе. Правядзе куды трэба. Усё вам раскажа.

— Хлопцы, я не... Я заплачу вам!

— Мы багатыя, дзядзя. Нам з табою па дарозе. Можаш ехаць дадому.

Ля дома той, што сядзеў ззаду, загадаў спыніць машыну так, каб цень ад дрэва падаў на яе.

— Не ўздумай, дзядзя, хоць што зрабіць не так, як мы сказалі табе. Ці схадзіць, паказаць кранік, каб там засаду ўстроілі. Цяпер ты ў нас Кранікам будзеш. Глядзі, а то чаго не бывае... Ці аварыя, ці правады ў доме замкнуць могуць, пасыплюцца іскры. А тавар у сумкі пастаў. І не бойся, за работу заплоцім. Не паўстаўкі, стаўку яшчэ адну адвалім табе!

Маладзейшы рагатнуў хрыплаватым і кароткім рогатам. За ўсю дарогу не сказаў ён ні слова, але праз два дні Гарбуз угледзеў, калі выйшаў з работы, яго ў сваёй машыне.

Камандаваў ён коратка: направа, налева, прама.

У двары прымусіў падагнаць машыну да старой, некалі фарбаванай іржавай скрыні, у якой звычайна дворнікі хаваюць сваё начыненне, адамкнуў яе, азірнуўся, паставіў туды сумкі, замкнуў замок, аддаў ключ Гарбузу:

— Вось так, Кранік,— ён знарок гаварыў хрыпла, каб змяніць голас.— Два разы на тыдзень. Усё зробіш так, як я табе паказаў. За кожную ездку табе... І не ўздумай дурыць!..

Ён яўна паўтараў не свае словы. Узяць бы гэтага шчанюка за шкірку і завезці куды трэба! На імгненне Гарбузу здалося, што ён гэтак і зробіць, нават нагнуўся, каб намацаць, ці ляжыць пад дыванком манціроўка.

Хлопец ляпнуў дзверцамі і пайшоў прэч ад машыны, ні разу не азірнуўся.

Гарбуз ад'ехаўся квартал, пералічыў грошы, якія хлопец сунуў яму.

Даклад следчага здзівіў і начальніка раённага аддзела. Усё было нічога, але «водаправод», які дзейнічаў не тыдзень, не месяц...

— Праверылі паказанні?

— Праверылі. Ёсць кран і працуе.

— Назіранне?

— Назіранне ўстаноўлена.

— Не чапаць нікога, толькі назіранне! Што яшчэ вамі зроблена?

— Дадзена каманда на праверку кафэ і бара, у двары якіх разгружаўся Гарбуз...

— Дарэмна. Пакуль што назіранне, і без майго дазволу нічога не рабіць.

## РАЗДЗЕЛ АДЗІНАЦЦАТЫ —

### дзе старэйшая дачка Міхаля Рудога вырашае пытанне наконт адпачынку.

Раіса Міхайлаўна прачнулася як звычайна — пад пазыўныя з дынаміка, які заставаўся ўключаным на ноч. Пацягнулася, прыслухалася, як смачна і здорава пахруствваюць суставы. У начной сарочцы падышла да балконных дзвярэй, адчыніла іх насцеж, яшчэ раз пацягнулася, удыхнула ранішняе халаднавате паветра. Потым выйшла ў прыхожую, кінула вокам у трумо: яна любіла сябе — рослую, прыгожую, ведала, што сяброўкі зайздросцяць ёй. На рабоце яе ўжо называлі Раіса Міхайлаўна, і яна не пярэчыла, але па-за работай называлася, знаёмячыся, па-дзявочы — Рая.

Потым Раіса Міхайлаўна вярнулася ў спальню, разаслала на дыване прасціну. Гімнастыку яна рабіла па сваёй сістэме, з элементамі ёгаў, рабіла стаpанна, з поўнай аддачай. Пасля гімнастыкі — масаж. І гэта кожны дзень.

Сёння яна не спяшалася — першы дзень адпачынку. Дачка паехала на лета да мужавых бацькоў — яна прывыкла там бываць змалку. Рая не пярэчыла. Развялася яна з мужам нечакана для ўсіх знаёмых і для самога Івана. Ён не заўважыў, што першая закаханасць да яго, армейскага капітана, даўно прайшла і Раіса Міхайлаўна стала не той вясковай дзяўчынкай. Яна адчувала сябе гараджанкай, скончыла гандлёвы тэхнікум, спазнала толк у прыгожым адзенні, адчула смак прыгожага, святочнага жыцця. І пасада — намеснік дырэктара мэблевага магазіна — вагу мела немалую, знаёмых завялося рознага ўзроўню і ў розных сферах. Прыйшла пара выхаду «на людзі». І тады аказалася, што Іван зусім не пара ёй — ні па інтарэсах, ні з выгляду, ні ўменнем быць у людзях. Дачасна палыселы маёр, заняты цэлы дзень на службе сваімі машынамі, ён да-

лёкі быў ад таго жыцця, якім цяпер жыла Раіса Міхайлаўна, не разумеў і не хацеў разумець яго. Раіса Міхайлаўна перастала звяртаць на яго ўвагу і не спрабавала перавучваць на свой капыл — яна жыла сваім жыццём, такім, якое падабалася ёй. І мужчыны ў яе былі не раўня Івану... Так бы, можа, і жылося, каб Іван раптам не пачаў раўнаваць. Гэтага цярпець яна не хацела. Развялася лёгка і проста, ёй амаль што адразу пасля суда далі кватэру за межамі ваеннага гарадка, у горадзе, двухпакаёвую. Сабе яна забрала легкавую машыну — куплялі за грошы, падараваныя яе бацькамі. У кругу знаёмых Раіса Міхайлаўна гаварыла, што з маёрам сваім яны разышліся па-добраму, зразумелі, што не падыходзяць адно аднаму. У пацвярджэнне гэтага расказвала, што дачка кожнага года адпачывае ў Іванавых бацькоў...

Раіса Міхайлаўна жыла пакуль што вольна, пра новага мужа не думала. І цяпер у яе быў наперадзе цікавы адпачынак — з мастаком, на беразе возера, дзе ён кватараваў у маленькай вёсачцы, пісаў эцюды. Малады мужчына, рослы, з ранняю сівізною і насмешлівымі чарнявымі вачыма. Рая пазнаёмілася з ім, калі ён памагаў афармляць у магазіне вітрыну.

Пасля гімнастыкі Раіса Міхайлаўна мылася пад душам, таксама па сваёй методзе, чаргуючы гарачую ваду з халоднай.

Сёння ў запасе ў яе вольны час, не трэба спяшаць. Прыехаць да мастака яна планавала пасля абеду, не раней.

Раіса Міхайлаўна піла каву, калі пазваніў тэлефон. Жаночы голас па-дзелавому папытаўся, ці не выйшла памылкі, ці званок па адрасу.

— А што такое? — нецярпліва папыталася Раіса Міхайлаўна.

Ніякі званок, нішто, акрамя сённяшняга ад'езду на возера, не ўваходзіла ў яе планы.

— Вам тэлеграма. Калі не супраць, я прачытаю?

— Прачытайце.

— Рая, прыязджай. Бацька цяжка хворы ў бальніцы. Адна дома не магу, сама хворая. Мама. Усё разабралі? — перапытала паштальёнка на тым канцы провада.

— Усё.

— Можна адзначыць, што тэлеграму вы атрымалі?

— Можна...

Раіса Міхайлаўна паклала трубку. Гэтага толькі ёй не хапала. Заўсёды гэты дом і гаспадарка! У душы Рая ненавідзела яе. Бацька і маці, колькі яна памятае, усё душыліся на рабоце і ўпэўнены былі, што ім, дзецям, таксама свет замкнуўся на гаспадарцы. Калі гаварыць чэсна, то і на мэблю, і на машыну сапраўды грошай далі яны. Лічылі, што гэта абавязкова.

Раіса Міхайлаўна вярнулася на кухню. Яна не збіралася траціць адпачынак на тое, каб карміць у маці свіней. Абыдзецца яна і без гэтага, без свіней і тых грошай. І дачку яна прывучыла ездзіць да Іванавых бацькоў таму, што яны, настаўнікі, не трымалі гаспадарку і прыязджаць да іх было добра. Там цякла рэчка, там можна было адпачываць і пакрасавацца.

Не спяшаючыся, Раіса Міхайлаўна паснедала. Яна ўжо прыдумала, што будзе рабіць. Праз гадзіну яе шэранькія «Жыгулі» прыпыніліся ля хлебнага магазіна, дзе Рая купіла булак, свежага хлеба, селядцоў у вялікай пляскатай бляшанцы.

Праз дзве з паловаю гадзіны Раіса Міхайлаўна была ўжо ў сталічным горадзе, спынілася пры тэлефонеаўтамаце, пазваніла сястры на работу.

— Алёну можна? Хто звоніць? Сястра. Выхадная?.. Дзякуй вам.

Рая здзівілася — сярод тыдня які мог быць выхадны на вытворчасці?

Дом, дзе кватаравала сястра, Раіса Міхайлаўна

знайшла не адразу — ён стаяў у двары, за дамамі. Чатырохпавярховы, зроблены з блокаў, абсаджаны каштанамі, якія давалі многа ценю.

На другім паверсе Раіса Міхайлаўна пазваніла ў абабітыя дэрмацінам дзверы. Дзверы адчыніла ёй пажылая, хударлявая жанчына ў мультановым халаціку і шлёпанцах на босую нагу.

— Алёна дома?

— Не, няма. А вы сястра яе? Заходзьце.

Прыхожая была вузенькая і прыцемная.

— Заходзьце ў залу,— запрасіла жанчына.— Не трэба разувацца. А я вас пазнавала. Алёна гаварыла, што вы прыгожая.

Жанчына зычліва ўсміхалася. Яна была ненамнога старэйшая за Раісу Міхайлаўну, але з яе жыццё забрала шмат сілы і здароўя — жанчына і не састарэла, а завяла дачасна, як вянуць расліны, зусім яшчэ нядаўна зялёныя і свежыя.

Кватэра была чысценькая, акуратна прыбрана, абстаўлена ардынарнаю шырпатрэбаўскаю мэбляй. З-за гэтай чысціні і сціпласці праглядвала беднасць.

— Алёна ў тым пакоі жыве, з дачкой. А я тут, у зале,— паказала жанчына на суседні пакой, у які з зальчыка вялі дзверы. Раіса Міхайлаўна ведала гэтыя пакойчыкі, вузкія, як пеналы.

— Вы сядайце,— жанчына паказала на канапу, сама прысела на крэсла.

— Дзякуй, я ненадоўга. Як Алёна тут?

— Знаеце, добрая, спакойная дзеўчына. Не тое што як цяперашнія многія і з хлопцамі цягаюцца, і выпіваюць, і кураць. Не, яна акуратная. Нічога на яе не скажаш. Да яе ў мяне дзве былі, от тыя што датваралі! І ў хлопцаў прападалі, і сюды прыводзілі. Пакуль я на работу, яны сюды. Адправіла я іх. У мяне свая дзеўка ўжо вырасла.

— А дзе сёння Алёна, чаму ў яе выхадны?

— Яны ж у гэтым бары мяняюцца па днях неяк... Яна часта ў гэтая свае зямлячкі, што яе на работу да сябе ўзяла, бывае. І начуе там. Звоніць нам, праўда, каб я тут не хвалявалася.

— Зямлячка? Адрас яе вы не знаеце?

— Чаму ж, тут Алёна і тэлефон запісала, і адрас.

Жанчына ўзяла ў прыхожай з тэлефоннай палічкі звычайны блакноцік у кардонных вокладках, пагартала яго.

— Во, зараз я запішу вам.

Яна зайшла ў другі пакой, вярнулася адтуль з лістком з вучнёўскага сшытка, падала яго Раісе Міхайлаўне.

— Яна добра ўстроілася. І зарабляе добра, а калі яшчэ гэтая зямлячка яе ўстроіць за прылавак, то і саўсім добра будзе.

— Вы толькі з дачкой жывяце?

— З дачкой,— жанчына зразумела, што мела на ўвазе Раіса Міхайлаўна.— Піў мой многа. Змучыў і мяне, састарэла, ссівела за ім. Развялася, дачку пашкадавала, што свету божага за нашымі сваркамі бачыць не будзе. І ваш таксама піў? Алёна казала, што і вы развяліся.

— Развяліся. Бывайце здаровы,— развіталася Раіса Міхайлаўна.

— Можа, пазваніце Алёне, калі яна там, то яна прыедзе.

— Дзякуй, не трэба. Я на машыне. Заеду па яе,— Раіса Міхайлаўна сказала ўпэўнена, хаця сама нічога не разумела: пра які бар гаварыла жанчына, пра які прылавак, ды і пра зямлячку яна не ведала нічога.

Раіса Міхайлаўна ведала, што Алёна ўладкавалася аператарам на вылічальных машынах, што завочна яна вучыцца ў тэхнікуме. Сястрычкай яна не надта цікавілася, але чула, пра што гаварылі бацькі.

Праз паўгадзіны яна знайшла невялікі з двума

пад'ездамі двухпавярховы домік, які неяк сарамліва схавалі за свае плечы сучасныя блочныя, дзевяціпавярховыя ўздоўж вуліцы. На другім паверсе было толькі двое дзвярэй.

— Ой, Рая, як ты мяне найшла? — Алёна зарадавалася і адначасна разгубілася, стаяла ў дзвярах. За ёй у прыхожай плыло, кружылася блакітнае, у ружовыя плямы святло.

— Дзень добры, сястрычка. Можа, упусціш усё ж мяне?

— Ой, заходзь! Валя, сястра мая прыехала. Я табе расказвала пра яе.

У прыхожую зайшла і павіталася з Раісай Міхайлаўнай маладая жанчына. Яна акінула госцю з ног да галавы хуткім позіркам, ацаніла і нібы параўняла з сабой. Раіса Міхайлаўна таксама ацаніла гаспадыню — яна была маладзейшая.

— Заходзьце.

Пакой засланы вялізным дыванам. Імпартная «сценка», за шклом крышталёвы посуд. Мяккая канапа, крэслы, тэлевізар, імпартны магнітафон і ліхтары святламузыкі.

І люстра, і шторы на вокнах — усё на сваіх месцах. Адчуваўся густ і дастатак.

Пасярод дывана стаяў пыласос, і Алёна хуценька адсунула яго ў кут.

— Адкуль ты, Рая?

— Табе маці нічога не пісала?

— Не.

— Сёння атрымала тэлеграму. Бацька ў бальніцы, маці сама хворая.

— Не, я нічога не ведаю.

— Я на два-тры дні адпрасілася на рабоце. А хто там будзе глядзець старых, не прыдумаю. Ты яшчэ не брала водпуск?

— Не-не.

Алёна пакруціла галавой і паглядзела на гаспадыню.

— Ты можаш паехаць. Фролаўна паходзіць за цябе на работу, а грошы тады аддасі, яна яшчэ і рада будзе.

— Ой, як добра, Валя! Рая, ты на машыне?

— На машыне.

— Тады паехалі! Ты тут, Валя, дагаворышся.

— Дагаваруся. Вы з дарогі, можа, кавы вып'еце? Я хутка,— Валя не магла не запрасіць Раісу Міхайлаўну.

— Дзякуй, іншы раз як-небудзь. Сёння мала часу.

— Рада буду бачыць. Я тут сама кончу,— кіўнула Валя на пыласос і гэтым нібыта канчаткова дазваляла Алёне паехаць.

Калі садзіліся ў машыну, Раіса Міхайлаўна заўважыла, што гаспадыня выйшла на балкон, Алёна бадзёра махнула ёй рукой.

У машыне Раіса Міхайлаўна паглядзела на сястру.

— Мне трэба заехаць дадому, сабрацца.

— А тут што ты робіш? Чаго ты тут прыбірала? Алёна замялася.

— І пра які гэта бар гаварыла твая гаспадыня? Алёна зачырванелася.

— Знаеш, Раечка, ты толькі дома не кажы нічога. Ні ў які тэхнікум я не паступіла. І на работу, думаеш, так проста без прапіскі! А тут Валя, яна з Сінілава сама. Барменшаю робіць у бары. Прапісала мяне. Пакуль што да сябе на работу ўзяла.

— Кім?

— Ну, пасуду прыбраць, сталы.

— Ясна, сястрычка!

— А што табе ясна? Думаеш, я там, як прыбіральшчыца якая? Тут я не тое, што тая аператарша на ІВЦ, а больш, чым інжынер, зарабляю! Дома, канечне, не скажаш, засмяюць. Валя абяцала мяне ўстроіць таксама барменшаю, праўда, трэба сунуць таму-сяму.

— Ну, сястрычка, не думала. Барменша-то барменша, але які-небудзь тэхнікум не памяшаў бы. Не за плячыма насіць...

Раіса Міхайлаўна недзе згаджалася з сястрою — ад навукі і ад дыплома вялікага заработку не займееш. Яе заела, што сястра гэтак сумела змоўчаць і вырашыць, ні словам не абазвалася пра сваё рашэнне.

— Ладна, там не да нас з табой. Як я зразумела, ты можаш пабыць дома колькі трэба? Бо мне на работу.

— Магу, ты ж чула, што Валя сказала.

— Гэта добра.

— А што там з бацькам? Ён жа здаровы быў, не хварэў, рабіў работу.

— Не знаю, прыедзем, паглядзім...

Адвячоркам на двор сарое Міхаліхі заехалі запыленыя шэрыя «Жыгулі».

Раіса Міхайлаўна ўздыхнула з палёгкай, выпрасталася, памахала рукамі. Пасля паездкі па гравійцы машына ўсярэдзіне пакрылася лёгенькім налётам пылу. І сама яна запылілася і адчувала пыл, як непрыемную пудру, на шыі, на руках.

Машыну Раіса Міхайлаўна паставіла на вуліцы, пры плоце, у цяні ад клёна.

Алёна з маці ўжо ўвайшлі ў хату, а з двара было чутно, як маці кляла свіней:

— Каб вы паздыхалі! Пачулі, што я ўжэ на двары!

Усё, што трэба было ад Раісы Міхайлаўны, яна зрабіла, звазіла маці і сястру да бацькі, Алёна аставалася пры маці. Раіса Міхайлаўна магла спакойна выязджаць у адпачынак, на бераг возера. Бацьку яна тут нічога не паможа. Тое, што ад яе залежала, яна зрабіла: дала грошы санітарцы, каб даглядала за ім. Бацька ляжаў забінтаваны і гаварыць нічога не мог. Можа, чуў, што яны гаварылі, а можа, і не. Маленькі ён такі здаўся ёй на ложку, як дзіця. Не той дужы, што ішоў, рабіў, пры-

мушаў іх, яшчэ малых. І шкадаванне было, як да малога, які трапіў у бяду, сам не ведаючы, чаго і куды ўбіўся.

— Лена, ты вазьмі кош, прайдзі вырві зелля! — распарадзілася маці аднекуль ад хлява.

Раіса Міхайлаўна зайшлі на двор, сказала Алёне:

— Утамілася я. Пайду пакупаюся, спаласнуся ад гэтага пылу.

— Ты далей па канаве прайдзі, там завоіна ёсцека. Вада чыстая, плаваць можна,— падказала маці. Яна не збіралася даваць ёй работу. Раіса Міхайлаўна была як госця, якая зрабіла ўвагу тым, што прыехала.— Мы тут з Ленаю самі ўходзімся...

За вёскаю яшчэ асталася стужачка лазняку, вербаў. Як ні асушалі балота, а веснавая вада брала сваё. І там, дзе цёк вясновы ручай, узялася над ім лаза, і ніхто яе не чапаў. Можа, таму, што вясною з трактарамі падысці да яго нельга было.

Цяпер, летам, тут раскашавала трава, і Раіса Міхайлаўна цвёрда ступала па мяккім і густым дыване. Мяцёлкі падсеянае цімафееўкі былі вышэй калена. Ад травы пахла душна і густавата нейкім прыманлівым вільготным халадком. І крышку поплавам, балотам.

Там, дзе канчаліся кусты, парослая лазняком і чырвоным ракітнікам па берагах, ляжала затока. Яна асталася ад старое рэчкі, як лука, пасля таго, калі спрамілі рэчку. І не зацягнулася балотам, і не зарасла, як іншыя, адрэзаныя ад рэчкі, старыцы. Ёй дапамагаў ручай, дапамагалі крыніцы, і вада са старыцы тонянькім ручайком нават у самае засушлівае лета сачылася ў канаву. Абмялела, не тая глыбіня стала, але ад былое ракі ў старыцы астаўся пясчаны бераг. Вада добра награвалася ўлетку. Цяпер, калі не стала ў вёсцы моладзі, тут амаль што ніхто і не купаўся.

Раіса Міхайлаўна раздзелася, асталася ў адным купальніку, прайшла па беразе, па мяккай, доўгай і быццам слізкай траве.

Вакол ляжалі асушаныя, зазелянелыя травой палі-калектары. Там, за кустамі, віднеліся крайнія вясковыя хаты. І толькі з Палянкі — так звалі ўзгорак сярод балота некалі, дзе пасвілі кароў,— значылася вузенькая, выезджаная матацыкламі і веласіпедамі сцяжынка, па якой з дарогі тыя, хто ведаў затоку, прыязджалі сюды купацца. На Палянцы трава была рыжаватая і рэдкая.

Раіса Міхайлаўна адразу ж зайшла ў затоку, легла на ваду, паплыла, потым нырнула, не глыбока, і, як магла, доўга плыла пад вадой. Вада не халадзіла, вада была здаровая, яшчэ не перагрэтая. Потым Раіса Міхайлаўна перавярнулася на спіну і кружыла, плавала, прыплюшчыўшы вочы ад шчодрага сонечнага святла.

Плавала да таго часу, пакуль не стамілася, пакуль усё цела не стала нейкім ватным. На бераг выходзіла стомлена, адкінула з твару валасы. Здавалася, што ад стомы яе пагойдвае ў бакі. Упала на пясок, мякенькі і гарачы, раскінула рукі, цяжка дыхала, супакойвалася, прыслухоўвалася да сонечнае цеплыні, якая не толькі саграvала, але і закалыхвала.

Яна, мабыць, задрамала, бо прахапілася ад таго, што нехта быў побач, рэзка ўскінулася на локці.

— Салют, міледзі!

Збоку ад яе, прысеўшы на пясок, сядзеў хлопец. Загарэлы роўным загарам.

— Табе што?

Раіса Міхайлаўна адчула, што яе поўніць абурэнне, з-за таго, што гэты малады і нахабна ўсмешлівы разглядваў яе.

— Во, міледзі! — хлопец усміхнуўся, паказаў вялікі палец. І падсеў бліжэй.

— Ну ты! — Раіса Міхайлаўна села, азірнулася. Вакол былі кусцікі, цішыня і спакой летняга, пустога ў палях дня.

— А я думаю, хто мой пляж заняў.

Хлопец падсунуўся яшчэ бліжэй, і яна заўважыла, якія шалёныя ў яго вочы.

— Ну ты!..

Раіса Міхайлаўна не дагаварыла. Ён нейк імгненна, па-рысінаму мякка і моцна прыціснуў яе да пяску. І першае, што яна адчула, як горача б'ецца ў ім кроў, якая маладая яго скура...

Раіса Міхайлаўна зайшла ў ваду, праплыла, выйшла з вады.

— Адвярніся, нахал малады!

Раісе Міхайлаўне падабалася камандаваць. На развітанне яна кінула:

— Адзью, д'Артаньян!

— Пачакай! Дзе цябе найсці!

— Сама найдуся. Ну! — прыкрыкнула Раіса Міхайлаўна, калі ўбачыла, што яе кавалер спрабуе ўстаць.

— Слухаю, міледзі!

Ён яе не даганяў. У кустах Раіса Міхайлаўна ўбачыла чырвоны матацыкл і здагадалася, што падкаціў ён з Палянкі.

І дома вечарам, калі слухала бедаванне маці, успамінала пра сваю нечаканую прыгоду, пра якую не ведае, ці раскажа хоць каму, можа, намякне з загадкавасцю.

Раніцаю, калі збіралася ад'язджаць, Раіса Міхайлаўна ўспомніла пра залаты гадзіннік з бранзалетам. Яго не было ні ў хаце, ні ў машыне. Ды яна і сама добра памятала, як распраналася і клала яго там, на цёплым пясочку.

«Зладзюга!» Яна адчувала сябе гуляшчаю, якая яшчэ і заплаціла.

Але нічога не заставалася, як ляпнуць дзверцамі машыны і пакінуць за сабой доўгі хвост пылу на ранішняй вясковай дарозе.

## РАЗДЗЕЛ ДВАНАЦЦАТЫ —

### пра тое, як маёру Пяткевічу не ўдалося паехаць у адпачынак.

Пяткевіч прачнуўся ад сонечнага прамня, які падаў на твар з акна. Гэта быў ягоны летні будзільнік. Пяткевіч любіў сонечныя дні, любіў уставаць з сонечным промнем. Потым ён рабіў ранішнюю гімнастыку, абавязковую ў ягоным узросце, каб мець бадзёрасць на цэлы дзень.

На снеданне гатаваў чай з бутэрбродам і пяшком ішоў на службу.

Па дарозе маёр дагнаў следчага Камара, як заўсёды, адпрасаванага, пры гальштуку. З ім непасрэдна працаваць Пяткевічу не даводзілася, і блізка маёр яго не ведаў.

— Добрай раніцы калегу-пешаходу,— жартаўліва павітаўся Пяткевіч.

— Добры дзень, таварыш маёр.

— А што так нявесела? Раніца вясёлая, начальства яшчэ не выклікала. А гусіныя зладзеі — гэта не такая і бяда.

Пяткевіч толькі ў апошні момант успомніў, што Камару далі весці справу пра кражы свойскай жывёлы ў людзей. Як стары і вопытны работнік, маёр быў упэўнены, што лейтэнанту не пашанцавала. Тут хутчэй за ўсё была работа не нейкіх там прафесійных зладзеяў, а гарадской шантрапы, «дзікіх» турыстаў, якіх цяпер развялося і якія маюць матацыклы і нават легкавікі. З дзяўчатамі тыя гускі і парасяткі з'едзены і запіты вінам, а на Камару павісне нераскрытая справа. Таму маёр жартам і хацеў падбадзёрыць лейтэнанта.

— Тут ужо не гусі, таварыш маёр. Чалавека амаль на той свет не адправілі з-за падсвінка. Яшчэ невядома, ці выжыве.

— Гэта горш. Хоць якая зачэпка ёсць?

— У тым і справа, што ніякай.

— Паглядзі на турыстаў, што прыязджаюць дзікарамі.

— Раёны я падняў. Апытваем. І пастаронніх быццам не было.

— А зачэпка недзе побач, як заўсёды.

Пяткевіч гаварыў больш з-за таго, каб неяк падбадзёрыць следчага. Маёр не ведаў, што праз нейкае паўгадзіны гэтая справа пераляжа на ягоныя плечы, аддаліць такі блізкі адпачынак і рыбалку.

Калі Пяткевіч зайшоў у кабінет начальніка ўпраўлення, там ужо былі капітан Васюкоў і лейтэнант Камар.

Палкоўнік павітаўся з Пяткевічам за руку, запрасіў яго садзіцца і быццам працягваў пачатую і вядомую ўсім прысутным гаворку.

— Дык вось, у мяне пыталася кіраўніцтва вобласці, калі мы скончым з крадзяжамі на вёсцы. Сярод людзей пайшла паніка. Асабліва сярод старых. А мы агітуем, каб трымалі гаспадарку. Справа пра крадзеж набывае іншае адценне. Лейтэнант Камар можа нам далажыць пра тое, што і дзе ўкрадзена. Ды і то, відаць, не пра ўсё. Я не гавару ўжо пра рэзананс з гэтым гарэлачным трубаправодам! Калецтва міліцыянера... Ці не замнога нераскрытага? Чалавек, які не пабаяўся падняць руку на чалавека ў форме, павінен мець на гэта прычыну. За гэта па галоўцы не гладзяць.

Палкоўнік замоўк, нібы задумаўся — гаварыць ці не гаварыць, потым звярнуўся да Пяткевіча:

— Так што, Валерый Паўлавіч, бяры лейцы ў рукі і ўключайся са сваімі хлопцамі ў следства. Па ўсіх трох напрамках.

Пяткевіч зразумеў, што палкоўнік усё ж не дагаварыў нечага.

— Калі што, заходзь, параімся.

Пяткевіч усміхнуўся — цяпер ён быў перакананы, што ў палкоўніка ўзнікла свая версія ці здагадка, але ён не хоча навязваць яе Пяткевічу.

Пра адпачынак не ўспамінаў ні Пяткевіч, ні палкоўнік.

Пасля нарады маёр запатрабаваў у Васюкова і ў Камара матэрыялы следства. Матэрыялу было небагата. У Камара толькі спіс здарэнняў, пра напад на міліцыянера наогул ніякіх звестак — ніхто нічога не бачыў і не чуў, можна падумаць, што хлопец скалечыў сам сябе. Крыху таўшчэйшая папка пра кражу гарэлкі, але зноў следства ўпіралася ў аднаго толькі Гарбуза. А ён не галоўны, ён пешка. Маёр жа паморшчыўся, калі прачытаў пра вынікі праверкі бара, у двары якога стаяла скрыня, дзе пакідаў гарэлку Гарбуз. Гэта была грубая памылка. Нічога не знайшлі, і цяпер, вядома, калі работнікі бара замешаныя ў перапрадажы, нічога ў іх не знойдзеш. Доўга не знойдзеш. Бар «Каштан». Маёр вярнуўся да справы пра напад на міліцыянера. У двары таго самага бара! Ужо паволі, не спяшаючыся, перачытваў маёр медыцынскае заключэнне. Простае супадзенне? А яшчэ якія супадзенні з таго, што ён прачытаў, вынікаюць? Палкоўнік меў на ўвазе гэта ці яшчэ што?

Пяткевіч узяўся перагортваць папку пра крадзяжы на вёсцы. Яны не мелі ніякага дачынення да горада. Вочы спыніліся на заключэнні пра калецтва старога. «Тупым цяжкім прадметам...» Прадмет не ўстаноўлены ні ў выпадку з міліцыянерам, ні ў выпадку са старым. Супадзенне? Пяткевіч адсунуў папку. Гэта ўжо фантазія, а не супадзенні і інтуіцыя...

Маёр узяў лісток паперы і пачаў прыкідваць план работы. Пачынаць неабходна з бара. Трэба пабыць там пастаянна свайму чалавеку. Нехта ж павінен хоць што ведаць! Другое — правяраць тых, хто рабіў на заводзе і меў доступ да ёмкасцяў, мог «урэзацца», з «гарэлка-

праводам». Росшук даводзілася пачынаць, лічы, з нуля. Камару параіць высветліць найперш, ці былі ў дні крадзяжу ў вёсцы ці паблізу прыезджыя, чужыя машыны. Другое, праверыць базар, у першую чаргу тут, у горадзе. На раённых базарах часта не пабудзеш з адным і тым жа таварам. Шукаць збыт украдзенага.

Маёр ужо не думаў пра адпачынак. Яму аставалася верыць, што на летнюю рыбалку ён усё ж патрапіць.

## РАЗДЗЕЛ ТРЫНАЦЦАТЫ,

### у якім Туманоўскі бліжэй знаёміцца з Валеркам Заторам.

Угрэтая за дзень скошаная травяная сумесь густа пахла сокам, лісце гароху звяла і пашарэла. І на сахор нанізвалася многа, як падняць. Мужчына ў клятчастай, гэтак заношанай рубашцы, што на каўняры яна аж пачарнела ад поту і пылу, накладаў траву на воз. Аднак рубашка была зашпілена на верхні гузік, рукавы таксама. На нагах у мужчыны старыя, з працёртымі халявамі кірзавыя боты і шэрыя шырокія картовыя штаны, на галаве невядома як уцалелая шапка-васьміклінка з пупсікам і паламаным казырком. У губах дымілася цыгарэта.

Рабіў ён, здавалася, паволі, як робат, завучана паднімаў і клаў накошанае на воз, і той нібыта сам сабою рабіўся раскладзістым. І конь, здаецца, сам, падбіраючы траву, падыходзіў уздоўж пракоса.

— Прывет, Мачанка!

Мужчына перастаў класці воз, паглядзеў на таго, хто абазваўся да яго.

Мужчына быў у пажаўцелым, не раз камечаным капронавым капелюшы, у гэтакай жа, як і ў Мачанкі, клятчастай рубашцы, рукавы якой закасаны, грудзі наросхрыст. На нагах у мужчыны чаравікі. Да рамы веласіпеда прывязаны кассё і загорнутыя ў анучку косы.

— Здароў, Саша.

— Ты што, і на падвозку пайшоў? Трактароў хіба мала ў вас у калгасе?

— Трактары работу робяць. Старшыня наш так сказаў — няма чаго на трактарах коўзацца там, дзе конь можа зрабіць. І мне выгадна...

— А табе што, даплочваюць?

— А як жа, за падвозку даплочваюць.

— Тады другое дзела.

Мужчына прыкурыў, Мачанка абапёрся на сахор. Ён, як заўсёды, быў зарослы густою кароткаю шчэццю.

— Хаця нашто табе гэтыя грошы... Твой гэты Затор усё роўна прап'е, яшчэ і табе ў карак надае!

— А табе на чорта? Усё косіш, грабеш. Ты ж на пенсіі. Сядзеў бы дзе пад кустом і «чарніла» піў у цяньку.

— Знаеш, Федзя, як варушышся, то і жывеш яшчэ, а як сядзеш — згніеш к чортавай мацеры.

— Яно і так...

— Слухай, а з кім гэта твой Затор лётае на матацыкле? Чуць не знёс мяне на павароце!

— А прыехаў з Мінска да Ермаліцкай сынаў друг. Кажа, на заводзе робіць, водпуск у яго. Чорта водпуск. Сядзіць тут у старое, праядае яе пенсію разам з маім, і цэлыя дні з матацыкла не ссядаюць...

— Я б на тваім месцы скулу яму ў бок, а не матацыкл. Гэтакі бугай вырас, а толку ніякага.

— Хай ён голаў скруціць! А зачапі — б'ецца, гадасць. І жонку б'е, і мяне. Вунь, каровы быў чаргу адпасвіў, пятнаццаць рублёў садраў. Яна яму толькі дзесяць дала. Набіў і запёр у варыўні. Цэлы дзень сядзела, пакуль я з Капыля не прыехаў. Скарэй бы ўжэ ў армію забралі, там, можа, дурату гэту выбілі б.

— Змалку вы яго раздурылі.

— Мая як дурная перла яму ўсё. А цяпер я вінаваты.

— Чуў, што з Міхалём зрабілі?

— Чуў. Навёў нехта, чаго б так палезлі... Ведалі, што стары.

— Што цяпер тут ведаць? Тут і ўсляпую, то папрабуй наскоч на тую хату, дзе мужчына. Маладыя дзе? У новых хатах альбо ў пасёлку.

— Але ж прыгледзелі, што кармляк ёсць.

— Ну, прыгледзелі.

— А ты вазіць будзеш?

— Буду. Пасля абеду.

— Дак у Асінаўку «Лучыстага» прывезлі. Петрыка бачыў на трактары, курэў адтуль. Ты б мо завінуўся на кані. Бо больш жа нідзе, хоць шаром пакаці.

— Давай грошы.

Мужчына дастаў з кішэні складзеныя рублі.

Мачанка зняў васьміклінку, паклаў грошы ў шапку над казырком, надзеў яе на голаў.

— Я вунь там касіць буду,— мужчына паказаў на кусцікі.

— Добра, чакай, заеду.

Мужчына лёгка асядлаў веласіпед, а Мачанка зноў узяўся за работу. Але нешта змянілася ў ягоных руках, спрытней захадзіў сахор.

Праз паўгадзіны падвода з Мачанкам, які сядзеў на ладным пуку травы, каб не трэсла, курыла-пыліла па дарозе да Асінаўкі.

Туды ж па сваёй дарозе ехаў і Тумаоўскі. Праўда, не на веласіпедзе, а ў калгасным «газіку».

Суправаджаў Туманоўскага, як і мінулы раз, сакратар партыйнай арганізацыі. Веласіпед, на якім Туманоўскі зранку прыехаў да канторы, так і астаўся там.

У канторы на гэты раз Туманоўскі застаў старшыню, які ў кабінеце нешта запісваў у блакнот. Ён моўчкі і ўважліва разгледзеў пасведчанне, падаў яго назад. Потым гэтак жа ўважліва паглядзеў на Туманоўскага. Карэспандэнту такое саліднае газеты, здавалася, вы-

магала і выглядаць адпаведна. Само сабою напрошваўся гальштук, касцюм. Гэтая брызянтоўка, як у студэнтаў, якія прыехалі будаваць цялятнік, чаравікі не да твару сур'ёзнаму чалавеку. Але старшыня чалавек ужо вопытны на сваёй пасадзе. Таму ён пастараўся ўявіць Тумаоўскага ў касцюме, пры гальштуку і зразумеў, што выглядаў ён салідна, надавалі гэтай саліднасці акуляры. У касцюме наведвальнік мог быць нават і самім рэдактарам, а не проста карэспандэнтам.

Гаварыў карэспандэнт пра маральна-этычную аснову выхавання моладзі, пра тое, што ён хацеў бы паглядзець, як у іх, у гаспадарцы, як кажуць, сярэдняй, якіх большасць усюды, выхоўваецца моладзь у плане павагі да старэйшых, да іхняй працы... Усё гэта было туманна і ненадзейна. Старшыня ведаў, што цікавіць карэспандэнтаў у кожную пару года. Цяпер сама пара была заняцца тым, як ідзе ўборка сена і як падрыхтаваўся калгас да жніва, як адрамантаваў найперш тэхніку, як замацаваў за ёй механізатараў.

Было зразумела, што, пачынаючы ад гэтае брызянтоўкі і канчаючы гаворкаю пра ўсе праблемы выхавання, гэты Тумаоўскі пускаў туман, каб выведаць усё і выгледзець.

Аднак выгляду старшыня не падаў, наадварот, ён адсунуў убок блакнот і з веданнем справы загаварыў пра ролю і бацькоў, найперш бацькоў, у працоўным выхаванні, і школы. Ён нават дазволіў крыху самакрытыкі з-за таго, што, занятыя выкананнем тэрміновых работ, калгасныя кіраўнікі забываюць пра гэта. Тады і вырастаюць такія, як Мачанкаў Затор.

— Во-во, я якраз пра яго і хацеў распытацца, даведацца ўсё. Бацька яго ж не адсюль, мне гаварылі?

— Затор Мачанкаў — гэта не зусім тыповы выпадак,— старшыня загарнуў блакнот, ямчэй сеў на крэсле. Ён гатовы быў гаварыць пра Затора, як пра лепшую

сваю даярку ці свінарку. Тут небяспекі ніякай для падрыву ягонага калгаснага аўтарытэту не намячалася і не магло быць. Затор фігура адметная ўжо ў раённым маштабе. Ім займалася не першы год раённая камісія па справах непаўналетніх, і, як гаворыцца, персанальна адказнасць клалася ўжо цалкам на раённае звяно і да калгаснага прасачыцца не магла. Старшыня непрыкметна зірнуў яшчэ і на насценны гадзіннік — хутка павінны былі сабрацца ў кантору спецыялісты, а там займацца карэспандэнтам ужо не ягоная, старшынёва, справа.

— Мачанка чалавек не наш. Прышлы ён. Тут меліярацыйныя канавы аплятáлі лазою. Некалі было такое, каб не размывала вада берагі... Ён з гэтымі плетунамі і прыйшоў. За трыццаць было ўжо. Ён на кватэру ў Піліпіхі старое астаўся. Старая хітрая была. Яна ўсё сваёй Вольцы выбірала жаніха. Каб і рахманы быў, і каб багаты. Так і давыбіралася, што сама састарэла і дачцэ недзе пад сорак павяло ўжэ. Тут не да жыру, як кажуць, а быць бы жыву. У акрузе Вольку ведалі, язык у яе доўгі, натура, як у асы.

А тут гэты Фёдар ад лазы. Піліпіха яго і ўзяла на кватэру. А ён і тады быў такі, хоць і маладзейшы. Боты кірзавыя, шапка блінцом, морда непабрытая, а пад вечар у самагонку памочыцца. Адным словам, так ён і жыў, начаваў у будцы ў садзе. У Піліпіхі старое пытаюцца, як, ці жаніх будзе. «Не, галубка, які з яго жаніх. Я яму мачанку з салам і зранку і ўдзень, і вечарам! Аполак сала скарміла, а ён у гэту будку сваю ўлезе і храпе, аж сабака спрасонку гыркае, пужаецца...» Але ўсё ж мачанка, мабыць, памагла, бо Волька пад восень пакруглела, а Фёдар пачаў галіцца, надзеў новую рубашку і штаны. І не пайшоў следам за сваёй брыгадай...

Старшыня ўвайшоў у ролю, але адчыніліся дзверы, зайшлі галоўны аграном, інжынер, сакратар партарга-

нізацыі. Ён павітаўся з Туманоўскім, што старшыню здзівіла, але выгляду ён не падаў:

— Я ў вас прашу прабачэння, Ян Данілавіч. Тут у нас...

Туманоўскі ўстаў.

— Вы можаце якую гадзіну самі пахадзіць тут, агледзець нашу цэнтральную. З усіх бакоў, не толькі з таго боку, з якога мы самі паказваем,— пажартаваў старшыня.

— Не хвалюйцеся, калі ласка. Я зайду пазней, а цяпер не буду перашкаджаць вам.

На здзіўленне старшыні, журналіст не клюнуў на дэмакратычную прапанову, не пайшоў аглядаць цэнтральную сядзібу з «чорнага» боку.

Старшыня паспрабаваў распытацца пра карэспандэнта ў парторга, але той паўтарыў прыкладна тое, што гаварыў старшыні сам Туманоўскі.

— Ён жук вопытны, глядзі, парторг. Ты ў мяне на тое, каб і прыняць чалавека, і паказаць яму. Глядзі...

— Не, у яго другое тут.

— Глядзі мне, глядзі. Калі не даецца на пачастунак, то не настырайся і ў баньку нашу не валачы. А то ён нам потым гэту баньку і распіша...

— Не, ён не такі чалавек. Ён па другой лініі,— паспрабаваў абараніць Туманоўскага парторг, але прызнацца ў тым, што лазню ён паказаў, не адважыўся. На ўсякі выпадак.

Аграном і інжынер цярпліва чакалі, пакуль кончыць гаварыць старшыня з парторгам,— часу ў іх, як заўсёды, не хапала...

Іван Спірыдонавіч быў рады, што журналіст згадзіўся паехаць у Асінаўку. Па-першае, гэта ўжо быў не іхні калгас, суседні. Таму ўсё тое, што там можна ўбачыць, ужо быццам і не датычыла ні Івана Спірыдо-

навіча, ні ягонага калгаса. Да ўсяго гэтага ў яго быў і канкрэтны клопат — паглядзець, хто з іхніх работнікаў сярод рабочага дня пакінуў работу і падаўся «на запраўку».

— Старшыня вам расказаў ужо, адкуль пайшла мянушка Мачанка? З-за тае мачанкі, якой карміла будучага прымака Піліпіха.

— А чаму Заторам завуць меншага?

— Ён хвастаўся, яшчэ як малы быў... Колькі ты, Валерык, вып'еш? Гэта ў яго сам Мачанка стары пытаўся. А той яму — вядро мо не вып'ю, а затор то точна... Затор — гэта выхад з аднае запраўкі брагі ў самагонны апарат. Так і пайшло — Затор Мачанкаў. Выпіўка і закуска разам...

— Вы думаеце, прыклад бацькі прычына? — дапытваўся Туманоўскі. Ён ужо бачыў гэтага ваўкаватага, зараслага шчэццю, невядома адкуль прыйшоўшага Мачанку.

— Як сказаць. Не алкаголік Мачанка. У другіх бацькі і не пілі, і слова лішняга не сказалі, а дзеці жулікамі вырастаюць,— парторг круцянуў рулём, аб'язджаючы выбоіну на дарозе.— Яго маці вінаватая. З малых год насілася — мой сынок, мой сынок. Ні работы яму, ні абазвацца нікому на яго, нават бацьку. Во так і вырас. У школу пайшоў — настаўнікі вінаватыя, што не вучыцца. Сама яна на свінарніку, грошай хапала. А цяпер і ка мне ходзіць, каб памог, і да міліцыі дайшло... Не знаю, што можна зрабіць. У яго ўжо нецярпімасць да людзей. Калі што не па яго... Ён сябе часам спыніць не можа.

Па лагчыне дарога ішла роўная, выцягнутая, як струна, белая на зялёным, як футбольнае поле, абшары. За лагчынаю па ўзгорках цягнулася вёска, у прысадах, у садах, быццам прывялых і прапыленых ад гарачыні.

— Меліяратары дарогу зрабілі. Добрая дарога.

А тут ні праехаць ні прайсці было,— усё роўна як прачытаў думкі Тумаfноўскага парторг.

У вуліцу машына не заязджала. Парторг пад'ехаў да магазіна з калгаснага двара.

З'яўленне машыны зрабіла сваю справу. Адразу ж сеў у кабінку «беларуса» трактарыст, які стаяў тут жа пры трактары і нешта гаварыў з двума мужчынамі. Яны таксама паглядзелі на парторга і на Туманоўскага і рушылі па вуліцы.

Амаль што разам з трактарыстам зняўся з якара і дзядзька на падводзе, нават шлеганануў лейчынаю каню па баку, азірнуўся. Парторг прытрымаў Туманоўскага за руку:

— Во, Мачанка тут як тут. Ужо ганца паслалі.

Цяперашняя падвода на гумавым ходзе пакацілася па вуліцы лёгка і весела.

— А што ён робіць?

— Пры ферме, як падсобны рабочы, ці што. Падвозіць харчы, прыбіраць памагае... Работу сваю ён робіць, нічога не скажаш. Цяпер там, дзе гной і яго прыбіраць, не надта каго і нойдзеш, хоць і плацім добра.

— І што, так ён тут без роду і племя астаўся? — Туманоўскі папытаўся проста так. Невядома, навошта вёз яго сюды парторг, каб паказаць выпівак, якія прыязджаюць да магазіна па віно?

— Не, чаму. Бацька да яго нядаўна прыязджаў. Ён недзе ў заходняй жыве. Акуратны такі дзед. Ён тут і жыў у іх. Нават Затор яго на матацыкле вазіў. Хадзіў усюды, аглядаў. Цікавы дзядзька. Мачанка хваліўся, што ў яго яшчэ два браты і сястра, і жывуць усе добра.

— Даўно гэта было?

— Не, нейкі месяц ці больш там...

— І што далей?

— Нічога, пахадзіў тут, пажыў і паехаў... Стары-то стары, а раніцаю еду раз, гляджу, а ён на матацыкле

па полі шуруе. Я вачам не паверыў: во табе і дзед. Самога Мачанку ні разу не бачыў, каб на матацыкле ехаў, а бацька яго. Пайшлі глянем, што тут робіцца.

У магазіне было прыцемна і халаднавата. Паліцы зроблены паўз сцены.

Бліжэй да кутка сядзела за прадаўгаватым прылаўкам маладая дзяўчына ў сінім капронавым халаціку, стаялі на паліцах трохлітровыя слоікі з гуркамі і кабачкамі, кансервавыя бляшанкі з баршчамі, салянкаю. І ўжо за прадаўшчыцаю на паліцы красаваліся бутэлькі з салодкімі вінамі, якія ніхто не браў, а таксама бутэлькі гарэлкі.

Галоўны тавар штабяліўся скрынкамі збоч ад прадаўшчыцы. І сама бутэлька з «Лучыстым» стаяла на вітрыне крыху асобна.

Прадаўшчыца адказала на прывітанне, устала. Маладая дзяўчына, з вучылішча ці з тэхнікума, якую накіравалі на работу.

— Ну, як вам тавару, завезлі? Надоўга хопіць?

Парторг усміхнуўся.

— Не, паўмашыны толькі. План каб выканала,— дзяўчына прыглядалася да незнаёмых ёй людзей.

Калі выйшлі з магазіна, парторг растлумачыў:

— Мы на перыяд уборкі закрылі ў нашых магазінах продаж спіртнога. А тут як другая рэспубліка. Нашы сюды і лётаюць.

— Іван Спірыдонавіч, вы падвязеце мяне дадому?

— Чаму дадому? У мяне час ёсць, колькі трэба і куды трэба мы з вамі зможам праехаць і паглядзець, пагаварыць...

— Знаеце, я тут яшчэ буду. Праедзем з вамі не раз. А калі ў вас час ёсць, гэта самае лепшае. Паседзімо ў цяньку, пагаворым, каб не спяшацца...

— Тады, можа, у нашу баньку на азерца?

Парторг не хацеў адступацца.

— Можна і ў баньку,— згадзіўся Тумаоўскі. У яго было адчуванне, што галоўнае ён намацаў.

Ад магазіна паехалі па вуліцы. Недалёка ад магазіна парторг аж прытармазіў машыну:

— А во і ваш Затор тут. Паглядзіце!

Проста на вуліцы, у ценю ад старое раскідзістае ліпы, стаяў пры плоце матацыкл. Рослы кудлаты хлопец у расхрыстанай рубашцы, з закасанымі рукавамі сядзеў на лаўцы. Ён быў загарэлы і прыгожы маладой прыгажосцю. І твар рашучы, чорныя бровы аж смылелі на загарэлым твары. Не, гэты сімпатычны малады хлопец не быў падобны на таго, пра каго чуў Тумаоўскі.

Побач з ім сядзеў таксама малады, коратка астрыжаны хлопец, меншы ростам, хоць і налітЫ сілаю ў плячах.

Абодва трымалі па бутэльцы. Яны не спяшаліся. Паміж імі на лаўцы ляжала адчыненая пачка з цыгарэтамі. Абодва курылі, смакуючы віно.

Затор, відаць, пазнаў парторга, ухмыльнуўся наравіста, усімі белымі зубамі.

— А з ім хто?

— А тут да старое аднае госць прыехаў... Сынок у яе ў горадзе. Таксама бяда горкая. Прыслаў дружка на адпачынак. Рыбак рыбака бачыць здаляка. З Заторам сышліся адразу, як хто звёў.

— Даўно?

— Не, тыдзень ці два... Разам шастаюць па вечарынках. Кажуць, гэты госць ужо ў бабкі з пенсіі пазычаць пачынае.

Тумаоўскі ўжо думаў пра тое, што далей росшук яму трэба весці аднаму. Не на машыне і не з начальствам разам. Начальства ўсе ведаюць у наваколлі.



## РАЗДЗЕЛ ЧАТЫРНАЦЦАТЫ,

### у якім зладзеі напалохалі зладзеяў і ўсё абышлося ціха.

Затор ехаў павольна. Яшчэ не пачынала брацца на досвітак. Васька на заднім сядзенні пачынаў драмаць і хістаўся з боку на бок. Тады пачынала вадзіць у бакі і матацыкл. Балела галава. Перад тым як паехаць на танцы, пілі многа, і цяпер усё, што адбылося вечарам, пачынала зліваццa ў нешта адно невыразнае, цёмнае, цяжкае. Мачанка нават не мог добра ўспомніць і твар дзяўчыны, якую ён цягнуў «прагуляцца». Памятае, што рослая, у джынсах у абцяжку. Яна так улупіла яму наводмаш, што разбіла губу. Цяпер губа распухла, павісла, як сліва. Ён не астаўся ў даўгу. Але наляцелі «курткі» — гэтак Затор зваў студэнтаў. Хоць і п'яны, але спалохаўся, зразумеў, што цяпер яму будзе так, як ніколі яшчэ не было. Ад гэтага і раўнуў: «Васька!»

І Васька выручыў. Нават сам Затор здзівіўся, як лёгка адляцелі ўбок два студэнты, потым коратка пстрыкнуў і выпрастаўся ў Ваською руцэ нож:

— Адвалі, шантрапа!

Студэнты не чакалі такога. Васька наступаў на іх, коратка кінуў Затору: «Заводзь!» Затор кінуўся да матацыкла. І ў пару. Першая разгубленасць прайшла. Суха трэснуў выламаны з плота кол.

— Ану, шпана, аддавай нам сваю цацку!

Рослы студэнт пайшоў на Ваську, але краем вока той убачыў, што Затор завёў матацыкл, кінуўся да яго:

— Жмі!

Кінуты наўздагон кол не дастаў.

Цяпер Затор ужо не толькі радаваўся, што вырабіўся цэлым, але і шкадаваў: звязвацца са студэнтамі не варта было. Пасля бойкі і Васькавага ножыка дарога туды закрыта на ўсё лета. А там танцы амаль кожны

вечар, адны ва ўсім наваколлі. Каб не гэтыя штаны ў абліпку...

Васька, які соп усю дарогу, нечакана прачнуўся і ля магазіна скамандаваў:

— Заварочвай!

Затор заехаў за магазін, хаця і не разумеў — нашто.

— Глушы,— загадаў Васька. Ён азірнуўся, прыслухаўся, потым хутка падышоў да дзвярэй складзіка, дастаў з кішэні звязку ключоў. Замок адамкнуў адразу, усё роўна як дадому заходзіў.

— Давай сюды!

У складзіку ён на нейкае імгненне чыркануў запалкай, падхапіў мяшок, які ляжаў на скрынках. Нагою ўдарыў у дзверы, і яны адчыніліся. Тут жа за дзвярыма Васька памацаў рукой, нешта падняў, падышоў да сейфа. Скрыгатнула жалеза. Вочы прывыклі да прыцемку, і Затор убачыў, што Васька шукае ў сейфе.

— Пуста! — Ён сунуў нешта ў кішэню і загадаў: — Чаго стаіш? Давай грузі гарэлку ў мяшок!

Васька зусім працверазеў, памагаў Затору. Укінуў у мяшок кансерваў, пячэння, хлеба. Перад тым як выйсці на вуліцу, паглядзеў у прыадчыненыя дзверы, потым махнуў рукой Затору — выходзь. Дзверы замкнуў за сабой, забраў у Затора мяшок, ускінуў за плечы.

З вёскі выехалі моўчкі. Затор стараўся не газаваць, і матацыкл толькі ціхенька вуркатаў маторам. Ад разгубленасці ён нават не пытаўся — куды ехаць.

— Давай на базу.

Спыніўся матацыкл ля пакінутага пастухоўскага доміка ў засені кустоў і дрэў. Васька асцярожна апусціў на падлогу мяшок.

— Цяпер жытуха! А то мне старая больш грошай не хоча пазычаць...

— І так напазычала!

Затор рагатнуў.

Васька адкаркаваў бутэльку, пацягнуў сам, пера-

даў Затору. Хутка яны спалі на сене моцным і здаровым сном. Дні са тры закадычныя сябрукі нідзе не паказваліся.

Таня прачнулася досвіта. Уставаць яшчэ рана. Соладка спаў побач муж, нават пасвістваў у свой шырокі нос. У ранішнім змроку на ягоным белым твары праступала рабаціннe. Трактарыст, а твар белы, не бярэ ні сонца, ні пыл. Худая жылістая шыя, скудлачаныя мяккія валасы над лысінай. Таня прыўзнялася, абаперлася на локаць, крутаплечая, чарнявая, дагледжаная жанчына: бач, спіць як пшаніцу прадаўшы, і хоць бы што... Здавалася, прайшло гэтулькі гадоў, двое дзяцей прыжылі, а тое даўняе адчуванне непрыязні, якое было і перад выхадам замуж, не знікла, наадварот, паўставала часам у грудзях. Яна тады кідала на яго дзяцей, гаспадарку, якую ён мусіў даглядаць, робячы на трактары. Ехала ў раён на нараду, часам вярталася дадому толькі назаўтра. Вярталася быццам спустошаная, вінаватая перад дзецьмі, але не перад ім.

Нібы ён вінаваты, што перабірала і дабірала кавалераў так, што асталася ў перастарках і сваякі ўжо знайшлі ёй яго ў жаніхі, старэйшага, непрыгожага. Яна і пайшла за яго, каб толькі пакінуць бацькоў з іхнім багаццем, з-за якога яны не пусцілі яе ў горад. Свой рай абяцалі, а яна верыла.

Яна прыехала ў новы прасторны дом, знайшлася чыстая работа — магазіншчыцай. Можна было зайздросціць усяму: рабоце, сям'і, дзецям. Любы тавар дастаць можа, а па цяперашнім свеце гэта не так і мала.

Але ж не, той здрок, які нападаў на Таню і пёр з дому ў прочкі, не праходзіў.

Сёння ёй прысніўся кароткі і брыдкі сон. Саснілася, што вязе яна тавар з Жэнькам — так звалі яго ўсе, хоць у мужчыны даўно ссівела галава. Праўда, ён і ха-

дзіў у джынсавых штанах, і глядзеў на жанчын пахабна. Ехалі яны з гэтым Жэнькам, і завярнуў той з дарогі ў малады сасоннік. Сонца свеціць, дзень, а яны... Таня раптам угледзела, што зусім блізка бягуць да іх Зіна і Анька. З гэтым жахам яна і прачнулася. Дочкі спалі на суседнім ложку разбрыкаўшыся, і над імі сонна яшчэ кружыла ранішняя муха.

Таня ўстала, падышла да дзяцей, папраўіла коўдру, спрытна махнула рукой, злавіла муху, якая настыралася над імі, ускінула на сябе лёгенькую кофтачку, надзела спадніцу, у верандзе ўссунула на ногі растаптаныя рабочыя басаножкі, выйшла на двор. Нават і ранішняга халадку яна не адчувала.

Усё паказвала на тое, што і сёння можа быць «здрок». Прынамсі, так падумала суседка, старая Волька, калі ўгледзела, як пашыбавала на вуліцу Таня.

Таня і сама не ведала, ці гэты самы «здрок», ці нешта іншае, нейкае нядобрае прадчуванне не давала спаць і пагнала раніцай да магазіна — узяць солі, забылася, што дома няма. Магазін быў звычайны, з адным зальчыкам, дзе мясціліся і прадуктовыя тавары, і гаспадарчыя, і прамысловыя. Цяпер на магазінах павесілі шыльды «Тавары паўсядзённага попыту». З зальчыка дзверы вялі ў склад. За магазінам, асобна адгароджаны, быў яшчэ напаўразбураны барак — там некалі прадавалі газу.

Таня, нібы хтосьці вёў за руку, адразу пайшла да дзвярэй склада і, як толькі ступіла на прыступку, угледзела, што замок вісіць не тым бокам. Не трэба і на кантрольку глядзець. Дрыжачымі рукамі дастала з сумачкі ключы, адамкнула замок, адчыніла дзверы, запаліла святло. Дзверы са складзіка ў залу прыадчынены. Таня на нейкае імгненне застыла на месцы, адчула, якімі цяжкімі сталі ногі і рукі. І дзверцы сейфа адчынены. Праўда, сейфам металічную скрынку можна было назваць толькі ўмоўна, і замок там як для

прыклёпу. Грошай не было... Хаця і выручкі за ўчарашні вечар рублёў з дваццаць, не больш, і набралася б.

Ад гэтага Таня паспакайнела, вярнулася ў склад, зашчапіла дзверы на зашчапку з сярэдзіны, агледзелася: у складзе нічога не чэпана, зайшла ў залу, найперш кінула вокам на адзенне. Быццам некранутае. Каракулевае футра вісіць на месцы. За прылаўкам у прадуктовым аддзеле спатыкнулася аб кансервавыя бляшанкі. Выбралі паўскрынкі гарэлкі.

«П'янчугі, каб вас паразрывала!» — Таня аж задыхнулася ад злосці, памкнулася выбегчы на вуліцу, падняць людзей, але ля сейфа спынілася, дрыжачымі рукамі пачала перабіраць шапаткія накладныя. Не, усё на месцы. Уставіла ключ у замок, ён паслухмяна павярнуўся. Замкнула дзверцы сейфа. Дзверцы падкалупілі ломікам, якім яна адчыняла скрынкі. Падабрала з падлогі кансервы і толькі цяпер заўважыла, што з шуфлядаў бралі пячэнне, хлеб таксама бралі. Наводзіла парадак, а сама думала пра тое, што, калі заявіць у міліцыю, магазін зачыняць на рэвізію, усё ператрасуць, пачнуць апытваць людзей, а тады... Ад гэтае думкі стала млосна. Няхай гараць гарам гэтыя грошы і гарэлка! І сама не ў пару прыперлася ў магазін, хто паверыць у тых зладзеяў?

Цяпер яна спяшалася пайсці з магазіна, пакуль спіць вёска. У складзе ўзяла пачак солі, спатыкнулася позіркам на няздадзеных мяшках з-пад мукі. Тады на мяшкі мукі яе быццам ненарокам, жартаўліва падапхнуў Жэнік.

Таня аж перасмыкнулася ад успаміну. Пасля Жэнік і пачаў глядзець на яе, як на сваю. Яна больш не падпусціла яго і блізка, але ён на гэта і не зважаў. І неўзабаве прывёз ён накладныя на дываны. І грошы, у двух пакеціках... Тавар быў афармлены на яе магазін, прададзены, грошы ў касу пайшлі і крыху ёй самой, што ў малым пакеціку. «Не будзь дурная, план будзеш

мецъ і да плана. А не — дачуюцца бабы, чым ты тут са мной займалася». Гэтага яна не надта баялася, свайга вахлака аса́дзіць на месца. Грошы ўзяла, і праўда, больш не мела праблемы з планам — тавар дэфіцытны магла б з базы сабе дастаць... А хто дакажа, што яна і сабе грошы брала?

Калі ўжо шыбавала па вуліцы з пачкам солі ў руцэ, Таня здагадалася, чаму ёй гэтак гнюсна сасніўся сёння Жэнік. Прадчувае душа, што дабром гэта не кончыцца.

Старая Волька здзіўлена глядзела на Таню, якая ляцела з пачкам солі дадому, і вачам сваім не верыла. Але неўзабаве пачула, як тугія струменьчыкі малака цырканулі па бляшанай даёнцы на Таніным двары.

Пасля снедання Таня схадзіла на медпункт, «захварэла», павесіла пра гэта аб'яву на дзвярах магазіна, у канверце адправіла ў сельпо заяву, што пакідае работу па ўласнаму жаданню з-за дрэннага здароўя. Пра гэта ніхто не ведаў, нават муж, а таму ўсёй вёсцы было вялікае дзіва: Таня перадавала сваю «дэфіцытную» пасаду маладой дзяўчыне, якая будзе прыязджаць на работу аж з самага раёна. У гэтым усёй вёсцы была вялікая невыгода, а таму гэтага Таніната «здроку» ніхто не мог ні зразумець, ні апраўдаць...

## РАЗДЗЕЛ ПЯТНАЦЦАТЫ,

у якім сталічныя жыхары
сустрэліся ў раённым аддзяленні міліцыі.

Старшына Вашчылін рабіў абход свайго асноўнага аб'екта — базарнай плошчы. Базар толькі пачынаўся, павільён, дзе прадавалася піва, яшчэ пуставаў. Старшына памятаў базар не такім — людзей збіралася, што не праціснуцца і не прабіцца. Цяпер вазоў не стала, прыязджаюць на машынах. Нарабілі новых паднавесаў і прылаўкаў, але добрая трэць іх так і пустуе. Ля

самага ўваходу цёткі прадаюць малако і тварог. Старшына ведае іх амаль што ўсіх. І пакупнікі ў іх пастаянныя. Многа кветак. Цяпер іх сеюць і прадаюць амаль усе пенсіянеры. Дзве чарнявыя кабеты з семачкамі. Прыезджыя. Не многа людзей і ў магазінчыках на базары. Людзі едуць у горад, у новыя магазіны, там большы выбар. Старшына вітаецца з прадаўшчыцамі. Гэта ў асноўным пажылыя жанчыны. Маладыя дзяўчаткі ідуць прадаўшчыцамі таксама ў новыя магазіны, там моладзі больш.

Старшына выйшаў з магазіна. У вочы кінуўся матацыкл пры плоце. Сюды заязджаць нельга. Знак вісіць. Матацыкл не перашкаджаў тут нікому, і старшына, як кажуць, заплюшчыў на гэта парушэнне адно вока — можа, трэба было падвезці чалавеку цяжкае. Але другім вокам ён усё ж акінуў базар і знайшоў тых, хто прыехаў на матацыкле. Пазнаць іх было няцяжка: адзін так і не зняў з галавы чырвоны шлем, другі насіў яго ў руцэ. Ім, мабыць, і патрэбы не было заязджаць на базар, маглі і прагуляцца ад стаянкі якую сотню метраў.

Старшына пакіраваў да хлопцаў, якія церліся ў гурце ля гандлярак семачкамі. Дайсці да іх старшына не паспеў:

— Таварыш міліцыянер! Таварыш міліцыянер!

Дзяўчына спяшалася насустрач Вашчыліну і паклікала яго амаль шэптам.

— Што такое?

— Таварыш міліцыянер, вунь той, у шлеме, прадае залатыя часікі! Якраз такія, якія прапалі ў мае сястры! А з ім з нашае мясцовасці п'яніца...

— Праверым. Не адставайце.

Старшына Вашчылін не паскорыў хады. Спакойна падышоў да хлопца, узяў яго за локаць.

— Пройдзем, маладыя людзі, са мной.

Ен адчуў, як таргануўся, напружыўся той, каго ён

узяў за локаць, але адразу ж пакорліва расслабіўся. Сілу старшыны Вашчыліна ён адчуў і зразумеў, што вырывацца не варта, пакуль цябе трымаюць далікатна. Ні адзін вясковы здаравіла, які спрабаваў буяніць на базары, больш на гэта не адважваўся.

— А што такое?

Другі, са шлемам у руцэ, адскочыў, як пеўнік, убок, гатовы даць дзёру.

— Парушаем правілы...

Той, са шлемам, на хаду надзяваў яго на голаў і бег да матацыкла. Старшына памкнуўся даганяць яго, але ўспомніў, што гадзіннік у гэтага, якога ён трымае. Уцекача ведае дзяўчына, нікуды ён не дзенецца.

— Пайшлі ў аддзяленне! І вы з намі,— загадаў старшына дзяўчыне.

Залатыя гадзіннікі на базары не прадаваліся ўжо даўно. І хлопец невядомы, прыезджы. Старшына быў перакананы, што ўсіх у раёне ён ведае, а чужых нюхам чуе.

— Пусціце руку, я сам пайду.

— Нічога, мы лепш з табой пад ручку, як бацька з сынам.

Ад хлопца несла перагарам, і ўжо з-за гэтага веры яму старшына не даваў.

Новы двухпавярховы будынак міліцыі быў непадалёку ад базара.

— Здравію жалаю, таварыш капітан! Каб не нудна табе было, прывёў маладога чалавека.

— Што такое?

Дзяжурны павітаўся з Вашчылінам.

— Дзяўчына гаворыць, што часікі яе сястры. А іх гэты малады і непахмелены прадаваў на базары. Сябручок яго ўцёк на матацыкле.

— Дзе гадзіннік?

Хлопец нехаця дастаў з кішэні жаночы гадзіннік з бранзалетам.

— Я пайшоў, капітан.

— Ідзі, старшына.

Дзяжурны набраў нумар тэлефона.

— Семежаў? Слухай, тут Вашчылін прывёў кадра. З базара. Залатыя часікі прадаваў. Ці не з таго магазіна, што ты вядзеш? Заходзь, разбярыся з гэтым маладым...

Дзяжурны не заўважыў, як наструніўся затрыманы пры слове «магазін». Цяпер ён не рады быў, што папёрся прадаваць гадзіннік на базар. Трэбы было дастаць грошай на білет, а гадзіннік збыў бы ў сталіцы. Трапіў у лапы міліцыі, як мокрая курыца, у нейкім зачуханым гарадскім пасёлку. Хлопец яшчэ не прыдумаў, што гаварыць, як з калідора выйшаў малады мужчына ў цывільным касцюме. Дзяжурны кіўнуў на хлопца і на дзяўчыну.

— Прашу,— коратка не запрасіў, а загадаў мужчына і паказаў рукой у калідор.

Хлопец пайшоў першы, скоса і злосна паглядзеў на дзяўчыну. Мужчына ішоў ззаду.

— Сюды,— паказаў ён на кабінет, дзверы якога былі адчынены.

Мужчына сеў за стол, кіўнуў на дзяўчыну:

— Расказвайце.

— Таварыш...— Алёна замялася. Яна пазнала міліцыянера. Валін знаёмы. І гэты стрыжаны таксама здаваўся знаёмым. Лена насцярожана азірнулася на хлопца, потым на чалавека за сталом.

— Можаце зваць мяне проста — таварыш лейтэнант.

Мужчына ўсміхаўся з Алёнінай разгубленасці і глядзеў на яе роўна і спакойна.

— Таварыш лейтэнант, ён падыходзіць на базары да мяне — і часікі купі, кажа. Глянула я — Раіны гэта часікі, сястры мае. Яна прывозіла мяне ў вёску. А перад ад'ездам шукала часікі — і не магла знайсці. Гава-

рыла, што яны ў машыне ў яе ляжалі. Машына на двары начавала...

Дзяўчына паглядзела на хлопца.

— А з ім тут на базары і Затор наш круціўся...

— Як ваша прозвішча?

— Рудзь Алёна... Алёна Міхайлаўна.

Лейтэнант падняў на яе вочы, нібы хацеў нешта папытацца.

— Гэта на майго бацьку напалі зладзеі,— растлумачыла Алёна. Лейтэнант зацікаўлена паглядзеў на яе.

— Як вас, малады чалавек, зваць-называць?

— Васька, Васіль Аляхновіч,— коратка і насцярожана адказаў хлопец.

Алёна зірнула на яго — знаёмы і голас, і гэтая круглая, коратка астрыжаная галава.

— А па бацьку?

— Васільевіч.

— Адрас.

— Які адрас?

— Пастаянна дзе жывяце?

— У інтэрнаце, у горадзе.

— Адрас мне трэба.

— Скажу і адрас.

Лейтэнант запісваў хутка.

— Чаго тут апынуліся?

— У водпуску. У друга жыву.

— Гэта ён з вамі быў?

— Не, гэта другі...

Васька на імгненне замяўся — ці называць Валерку.

— Затор Мачанкаў з ім... Гэтакі ж п'яніца і жулік,— не ўтрывала дзяўчына.

— Ведаем твайго дружка.

Лейтэнант пільна паглядзеў на Ваську, усё роўна як прыцэньваўся.

— Дзе ўзяў часікі?

— Падарылі мне,— нечакана ўхмыльнуўся Васька.

— Хто табе падарыў? Хто? Укралі разам з Затoрам, каб прапіць?

Алёна раззлавана завярнулася да хлопца і зноў злавіла сябе на тым, што бачыла, ведае яго.

— Сястрычка твая. Яшчэ мяне на машыне павазіць абяцала.

Васька зноў ухмыльнуўся. Ён не пазнаваў яе, бо там, дзе бачыліся, не звяртаў увагі на тую, што прыбірала са стала.

— Аляхновіч, адкуль у цябе гадзіннік?

— Я ж сказаў. Паехаў на Валеркавым матацыкле пакупацца. А там, на купальні, мадама на пясочку. Не маладзенькая, але нічога яшчэ... На яе падобная.

Васька ўхмыльнуўся.

— Спадабаўся ёй малодзенькі мальчонка. Паплавалі потым, на машыне павазіць яшчэ абяцала.

Пра машыну Васька прыхлусіў. Ён быў перакананы, што «мадама» нікому не прызнаецца пра тое, што было на беразе, і пра тыя «часікі». Васька іх сціхача ўсунуў у кішэню.

— Нахал! Злодзей ты, як і Затор твой!

Васька ўвайшоў у ролю і адчуваў сябе на кані. Ён цяпер зразумеў, што сказанае дзяжурным «магазін» не мела дачынення да таго магазіна, дзе яны пабывалі з Заторам.

Лейтэнант спакойна і нават абыякава глядзеў на затрыманага. Ён яшчэ ў дзяжурнага, як толькі ўгледзеў гадзіннік, зразумеў, што ён не з вітрыны універмага — там не было падобных гадзіннікаў. Цяпер Семежава зацікавіла толькі тое, што Алёна апынулася тут, што яна дачка таго самага старога.

— Так што прашу часікі назад,— Васька нават руку працягнуў. Маўчанне лейтэнанта ён зразумеў пасвойму.

— Дакументы.

— Нашто?

— Калі няма пашпарта, давядзецца пагасціць у нас, пакуль мы праверым, хто вы такі і ці праўда, што часікі вам падарылі.

Васька з палёгкай выдыхнуў: пашпарт у яго быў з сабой. Васька дастаў яго і падаў следчаму. Той зрабіў выпіскі і аддаў дакумент назад.

— Прайдзіце да дзяжурнага і на яго імя напішыце тлумачэнне, тое, што вы мне гаварылі. А вы, Рудзь, напішыце заяву. І адрас свае сястрычкі ўкажыце.

Лейтэнант зняў трубку. Краем вока ён заўважыў, як з палёгкай выскачыў з кабінета хлопец. Дзяўчына замялася, азірнулася на Семежава.

— Вы хацелі яшчэ нешта сказаць?

— Я ўспомніла, дзе бачыла яго.— Алёна кіўнула на дзверы.— У нас у бары... Ен ходзіць рукі ў кішэні, і яго ўсе баяцца...

— У якім бары?

— «Каштан» называецца.

— Ну і што?

— Нічога, толькі я падумала пра бацьку, калі ўспомніла яго...

— Што вы хочаце сказаць?

— Нічога. Проста падумала...

— Калі бачылі Аляхновіча апошні раз там, у бары?

— Даўнавата... Да таго, як міліцыянера найшлі ў двары, ля бара... Больш ні ён, ні яго лысы інжынер у нас не паказваліся...

— Ладна, Рудзь. Ідзіце напішыце заяву і пакіньце ў дзяжурнага. Мы пашлём запрос вашай сястры. А таго, хто напаў на бацьку, знойдзем...

Семежаў устаў, гэтым самым даў знак, што Алёна можа ісці. Ен здагадаўся, што яна пазнала яго, але так і не адважылася нават намякнуць на тую сустрэчу, нават папытацца, ці гэта ён быў там.

У панядзелак Камар пазваніў Семежаву: Семежаў нічога новага пра расследаванне справы старога сказаць не мог.

— Шукаць трэба, Паша, а не сядзець там,— голас Камара быў нават па-начальніцку не задаволены.

— Гэта не табе там. У нас не наседзіш. Сярод бела дня з вітрыны універмага гадзіннікі выбралі. Шукай. А хутчэй за ўсё вашы сталічныя кадры тут пагасцілі,— агрызнуўся Семежаў.

— Цікава, на каго вы спісвалі б, каб не было гарадскіх? У вас усе там святыя...

— А ты знаеш, каго я тут сустрэў? Тваю Алёну... Тую, тую. Толькі яна, аказваецца, у бары сталы прыбірае,— Семежаў хацеў дапячы Камару.— А ты яе, як інжынершу, абходжваў. У тым бары, дзе на міліцыянера напалі. Ну як было? Вось так і было...

Семежава здзівіла, што Камар не звярнуў увагі на ягоную з'едлівасць. Ён вымушаны быў падрабязна расказаць пра ўсё, што адбылося ўчора ў ягоным кабінеце.

— Вось што, Семежаў. У следства ўключы Пяткевіча і яго аддзел. Усё, што толькі новага, паведамляй мне альбо адразу маёру. І сам варушыся.

## РАЗДЗЕЛ ШАСНАЦЦАТЫ —

пра тое, як Тумаоўскі апынуўся ля доміка пастухоў.

Круг даследаванняў для Тумаоўскага акрэсліваўся: сям'я Мачанкі, выхаванне сына ў сям'і. Потым школа... Чаму Затора цягнуць да атэстата, Тумаоўскі ведаў — каб не псаваць агульны паказчык па ўсенавучу. Сустрэчу ён рашыў пачаць з сакратара камсамольскай арганізацыі школы. Яго Тумаоўскі застаў дома. Дакладней — яе. Дом трактарыста Булыкі ён пазнаў адразу: у вочы адразу кідаўся пафарбаваны сіняй фарбай плот, жалезная брама з варотцамі. Ад варотцаў да ганка вымашчана бетоннымі пліткамі дарожка. Перад

хатай кашлата стаяў малады, урадлівы садзік. Сама ашаляваная хата пафарбавана ў мяккі колер. Для хлявоў, якія зроблены збоч хаты, быў выгараджаны асобны двор.

Ва ўсім адчуваўся дастатак і спраўная гаспадарская рука.

На двары маладая жанчына мыла бялізну. Шумела пры верандзе пральная машына. У садзе між яблынь ужо віселі белыя прасціны і навалачкі.

Тумашоўскі міжволі прыпыніўся перад варотцамі і загледзеўся на жанчыну, якая стаяла бокам да яго і выкручвала мокрую бялізну, складала яе ў белы эмаліраваны таз. Рухі яе загарэлых залацістых рук былі нетаропкія, ласкавыя. Жанчына кончыла выкручваць, тыльным бокам ладоні адкінула з ілба грыўку валасоў.

Яна адчула позірк Тумашоўскага, азірнулася.

— Дзень добры,— павітаўся ён.

— Дзень добры.

— Тумашоўскі. Карэспандэнт газеты...

Дзяўчына не здзівілася:

— Бацькі няма дома.

— Я не да бацькі... Я да Тані.

— Я Таня.

Тумашоўскі разгубіўся. Чамусьці сакратар уяўлялася яму выдатніцай у акулярах, а не гэтай маладой і дужай дзяўчынай.

Дзяўчына змахнула мокрай анучкай лаўку, запрасіла садзіцца і села сама, паказваючы, што гатова слухаць Яна Данілавіча.

— Я з вамі пра Затора пагаварыць хачу,— пачаў Тумашоўскі і заўважыў, што дзяўчына не здзівілася.— Як вы, камсамольцы, гледзіце на яго? Чаму не паставіце на сваё месца?

— Чаго не паставім? Знаеце, а яго і ў школе трымаць нельга. Ёсць правілы для вучняў, праўда?

Дзяўчына ўпэўнена глядзела на Тумашоўскага чы-

стымі блакітнымі вачыма. Яна не спяшалася тлумачыць.

— Усё ж цэлая школа, камсамольская арганізацыя...

— І вы за тое, каб мы прынялі яго ў камсамол, а потым перавыхавалі?

— Пры чым тут прыём у камсамол?

— Наш участковы так хацеў.

Дзяўчына ўсміхнулася. Тумано ўскі ўспомніў, што такія дзяўчаты спакойна і ўпэўнена выступаюць на сходах. Маладыя, прыгожыя, упэўненыя ў сабе.

— І што вы?

— Мы сказалі, што і так на яго ўздзейнічаем. У школе ён не хуліганіць.

— Як?

— Вельмі проста. Нашы хлопцы некалькі разоў пагаварылі з ім яго ж метадамі. Такія, як Затор, смелыя там, дзе на іх сілы няма. Яго каб бацька малога на сваё месца паставіў, нармальны б чалавек быў. Пойдзе ў армію, там з яго вылецяць усе гэтыя дурныя мухі.

Дзяўчына была ўпэўнена ў тым, што гаварыла.

Тумано ўскі падумаў, што яна і сапраўды выдатніца і, мабыць, «ідзе на медаль», атрымае яго, паступіць у інстытут, выдатна кончыць і потым будзе на нерадавой рабоце.

Тумано ўскі не сумняваўся, што з-за гэтага прыгожага важака хлопцы-старшакласнікі ў школе паставілі на сваё месца Затора. Дзіва ў гэтым не было.

Тумано ўскі ўстаў. Дзяўчына таксама паднялася.

— А вы што, будзеце пісаць на маральна-этычныя тэмы?

— Не знаю.

Тумано ўскаму не хацелася адказваць на пытанне дзяўчыны. Здалося, што ў ім было крыху насмешкі ці скептычнасці.

— Пра яго пісалі ўжо. І ў нас у раёнцы, і ў абласной.

— Можна і не пра яго. Чаму толькі пра яго? Ён не ў лесе жыве. І не ў лесе вырас. Чаму такі вырас? Бывайце здаровы.

— Усяго добрага.

Дзяўчына правяла Тумаоўскага да веснічак.

Калі ён сядаў на веласіпед, пачуў, як у двары зноў роўна зашумела пральная машына.

Цяпер ужо Тумаоўскі бачыў свой матэрыял цалкам, бачыў той паварот, якога не хапала яму. Трэба напісаць не пра самога дрэннага Затора, а пра тое, як і чаму стаў ён такім сярод сваіх людзей. Чаму ніхто не ўмяшаўся, ніхто не памог, і цяпер чакаюць, спадзяюцца на добрага дзядзьку. І ўсе фармальна не маюць за гэта віны. Усе фармальна чыстыя. Тумаоўскі ведаў і тое, з чаго пачне артыкул,— з апісання, як праходзіць дзень гэтага Затора, хроніка яго пустога жыцця з дня ў дзень.

Калі за сталом у абед Тумаоўскі зноў загаварыў пра Затора, Вера нечакана сказала:

— Што ён робіць? Нічога. Блытаецца на матацыкле... Некалі і мой з ім піў. Гэты ж Затора вото закруціцца і адкуль хочаш таго «чарніла» прывалачэ. Яшчэ і з гэтым сватам Мачанкавым піў.

— З якім?

— Прыязджаў аднекуль. Гасціў тут доўга. Гэтакі самы апівоша, як і сам Мачанка, як і Затор гэты яго. Унучак яго на матацыкле і вазіў усюды. Смеху было перад ад'ездам. Павёз гэты Затор яго ў Сярэдніке. Мачанчыха на дарогу і закускі ўжо свату наклала, мо і бутэльку. Каб толькі даехаў дадому, не памёр з голаду. Як павёз яго гэты Затор, дык і сам прапаў. Тут усхадзіліся, пачалі шукаць яго. Дзень, і два няма, і тры няма. Недзе ж бы паказаўся. Пазванілі і ў міліцыю,— не, не сядзіць там. Бяда. Адале нехта прыгледзеў. А яны, і

старыі малы, абодва роўныя, не на поезд, а ў домік. Тут на высушаных балотах пастухам домікаў настаўлена. Летам, дзе не пад пашу, там ніхто і не бывае. Вон яны заехалі ў той домік і сядзелі там, пакуль закуска была і не папілі ўсю гарэлку, што з сабою набралі. Дык пасля гэтага сама Мачанчыха запрэгла каня і павезла свата ў Сярэднікі, каб на поезд пасадзіць. А так бы ён ад яе і не выехаў бы. Так што ў іх парода такая. Во, як гэты павой,— Вера кіўнула на густую зелень павою, якая ўчэпіста спляласся, ахіліла веранду, закрыла ад сонца. Павой цвіў пяшчотнымі ружовымі кветкамі.— Здаецца, што і зялёны, і харошы, а так усё затуліць, загноіць, што пасля яго і на рамах, і на ўсім гнілая чарната. Такія і людзі ёсць. Пад гэты павой дык хоць яшчэ, як надаесць, чыгун кіпню раз-другі вылье́ш, дык і згіне... А гэта ж людзі быццам.

Тумано́ўскі чуў яе ўжо адным толькі вухам. «Чорны павой» — гэтак ён назаве свой артыкул.

Адразу ж пасля абеду Тумано́ўскі сеў на веласіпед і выправіўся на асушаныя балоты.

Першы дашчаны хляўчук быў недалёка за вёскай. Яго даўно прыкмеціў Тумано́ўскі, толькі не ведаў, нашто гэта дашчаная пабудова ў лузе за кустамі. Здалёку яна надта ж нагадвала адпаведную ўстанову для грамадскага карыстання.

Хляўчук быў замкнуты на вялізны, як сабака, вісячы замок. Тумано́ўскі прысланіў да сцяны веласіпед, зазірнуў у хляўчук праз невялікае закрачанае акенца. Там пуста, толькі ў куце ляжала згрэбенае ў кучу леташняе сена, якое, мабыць, служыла пастухам за пасцель. Не відаць, каб да хлеўчука хоць хто і падыходзіў за ўсё лета. І замок роўна пакрыты чырванаватым іржавым налётам.

На лёгкую ўдачу Тумано́ўскі і не разлічваў. Ён гатовы быў да ўпартага пошуку. У яго і тактыка пошуку ўжо ў галаве склалася. Узгоркамі, па грудáх, ён наў-

круга аб'едзе ўсё асушанае балота. З узгоркаў яму ўсё будзе добра відаць, не праміне ніводнага хлеўчука.

На павер аказалася, што гэтыя хлеўчукі стаялі так, што і да іх, і паміж імі не было ніякіх, ні вялікіх, ні малых, сцежак-дарожак. Нават болей, амаль усе гэтыя хлеўчукі і не замыкаліся. І акрамя старое пацярухі, у іх — нічога.

Калі ўжо пачало змяркацца, Тумаоўскі нявесела згадзіўся з тым, што артыкул «Чорны павой» давядзецца пачынаць не з апісання «берлагу», у якім хаваецца ад людзей малады чалавек.

Туманоўскі вёў веласіпед у руках. Ад апошняга хлеўчука да дарогі, якая ішла па ўзгорку, аставалася кіламетра паўтара. Трава стаяла вышэй за калена, густая, моцная, як дрот. Ногі гудзелі ад язды і ад хадзьбы.

Туманоўскі спыніўся, выцер спацелы лоб рукавом курткі, азірнуўся: старое балота яшчэ давала напамінак пра сябе. Нягледзячы на спякотныя дні, на суш, якая стаяла навокал, а на ноч, у самых лагах, над канавамі пачынала слацца лёгенькая бялявая намітка. Туманоўскі ўспомніў, як гаварыла Вера, што недзе тут, на канавах, асталася яшчэ старая крынічная старыца, абрасла кустамі, і туды ходзяць нават у самую спякоту купацца. Ён пачаў азірацца навокал. І ў купцы асінніку заўважыў яшчэ адзін хляўчук. Але гэтае адкрыццё не ўзрадавала Туманоўскага. Ён злавіў нават сябе на думцы, што лепей бы не ўгледзеў ён гэтага хлеўчука. Не хацелася мучыць ногі па густой траве. Але ён усё ж пайшоў. І калі падышоў бліжэй, сэрца страпянулася: да хлеўчука быў след. Да яго і пад'язджалі, і падыходзілі. Туманоўскі паклаў веласіпед у кусты, асцярожна падышоў да хлеўчука. На прабоі быў замок, але павернуты старчма, дужка ўніз. Ён узяўся за замок. Здагадаўся правільна — замок не замыкаўся.

Знайшоў! Сена наслана свежае, завалена парожнімі

бутэлькамі. У куце вялікая абшарпаная сумка, поўная бутэлек, кансервы, хлеб...

Адразу ж успомнілася, што гаварыла Вера пра абкрадзены магазін.

Тумаюўскі асцярожна і хутка выйшаў з хлеўчука. Калі выйшаў, азірнуўся. Светла, па-летняму няспешна надыходзіў вечар, ціха было, і ад гэтай цішыні, здавалася, пачынала звінець у самога ў вушах.

Толькі пасля таго, як падняў веласіпед, каб ехаць, Тумаюўскі крыху апамятаўся. Ехаць і званіць у міліцыю? А што ён скажа? Што бачыў бутэлькі? Бутэлькі так і астануцца бутэлькамі. Патрэбен той, хто прынёс гэтую здабычу. Туманоўскі на імгненне нават уявіў, як высачыць ён зладзеяў. Во будзе пачатак артыкула.

Туманоўскі замаскіраваў веласіпед і сам прысеў за кустом, глядзеў на сцяжынку і чакаў. Вечарэла, стома брала сваё, і Туманоўскі нават пачаў паклёўваць носам.

Ачнуўся Туманоўскі ад таго, што нешта моцна шарахнулася ў яго ззаду за кустом. Ён падхапіўся на ногі, завярнуўся, каб угледзець, што там ці хто, але нічога ўгледзець не паспеў: нешта балюча пеканула яго ў лоб, у вачах нібы разляцелася на кавалкі, а потым на густы рой драбнюткіх іскарак.

## РАЗДЗЕЛ СЕМНАЦЦАТЫ,

### у якім маёр Пяткевіч сваім рашэннем ратуе Туманоўскага.

Маёр Пяткевіч паволі ішоў бетоннай набярэжнай. Скрозь плыткую ваду было відаць пазелянелае, загнанае тванню дно. Ён знарок выйшаў з упраўлення, каб абдумаць усё, улічваючы апошняе паведамленне Камара, якому сам следчы не надаваў асаблівага значэння і якое ўстурбавала Пяткевіча. Гэта было прадчуванне ўдачы. Цяпер неабходна ўсё ўзважыць, не зрабіць памылковага ходу.

Самае дзіўнае, што ў час росшуку найбольш фактаў

раскрылася ў сувязі з крадзяжом жывёлы. Крадзеж у людзей — гэта толькі асобныя выпадкі ў параўнанні з тым, што за апошнія гады прападала з калгасных пашаў, летніх лагераў, са свінарнікаў. Значыць, працаваў добра наладжаны канвеер. Першыя праверкі сталічнага базару, абласнога цэнтра не далі вынікаў. Камар рыхтаваў карту месцаў, дзе адбываўся крадзеж. Яна павінна паказаць месца збыту накрадзенага.

Бетонная набярэжная кончылася. Пачалася мяккая сцежка паўз самую ваду да старога моста, які служыў цяпер толькі пешаходнай пераправай. Па мосціку Пяткевіч перайшоў на другі бок. Тут на прасторнай лугавіне дзічэў недагледжаны парк. Над вадой нізка нахіляліся старыя пакручастыя вербы, ніжняе ніцае галлё даставала да самай вады. Пад вербамі вада здавалася чорнай, застылай, як смала.

Праверка на гарэлачным заводзе пакуль што не дала жаданых вынікаў, злавілі толькі двух «несуноў». Дзяжурства ў бары таксама не прынесла новых звестак. Адна толькі з пастаянных неведвальніц успамінала пра нейкага інжынера, у якога надта добрая дача за горадам, і пра «баксёра», які заўсёды з ім. Пасля таго як Камар далажыў маёру пра падазронага хлопца, на якога выйшла раённая міліцыя там, дзе пакалечылі старога, маёр успомніў гэтую інфармацыю. Маёр памятаў медыцынскае заключэнне пра калецтва і міліцыянера, і старога: «удар тупым цяжкім прадметам». У сувязі з гэтым выплывала ў памяці клічка «баксёр». Кулак баксёра можа быць такім прадметам. Не, гэта хутчэй жаданне, а не вывад, нават не інтуіцыя... Праверыць, асцярожна праверыць усё па парадку.

Сказаць пра сваю версію Пяткевіч нізавошта б нікому не адважыўся — надта ж розныя былі справы, каб звязвацца ў адну. Ён вярнуўся ва ўпраўленне і распарадзіўся перадаць у раён — затрымаць хлопца і прывезці да яго. Дзяўчыну таксама запрасіць на гутарку.

Семежаў троссяў прапыленым «газіку» і лаяў былога аднакурсніка. Яму, Семежаву, Камар даручыў даставіць Аляхновіча. А таксама Алёну. Ужо потым, пасля гаворкі з Камаром, Семежаў спахапіўся, што не ўдакладніў, як дастаўляць у абласное ўпраўленне Алёну. Пра хлопца было сказана зразумела і канкрэтна, а пра Алёну — што з ёю хоча пагутарыць Пяткевіч. Рашэнне з Алёнаю Семежаў прыняў сам — выпісаў ёй выклік на імя Камара і даў яго тэлефон. Няхай Камар разбіраецца сам, як хоча. Не будзе ж ён браць яе на ноч і трымаць пад замком.

Ля хаты Міхаля Рудзя Семежаў міжволі акінуў вокам тое месца, дзе знайшлі знявечанага старога, быццам цяпер мог знайсці тут нешта такое, што б магло дапамагчы следству. Алёну ён пазнаў, калі машына яшчэ не пад'ехала да варотцаў. Яна ў кароценькім халаціку праганяла ад двара вялізную чараду цяжкіх белых качак. На нагах у яе былі пляжныя гумавыя шлёпанцы.

— Што б вы падохлі! Не накорміш вас!

Яна збянтэжылася Семежава.

— Добры дзень,— павітаўся Семежаў і сурова зірнуў на шафёра, які падміргнуў яму.— Вам, Алёна Міхайлаўна.

— Ну што, праверылі? Сестрыны часікі?

— Не. Сястра ваша пакуль што ў водпуску...

— Як у водпуску? Яна ж сказала...— Алёна не дагаварыла, асеклася, пачырванела.

— Заўтра вам трэба вярнуцца ў горад. Пазваніце па гэтым тэлефоне, вам скажуць, калі прыйсці.

Дзяўчына асцярожна ўзяла паперку.

— Усяго добрага,— развітаўся Семежаў. Ён усміхаўся сам сабе з таго, якая фізіяномія будзе ў праведнага Камара, калі да яго на гутарку прыйдзе тая самая, з кім ён парыўся разам у лазні і якую праводзіў ноччу ў горадзе.

Пра тое, як знайсці хату, дзе спыніўся Аляхновіч, Семежаў распытаўся ў мужчыны. Ён, пакуль адказваў Семежаву, прыглядаўся да міліцэйскага «газіка», да сяржанта, які кляваў носам. Семежаву здавалася, што сяржант спіць не толькі цэлую ноч, але і цэлыя дні і не высыпаецца: колькі яны ні выязджалі разам, сяржант шчыра драмаў. Мужчыну не здзівіла, што міліцыя пытаецца пра Аляхновіча.

Хату Семежаў пазнаў адразу. Яшчэ і не старая, і моцная, яна быццам бы неяк асела крыху, прытулілася да зямлі і прытаілася. Гэта, можа, здавалася ад таго, што паўз платы густа і высока прабівалася зелле, зусім звузілася, зарасла спарышом сцяжынка на двор, вісеў на адным цвіку кол у плоце, скрэблі і прарэзалі канаўку ў зямлі стаўбцом абвіслыя варотцы... У такіх хатах дажывалі адзінокія старыя.

Старая была на двары. Стаяла пры высакаватай калодцы і секла галлё на дровы. Тут жа ляжала і вязанка сухога галля, невялікая, перавязаная тасьмовым пастронкам. Паўз сцяну галлё было складзена роўным кастром. Старая запасалася на зіму.

— Змерзнеце, цётка, па такіх дровах,— сказаў Семежаў.

Бабулька падняла галаў, паклала на калодку сякеру. На Семежава паглядзелі сінія спакойныя і сур'ёзныя вочы.

— Дзень добры,— павітаўся Семежаў.

— Дзень добры.

Старая яшчэ глядзела на яго, чакала, што ён скажа і чаго ён тут.

— А дзе ваш Васька? — папытаўся Семежаў.

— А-а,— старая з палёгкаю расслабілася.— Чорт яго ведае. Ён, бывае, па некалькі дзён не паказваецца, бадзяюцца з гэтым Заторам. Звёў гасподзь бог пару!

— Ён унук ваш?

— Які ўнук! Унукі ў мяне малыя... Мой дурань па-

кінуў жонку, а цяпер сам бадзяецца, прападае.

Старая кіўнула галавою, нібы паказвала і на хату, і на агарод.

— Мо каб быў тут, то не распіўся б і не разбасячаў так. Унукі б прыязджалі. Памог бы мне троха, то я і карову б яшчэ яму трымала, і парася б пакарміла. А так і сама гібею. Пайшоў некалі ў свет, усё роўна як за свет.

Старой хацелася пагаварыць. Яна неяк падабрэла ўся і яшчэ больш, здавалася, пастарэла.

— Сваяк гэты Васька?

— Чорту лысаму сваяк! Прыехаў, сказаў, што гэта яго Шурык да мяне прыслаў... Сірата, у водпуск на лета. Я, дурная, была ў Волькі і малака дагаварылася... А ён з-пад другое каровы малако любіць. Пасядзеў спачатку ціха, а потым з гэтым Заторам як знюхаліся, і пацякло-палілося. Ужо і ў мяне дзесятку ўзяў — пазыч, кажа, старая, трэба. П'яны, вочы чырвоныя. Дала, думаю, яшчэ стукнеш ці папхнеш, то рассыплюся ці скалечуся.

— І даўно ён сядзіць тут?

— Даўно. Нейкі тут раз прыязджаў да яго на машыне адвячоркам. Недзе пасля таго, як Міхаля стукнулі. Мабыць, насварыўся на яго. Бо дзён колькі як мыш пад мятлою. Пакуль яму пісьмо не прыйшло. Грошы былі ў пісьме, я бачыла. Вот тыя грошы і не далі спакою, пайшоў прапіваць.

— А што, ён у гэтага Затора і начуе?

— Не, тут недзе на пашы будка пастухоўская, то адтуль, я прыкмячала, разоў колькі ён ішоў агародамі. Цяпер жа лета, дзе хочаш і пераначуй. А вы хто ж такі будзеце? — старая нібы спахапілася, што многа нагаварыла невядомаму чалавеку.

— Я, цётка, з міліцыі.

— Мой мо што там нарабіў?

— Не, нам кватарант трэба.

— Слава богу. Вы ж яго звязеце, а не — прыкажэце, каб сюды больш не паказваўся. Я ўжо сама да ўчастковага ісці хацела, каб адправіў яго куды.

— Адправім, цётка. Дзе тая пастухоўская будка?

— А за канец выедзеце, налева зразу, паўз поплаў будзеце ехаць, а там і ўгледзіце. Домік такі з дошак. Там алешнічку купка. Яна здалёк і відна, і домак пад алешынкамі там у цяньку.

— Дзякуй, цётка. Што, так і збіраецеся з гэтымі дрывамі зімаваць?

— Торфу ж прывозяць, чаму. Я ж пенсіянерка. А гэта на падпал.

Сяржант усё яшчэ драмаў у машыне.

— Прачынайся, Асцюк. А то спрасонку мяне злавіш замест гэтага Ваські,— штурхануў Семежаў міліцыянера і загадаў шафёру: — Давай у канец вёскі і налева паўз поплаў.

Тое, што сказала старая пра прыезд на машыне да «кватаранта», аж скаланула Семежава. Менавіта, што прыезд гэты быў якраз у тыя дні, калі напалі на старога. Проста так супасці гэта не магло. У супадзенні Семежаў не верыў.

У надвячэрнім прыцемку ён адразу ўгледзеў на роўным поплаве невялікі астравок дрэваў і кустоў і маленькую будыніну ў іх. Да домікаў вёў леташні, зарослы травой машынны след-дарога.

— Давай туды,— загадаў Семежаў.

Машына лёгка, мякка, як па дыване, памчала да доміка.

Да доміка заставалася метраў дзвесце, калі Семежаў заўважыў, што ад кустоў мільганула чалавечая постаць.

— Давай за гэтым! — крыкнуў Семежаў, і машына пайшла ў аб'езд кустоў, падскокваючы ўжо на няроўным поплаве. Семежаў бачыў, што чалавек азіраўся на машыну, якая ўсё ж ехала хутчэй, чым бег ён да

далекаватага яшчэ шнурочка кустоў, які цягнуўся па поплаве. Больш не было дзе схавацца тут.

— Стой! — крыкнуў Семежаў, калі машына амаль параўнялася з уцекачом.

Следам за Семежавым на хаду выскачыў і сяржант Асцюк.

— Чаго так бегаем, Аляхновіч? Часікі ж вам падарылі,— з усмешкаю сказаў Семежаў.

Васька прысеў, сцяўся увесь, гатовы рвануць з месца, падскочыць. Вочы яго востра рэзалі па баках, а рукі, сціснутыя ў кулакі, варушыліся, гатовыя біць. Семежаў глядзеў на гэтыя рукі і паволі неяк міжвольна даставаў з кішэні наручнікі.

Ён бачыў, што Аляхновіч не астыў яшчэ ад уцёкаў, ён яшчэ быў гатовы бегчы, кідацца.

— Рукі, уверх рукі,— загадаў Асцюк, і хлопец неяк адразу быццам аслаб, гледзячы на пісталет у руках у міліцыянера. Рукі паволі пачалі падымацца, але падняць іх угору Семежаў так і не даў — надзеў наручнікі.

— Пайшлі паглядзім, Аляхновіч, што там у цябе за бярлог,— загадаў Семежаў і паказаў на хляўчук.

Аляхновіч моўчкі пайшоў наперадзе. Ля кустоў першы заўважыў чалавека Асцюк:

— Таварыш следчы! Чалавек вунь!

На траве ляжаў мужчына ў вылінялай брызентавай штармоўцы, і сяржант адразу ж нахіліўся да яго.

— Хто такі? — запытаўся Семежаў у Аляхновіча.

— Адкуль я знаю! П'яніца нейкі прываloкся і ляжыць...

— Валодзя, аптэчку дай сюды! — папрасіў сяржант у шафёра, і той заспяшаўся да яго, на хаду адкрываючы аптэчку.

Асцюк пачаў націраць скроні незнаёмага нашатырам, даў панюхаць яму, і чалавек цяжка закруціў галавою, быццам сіліўся прачнуцца. Потым ён расплю-

шчыў вочы, няўцямна, аднекуль зглыбоку паглядзеў на міліцыянераў, якія нахіліліся над ім, прамовіў: «Чаго тэта так галава баліць?» — і зноў заплюшчыў вочы.

Асцюк абмацаў кішэні незнаёмага, дастаў невялікую чырвоную кніжачку, разгарнуў яе:

— Глядзіце, таварыш следчы. Карэспандэнт.

Семежаў узяў у рукі карэспандэнцкае пасведчанне, коратка запытаўся ў затрыманага:

— За што вы яго?

Той нічога не адказаў.

Семежаў падышоў да хлеўчука і прысвіснуў, гледзячы на батарэю бутэлек, кансервы і іншы набытак.

— Асюк, ідзіце гляньце! Аказваецца, і тут спецыялісты па магазінах... Валодзя, давайце да вёскі, вазьміце пару чалавек — і сюды.

— Ёсць,— коратка адказаў шафёр.

Аляхновіч моўчкі сеў на траву, паклаўшы перад сабой рукі ў наручніках.

У галаве чамусьці была адна недарэчная думка — трэба было ўскочыць у хляўчук і выпіць, а не ўцякаць.

## РАЗДЗЕЛ ВАСЕМНАЦЦАТЫ,

### у якім маёр Пяткевіч выходзіць на фінішную прамую.

Пяткевіч моўчкі глядзеў на Аляхновіча. Коратка астрыжаны, круглагаловы, ён неяк асунуўся ўвесь, толькі час ад часу пазіраў на свае кулакі, якія ляжалі на каленях. Пяткевіч не спяшаўся задаваць пытанні. Ён ведаў ужо амаль усё, пра што не хацеў прызнавацца гэты зусім яшчэ малады хлопец. Пяткевіч глядзеў на ягоныя рукі, што міжвольна скручваліся ў кулакі, і думаў пра тую кароткую дарогу, якая прывяла хлопца сюды. Звычайная сярэдняя гарадская сям'я, звычайны вучань у школе, які не надта ўлягаў у навуку, але і не з горшых, не дысцыплінаваны, але і не пару-

шальнік. Займаўся спортам, абараняў гонар школы, а потым і вучылішча. Звычайны гэпэтэвушнік. Не, не зусім звычайны: дарэктар паставіў умову, што калі бацькі забяруць яго з васьмі класаў, то адзнакі будуць выведзены болей-меней. Увогуле ціхі. І каб было ціха, бацькі забралі са школы. Займаўся боксам. Трэнер спадзяваўся на яго. «Звычайная» кампанія ў двары, «звычайныя» сябры... Прывод у міліцыю за бойку, вядома, выпадковую... Потым «звычайныя» бойкі, час ад часу «звычайныя» прыводы ў міліцыю. Дома, калі прыходзіць п'яны, бацькі ўжо не чапаюць, бо хмель дурны, можа тыцнуць кулаком. Грошай у бацькоў не просіць, але і сваіх не дае. Жыве сам на сябе. Саромеліся перад людзьмі, смецце з хаты не выносілі. Але і не праверылі, адкуль грошы, дзе прападае падоўгу. Чакалі, што восенню ў армію, можа, там вылеціць дурное з галавы. У армію ён не пойдзе, маёр Пяткевіч ведае пра гэта.

— Скажы, Аляхновіч, ужо больш года ты нідзе не на рабоце. Дома ты грошай не бярэш. Хто корміць і поіць цябе? За што? — у працяг сваіх думак запытаўся Пяткевіч, хаця пачаць допыт хацеў з другога.

— Пры дружках не прападзеш...

Хлопец насцярожана паглядзеў на маёра. Пяткевіч адчуваў, што ён нечага баіцца.

— Хто ж ён, гэты багаты дружок?

— Ну што вы да мяне прысталі! Не лез я ў гэты магазін! Дурны Затор папёрся і прывалок! Я не знаў пра гэта! І часікаў не краў! Сама мне дала! Яна і не толькі часікі... Ёй што, яна ўкормленая, дагледжаная, ёй маладзенькага захацелася. Чаго вы хочаце ад мяне!

Пяткевіч глядзеў, як Аляхновіч стукаў сябе па каленях, і калі той заціх, напаўголасу папытаўся:

— Клімакін? За што?

Аляхновіч стомлена апусціў рукі.

Нейкае імгненне глядзеў на Пяткевіча са здзіўленнем, якое потым скамянела на твары спалохам.

— Не знаю я ніякага Клімакіна! Не знаю!..

— Чаго ты так спалохаўся? У пісьме нічога лішняга...

Пяткевіч паклаў пісьмо, якое знайшлі ў Аляхновіча, на стол. Маёр ужо ведаў, што гэта той чалавек, з якім Аляхновіч «апрацоўваў» Гарбуза. Чалавек, які быў у бары ў дзень, калі напалі на міліцыянера. Пяткевіч не сумняваўся, што з раёна прыйдзе пацвярджэнне, што гэта Клімакін прыязджаў да Аляхновіча ў вёску ў той час, калі абрабавалі старога... Гэта ўжо не супадзенні і не інтуіцыі. За ўсім стаіць адна рука... Пакуль што яна так і застаецца таямніцай. На паштамт па пісьмо Аляхновіча ён не прыйшоў, значыць, і не збіраўся прыходзіць... У пісьме Аляхновіч прасіў грошай і дазволу вярнуцца ў горад.

— Ладна. Чаго Клімакін прыязджаў да цябе?

— Прывёз грошы і загадаў, каб сядзеў ціха...

— І ўсё?

— Усё.

— За што ён даваў табе грошы? За прыгожыя вочы ці за тое, што ты вазіў гарэлку ў «Каштан»?

— Я гарэлку не вазіў. Я сачыў, каб Кранік прывозіў...

— Як ты находзіў Клімакіна?

— Ён сам находзіў мяне. У барах альбо дома...

— ...Каб ты быў пры ім і біў па яго загаду? — дагаварыў за Аляхновіча маёр. Хлопец не запярэчыў, угнуў галаў.

— Чаго Клімакін аціраўся ў «Каштане»?

— Паўз барменшу цёрся. На дачу яе да сябе хацеў угаварыць... З-за яе баяўся, што адлупяць. А яна паплёўвае толькі на яго. Ён і гэту, што мяне з часікамі сыпле, туды цягаў...

Аляхновіч паспакайнеў, калі гаворка пайшла пра барменшу, пра дачу, пра дзяўчат Клімакіна.

— Дзе яго дача?

— Не знаю. Ён мяне туды не разу не пусціў. Не ездзілі з ім...

— Аляхновіч, ты думаеш, што выпадкова трапіў сюды? Часікі, магазін... Дарэчы, твой дружок гаворыць другое: што ты і падвучыў яго красці.

— Сволач! Заторам быў і Заторам астанецца!

— Ты куды ездзіў з Клімакіным вечарам, як ён прыязджаў да цябе?

— Нікуды.

— Дапусцім. Чаго ж прыязджаў Клімакін?

— Праверыць.

— Што праверыць.

— Ці праўда я тут, у вёсцы.

— Значыць, ён цябе адправіў з горада. То ты за ім бегаў, а то ён за табой, як за персонай. Чаго раптам? Мы ўмеем лічыць, Аляхновіч. Калі і чаму ты выехаў з горада — гэта раз, і што было, калі да цябе заехаў Клімакін,— два... Тут міліцыянер, там дзед... Потым і журналіст.

Пяткевіч бачыў, як зноў у хлопца сцяліся кулакі, ён аж прыўстаў з крэсла.

— Я п'яны быў!.. Выйшаў на двор, а ён нюхае! Гляджу — нюхае! Я раз яму!.. Я нічога не хацеў!.. Я не помню!.. Толькі пужнуць, каб больш не нюхаў. Ну што вы да мяне прычапіліся! Не чапайце мяне! Я нічога не хачу, я сам па сабе!..

У хлопца пачалася істэрыка. Пяткевіч націснуў кнопку званка — выклікаў канвой.

Маёр яшчэ нейкі час сядзеў за сталом. Прызнанне Аляхновіча пра напад на міліцыянера і той факт, што ён быў у вёсцы ў той час, калі скалечылі старога. І гэты таямнічы Клімакін таксама там... «Удар цяжкім тупым прадметам...» І тут і там. Ім можа быць і кулак, як у гэтага маладога і дужага яшчэ алкаголіка. Выходзіла, што і спекуляцыя гарэлкай, і крадзеж скаціны работа адной шайкі-лейкі, усе канцы сыходзіліся на

гэтым самым Клімакіну. Калі не ён сам арганізатар усяго, то ведае, хто над усімі.

Пяткевіч зняў трубку:

— Камар? Дзень добры. Па Клімакіну ў цябе ёсць што?

— Не. Таго Клімакіна, якога шукаем мы, няма ў горадзе. І машына таксама не зарэгістравана... А што ў вас новага?

— Аляхновіч прызнаўся, што ён напаў на міліцыянера. Той выпадкова ўгледзеў, як Гарбуз выгружае гарэлку... Клімакін быў тады ў бары. Ён адправіў Аляхновіча ў вёску. Прыязджаў да яго, праверыць... У тыя дні скалечылі старога...— Пяткевіч не дагаварыў да канца. Але па напружаным дыханні ў трубку Камара здагадаўся, што лейтэнант зразумеў, што меў на ўвазе маёр.— Аляхновіча я перадам табе. Самае галоўнае — Клімакін.

Маёр паклаў трубку. Цяпер ён не сумняваўся, што такога чалавека няма. У таго іншае прозвішча. Адзіны выхад на яго, зачэпка — Алёна Рудзь. Маёр запомніў сказаныя Аляхновічам словы, што Клімакін вазіў яе да сябе на дачу.

## РАЗДЗЕЛ ДЗЕВЯТНАЦЦАТЫ —

### пра тое, як бясследна зніклі адразу два чалавекі.

Сонца засвечвала ў акно ярка, і цень ад галінкі пакалыхваўся на сцяне над самай галавой. З прачыненага акна павявала ранішнім халадком, водарам саду і лета. Мужчына не расплюшчваў вачэй, прыслухоўваўся да дачнае цішыні. Некалі, калі быў яшчэ малы, гэтаксама яму не хацелася прачынацца раніцаю, і з акна гэтак жа павявала ранішнім халадком, крышку пахла кропам. Чамусьці запомніўся яму гэты лёгкі кропавы пах з грады. Ён чуў, як збіраецца і ад'язджае на работу бацька, як лёгенька фыркае маторам ягоны началь-

ніцкі «Масквічок», як маці і бацька стараюцца гаварыць цішэй, каб не пабудзіць яго.

Яму часта ўспаміналася гэтая раніца, быццам адна яна толькі і была. Маці ў халаце, у мяккіх пантофлях, бацька, лысы, круглы, з жывоцікам, як і мае быць начальніку, па якога нават дадому прыязджае машына.

Дзіўна, цяпер маці носіць прадаваць на аўтобусны вакзал кветкі, якіх многа расце ля дома. І бацька памагае ёй — падносіць вядро з кветкамі...

Тады ён канчаў сёмы клас, здаў экзамены, атрымаў адну толькі чацвёрку. Коля Трацякоў запрасіў яго да сябе — адзначыць. Трацяковы жылі на той жа вуліцы, таксама ў прыватным, пасля вайны пабудаваным доме. Па Колевага бацьку таксама раніцай прыязджала машына. Яна не толькі прыязджала, але і ездзіла да дома цэлы дзень, падвозіла Колеву маці на базар, у магазіны, нават Колю ў школу. І Коля першы надзеў у класе вузенькія штаны-дудачкі, прыйшоў коратка астрыжаны. Гэтаму нават ніхто не здзівіўся — нават настаўнікі прызнавалі, што Колю можна тое, на што іншыя не адважыліся б.

Ён ведаў, што ісці з пустымі рукамі да Колькі нельга, яго папярэдзілі, што з кожнага мінімум па бутэльцы сухога віна. Яму тады хацелася да Колі, усё роўна як трапіць у нейкі іншы, вышэйшы свет. Ён не ведаў, як сказаць пра гэта маці, не тое што папрасіць у яе грошай. Грошы ён узяў сам, у буфеце на кухні. Два рублі. На іх купіў бутэльку чырвонага сухога віна. Ён запомніў ягоную дзіўную назву «Мельнік».

Да Колі выйшаў з дому ціха, калі пачынала вечарэць. Маці калупалася на градах і не заўважыла, куды ён пайшоў. Можа, ад таго і запомніўся густы, вільготны крыху пах кропу. У Колі ўсё было нечакана: на стол прыгатавана ў прасторнай верандзе. Стаяла гароднiна, закуска, сюды ж Коля перанёс з пакоя радыёлу. Самае дзіўнае, што накрываць на стол памагала Колю

маці. І бутэлька сухога віна. Коля маргнуў яму, каб прынесеную бутэльку не паказваў. Ён здагадаўся і хуценька схаваў яе за дзверы. Колева маці кончыла ставіць на стол, прыбралася сама і села ў машыну, якая прыехала па яе,— «каб не замінаць маладым», як какетліва сказала яна.

Потым пілі віно, гаварылі. Да Колі ў большасці прыйшлі старшакласнікі, таксама ў вузкіх штанах. Іграла непрывычная музыка, тая, якую ягоны бацька называў не інакш як бугі-вугі. Было весела і добра. Потым яны пайшлі ў гарадскі парк на танцы, і ён таксама танцаваў, як танцавалі Колька і яго сябры, праўда, не пасярэдзіне, а з краю танцавальнае пляцоўкі, дзе было крыху прыцемней. Ён нават паспрабаваў і курыць тады, хоць цыгарэта не падабалася яму.

Дадому вяртаўся позна, крыху ахмялелы і шчаслівы. Маці плакала дома. Бацька ў піжаме злосна тупаў туды-сюды па пакоі.

Першае, што ён зрабіў, гэта навотліў, з адцяжкаю, тры разы ўдарыў яго. Нічога не папытаўся, толькі сказаў:

— Гэта табе за грошы, якіх ты не зарабіў! Гэта табе за бугі-вугі! Гэта табе за тое, каб быў чалавекам!

Маці толькі ўсхліпвала, як па нябожчыку. Яна была амаль знішчана тым, што адбылося, і яе сын, адзіны сын, павінен быў гэта адчуць і спазнаць.

Яна потым усё ж сама давала яму грошы, употайкі ад бацькі. І штаны-дудачкі купілі яму, і вузенькі гальштук. Але пасля. Здаецца, з таго часу ён пачаў прыглядацца да жыцця, да бацькоў, да таго, як жыве Колева сям'я. Яны ездзілі на машыне, яны сустракалі гасцей, у іх было ўсё. Ягоны бацька гаварыў, што за такое трэба садзіць, выганяць з работы. Да яго ўсё гэтак жа ціхенька раніцаю прыязджаў «Масквічок», забіраў на работу, а вечарам прывозіў назад. Ён бачыў, што Колю не трэба было зубрыць,— тоў быў упэўнены, што

здасць за дзесяць класаў і паступіць. Над ім жа сядзела маці і прымушала, як першакласніка, правярала, толькі што не ставіла ў кут. Слава богу, што хоць вучоба давалася лёгка і ён сам хацеў хутчэй паступіць, каб толькі вырвацца з дому, у якім усё правільна. Тады ён зажыве так, што не снілася нават і Колю... Ен паступіў. На другім курсе пазнаёміўся з чалавекам з невялікаю сівенькаю барадою. Ен лабарантам працаваў у інстытуце. А кватэрка была, як музей. Чалавек гэты здабываў грошы не толькі даўніною. Маладзенькія перакупшчыкі і спекулянты ішлі праз яго рукі. У яго можна было павучыцца, як рабіць грошы.

На трэцім курсе ён не паехаў да бацькоў па стыпендыю. Ен ужо меў сваю «жылу», да яго пайшлі грошы.

Мужчына расплюшчыў вочы, мацнуў рукою — добра было б, каб нехта драмаў побач. Гэтая думка адразу ж і ачнула яго, і вярнула ў рэальнасць.

Тонка пазвоньвалі ў лесе, які пачынаўся непадалёк ад дачы, птушкі. Мужчына больш не слухаў іх, хутка, па-вайсковаму надзеў трэніровачны касцюм, абуў кеды, на двары з рукамыйніка спаласнуў твар за ноч не астылай вадой і лёгенька, паволі пабег па сцежцы, кіўком галавы павітаўся з суседзямі.

Суседка Лідзія Яўгенаўна, у трэніровачным касцюме, які абвісаў на ёй, худой і доўгай, і муж яе, Антон Казіміравіч, круглы і пузаты, у майцы, якая была заўсёды выквацавана, палолі ўжо грады. Яны праводзілі позіркамі суседа, і ён ведаў, што яны зайздросцяць яму. Лідзія Яўгенаўна зайздросціла таму, што Віктар Антонавіч працуе ў «гандлі». Хаця сусед і тлумачыў ёй, што гэта не зусім «гандаль», што проста ў яго такая пасада ў міністэрстве, якая звязана з прадажай айчынных трактароў за межы краіны. Лідзія Яўгенаўна паблажліва прытваралася, што згаджалася з ягонымі довадамі, бо лічыла, што прыбядняецца сусед па сціпла-

сці. Джынсы ж іхняй дачцэ і самой ёй кофтачку, лічы, падарыў, капейкі ўзяў. Яшчэ яна зайздросціла таму жыццю, якім жыў Віктар Антонавіч: мець такую ўтульную дачу, машыну, такую работу... Ей нават хацелася ўявіць на ягоным месцы свайго Антона Казіміравіча і тое, як бы яна жыла-прыпявала тады. І калі б яе муж працаваў там, дзе сусед, то яны б зараз збіраліся ехаць за мяжу, і не на год, і не на два... Але тады Лідзія Яўгенаўна ўспамінала, што ім давялося б прадаваць сваю дачу, як прадаў сусед, і дачы ёй рабілася шкода. Лідзія Яўгенаўна ачыналася і заўважала, што разам з зеллем наскубла і морквы, зірнула на Антона Казіміравіча, але той нічога не заўважыў.

— Антон, ты ж асцярожна, агуркі патопчаш усе! — прыкрыкнула яна на ўсякі выпадак на мужа, хоць той яшчэ і не наступіў на гурочнік.

Антон Казіміравіч таксама глядзеў услед суседу. Таго цялячага захаплення, якім палала ягоная Лідзія да суседа, Антон Казіміравіч не меў. Такіх хлюставатых і пранырлівых ён ведаў і недалюбліваў. Антон Казіміравіч мераў усіх на свой аршын ці аршынчык і лічыў, што калі ты не выседзеў свайго і не даслужыўся гадамі, то проста выскачка, скараспейка. Праўда, пра сябе не дапускаў і думкі, што ён даўгаспейка, ужо і пераспяваць пачынае. Антон Казіміравіч зайздросціў стройнасці і лёгкасці суседа. Гэта наглядзеўшыся на яго, і сам спрабаваў зганяць «гарбузік« з жывата. Садзіўся нават на нішчымную дыету. Але бегаць было цяжка, пачыналі балець ногі, калола ў бок, хацелася раніцаю спаць, а для таго каб бегаць і паспяваць на работу, трэба ўставаць досвіта. Да таго ж яго вечна худая Лідзія ела ўсё ўпадрад і ніяк не таўсцела, таму гатавала страву, не зважаючы на мужавы выкруткі, і пасціцца ён больш тыдня не мог. Урэшце, Антону Казіміравічу і так было добра, на дачу ён не ездзіў без свае Лідзіі ніколі, ды і машыны ў яго не было, каб прыво-

зіць туды маладзічак, як гэта рабіў Віктар Антонавіч. Халасцяку дазволена, нават Лідзія лічыла, што такі відны мужчына можа дазволіць сабе такое.

Сёння зноў Антону Казіміравічу захацелася чамусьці быць стройным і маладым. Ён ужо вырашыў, што з заўтрашняга дня пабяжыць.

— Шкода такога добрага суседа,— уздыхнула Лідзія Яўгенаўна.

— Чаму, старыя, здаецца, таксама людзі спакойныя,— заўважыў пра новых гаспадароў Антон Казіміравіч.— А садраў ён з іх добра, твой Віктар Антонавіч! Не промах!

— Бач, якая да́чка дагледжаная, як цацка! Таму і ўзяў.

— Што тут дагледжана? Сад мо раз падрэзаў. А ўсё пад траўку запусціў. Таму і прыгожа, зялёненька.

— Ты лепш гуркоў не патапчы,— перапыніла яго Лідзія Яўгенаўна. Каб гэта раней, калі яна была маладзейшая, то Віктару Антонавічу яна б закружыла галаў.

Суседзі бачылі, як вярнуўся Віктар Антонавіч з прабежкі, чулі, як плюхаў ён вадою з рукамыйніка. Потым ад ягонай дачы пацягнула цёплым і вострым водарам толькі што згатаванае кавы. Усё паўтарылася, як каторы ўжо год. Потым яны бачылі, як Віктар Антонавіч у тэнісцы-сетачцы, з невялікаю спартыўнаю сумкаю ў руцэ пайшоў сцяжынкаю цераз лес да возера купацца і загараць.

Віктар Антонавіч нечакана спыніўся на сцежцы і азірнуўся — яму здалося, што следам за ім нехта ідзе назіркам, і ён нават пачуў, як трэснула ў чалавека пад нагой сухая галінка. Нікога не было, вытаптаны прыгарадны лес праглядаўся наскрозь, і за тонкімі хваінкамі не магло затаіцца нават і дзіця, не тое што дарослы чалавек. Але адчуванне страху, праціўнае,

халоднае, нейкае клейкае, не пакінула яго. Чаму яно прарвалася менавіта тут, у лесе, у цішыні, на адзіноце, ён сам не мог зразумець. Не вытрымліваюць нервы?

Віктар Антонавіч усміхнуўся, спрабуючы адагнаць страх. Усё ў яго прадумана, прадубліравана. Памылкі не магло быць. Ён даўно ўжо ўзяў сваё. Даўно пара знікаць, каб жыць, цешыцца і не азірацца ні на што і ні на кога. Ён бачыў гэтае сваё блакітнае жыццё ля блакітнага мора. Не, не распуснае, а прыгожае жыццё чалавека, які заўсёды мае грошы. Работу ён знойдзе, каб яго ніхто не папракаў, каб і часу яна не забірала.

У гэта ён верыў свята, пра гэта ён марыў. З таго часу як яшчэ студэнтам пачаў перапрадаваць імпартныя «шмоткі», грошай ён назбіраў у чатыры разы болей, чым некалі вызначыў сам сабе. Значыць, даўно павінен быць ён там, дзе сіняе мора. Паверыў, што ўсё можна, звязаўся з гэтым алкагольным хлопцам з жалезнымі кулакамі. Гэтыя кулакі і падвялі пад міліцыю. Гэтага старога завербаваў. Валя знала яго даўно. За Валю ён не баяўся. Яна са свайго не спусціць. У яе хватка ваўчыцы.

І ўсё ж дарма ён сядзіць гэтыя дні на дачы. Гэтая Алёнка, якую ён падпаіў і прывёз сюды, можа паказаць дарогу. Яна ўзненавідзела яго за тое, што ён рабіў з ёй. І Валі расказала. Ён гэта адразу ж зразумеў, калі ўбачыў, як грэбліва таргануліся Валіны губы, калі зірнула на яго.

Віктар Антонавіч выйшаў да берага возера, раздзеўся, але, перад тым як увайсці ў ваду, не стрымаўся ўсё ж, азірнуўся. Вада была цёплая, як луг, і гэтакая ж карычняватая. Плаваў Віктар Антонавіч доўга, не спяшаючыся, адчуваў, як ад вады прыходзіць у душу зноў спакойнасць і ўпэўненасць.

Праз дзве гадзіны ён вярнуўся дадому, паснедаў і выйшаў з доміка ў светлым летнім касцюме з чамаданчыкам, зайшоў да суседзяў, аддаў ключы.

— Вы ж збіраліся яшчэ тыдзень пабыць! — успляснула рукамі Лідзія Яўгенаўна.

Суседзі ведалі, што ён едзе за мяжу ў камандзіроўку на пяць гадоў, таму прадаў дачу і машыну.

— Падумаў, што да бацькоў трэба заехаць... Перад ад'ездам у мітусні можа не хапіць аднаго дня.

— А ў вас бацькі яшчэ жывыя? Вы ж ніколі не гаварылі.

— Жывыя.

— Добра, перададзім ключы, але такога суседа ў нас ужо не будзе.

Лідзія Яўгенаўна скрывіла твар, нібы збіралася нават усхліпнуць на развітанне, але Віктар Антонавіч не стаў чакаць гэтага, падаў сам ёй першы руку, потым Антону Казіміравічу, прыветна ўсміхнуўся. Потым Віктар Антонавіч пайшоў па сцяжынцы, крыху памахваючы сваім звычайным, зусім не знакамітым з выгляду, не імпартным чамаданчыкам.

Ён сам сабе ўсміхнуўся, калі ўявіў, як глядзяць услед яму суседзі. Цікава, што было б, каб яны раптам даведаліся, што гэты чамаданчык напалавіну закладзены роўнымі пачкамі грошай.

На сваю кватэру ў горадзе Віктар Антонаіч не заходзіў, не паказаўся нікуды, узяў білет, праседзеў у скверыку на вакзале і адвячоркам выйшаў з цягніка ў абласным горадзе, зайшоў у папярэднія касы, узяў білет на заўтра і толькі тады пайшоў на стаянку таксі. Па дарозе дамовіўся з таксістам, каб той абавязкова заехаў назаўтра па яго а палове шостай раніцы, шчодра заплаціў і пайшоў па вузенькай вулачцы прыватных домікаў, якія з усіх бакоў былі акружаны ўжо гмахамі дзевяціпавярховых будынін.

Калі назаўтра таксіст прыехаў у вызначаны час, пасажыр ужо чакаў яго. Ніхто ў ранішні час не бачыў, як мужчына, седзячы на лаўцы, ад няма чаго рабіць спаліў камячок паперы. Гэта былі пашпарты і на імя

Клімакіна, і на імя Горскага. У кішэні ў яго ляжалі іншыя, загадзя прыпасеныя дакументы...

## РАЗДЗЕЛ ДВАЦЦАТЫ —

з пагоняй і забойствам.

Сяржант спаў, паклаўшы голаў на рукі, якія ляжалі на рулі. Заснуў соладка і не адчуваў ранішняга халадку, які пачаў пранікаць у стары, з пашарпаным тэнтам «козлік». Інспектар дарожна-патрульнай службы старшы лейтэнант глядзеў на яго і стомлена ўсміхаўся. Канчалася начное дзяжурства. Мёртва ляжала і адна, і другая шаша, на перакрыжаванні якіх на абочыне сіратліва стаяла міліцэйская машына. Дарога замерзла недзе пасля паўночы, апошнімі прайшлі два міжгароднія аўтафургоны. Потым яшчэ адзінокая «Волга».

Украдзенага два тыдні назад калгаснага «уазіка» на дарозе не было заўважана за час дзяжурства — гэтак давядзецца дакладваць старшаму лейтэнанту. Машыну ўкралі ў суседняй вобласці, але на днях прыйшла арыенціроўка, што заўважылі яе ў іхнім раёне. Старшы лейтэнант не надта верыў у тое, што машына яшчэ дзе-небудзь ездзіць, а не ляжыць на дне якой рэчкі ці возера.

Праз нейкую гадзіну-паўтары дарога ажыве. Спачатку пойдуць вялікія машыны міжгародніх маршрутаў, а потым, як мурашкі, запоўзаюць раённыя: калгасныя, з аўтакалон. Але гэта ўжо будзе клопат другога. На сёння дзяжурства кончылася.

Старшы лейтэнант лёгенька патрос за плячо напарніка, і той адразу ж прахапіўся, сцепануў плячыма.

— Завядзі матор, прагрэй машыну.

Да паста ехаў «козлік». Старшы лейтэнант не падумаў нават пра тое, што гэта можа быць тая машына, якую шукае міліцыя. Здалёк кінулася ў вочы, што

10 Зак. 2732

нeяк не па-ранішняму ехала машына. Спяшалася яна занадта, ці што. Чыстая добрая дарога, ніякіх сустрэчных. Шаферу за рулём трымай хуткасць і адпачывай. А ў тым, як ішла гэтая машына, адчувалася нейкая мітуслівасць.

Старшы лейтэнант тым часам ужо выходзіў з машыны, прывычным рухам выкінуў наперад жэзл, загадваючы спыніцца. Ён ужо бачыў, што машына гэтая не з тых, якую яны шукаюць. Кузаў абабіты бляхай, не брызентавы. Машына быццам і падпарадкавалася загаду інспектара, заміргаў правы падфарнік, але хуткасці не збавіла. Старшы лейтэнант яшчэ ўспеў заўважыць, што нумары былі замазаны граззю і што зад машыны асеў.

Ён ускочыў у кабіну, коратка кінуў:

— Давай!

Тонка заспяваў стартэр, матор завёўся.

Сяржант не азірнуўся на старшага лейтэнанта, толькі коратка кінуў:

— Дагонім. Яна нагружаная, а ў мяне матор новы.

Старшы лейтэнант нічога не адказаў. Машына, якая ўцякала, роўна ішла пасярэдзіне шашы. Непрыкметна, але няўмольна адлегласць скарачалася. Ад уключанае печкі пацягнула цяплом. Сяржант не звяртаў на гэта ўвагі.

Калі падышлі да ўцекачоў, старшы лейтэнант добра бачыў, што па нумары быццам знарок мазнулі граззю. Ён зняў трубку.

— Дваццаць першы... Даганяю машыну. На трыццаць другім кіламетры. Нумары замазаны. Як зразумелі? Прыём.

— Зразумеў, дваццаць першы. Дзяржу на сувязі,— зусім блізка і чыста пачуўся голас дзяжурнага.

Старшы лейтэнант ведаў, што на пяцьдзесят трэцім кіламетры таксама стаяла машына. Там на ўсякі выпадак хлопцы павінны быць гатовы.

— «Браневічок», як у сваячка майго,— коратка кінуў сяржант, уключыў далёкае святло, маргнуў некалькі разоў і напорыста пайшоў на абгон.

Старшы лейтэнант сцяўся: у любы момант тыя, каго яны пераганялі, маглі не пусціць іх наперад, падрэзаць. Але пярэдняя машына ішла роўна. Міліцэйскі «козлік» параўняўся з машынаю і паволі пачаў прыціскаць яе да абочыны.

Старшы лейтэнант бачыў за шклом суседняе машыны мардатага дзядзьку.

Машына спынілася. Старшы лейтэнант адразу ж выскачыў з машыны. Выйшаў і сяржант. Да іх, не спяшаючыся, выйшаў з машыны і той, хто ўцякаў. Здаровы дзядзька ў брызентавай робе і маленькай берэтцы на галаве.

— Ну, здароў, пляменнічак! Думаю, пазнаў свайго, аж, гляджу, даганяеш,— мужчына працягнуў руку сяржанту.

— Дзень добры, дзядзька Іван. А я гляджу, ваш нібы «бранявік»...

Старшы лейтэнант здзіўлена глядзеў на сяржанта.

З машыны выйшаў і другі мужчына, падобны на першага, гэтакі ж і круглы, і чырванашчокі, толькі меншы. І маладзейшы.

«Сын»,— здагадаўся старшы лейтэнант, падышоў да машыны, ботам скалупнуў з нумара гразь і пайшоў наўкруга. Хутчэй механічна, каб нечым заняцца. Ён не заўважыў, як старэйшы мужчына, не перастаючы гаварыць з пляменнікам, насцярожана сачыў за інспектарам. Маладзейшы ступіў следам.

Старшы лейтэнант гэтак жа кароткім ударам нагі збіў камяк гразі з задняга нумара, узяўся за ручку і адчыніў заднія дзверцы, ад нечаканасці адхіснуўся.

У гэты ж час па вушах разануў ускрык сяржанта:

— Лейтэнант!..

Міжволі ён адскочыў убок, адчуў, як нешта рас-

секла паветра і балюча пеканула па плячы. Рука хапянулая за кабуру. Другога ўдару ён не пачуў.

Сяржант, гаворачы з дзядзькам, з жахам заўважыў, што за старшым лейтэнантам, які адчыніў дзверцы, з'явіўся дзядзькаў сын. У руках у яго ўзляцела ўгору манціроўка. Сяржант успеў крыкнуць і рвануўся на дапамогу афіцэру.

Ён не заўважыў, як з дзядзькавага рукава імгненна выслізнула швайка, і сяржант, магло здацца збоку, сам напароўся на яе, скурчыўся. Мужчына яшчэ два разы пырнуў яго кароткімі ўдарамі, пакуль асядала цела на зямлю.

Ён бачыў, як сын нагнуўся да інспектара, выцягнуў у яго з кішэні пісталет і мацюкнуўся:

— У машыну, такую...

Але сын падбег да міліцэйскай машыны, ускочыў на шафёрскае месца, уключыў перадачу і накіраваў машыну ў кювет. Выскачыўшы, сцягнуў з дарогі сяржанта, потым інспектара:

— У машыну!..— крычаў бацька. Цяпер яму хацелася як мага далей ад гэтага месца.

— Успеем,— сын азірнуўся: дарога была пустэльная, сухая, на якой не заставалася ніякага следу.

Машына раўнула і сарвалася з месца, праз кіламетраў пяць звярнула ўправа, імчала па полі. У машыне маўчалі.

Старэйшы глядзеў на дарогу. Маладзейшы курыў цыгарэту. Трэці, калоцячыся ад усяго таго, што ён толькі што бачыў. Яму страшна было нават абазвацца. І пра яго, здавалася, забыліся.

Нарэшце машына спынілася, задам заехала ў жыта.

Бацька з сынам моўчкі вылезлі з машыны, падышлі да задніх дзверцаў, разам з цэлафанам выцягнулі адтуль двух бычкоў і пацягнулі далей у жыта, да невялікай ямы, якая парасла быльнікам. Потым яны

вярнуліся да машыны, агледзелі, ці не асталося ў машыне крыві.

Стары старанна загнаў у зямлю швайку, з вушкам, каб і следу не асталося:

— Дзе манціроўка? — папытаўся ён у сына.

— У машыне.

— Выкінь у поле. Крыві нідзе не асталося?

Яны агледзелі адзін аднаго. Крыві не было.

— Сяргейка ўсё бачыў. Дарэмна мы яго ўзялі. З яго і помачы, як з камара,— коратка кінуў сын, усё яшчэ пільна азіраючыся навокал.

— Будзе маўчаць,— адказаў яму старэйшы.— На бацьку і на брата не пойдзе даносіць. Наган табе нашто?

— Прыгодзіцца. Цяпер усё роўна.

— Паехалі.

«Браневічок» выехаў з жыта на палявую дарогу і ўпэўнена папыліў полем далей ад шашы.

У машыне старэйшы, не азіраючыся, загадаў:

— Ты, Сярожа, нідзе не быў і нічога не бачыў! А то...

Бацька не азірнуўся на сына. Той нічога не адказаў. Яго ўсё яшчэ калаціла. Ён і адказаць нічога не мог — здавалася, што ў яго адняло мову.

Больш чым праз гадзіну запылены «браневічок» заязджаў у гарадок з супрацьлеглага боку, і яго ніхто не заўважыў. Машына пад'ехала да вялікага, у два паверхі, дома.

Маладзейшы выйшаў, адчыніў адны вароты, потым другія, у падвал, які быў пад домам. Машына нячутна скацілася ў падвал, вароты зачыніліся, сціх сабака ў будцы, які незнарок, нязлосна брахнуў пару разоў, пакуль разабраўся, што адчынялі вароты і вярнуліся дадому свае.

— Таварыш падпалкоўнік, паведамленне з чыгу-

начнай міліцыі. Затрыманы падлетак, Сяргей Барылка, з нашага горада. Уцякаў на БАМ.

Начальнік райаддзела падняў вочы на дзяжурнага — чаму гэта трэба дакладваць яму тэрмінова?

— У хлопца адабраны пісталет аўтаінспектара.

— Аператыўную на выезд! — загадаў падпалкоўнік, ужо на хаду даслухаў дзяжурнага і аддаў неабходныя распараджэнні.

Праз некалькі хвілін адна аператыўная машына імчала на мясакамбінат, другая — на Трэці Палярны завулак, дзе ў падвале, у гаражы, стаяў стары, але добра дагледжаны, з металічным самаробным кузавам «газік».

Лейтэнант Васюкоў скоса пазіраў на маёра Пяткевіча і стараўся роўна трымаць хуткасць. Ён адчуваў, што маёр спяшае і хвалюецца. Гэтага хвалявання ён не паказваў. Але не хвалявацца не мог, меркаваў па сабе Васюкоў. Ён сам здзівіўся, калі атрымаў раніцай зводку здарэнняў па вобласці.

Маёр Пяткевіч глядзеў на дарогу. Як паведамілі яму, папярэднія допыты затрыманых нічога не далі. Вобшук — таксама. Па забойству міліцыянераў усё была раскрыта, нават знойдзена ў жыце манціроўка і швайка — тое, чым было зроблена забойства. Пра забітых бычкоў версія ў затрыманых была недарэчная: выпадкова ўгледзелі паўз дарогу, пагналіся на дармаўшчыну. Гарадок малы, бандытаў затрымалі на рабоце. Трэба было спяшацца — над імі павінен быць нехта, каго яны, несумненна, баяцца, хто арганізоўваў усю іх работу.

Пасля прыезду Пяткевіч адразу ж загадаў устанавіць назіранне за домам, даў загад праверыць усіх, з кім дружылі Барылкі — такое было прозвішча затрыманых,— на мясакамбінаце. У Пяткевіча не ўзні-

кала сумнення, што гэты камбінат і ёсць тое месца, куды сцякалася крадзеная жывёла. Шукаць трэба было тут. Сорак пяць хвілін да сталічнага горада. Ён перагартаў лісткі са скупымі звесткамі пра сям'ю Барылкі.

Сам амаль дваццаць год на камбінаце, байцом. Сын растарэйшы пайшоў па бацькавай дарозе. Працуюць разам. Жывуць у адным доме. Новы дом пабудавалі гадоў пяць назад. У сына дачка васьмі гадоў. Жонка прадаўшчыца ў гастраноме. Старая Барыльчыха нідзе не робіць — пры доме ладны агарод і сад, у вёсцы сядзіба маці. На ашчаднай кніжцы дзве з палавінай тысячы грошай. Узносы паступаюць рэгулярна, пасля зарплаты. З месяца ў месяц.

Малодшы Барылка, Сяргей, кончыў восем класаў. Позні сын.

Старшы Барылка зайшоў у кабінет усё ў той жа брызентавай робе і маленькай, як на смех, берэтачцы. Вузкія вочы глядзелі на Пяткевіча з круглага твару, і ў іх не прачытвалася ні страху, ні раскаю, ні разгубленасці. Была нейкая глухая туманнасць.

— Грамадзянін Барылка, куды вы везлі бычкоў?

— Дадому, куды вёз.

— Дзе вы іх узялі?

— Я гаварыў, адбіліся. Пры дарозе ў кустах стаялі. Пагнаўся на дармаўшчыну.

— У вас у хаце не было чаго з'есці?

Вочы на імгненне падняліся на Пяткевіча, але праз туман у іх нічога не ўспыхнула. Толькі ў самім руху было і недаўменне, і пратэст.

— Ладна. За што вы забілі двух чалавек? Вы знаеце, што вам за гэта будзе?

Вочы зноў глуха і тупа паглядзелі на следчага. У іх ажыў на нейкае імгненне неспакой, нейкі прытоены, глыбокі жывёльны страх, не болей. На імгненне следчаму здалося, што чалавек, які сядзіць перад ім,

не разумее таго, што ім зроблена, што і забіў ён таму, што ўмеў забіваць, проста і лёгка, адным рухам, каб нават ні голасу, ні гуку.

Ён толькі цяжка варушыў на каленях рукамі.

— Дзе хаваеце грошы?

На гэта Барылка ўстрапянуўся, вочы ажылі, і адказаў адразу:

— Усё, што было, на хату аддаў.

— Няпраўда, Барылка. Грошы мы знойдзем. Хата будзе канфіскавана, я думаю.

Пяткевіч прыстукнуў далонню па стале. Ён адчуваў, што пачынае злаваць на гэтую грамадзіну з касцей і мяса. Толькі пасля таго, як маёр сказаў пра грошы, у вачах Барылкі прарэзалася вострая дрымучая лютасць. Цяпер ён пільна сачыў за маёрам, быццам той зараз мог забраць ягоныя грошы.

— Адрас Кульгавага, Барылка.

І вочы зноў засланіся тупым раўнадушным туманам. Барылка быццам і не пачуў, і не зразумеў, пра што яго пытаюцца. На імгненне Пяткевіч падумаў, што ён ягоны равеснік. Гэтаксама канчаў школу, а пасля збіраў сабе багацце. Рабіў і збіраў багацце. І больш нічога. Нічога болей, акрамя багацця.

Пяткевіч адчуў, што ў ім закіпае злосць, і каб стрымаць сябе, ён націснуў на званок, коратка загадаў канваіру:

— Адвядзіце. Сына да мяне.

Сын зайшоў, як жывая копія бацькі. Толькі на галаве не хапала берэткі-блінчыка, і паходка лягчэйшая, не гэтак урасла ў плечы спіна. І бацькавы шэрыя вузкія вочы на тлустым твары неспакойна і спалохана мітусіліся. У іх не было тае тупое і глухое пеляны, якая адгароджвала старэйшага Барылку ад усяго свету. Ён сеў і гэтак жа, як бацька, паклаў на каленях шырокія ў далонях з кароткімі тоўстымі пальцамі рукі.

— Вы канчалі школу?

— Кончыў.

— У арміі служылі?

— Служыў. У Карэліі.

— Пасля арміі нікуды не хацелі паехаць?

— Тата сказалі, каб вярнуўся дадому.

— А чаму вы пайшлі на мясакамбінат?

— Тата дамовіліся. Я прыйшоў з арміі і зразу ж на камбінат, каб месца не прапала.

— Чаму вы не пабудаваліся асобна? У вас жонка, сям'я. Цяпер маладыя сем'і не хочуць жыць са старымі.

— Тата сказалі, што на нас і аднаго дома хопіць.

— Грошы вы каму аддаяце, ну, палучку?

— Маме.

— А жонка?

— Жонка сваю палучку сабе пакідае. У мамы бяром, калі трэба.

— А вы знаеце, што вам павінна быць за зробленае?

— Што? Не памілуюць?

— За што вас памілаваць? Чаму вы забілі чалавека?

— Мне здалося, што тата паказалі галавою, каб я не пусціў яго паглядзець у машыну. Я не хацеў забіваць яго, я толькі стукнуў...

У вачах у малодшага Барылкі Пяткевіч бачыў толькі страх. Цяпер маёр разумеў, чаму гэты мядзведзяваты Ванька, калі «тата сказалі», трымаў брата, пакуль той паласаваў яго тросікам у гумавым шлангу.

— Дарогу да Кульгавага помніце? Бацька сказаў, што пакажаш.

Пяткевіч успомніў, што Сяргей Барылка гаварыў пра нейкага кульгавага — чуў пра яго ад бацькі.

— Помню.

Пяткевіч устаў з-за стала і ўжо на хаду, радуючыся, што малодшы так хутка раскрыўся, быццам між іншым папытаўся:

— А як вы аказаліся ў Забалоцці? Вы ж толькі па калгасных фермах бралі.

— Сярожка быў ў школьным лагеры. Ездзілі адведваць. А ночы тата сказалі, што можна заехаць. Сабе свежанінка будзе. Мы ўдзень яго прыгледзелі.

— Манціроўкаю старога білі?

— Не, кулаком... Каб не крычаў.

— Пакуль што не крычыць. У маю машыну яго,— загадаў Пяткевіч.

Праз некалькі хвілін «Волга» і «козлік» з аператыўнай групай выехалі з райаддзела міліцыі.

## РАЗДЗЕЛ ДВАЦЦАЦЬ ПЕРШЫ,

у якім маёр Пяткевіч затрымлівае бандыта.

Гарадок разбудоўваўся. Раён прыватных дамоў — у цэнтры месца на прыватную забудову болей не выдзялялі — падбіраўся да самага лесу. І Кульгавы не разлічваў, што гэтак хутка будзе ісці забудова і за ягоным домікам ужо пачнуць капаць траншэі на падмуркі і ўстануць дашчаныя часовыя хацінкі. Ля дома Кульгавага канчалася падсыпаная гравіем дарога, далей, да самага лесу, яе не было.

Дом Кульгавага быў пабудаваны не на мясцовы, на нейкі сібірскі лад, ці што. Ён выкапаў глыбокі падвал, і над ім так званы падмурак падняў на добры паверх. А ўжо на гэты падмурак паставіў драўляны, куплены тут жа, у райцэнтры, на знос моцны, яшчэ са стрыжнёвага дрэва, дом.

Тое, што чалавек гэтак хутка і гэтак багата забудаваўся, ні ў кога не выклікала вялікага здзіўлення. Чалавек адрабіў сваё на Поўначы, меў дакументы, меў права пасяліцца, дзе яму захочацца. Да таго ж яшчэ быў і інвалідам. У раённай ашчаднай касе ляжалі пакладзеныя ім грошы... Жыў мірна, завёў галубоў, купіў з рук машыну і ездзіў па грыбы і на рыбалку.

Больш пра яго ніхто нічога не ведаў, з суседзямі ветліва вітаўся, сяброўства вялікага не вадзіў. Яго і празвалі яны між сабою Кульгавы, хаця накульгваў ён ледзь прыкметна і заўважыць можна было толькі, калі добра прыгледзецца. А сам ён нават і прывабны, дужы, з блакітнымі вачыма. Адзяваўся па-маладзёжнаму.

Мужчына зайшоў на кухню, уключыў газавую пліту, паставіў чайнік з вадой, зварыў кавы, наліў у кубачак, капнуў некалькі кропель каньяку, прысеў на табурэтку і пакрысе, смакуючы напітак, пацягнуў яго і глядзеў з акна. Ён сам не заўважаў, што гэтак вось сядзіць на кухні і часта п'е ўдзень каву, калі хвалюецца. З кухні, як з назіральнага пункта, ён глядзіць на дарогу — толькі па ёй можна дабрацца да ягонага дома. Трывожыцца не было чаго. Усё ішло, як і звычайна, не першы год ужо. Не прывезлі толькі свой узнос Барылкі. Але такое здаралася і раней. І ўсё ж нешта турбавала яго. Тое знаёмае адчуванне, якое было і раней, перад тым як яго бралі. Ён не верыў ні ў прыкметы, ні ў прадчуванні, але ад гэтага не станавілася спакайней. Неяк само сабой ён праверыў, ці запраўлены «Масквіч», даліў поўны бак гаручага, выгнаў машыну і паставіў за плотам.

Ён нават усміхнуўся, калі ўгледзеў «Волгу», і следам за ёй міліцэйскі «козлік» на дарозе, адпіў глыток кавы, асцярожна паставіў кубачак на стол, дастаў з буфета бутэлечку з бензінам для запальнічак, паліў падлогу, выйшаў з кухні, запаліў запалку, кінуў і зачыніў за сабой дзверы. І тады хутка, па-кашачы выбег на двор, адчыніў варотцы ў глухім дашчаным плоце, сеў у машыну, завёў яе і ціхенька, як крадучыся, паехаў нацянькі поплавам да другой вулачкі.

Моцна зробленая з жалеза брама і варотцы былі зачынены з двара. На званкі ніхто не адзываўся. І Пяткевіч адчуў, што іх ужо заўважылі, што гэта не выпад-

ковасць. Ён памкнуўся абысці дом і ўгледзеў легкавічок, які прысадзіста, але хутка праставаў па поплаве.

Пяткевіч зразумеў усё адразу, падбег да машыны, адчыніў дзверцы, загадаў маладзейшаму Барылку:

— Вылазь! — І адразу ж Васюкову і капітану з раённага аддзела: — Тэрмінова ў дом!

А сам ужо садзіўся ў машыну, з'ехаў з гравійкі і завярнуў за вугал дома, убачыў, як за пусткаю знік у вулачцы сіні дым машыны.

Перад тым як завярнуць у вулачку, Кульгавы азірнуўся: нікога следам. Ён з палёгкай усміхнуўся — цяпер шукай ветру ў полі. Па вуліцы ехаць не спяшаўся, яшчэ раз для кантролю азірнуўся.

Маёр Пяткевіч разумеў, што адпускаць далёка ўцекача яму нельга — але спалохаць адразу, на вулачках, якіх ён не ведаў, не хацелася.

— Я — першы... Вяду праследаванне. «Масквіч» сіняга колеру. Дваццаць пяць — нуль тры. Устанавіце, хто пражываў па адрасу. Перакрыйце выхады з горадка...

Пяткевіч бачыў, як «Масквіч» выскачыў з завулка на заасфальтаваную вуліцу. Ён ужо тады, калі ўгледзеў машыну, якая ўцякала ад дома, зразумеў, што пагарачыўся, недаацаніў сітуацыю і зрабіў памылку, паехаўшы адразу дахаты. Трэба было абавязкова арганізаваць праверку, назіранне і засады. Разам з гаспадаром «Масквіча» магла абарвацца і адзіная, такая надзейная нітка, якая прывяла амаль што да завяршэння аперацыі.

Кульгавы зірнуў у люстэрка задняга абзору міжволі, па шафёрскай прывычцы, калі выязджаў з завулка. Вока паспела заўважыць толькі пярэднюю частку капота, крыло і фару. Але і гэтага было дастаткова, каб ён зразумеў, што за ім едзе «Волга». Чаго яна едзе, сумнення не ўзнікала. Ён адразу ж ірвануў наперад

свой «Масквіч», праклінаючы сябе за тое, што паспяшаўся, што не дастаў «жыгуля», на якім не страшна была б і «Волга».

— Я — першы... Іду па Валадарскага... Мяне заўважылі,— коратка перадаў Пяткевіч па рацыі, праверыў пісталет і зняў з засцерагальніка.

У «Масквіча» не хапала ні магутнасці, ні хуткасці, Пяткевіч гэта зразумеў з палёгкаю, але ягонай «Волзе» не давала ходу вузкая, з глыбокімі выбоінамі ў асфальце вуліца, якая выходзіла на шашу.

— Першы, першы, патрулі выйшлі з выхаду Валадарскага на шашу,— нібыта пачуўшы яго думку, ажыла рацыя.

— Зразумеў,— коратка адказаў Пяткевіч, выскокваючы следам за «масквічыкам» на шашу, набраў хуткасць. «Масквіч» з усёй сілы стараўся не паддацца. Маёр заўважыў, што патрульны міліцэйскі матацыкл з каляскай заміргаў святлом, спыніўся папярок дарогі, міліцыянер, які сядзеў у калясцы, падняўся, выйшаў крыху насустрач «Масквічу», загадзя выкінуўшы руку з жэзлам. Пяткевіч бачыў таксама, што і другі міліцыянер, які так і астаўся за рулём матацыкла, дастаў з кабуры зброю, каб падстрахаваць таварыша. Пачалі спыняцца машыны, якія ехалі ўслед за міліцэйскім матацыклам. «Масквіч» пачаў збаўляць хуткасць, набліжаючыся да міліцыянера. Пагоня канчалася. Пяткевіч нават расслабіўся на нейкае імгненне, усё было даволі звычайна і проста. І ў гэты час ён убачыў, як «Масквіч» рэзка газануў, ірвануў з месца, левым крылом ударыў у міліцэйскі матацыкл, паваліў яго, ірвануў па дарозе. Ужо краем вока Пяткевіч сфатаграфаваў міліцыянера, які бег да свайго таварыша, якога не было відаць з-за перавернутага матацыкла. Маёр прыбавіў хуткасці, з лютасцю прыціскаючы машыну, гатовы скінуць яе пад адхон. І ўбачыў, як з калоны сустрэчных машын, якая спынілася, паволі выруляваў

МАЗ і наўскасяк загарадзіў праезд. Пяткевіч націснуў на тармазы, бачыў, як закруціў па асфальце «Масквіч», павіс пярэднімі коламі ўжо над кюветам. З машыны выскачыў чалавек у спартыўнай куртцы, з партфелем і кінуўся бегчы ў жытнёвае поле.

— Стой! — Пяткевіч бег следам за ім, але мужчына нават не азірнуўся. Пяткевіч адчуваў, што дагнаць уцекача яму будзе няпроста. Нібы ў пацверджанне гэтага, мужчына на хаду азірнуўся, ускінуў руку, і Пяткевіч пачуў, як блізка, побач прайшла ў паветры куля.

Цяпер трэба было весці пагоню асцярожней. Чалавек, які мае зброю і пачынае страляць па міліцыі, мае за сабой такое, што можа пайсці на ўсё.

— Стой! — яшчэ раз крыкнуў Пяткевіч. Адлегласць паміж ім і мужчынам павялічвалася. Але ў адказ на крык уцякач зноў азірнуўся і стрэліў, быццам пацвярджаў, што літасці чакаць нельга.

Пяткевіч яшчэ не прыняў рашэння, але ведаў, што губляць з воч бандыта ў полі нельга.

Бандыт зноў азірнуўся, і Пяткевіч не ўспеў падумаць, што страляе той упэўнена, адчуў, як нешта пякуча хвасянула па галаве вышэй вуха. Востра, нібы пугай, сербанула. Мацнуў рукой за галаў — рука была ў крыві.

Пяткевіч ускінуў пісталет і таксама стрэліў паверх галавы. Бандыт не зрэагаваў на стрэл, але на нейкае імгненне запаволіў бег, усё роўна як задумаўся.

Злева па полі ішла міліцэйская машына пад мігалкай, закрывала бандыту дарогу далей.

Нібы па інерцыі бандыт яшчэ бег, потым спыніўся, завярнуўся і стрэліў па Пяткевічу не цэлячыся. Маёр бачыў, што страляе у яго раз, другі, трэці. Усе тры кулі ён пачуў блізка, хрыпла кінуў:

— Стой!

Бачыў, як бандыт адкінуў убок пісталет, але рук

так і не падняў, глядзеў ва ўпор на задыханага Пяткевіча лютымі вачыма.

— Кулю б табе ў лоб, сука лягавая! — працадзіў ён скрозь зубы, кінуў пад ногі Пяткевічу партфель, завярнуўся і пайшоў да міліцэйскай машыны, сашчапіўшы за спіной рукі.

Маёр азірнуўся, знайшоў у жыце выкінуты бандытам пісталет — затвор быў у заднім становішчы, кончыліся патроны. Партфель напакаваны.

Затрыманы нават не азірнуўся, ужо ў наручніках ссутулена ўлазіў у машыну.

— Вы паранены, таварыш маёр! — здзіўлена ўсклікнуў сяржант.— Зараз я вас перавяжу.

— У машыне.

— Поўны партфель грошай! — паведаміў шафёр.

— Паехалі,— коратка загадаў маёр.

Васюкоў зразумеў усё і адразу. Ён першы пераскочыў цераз агароджу, адкінуў жалезную масіўную зашчапку з варотцаў. З акна густа праз шчыллё вылазіў дым.

— З машыны агнятушыльнік! — коратка загадаў ён.

Дзверы ў дом былі адчынены.

— За вёдры і ваду з калонкі,— загадаў ён разгубленым міліцыянерам.

Агонь ужо пачаў вылазіць з кухні па фарбаванай падлозе ў пакой. Адразу ж струменем пены Васюкоў пагнаў яго назад у кухню.

Знізу ўжо чуваць быў тупат міліцыянераў з вёдрамі вады.

Праз некалькі хвілін з адчыненага акна абгарэлае чорнае кухні выходзілі астаткі дыму і пары. Камар падышоў, зачыніў кран газавае пліты, з аднае канфоркі якое шыпеў газ.

— А дзе ж гаспадар? — папытаўся адзін з апératыўнікаў.— Пажар не крымінальнаму вышуку тушыць...

— Прадымілі гаспадара,— кінуў у адказ Васюкоў.

Зайшоў шафёр.

— Таварыш лейтэнант, маёр загадаў пакінуць тут засаду.

— Арыштаванага дастаўце ў райаддзел. Вернецеся, машыну пастаўце ў завулачку, перад выездам на вуліцу. Каб не кідалася ў вочы. Стаяць на сувязі,— распарадзіўся Васюкоў.

Ён зразумеў, штó стаяла за рашэннем маёра.

Падышоў, зачыніў акно.

— Так, хлопцы, пайшлі агледзім дом. Адзін будзе дзяжурыць на варотах. Другі на тым выхадзе, кудою знік гаспадар. Пайшлі агледзім дом.

Звычайная, за прыгожымі варотамі, калі глядзець знадворку, сядзіба выглядала дзіўна і нязвыкла знутры. Першае, што ад варот да самага ганка вяла выкладзеная бетоннымі пліткамі дарога. Двор зарослы рамонкам, дзяцельнікам. Ад вуліцы пасаджаны сад, малады, але таксама нейкі запушчаны, быццам здзічэлы. І ніводнае ўскопанае грады, ніводнае кветкі. За домам збіты з дошак прасторны хлеў для торфу і дроў. Другі, крыху меншы хляўчук, збіты з дошак, служыў за гараж машыне, хаця ад варот дарога вяла да дзвярэй у падвал пад домам, які больш падыходзіў для гаража. Моцныя, акованыя жалезам вароты былі замкнуты. Васюкоў, а следам за ім рабаціністы з твару, рослы і дужы аператыўнік Жэня спусціліся ў падвал па крутой драўлянай лесвіцы.

Падвал вымураваны з бетону. Абапал праходу двое металічных дзвярэй. Васюкоў адкінуў зашчэпку, адкрыў адны з іх. Дзверы адчыніліся мякка. Адтуль дыхнула холадам. У шафе, зробленай у бетоне, ляжалі цялячыя тушы. Працаваў халадзільны агрэгат.

— Фіў-у,— прысвіснуў Жэня, адчыніў наступную шафу.

Там таксама ляжалі тушы.

Далей за шафамі была ніша. На століі ўмацаваны крукі. Стаялі дзве паяльныя лямпы. Цялежка на нізенькіх колах. Замест крука да столі была прымацавана невялікая самаробная лябёдка. У падлозе пад крукамі канаўка, у канцы якой апушчаная ў бетонную яму выварка. У кутку стаяў маторчык, і ад яго выходзіла вентыляцыйная труба ўгору. На сцяне вісеў скручаны гумавы шланг, надзеты на водаправодную трубу.

— Цэх папярэдняй апрацоўкі,— прысвіснуў Жэня.

— Асталося ўзяць яшчэ збыт,— коратка кінуў Васюкоў, азіраючыся на дзверы, якія былі зачынены з сярэдзіны на металічную завалу, замкнутую на вісячы замок.

Ззаду пачуліся крокі, і Васюкоў убачыў маёра, які спускаўся ў падвал.

— Таварыш маёр,— пачаў ён, але Пяткевіч жэстам спыніў, прайшоў сам па падвале, зазірнуў у самаробныя халадзільнікі, агледзеў дзверы. Ён моршчыўся ці то ад болю, ці ад таго, што дапусціў такую прамашку.

— Прапаную такі план засады,— зноў пачаў Васюкоў, але маёр кіўнуў галавой, каб ішлі следам за ім.

— Заварыць кавы, таварыш маёр? — Васюкоў устаў.

— Звары, лейтэнант.

Непрыемна пахла вуголлем, як ад галавешак на залітым пажарышчы. Але адсюль, з кухні, як зназіральнага пункта, былі відаць усе пад'езды да дома.

Васюкоў паставіў на пліту чайнік.

— Урэшце, каб пасадзіць Кульгавага, доказаў хопіць. Барылкі і ён. Ён — асноўнае. Збыт ён арганізоўвае.

— Нам трэба той, хто дапамагаў.

— І тыя, хто акрамя Барылкі яшчэ пастаўляў яму тавар.

11 Зак. 2732

— Значыць, гарэлачная справа і міліцыянер з другое оперы?

— Значыць, з другое, лейтэнант.

— Вы збіраецеся ўсе дні сядзець тут у засадзе?

— У засадзе будзе каму сядзець і без нас з табой. Смачна пахне. Ты сам добра гатаваць умееш, таму і не жаніўся дасюль?

— Часу не хапае.

— Што значыць не хапае часу, будзеш ведаць, як пастарэеш. А каву, мабыць, прыйдзецца адкласці.

Пяткевіч устаў — з акна было відаць, як у вуліцу заварочваў рэфрыжэратар.

— Я адчыняю вароты, дзверцы шафёра. Ты страхуеш другога, калі будзе ў кабіне,— спускаючыся ўніз па лесвіцы, яшчэ раз паўтарыў Пяткевіч. Ен заўважыў, што ў многіх дамах яшчэ не патухлі вокны, было не так і позна.

Ужо стоячы ля варот, ён чуў, як мякка і спакойна пад'язджае машына, і калі яна пад'ехала да дома, прачыніў вароты. Машына прытармазіла, шафёр пачаў заварочваць улева, паставіў машыну ўпоперак дарогі і задам пачаў заязджаць на двор. Машына пайшла на двор упэўнена, і Пяткевіч адступаўся разам з ёй, каб аставацца ў цяні ад кабіны. Заглух матор, ляпнулі дзверцы, і шафёр лёгка, упэўнена саскочыў з падножкі, па-свойску кінуў:

— Прыбылі. Прычыні вароты.

Ен быў нізкаросль, сярэдніх год.

— Рукі ўгору,— ціха загадаў Пяткевіч. Вароты ўжо зачыніў Васюкоў.

У святле ліхтара ён убачыў утрупелы ад страху і ад нечаканасці твар.

— Марш!

Шафёр пакорліва пайшоў у хату. У яго падгіналіся ногі.

— Дакументы на тавар з сабой?

— З сабой,— паслухмяна адказаў ён.

У пакоі Пяткевіч, разгортваючы шафёрскія дакументы, ружовыя запоўненыя лісткі, коратка кінуў:

— Ну вось, асталося толькі вагу пазначыць.

Мужчына цяжка апусціўся на крэсла, калені яго ўздрыгвалі. Ён не вытрываў, уткнуўся тварам у калені і заплакаў неяк па-бабску, наўзрыд, прыгаворваючы:

— Знаў, знаў, што рана ці позна!.. Каб вам калом зямля стала! Знаў, знаў жа!..

— Прозвішча правільнае? — папытаўся Пяткевіч, прыглядаючыся да накладных.

— Сволач, каб яму зямля калом! Задушыць яго мала! — мужчына не пераставаў плакаць.

— Хваціць, Залатарэвіч. Грошы ж бралі. Выведзіце яго.

Гэты страх перад пакараннем ніяк не вязаўся з той лёгкасцю і ўпэўненасцю, нават з бесклапотнасцю, з якой шафёр вылазіў з машыны.

Праз некалькі хвілін рэфрыжэратар ціха выехаў з двара, вароты за ім зачыніліся, праз некалькі хвілін за ім ад'ехала ад дома і міліцэйская «Волга». Два апаратыўнікі і машына напагатове асталіся несці дзяжурства.

Праз некалькі гадзін у сябе дома быў арыштаваны прыёмшчык базы Новак. Падняты з пасцелі ў сваім ладна адбудаваным доме, ён спрабаваў абурацца і пратэставаць, але неяк адразу зніякавеў, калі Пяткевіч з усмешкаю кінуў, што яго чакае кампанія сяброў.

## РАЗДЗЕЛ ДВАЦЦАЦЬ ДРУГІ,

### у якім маёр Пяткевіч завяршае пошук.

Маёр Пяткевіч перагарнуў яшчэ раз лісткі ў папцы, паказаў на крэсла Кульгаваму, якога ўвёў сяржант.

— Сядайце, грамадзянін Маёраў.

Мужчына асунуўся за апошнія дні, глядзеў на Пяткевіча спадылба.

— Перад тым як развітацца, давайце ўсё расставім на свае месцы.

Пры слове «развітацца» арыштаваны паглядзеў на Пяткевіча, быццам хацеў разгадаць, што стаіць за гэтым словам.

— Вы не хочаце гаварыць? Што ж, гаварыць амаль няма чаго і па тых фактах, што маем. Пра тое, што ўзята ў падвале вашага дома, пра напад на міліцыянера на дарозе. Пра арганізацыю рабаўніцкай шайкі... І ніякі вы не Маёраў, а Сімакоў Яўген Іванавіч, трыццаць восьмага года нараджэння. У свой час прараб на будаўніцтве ў сістэме «Міжкалгасбуда». Памятаеце гісторыю са збытам будаўнічых матэрыялаў? Пераказваць доўга. Адзін з саўдзельнікаў крадзяжу ў асабліва значных памерах. Пяць год строгага рэжыму... У вас асталіся грошы, і, мне здаецца, вы лёгка выйшлі з тае сітуацыі. Ці яна вам дала добрую навуку?

Затрыманы маўчаў, быццам усё, што гаварылася, не датычыла яго. Урэшце, ён ведаў, што асобу яго хутка высветляць.

— У той час па справе будматэрыялаў праходзіў нехта Новак. Яму суд вынес умоўнае пакаранне. І вось аднойчы да яго з'яўляецца ў госці нехта Маёраў Мікалай Паўлавіч, чалавек, які чэсна адпрацаваў на Поўначы, які вырашае пасяліцца ў горадзе. Новак ужо працуе прыёмшчыкам на базе. Дапамагае па блату таму-сяму здаць жывёлу. У яго і на прыкмеце ёсць людзі. Такія, як Барылкі. Ён дапамагаў ім. Хата пабудавалася, з падвальчыкам. Пайшла работа, пайшлі грошы. Білі не толькі жывёлу, але і людзей...

— Людзей не білі. Бралі толькі ў калгасах.

— Пакуль бралі ў калгасах, на жаль, усё ішло шыта-крыта. З-за бычка-двух калгасы не заяўлялі ў міліцыю, яны «прападалі». Вось пратакол допыту ма-

лодшага Барылкі. Ен не адмаўляе, што ім у Забалоцці скалечаны да паўсмерці стары.

— Сволачы! Я так і думаў, што пачалі грэбці самі! Сволачы!

Сімакоў прамовіў гэта працяжна, з нянавісцю, быццам толькі зараз знайшоў разгадку таго, чаму ён сядзіць перад маёрам.

— Вы нічога не зразумелі, грамадзянін Сімакоў. Рана ці позна ўсё б скончылася. Чым раней, тым лепш для людзей. Вы паказалі, што можна браць і ні за што не адказваць. Вы адрадзілі Новака, вы далі ход прагнасці Барылкаў, і не толькі Барылкаў. Вы нават не пагрэбавалі звязацца з раённымі зладзюжкамі.

— Доўга я астаўся на адным месцы. І не шукалі б... Успелі!

— Заўсёды ўспелі б. Падумайце, што недаказалі мне, раю чэсна расказаць следчаму пракуратуры.

Пяткевіч адчуваў, што яму няма цікавасці і не хочацца весці допыт далей. Факты былі сабраны, падрыхтаваны дакументы, падмацаваныя паказаннямі саўдзельнікаў, рэчавымі доказамі.

Пяткевіч націснуў кнопку. З'явіўся сяржант. Сімакоў недаўменна паглядзеў на маёра, быццам чакаў яшчэ пытанняў і працягу, не хацеў выходзіць з кабінета, туды, на ім самім выбраную дарогу, па якой так не хацелася цяпер ступаць далей.

Пяткевіч загарнуў папку, акуратна завязаў яе. Сімакоў устаў, у ягоных вачах зноў мільгануў агонь тае лютасці, якім ён апёк Пяткевіча там, на полі, калі зразумеў, што нікуды яму не дзецца, што яго затрымалі.

Пяткевіч нейкую хвіліну сядзеў адзін, потым зняў трубку.

— Камар, ну што ў цябе?

— Нічога новага, таварыш маёр.

— Не можа быць. З кім працуеш?

— «Баксёр» нічога новага не даў. Думаю, што яго Клімакін і не падпускаў блізка.

— Барменша?

— Барменша гаворыць, што ведала яго як частага наведвальніка бара. З грашыма. Інжынер.

— Па самой барменшы?

— Ніякіх дакументаў, ніякіх доказаў. Дарэмна палезлі ў бар з рэвізорамі. Без барменшы тут не абышлося. Занадта ж вольна яна жыве і адчувае сябе.

— Гэта твае фантазіі. Факты дзе?

— Факты, мабыць, там, дзе і Клімакін. Рудзь паказала, што Клімакін даўно ведае барменшу. Ён нават прагаварыўся быў, што і работаю, і тым, што выцягнуў у людзі, Кандрацік абавязана яму.

— А Рудзь каму абавязана? Кандрацік?

— Падобна, так. Кандрацік закінула мне ў гаворцы, што Алёна больш ведае пра Клімакіна, чым яна... Неяк занадта ж з намёкам.

— Ну вось і раскруці гэты намёк. Дарэчы, што з сястрой Рудзь наконт таго гадзінніка?

— Аляхновіч не схлусіў. Афіцыйна пасведчыла, што ніякі гадзіннік у яе не прападаў. Вось так.

— Што яшчэ?

— Прасіў сустрэцца з вамі Тумаоўскі Ян Даніпавіч. Журналіст. Той, каго Аляхновіч аглушыў у полі. Ён ідзе па справе як пацярпелы і сведка.

— Чаго сустрэцца?

— Збірае матэрыял для газеты. На маральна-этычную тэматыку, так сказаць, хоча раскрыць прычыны і ўмовы, якія прыводзяць да злачыннасці.

— На тым тыдні. Усё ж высветлі, што мела на ўвазе Кандрацік, гаворачы, што Рудзь лепш ведала Клімакіна. Трэба шукаць яго. Як бачыш, кража жывёлы — асобная справа. Я перадаю яе следчаму пракуратуры, няхай раскручваюць да канца гэтую справу, бо надта ж усё сур'ёзна.

Назаўтра Камар выклікаў Валю да сябе. Яна зайшла лёгка і прыгожа, усміхнулася. Толькі губамі і вачыма, нібы гэтым ашчаслівіла.

— Дзень добры.

— Дзень добры, Валянціна Рыгораўна.

— Ну, можна і проста Валя. І сустрэцца маглі не ў кабінеце, а на беразе мора. Ці магу лазеньку заказаць, пазваніце Пашку, няхай прыедзе.

Яна ўсміхнулася стрыманай, халоднай усмешкай. І ў кожным яе руху было адчуванне сваёй перавагі, сваёй вышэйшасці. Холадна глядзелі вочы, і яны здаваліся плоскімі, без глыбіні. Яна нібы хацела паказаць, што можа ўсё тое, чаго не можа ён, Камар, якому яна зараз вымушана падпарадкавацца, але яна не надае значэння гэтай часовай ягонай перавазе, бо на самай справе перавага на яе баку, за ёй апошняе слова.

— У лазні нам больш разам не мыцца. І не загараць таксама. А з Пашам — гэта ваша прыватная справа. З вамі я сустрэчы назначаю не таму, што мне хочацца.

— Пашу я магу і пазваніць. А вам я б ніколі не пазваніла. Усе вашы фантазіі не выходзяць за аколыш міліцэйскай фуражкі. Што такое жыць па-сапраўднаму, вам ніколі не зведаць...

— Значыць, знаёмства з Клімакіным у вас выпадковае? А вось Рудзь гаворыць, што вы даўно знаёмы?

— Алёна? Адкуль ёй ведаць? Урэшце, я адзінокая і прыгожая жанчына, ён адзінокі мужчына. Але не гэта вас цікавіць.

— Па сведчанню тае ж Алёны, ён не з тых, хто вам падабаецца.

— А як ён спадабаўся ёй пасля загараднай прагулкі? Няхай пра гэта яна вам і раскажа. Гэта і ўсё, што вы хацелі ў мяне папытацца? Калі яшчэ што ёсць, то не адкладвайце — у мяне білет, я лячу ў Сочы. Там цёпла, там мора і там на пляжы вясёлыя мужчыны.

Яна ўстала, падала Камару пропуск. Усміхнулася.

Камар моўчкі адзначыў пропуск. З кожнай сустрэчай з Кандрацік ён адчуваў, што яна выклікае ў ім нейкую глухую хвалю абурэння. Яго злавала і яе ўсмешка, і гэтая прыхаваная пагарда да яго, нікчэмнага і дробнага,— так і не інакшай яна глядзела на Камара. І гэтыя словы пра Сочы, пра раскошу траціць грошы ў рэстаранах яна сказала знарок, каб паказаць сваю перавагу, каб даць зразумець, што да яе, багатай і маладой, яму ніколі не дацягнуцца.

Алёна Рудзь зайшла ў кабінет насцярожана.

— Што, Алёна, будзем гуляць у хованкі яшчэ? Дзе вы сустракаліся з Клімакіным акрамя бара і што пра яго ведаеце?

Камар прыстукнуў далонню па стале і ўстаў.

— Я гаварыла вам...

— Ад мяне толькі што выйшла Кандрацік. Яна гаварыла другое.

Дзяўчына ўсхліпнула:

— Мне брыдка гаварыць...

— Гаварыць брыдка, а рабіць?.. Я слухаю. Дзе вы яшчэ сустракаліся з ім?

— У яго на дачы. Ён катаў спачатку мяне на катэры, потым паехалі на машыне. У яго дача. А там, потым... Не, я не магу ўсяго. Валька сама падвучвала мяне пагуляць з ім, а пасля ўхмылялася!

— Вы можаце паказаць, дзе дача?

— Я не помню.

— Па якой дарозе вы ехалі?

— Па Усходняй шашы. І там чыгунка недалёка. Электрычка праходзіць.

— Паедзеце са мной. Пачакайце ў калідоры.

Праз дзесяць хвілін шэры «жыгуль» ад'ехаў ад абласнога ўпраўлення міліцыі. Алёна перастала шмыгаць носам, падпудрылася і пазірала на Камара.

— Правільна едзем?

— Правільна. А там далей будзе з'езд направа, зноў на асфальтаваную дарогу. Гэта я помню. А потым пасёлак. Вялікі такі, у ім павярнуць налева, па вуліцы. Там з аднаго толькі боку дамы. А потым па лесе дарога.

— Глядзі ўважліва.

Дачны пасёлак пачынаўся за ўзгоркам, і з лесавое дарогі быў відаць вялізны масіў садовых домікаў. Пры ўездзе ў пасёлачак стаяў драўляны магазінчык, да яго цэнтральная лінія вяла ўздоўж усяго пасёлка. Ад яе па парадку адыходзілі лініі-вуліцы.

Камар завярнуў на першую лінію, ехаў паволі па вузкай, абсаджанай кустамі, бэзам, маліннікам дарозе. Зблізку домікі не здаваліся такімі падобнымі адзін на аднаго. Гэта былі стандартныя, купленыя і зманціраваныя, самаробныя, са сваёй архітэктурай, з верандамі, мансардамі і вострымі, як у церамках, дахамі. Стаялі і звычайныя перавезеныя і пастаўленыя вясковыя драўляныя хаты, некаторыя на высокім падмурку, са з'ездам у падвал-гараж.

— Не, недзе ўсярэдзіне. Звычайны стандартны домік...

Праехалі другую, трэцюю, чацвёртую лініі.

— Не, гэта недзе ўсярэдзіне пасёлка... Я не помню. Здаецца, жаўтлявыя сцены. І залацістыя шторы на вокнах. Праўда, акно з пакоя выходзіла ў сад, не на дарогу. І плота ад вуліцы там не было.

Пафарбаваных охрай было дзве трэці домікаў. Абыходзіць усе і глядзець на шторы ў тое акно, якое выходзіла ў сад, не было магчымасці ды і патрэбы.

Камар усё ж праехаў да канца ўсе лініі. Домік Алёна так і не змагла пазнаць. На малой хуткасці ў машыне было душна.

— Ён што, цябе з завязанымі вачыма сюды вёз, гэты Арнольд? — не стрымаўся Камар, калі яны выехалі з пасёлка, каб ехаць назад у горад.

— Я ж нічога не думала. Балбатала з ім. На катэры мы выпілі шампанскага. Ён крышку, а я астатняе, а пасля шампанскага...

Камар скоса паглядзеў на дзяўчыну і вылаяў Семежава: гэта ён пазнаёміў яго з гэтым ягняткам, якое ў горадзе замест навукі выбрала работу ў бары, якое возяць па дачах сумніцельныя мужчыны, якое потым гатова толькі плакаць і прасіцца, каб дома ні пра што не даведаліся. Баіцца, што перастануць даваць грошы ці вернуць назад да сябе. Добра, што тады ў яго хапіла вытрымкі і не пачаў заляцацца. У Камара нават узнікла жаданне спыніць машыну, высадзіць яе на ўзбочыне, няхай дабіраецца па гарачыні да горада, як хоча.

— На якім вы катэры пілі? — амаль механічна задаў ён пытанне, бо катэр і вада ніякага дачынення не мелі да гэтага раскінутага ў лесе за горадам дачнага пасёлачка.

— На выратавальным. На возеры ў горадзе. Арнольд узяў там катэр, і нас каталі па возеры.

— Хто даў вам катэр?

— А там Арнольда ўсе ведаюць. На выратавальнай станцыі. У яго там нават і шампанскае ў запасе.

Апошняе спадзяванне было на выратавальную станцыю.

— Раскажы мне, як ты пазнаёмілася з Кандрацік?

— Дома думаюць, што я вучуся завочна ў тэхнікуме, а раблю на заводзе, аператарам на эвээм. Я правалілася на экзамене. Трэба дадому ехаць, а як падумаю, што дома мяне поедам будуць есці, потым кармі гэтых свіней-гусей... Села і раву ў скверыку. Яна ля мяне села, распыталася, дадому завяла. На работу ўстроіла, прыпісала.

— Хто яна?

— Ну, Валя, барменша.

— Ты ў яе жывеш?

— Не, на кватэры. Яна памагла мне найсці.

— Так і думаеш пасуду мыць усё жыццё?

— Не. Валя абяцае, што ўстроіць мяне афіцыянткай ці буфетчыцай. Завочна ў гандлёвы тэхнікум паступлю. Цяпер хто звязаны з гандлем...

Алёна спахапілася, не дагаварыла. Яна паўтарала чужыя словы.

— І чым жа ты аддзячыла яе за дабро...

— Ну... Я прыбіраю ў яе кватэры, мыю...

— Бясплатная домработніца? — усміхнуўся Камар.

— Не, яна мне плоціць шэсцьдзесят рублёў.

— Выходзіць, ты зарабляеш у месяц, як інжынер. З Клімакіным Валя знаёмая?

— Ён часта ў бары бывае. А так я іх не бачыла разам.

— Хто і што прывозіў у бар, ну, акрамя тавараў з базы?

— Не! Нічога ніколі! Праўда!

Дзяўчына гаварыла шчыра.

— Вось што, калі хочаш астацца чалавекам, кідай гэту сваю сяброўку, работу і ўсю мудрасць пра тое, як добра жыць таргашом... А не зробіш, я бацькам пра ўсё паведамлю. Запомніла, што я табе сказаў?

— Запомніла.

Алёну ён высадзіў у горадзе. Яна больш была яму не патрэбна: на гарадскім возеры толькі адна выратавальная станцыя.

Машыну Камар паставіў крыху воддаль доміка, зайшоў за дашчаны шчыльны плот, прайшоў па калідоры цераз домік і выйшаў да прычала, павітаўся, спытаў па-свойску:

— Арнольда тут не было?

На яго паглядзелі здзіўлена і доктар, і хлопцы-выратавальнікі, якія сядзелі ў цяньку ў альтанцы.

— Тут такога няма. Мы не знаем.

— А ён прыязджае да вас пакатаць дзяўчатак. У белым касцюмчыку, з лысінаю і доўгімі валасамі...

— А, таргаш,— кінуў адзін з выратавальнікаў і гукнуў мужчыну, які калупаўся ў маторы катэра: — Твайго таварыша пытаюцца.

Камар бачыў, што хлопцы ўважліва і крыху непрыязна разглядалі яго. Ад катэра, выціраючы рукі анучкаю, ішоў худы і чорны ад загару, нібы прасмалены, мужчына ў плаўках, у заношанай шэрай шапачцы.

Камар не чакаў, калі ён падыдзе, адышоўся да доміка, кіўнуў галавой і вывеў мужчыну следам за сабою на другі бок доміка, дзе нікога не было.

— Трэба бачыць Арнольда Клімакіна...

— А хто гэта? — мужчына востра паглядзеў на Камара.

— Гэта той чалавек, які бярэ у вас катэр, катае на іх дзевачак.

— Ніякага Арнольда я не ведаю,— мужчына завярнуўся, каб ісці.

— Хвілінку,— Камар паказаў пасведчанне.

— Што вы хочаце ад мяне?

— Я хачу ведаць, дзе той чалавек, які прыязджае да вас і які катае па возеры дзяўчатак на катэры...

— Дакатаўся, падла, я так і гаварыў сваім,— з нейкаю пераможнаю лютасцю сплюнуў сабе пад ногі мужчына.— Чуў, што гэтыя сікушкі яго чамусьці Арнольдам завуць. А гэта Віцька Горскі. Віктар Антонавіч Горскі. Мы разам вучыліся некалі ў інстытуце. Я не давучыўся... А ён кончыў, хвастаецца, па заграніцах шастае. Чырвонцамі направа-налева пры дзяўчатах: «Толік, прынясі мой запас...» Гэта мне, як халую. І каб бачыла гэтая ягоная сікушка, чырвонец падкіне!

Мужчына зноў сплюнуў, і Камару здалося, што ён ужо выпіў сёння віна, але яму хочацца яшчэ, і таму ён такі злосны і на свайго былога аднакурсніка, і на надвор'е, і на ўсё на свеце.

— Пайшлі да мяне ў машыну, і вы раскажаце ўсё па парадку, што пра яго ведаеце.

— А больш я пра яго нічога і не ведаю. Тыдні са тры ўжо не паказваўся тут, падла.

Дача Віктара Антонавіча Горскага, да якой выехала аператыўная група, ужо была не ягонай, стаяла замкнёнай, чакала новых гаспадароў.

Антон Казіміравіч і Лідзія Яўгенаўна са сваіх градак здзіўлена і разгублена глядзелі на міліцэйскую машыну.

— Ну, казаў я табе, што злодзей твой таргаш. І кофтачкі табе крадзеныя дарыў,— урачыста прыпужнуў Лідзію Яўгенаўну Антон Казіміравіч, калі ўгледзеў, як міліцыя абыходзіць домік.

Адзін з міліцыянераў неўзабаве накіраваўся да іх, прывітаўся і запрасіў быць панятымі пры вобшуку.

Лідзія Яўгенаўна пераступіла з нагі на нагу, дачакалася, каб першым следам за міліцыянерам пайшоў Антон Казіміравіч.

— Можа, ключы ўзяць ад дачы?

— А ключы ў вас?

— У нас. Віктар Антонавіч пакінуў, каб перадалі новым гаспадарам.

— Вазьміце,— міліцыянер спыніўся, пачакаў, пакуль Лідзія Яўгенаўна схадзіла па ключы. Калі падышлі да доміка, дзе іх чакалі, міліцыянер далажыў, што ключы ад дачы ў суседзяў. Чалавек у цывільным перадаў ключы свайму напарніку, каб адмыкаў дзверы, а сам падышоў да Лідзіі Яўгенаўны і Антона Казіміравіча.

— Вы не помніце, калі апошні раз бачылі суседа?

— Помню, мы палолі клубніку,— Лідзія Яўгенаўна зірнула на Антона Казіміравіча і выступіла наперад.— Віктар Антонавіч ужо з месяц назад сказаў нам, што едзе аж на пяць гадоў за граніцу. Ён прадаў машыну, потым дачу. Адпачываў тут апошнія дні. Раніцаю бегаў купацца. А потым чуем, кава пахне ў яго з доміка. Ён умеў варыць каву. І зярняты яму прывозілі.

Потым глядзім, ён у касцюмчыку і з такім невялікім чамаданчыкам выходзіць да электрычкі.

— Куды і чаго паехаў, сказаў вам?

— Сказаў. Гаворыць, да бацькоў хоча заехаць перад ад'ездам. Пагасцяваць пару дзён. Нам ключы пакінуў, каб новым гаспадарам дачы перадалі, калі ён сам не паспее сюды заехаць. А што з ім, няшчасце якое? — не вытрывала Лідзія Яўгенаўна.

— Не, пакуль што няшчасця з ім няма. Заходзьце, вам трэба прысутнічаць пры вобшуку.

Камар не сумняваўся, што вобшук нічога не дасць. Да свайго ад'езду Горскі падрыхтаваўся спакойна. Адчуваў сябе ўпэўнена. Нават машыну і дачу прадаў, каб не траціць грошай. Не баяўся. Камар не паверыў, што Горскі праўду сказаў суседзям і што сапраўды ён паехаў да бацькоў. Аднак трэба было праверыць і гэты ход.

Вобшук на дачы, як і на кватэры, нічога не даў. Там гаспадара бачылі даўно. Ніхто не здзіўляўся, бо суседзі ведалі, што работа ягоная звязана з доўгімі камандзіроўкамі.

## РАЗДЗЕЛ ДВАЦЦАЦЬ ТРЭЦІ,

### у якім губляецца след Клімакіна-Горскага.

На вакзале Камара чакала машына. Інспектар крымінальнага вышуку, малады, круглатвары хлопец, адразу ж падышоў да Камара, прывітаўся і назваўся: лейтэнант Воранаў. Ужо ў машыне коратка далажыў, што паводленазірання за домам Горскіх да іх ніхто не прыязджаў. Старыя дома, корпаюцца на градах, сама Горская рэгулярна зранку носіць на базар прадаваць пятрушку і ўкроп. Стары праводзіць яе да аўтобуснага прыпынку, чытае газеты, глядзіць тэлевізар і выходзіць да аўтобуснага прыпынку сустракаць жонку.

Пра маладога Горскага апытвалі суседзяў. Дома ён

даўно не быў. Паводле распытанага ў суседзяў, малады Горскі насуперак бацькам пакінуў інстытут, што для іх было страшэнным ударам. Стары Горскі прахадзіў у начальстве да пенсіі. Адзінага сына выхоўвалі з дзяцінства строга, рыхтавалі да дыплома. Хлопчык рос ціхі і пакорлівы, бацькоў слухаў, школу скончыў добра і паступіў у інстытут. Толькі некалькі чалавек з класа паступіла, і сярод іх сын Горскага. Старыя не маглі нарадавацца на свайго Вікторчыка.

З трэцяга курса ён кінуў інстытут. Пайшоў на работу ў сталіцы слесарам. У старога Горскага, гавораць, ледзь не ўдар адбыўся, калі сынок прыехаў дадому і аб'явіў пра гэта. Стары выгнаў яго з хаты, заявіў, каб і нагі болей не было. Сын прыязджаў некалькі разоў. Ужо на сваёй машыне. Жыў багата ў сталіцы, гаварыла старая Горская. Але стары і старая радасці ад гэтага не мелі. Апошнія гады ён толькі на святы старым замест падарункаў прысылаў грашовыя пераводы. Па сотні і па болей. Суседзі зайздросцілі і не разумелі Горскіх, чаго яны гэта перажываюць, што сын не мае дыплома: цяпер тыя, хто без дыплома, зарабляюць лепш. Вось і ўсё, што змаглі высветліць на месцы.

— Куды паедзем?

— Калі можна, адразу да Горскіх.

— Горская яшчэ на базары. Вы, відаць, захочаце пагаварыць і з ёй?

— Вядома.

— Тады лепш паедзем у гасцініцу. А потым машына падвязе вас да Горскіх. Я заеду па вас.

— Дзякуй. Калі будзе машына, я магу з'ездзіць і адзін.

— Удвух нам будзе весялей. Што-небудзь сур'ёзнае?

— Быццам і не. На ім павязаны продаж і перапродаж. Ён з інстытута заняўся фарцоўкай... Хацелася б нам ведаць усё.

— Ясна.

Лейтэнант Воранаў падкінуў Камара, пакуль той уладкуецца, і апоўдні асцярожна пагрукаў у дзверы нумара.

Горскія жылі непадалёку ад міліцыі, у самым цэнтры горада. Тут, як і шмат у якіх гарадах, асталіся астраўкі прыватных дамоў, забудаваных адразу пасля вайны. Гарады разрасталіся далёка, на ўскраінах павырасталі новыя мікрараёны, а вось гэтыя раёны так і зелянеліся пакуль што ў цэнтры.

Ля звычайнага, не надта вялікага па цяперашніх мерках драўлянага дамка машына спынілася. Воранаў пайшоў паперадзе, адчыніў веснічкі. Сабакі гаспадары не трымалі. На прысядзібным участку рос невялікі, але ўрадлівы садок, а на градах ад вуліцы — кветкі.

Дзверы веранды былі замкнутыя, і Воранаў націснуў на званок.

Адчыніў ім сухенькі стары ў акулярах і піжаме... Праз акуляры ягоныя вочы глядзелі па-начальніцку суха і строга.

— Мы з міліцыі,— пасля прывітання сказаў Воранаў, але стары пасля гэтага не запрасіў у хату, толькі зірнуў на Воранава і на Камара. Воранаў паказаў пасведчанне, і стары спакойна, але ўважліва прачытаў яго і толькі пасля гэтага сказаў:

— Заходзьце.

Правёў ён іх у невялічкі чысты пакойчык, пасярод якога стаяў круглы стол, засланы настольнікам, махры якога звісалі амаль што да падлогі. На стале стаяў драўляны гадзіннік, у куце старога выпуску, з маленькім экранам тэлевізар «Рэкорд», пры сцяне канапа з высокаю спінкаю і круглымі кацёлкамі па краях.

— Сядайце.

Стары прыняў са стала гадзіннік, сеў сам і чакаў, што яму скажуць.

— Следчы абласнога ўпраўлення,— назваў Камара Воранаў.

— Скажыце, Антон Восіпавіч, сын у вас быў даўно?

— У мінулую пятніцу. Прыехаў вечарам, перанначаваў і раненька паехаў.

— Куды паехаў?

— Не сказаў. Папярэдзіў толькі, каб не палохаліся, можа, надоўга і наўрад ці зможа падаць вестку.

— Усё?

— Усё.

— Можаце ўспомніць, пра што вы з ім гаварылі?

— Мы з ім больш ні пра што не гаварылі. У нас з ім даўно няма пра што гаварыць. Я не ведаю, чаго ён прыехаў. Ён жыве па-свойму, па-цяперашняму. Паказацца хацеў, што багаты? Я пра гэта ведаю.

Камар пачуў, як за плячыма ў яго нехта ўсхліпнуў. Ён азірнуўся. У дзвярах стаяла поўная, сівенькая старая жанчына. Гэта яна не стрымалася і ўсхліпнула, слухаючы мужа.

— Перастань, Маша. Даўно ясна было, што дабром ён не кончыць. Лішнія грошы дабра чалавеку не давалі ніколі.

— Заходзьце, Мар'я Гаўрылаўна, сядайце,— запрасіў Воранаў.

Жанчына зайшла, села на канапу.

Памаўчалі, яна саўладала са слязьмі, пачала гаварыць.

— Ён адзін у нас. Пасля вайны і нястача, і ўсё. У людзей кавалачка хлеба не было. Слава богу, мы маглі накарміць яго і дагледзець. Антон рабіў усё жыццё чэсна, здароўе паклаў. Мы і яго так вучылі. Ён быццам і слухаў. А потым пайшлі гэтыя моды. То валасы кароткія, то доўгія, то штаны вузенькія, то шырокія, то сукеначкі, што далей нельга...

— Мы яму ніколі волі не давалі,— строга ўставіў Горскі.

— Праўда. Я часам дам яму на што грошы, то Антон сварыўся. Слава богу, вывучыўся, паступіў. А пасля

прыехаў цераз два гады, мы яго не пазналі. Грошай аднекуль у яго. Дадому віно прыносіць, п'е. На танцы, у рэстаран. Тут у нас па суседству Трацяковы... Яго, старога, з месца на месца колькі пераганялі! Ён і сам то з жанчынамі блытаўся, то дадому валок. Але блат у яго ўсюды быў. Ён свайго сынка таксама ўстроіў вучыцца, хоць таго і са школы ледзьве выпхнулі. А бацька падмазаў, паступіў. Дак вот, прыехаў наш і з гэтым Трацяковым як злыганыя. Дзяўчат тут пачалі вадзіць. Ну, бацька, каб прыструніць яго троха, пачаў гаварыць... А ён на бацьку ўсяк. Што ненавідзіць і нас, і гэты дом, і тое, што мы тут святымі прытвараемся, што яго мучылі і што ён спаў і сніў, каб школу хутчэй кончыць, каб ад нас вырвацца... Што ён тады нагаварыў! Аж страшна! Бацька на яго: вон — а ён сабраўся і пайшоў! Плакаць не буду... Пасля нам грошы прысылаць пачаў, як на злосць. А пасля і на машыне прыехаў. Разадзеты. Ужэ і не піў, і не цягаўся тут альбы дзе. Я аж зарадавалася. А ён не запыніўся. Як чужы ад нас паехаў. Нават адрасу свайго не аставіў. На паштамт сказаў, каб пісалі...

— Жыць раскошна пачаў. Цяпер модна стала раскошна жыць. Не той у пашане, хто чэсна робіць, а хто грошы мае,— уставіў стары.— Рана ці позна, як і па нашага, міліцыя прыедзе па такіх.

— Што ж ён хоць натварыў?

— Пакуль нічога. Скажыце, у вас ёсць фатаграфія сына?

— Ёсць, а як жа.

Старая ўстала, прынесла альбом, разгарнула яго і падала фотаздымак Камару.

З фатаграфіі на яго глядзеў пастрыжаны, пры гальштуку, у касцюме малады хлопец студэнцкага ўзросту, акуратны, строгі, як з Дошкі гонару.

— А пазнейшай няма?

— Не, больш няма. Я яго такім і памятаю. А цяпер

нейкі з доўгімі валасамі, лысы. Усё роўна як і не той. Цяпер прыязджаў, заснуў, я падышла, глядзела на соннага. Усё роўна як чужы чалавек, а не той маленькі Віця.

— Нічога не сказаў, куды паехаў?

— Не, толькі што надоўга і невядома, ці пабачымся... Так пажартаваў, калі выпіў тут з бацькам.

— Па багатае жыццё зноў некуды паехаў. Змалку ён на яго зайздросны быў, хацелася яму такога. Цяпер міліцыя шукае. Не верыў мне.

Стары Горскі цяжка пракаўтнуў нешта даўкае і яшчэ больш ссутуліўся.

— Ён, можа, украў што? Бо паехаў, а на стале, я гляджу, пачак з грашыма пакінуў. У нас ніколі гэтулькі грошай не было. Калі з-за іх шукаеце, то вазьміце, яны нам не трэба.

Горская, як нешта гарачае, падала Камару дзве пераклееныя банкаўскай лентай пачкі дзесятак.

Камар падаў назад старой грошы.

— Можна ў вас папрасіць фатаграфію?

— Гэтую?

— Гэтую.

Старыя замяліся.

— Не бойцеся, мы вам аддадзім яе назад.

— Больш у нас не асталося...

Камар устаў, развітаўся са старымі. Горскі правёў іх у веранду, і яны пачулі, як за плячыма пстрыкнуў французскі замок.

Да машыны з Воранавым ішлі моўчкі. Маўчалі і ў машыне. Было нейкае цяжкае адчуванне на душы.

— І сям'я не зладзееў, не п'яніц.

— Затое на другіх глядзеў. Ён і бацькамі пачаў грэбаваць з-за таго, што яны маглі ўзяць і не бралі. Уяўляеце, лейтэнант, рос малады чалавек, а ў яго ўжо нянавісць была за тое, што недадалі яму. Яму хацелася адыграцца. Кінуў вучобу, заняўся фарцоўкай, а потым,

відаць, большы бізнес наладзіў. Грошай сабраў, шыкаваць пачаў. А цяпер паехаў недзе раскашаваць. Чамаданчык грошай наклаў і паехаў раскашаваць...

— Думаеце, што больш ужо няма Горскага Віктара Антонавіча?

— Думаю, няма. Успеў уцячы. Толькі ён памыляецца, не ўтрывае, некалі захоча яшчэ дабраць, яшчэ лепш пашыкаваць...

— Шкода, што яшчэ не толькі сабе, а і людзям жыццё спаганіць можа.

— Аб'явім росшук. І будзем шукаць, пакуль не знойдзем. Давайце, Воранаў, заедзем у гасцініцу, а потым у аэрапорт. Мне рабіць тут больш няма чаго. Дзякуй за дапамогу.

— Няма за што. Такая наша з вамі служба.

Машына з вулачкі выскачыла на шырокую, новую магістральную вуліцу, абапал якое стаялі дзевяціпавярховыя нядаўна пабудаваныя дамы.

## РАЗДЗЕЛ ДВАЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТЫ —

пра тое, як становяцца сябрамі маёр і Ян Туманоўскі.

Туманоўскага паклалі ў асобную палату. Толькі праз тыдзень ён пачаў уставаць, хоць і адчуваў, што кружыцца галава і пачынае падварочваць пад грудзі.

На другім тыдні, калі ён драмаў, прыкрыўшыся газетай, якую так і не дачытаў, у палату далікатна пастукалі.

— Заходзьце,— запрасіў ён.

— Дзень добры, Ян Данілавіч. Ой, як жа гэта вас! — яшчэ ў парозе ўскліснула Эма Барысаўна. Хударлявая, вастраносенькая, пафарбаваная пад бландзінку, яна трымала ў руцэ букет кветак, а ў другой напакаваную сумку. Туманоўскаму падалося, што ў сваім парыве яна кінецца зараз да яго, каб пацалаваць, і ён на ўсякі выпадак прыкрыўся газетай.

— Што, Эма Барысаўна, вы, падобна, у сваты да мяне прыйшлі?

— Ай, Ян Данілавіч, вы заўсёды так!..

— Заходзьце, заходзьце, Эма Барысаўна. І я ж саскучыўся без вас,— стараючыся, каб было ласкавей, запрасіў Тумаоўскі наведвальніцу.

Эма Барысаўна, нязменны рэдакцыйны прафорг, паклала на тумбачку кветкі, пачала выгружаць з сумкі цукеркі, піражнае і іншую здобу. Старая халасцячка, Эма Барысаўна заўсёды давала на старонкі газеты інфармацыі пра ўсе выстаўкі кандытарскіх вырабаў. Туманоўскі ніколі не любіў і не мог цярпець з дзяцінства салодкага.

— А горкага, Эма Барысаўна, няма там на дне нічога?

— Ой, Ян Данілавіч! Хіба ж можна ў бальніцы!

Эма Барысаўна ўсклікнула так, нібы Тумаоўскі прапанаваў ёй забіць чалавека ці саграшыць вось тут, адразу ж.

— Сядайце, сядайце, Эма Барысаўна. Ну што вы мітусіцеся.

— Ой, Ян Данілавіч, уся наша рэдакцыя ўзрушана, так узрушана... Гэта геройства. Як вы не пабаяліся лавіць гэтых зладзеяў? Рэдактар асабіста прасіў перадаць вам прывітанне, каб вы не хваляваліся. І паездку вашу ён будзе лічыць камандзіроўкай па заданню рэдакцыі...

— А на ордэн ужо мне прадстаўленне напісалі ці не?

— Ян Данілавіч, паверце, што ўвесь наш калектыў ганарыцца вамі. Асабліва наша моладзь...

Тумаоўскі ўздыхнуў і не стаў перабіваць болей Эму Барысаўну рэплікамі, счакаў, пакуль Эма Барысаўна выканае свой грамадзянскі абавязак, і толькі потым запытаўся:

— Дык што вы сказалі, даражэнькая, наконт камандзіроўкі?

— Шэф усе гэтыя дні адносіць вам за камандзіроўку па заданню рэдакцыі. Так што адпачынак за свой кошт застаецца за вамі на будучае.

— Дзіва проста. Што гэта я не пазнаю свайго шэфа? Можа, і праўда мне дадуць ордэн?

— Больш таго, шэф сказаў, што, калі трэба, ён яшчэ прадоўжыць вам камандзіроўку. Каб вы пра ўсё напісалі, што здарылася з вамі.

— Во, змей стары, чуе, дзе пахне матэрыялам! — не стрымаўся Туманоўскі.

Тое, што перадаваў цераз Эму Барысаўну рэдактар, пачаў рабіць ужо сам Туманоўскі. Рэдактарскі нюх на цікавую тэму, на цікавы матэрыял быў выключны, і Туманоўскі ведаў пра гэта.

— Дык ён, можа, і камандзіроўку мне перадаў ужо? Я яшчэ, мая даражэнькая, на бюлетэні. І невядома, што ў мяне з галавой, ці ў той бок я напішу.

— Рэдактар сказаў, што для вашай галавы гэта якраз і добра. Можа, ад такога сатрасення ўсё якраз і на месца стане.

— Гэта, даражэнькая, ён па сабе мерае: пакуль яму не абухам па галаве, датуль не пераканаеш. А як ваша новая пакупка, Эма Барысаўна?

— Вы не смейцеся. Вось папраўляйцеся, пазваніце, і я прыеду на сваёй машыне, забяру вас, адвязу дадому.

— Го, сядзь з вамі ў машыну, то тады не ў такую бальніцу пападзеш і не так хутка адтуль выберашся!

— З групы я сама лепш здала экзамены на правы, Ян Данілавіч. Мне інструктар нават сказаў, што з мяне гоншчык можа быць...

— Будзе, будзе, мая даражэнькая... Цяпер вам, Эма Барысаўна, ад кавалераў адбою не будзе. Такая нявеста і за рулём яшчэ.

— А ў мяне і так кавалераў хапае!

— Чаму ж, я ведаю! — пра сваіх кавалераў Эма Ба-

рысаўна любіла пагаварыць, і Тумаоўскі разумеў, што гэта надоўга.

Туманоўскі паабяцаў і назаўтра ўгаварыў доктара, аўтобусам паехаў дадому. З кватэры ён пазваніў рэдактару.

— Дзень добры, дарагі мой шэф! — прывітаўся Туманоўскі.

— Здароў, здароў, сышчык. Падлячылі табе галаў?

— Падлячылі, падлячылі. А мне тут Эма далажыла, што вы мяне на ордэн прадставілі.

— А як жа! Герой. Можа, у міліцыю пяройдзеш ужо, там сышчыкі патрэбныя.

— Калі вы мне дасце рэкамендацыю...

— Звяжыся з маёрам Пяткевічам. Ён цікавы як герой. Вось табе заданне. Глядзі, як ляжа. Ці адзін нарыс, ці цыкл матэрыялаў. Можаш з заўтрашняга дня...

— Дзякую за давер, шэфе. У мяне яшчэ тры дні законнага бюлетэня.

— Значыць, праз тры дні і займіся. А наогул, табе што трэба? Лякарства якое, ці што?

— Дзякуй. Пакуль што нічога. З маёрам я звяжуся сёння.

— Будзь здароў.

Рэдактар паклаў трубку.

Сонца пахілілася на захад, і белыя, у ледзь прыкметных чорных крапінках ствалы бярозавага гайку засвяціліся мяккім жаўтлявым водсветам. У паветры панавала цішыня і цеплыня. Не спякота, а глыбокая летняя цеплыня.

Маёр Пяткевіч з веранды прыглядаўся да гаю, прыслухоўваўся да цішыні. Далей, за гайком, відаць былі палі, ужо таксама мяккія, залацістыя. У гэтай іхняй спеласці адчувалася лёгкая журба спелага лета.

Туманоўскі выйшаў з кухні, паставіў на столік паднос з кубачкамі гарачае кавы, прысеў да стала. На ра-

дасць Тумановскаму, маёр аказаўся маладзейшым за яго і сціплым чалавекам, з тых, да каго не прыліпае слава і вядомасць. Вопытны работнік, ён па натуры сваёй не хварэў на гэту кароллівую хваробу. Пяткевічу журналіст спадабаўся сваёй ненастырнасцю, спакойным жаданнем ведаць кожную драбніцу. Ён амаль не задаваў пытанняў, дзяжурных, трафарэтных, а ўмеў пагаварыць, і ў гэтых гаворках Пяткевіч знаходзіў нешта патрэбнае сабе. І з самога сябе ўмеў падсмейвацца, расказваючы пра тое, як ён сам учыняў расследаванне ў вёсцы пра смерць свайго сябра:

— Ведаеце, я ўжо пасля таго, як паехаў у райаддзел, паглядзеў фатаграфіі і зразумеў, што сапраўды памёр ён. Дагнала яго смерць чамусьці там, у крыніцах. Упаў чалавек. Памагчы яму не было каму, і наўрад ці хто і дапамог бы. Я ж ваяваў і ў партызанах, і на фронце. Смерць бачыў. Гэта быў твар не забітага чалавека, а чалавека, памёршага сваёй смерцю. І не верылася, што так. Знаеце, не верыцца, што ты стары. І сябар твой маладым таксама здаецца заўсёды. Так чалавек зроблены...

Тумаoўскі памяшаў лыжачкай у кубачку.

— Тады мне і захацелася даведацца: што гэта за людзі, якія галёкаюць начамі на матацыклах. Мы ў іх гады вымушаны былі па лясах і балотах лазіць. А яны тут п'юць і шастаюць...

— Не ўсе ж, Ян Данілавіч,— усміхнуўся Пяткевіч, бачачы, што Тумаоўскі пачынае гарачыцца. Яго цешыла гэтая нейкая дзіцячая гарачнасць журналіста.

— Яшчэ гэтага не хапала. Але адкуль вось такія Заторы? Пайшоў шукаць... І знайшоў.

Тумаоўскі ўсміхнуўся, пакратаў рукой голаў.

— У сям'і ніколі не было без вырадка. Яно, мабыць, так. Але жахліва, калі мы з чалавека пачынаем рабіць вырадка. Бацькі — патачкай, а мы найчасцей тым, што мая хата з краю і я нічога не знаю. Я ж па-

глядзеў, усё ў ажуры ў камсамольцаў, і ў партарганізацыі, і ў школе, і ў калгасе. Усюды гладкія справаздачы, мерапрыемствы... А на жывога чалавечка не хапіла часу. Нават такое падумалася, каб не было гэтага Затора, дык апошнімі гадамі ім бы не было на чым рабіць справаздачы за прафілактычна-выхаваўчую работу...

Тумаnоўскі, каб асадзіць сваю гарачнасць, гаварыў іранічна, але за гэтай іранічнасцю праглядваўся боль.

Пяткевіч не перабіваў яго.

— Вось вы ловіце бандыта. Вы можаце разбіцца на машыне, ён страляе па вас з пісталета. І гаворыце, што ваша гэта работа і што не ўзяць яго вам было нельга. А я хачу з'ездзіць да гэтага таварыша, які там у раёне за прафілактычную работу адказвае, паглядзець яму ў вочы, папытацца. Мне расказала жанчына: званіць яму, што гэты Затор дома пагром учыняе. А ён, будучы дзяжурным, намякае ёй: што, хочаш, каб у сведкі запісаў, каб пацягалі?.. Прыпужвае. Вось і прафілактыка... Адзін, другі з абармотаў адчувае гэтую прафілактыку, і бяжы, даганяй ужо яго маёру Пяткевічу пад кулямі. А ў таго, згодна справаздачы, эфектыўнасць зніжэння правапарушэння расце... Ад кожнага многа залежыць.

— Залежыць,— усміхнуўся Пяткевіч.— Вось гэтага, маладзейшага, Барылку, бацька мучыў, а ён не стаў бандытам.

— Гэта паталогія, ці што? Забіваць людзей, як жывёлу. Сваяка свайго швайкай, у сэрца, каб і не пікнуў... А на мясакамбінаце два лепшыя байцы. Старэйшы на Дошцы гонару.

— Не, рана ці позна, як вы кажаце, такі б выпадак надарыўся. Нутро б адкрылася. У іх усё замкнулася на тым, каб больш мець. Спачатку збіралі. Выпадкова ўкралі. А потым прыёмшчык сустрэўся. Вось жа выйшаў на іх...

— Як яны збыт наладзілі?

— Проста. Выпісваліся дакументы на падстаўных.

Нарыхтоўка ішла. Тавар забіраўся з халадзільніка ў Сімакова.

— І тут не абышлося без таго, што мая хата з краю. Маўчалі, амаль маўчалі калгасы і саўгасы.

— Маўчалі. Для іх дробязь, не са сваёй кішэні... Прагнасць згубіла Барылкаў — пачалі і ў людзей падкрадваць, а старога ледзь на той свет не адправілі. Той колькі перадрыжаў!

— Грэблі дзеля таго, каб грэбці, дзеля грошай... А гэты, што гарэлкаправод зрабіў?

— Гэты схаваўся. Змоладу перапрадаваў, хімічыў, грошы збіраў. Усё жыццё звярнуў на тое, каб жыць прыгожа. У пасёлачку сядзеў на дачы, любаваўся сонейкам, пакуль вы і я на рабоце. Прывозіў дзяўчатак разбэшчваць. І заўважце, ніхто не заявіў на яго... Нават горш, мабыць, ад некаторых не мог адагнацца. Ціха, непрыкметна награбаў сабе ў кішэні. Гарэлка, адчуваю, не адзіны ягоны промысел. Можа, кнігі, можа, маркі?.. Ці мала што. І чужымі рукамі. Страшна тое, што недзе асядзе пад чужым прозвішчам, гэтакі знешне сучасны. І многім сапсуе жыццё. Чым хутчэй знойдзем, тым лепш. Шукаем чалавека, які прапаў,— Пяткевіч горка ўсміхнуўся.— Так што вам будзе пра што напісаць і паставіць пытанні. Пачакайце толькі суда. Там будуць у сведках і тыя, хто ў нейкай ступені нясе адказнасць і за Барылкаў, і за Гарбуза, і за Ахляновіча, які з-за таго, каб услужыць свайму шэфу, так гваздануў па галаве міліцыянера, што ледзь на той свет не адправіў. І вас таксама.

Туманоўскі сам сабе прамовіў:

— Белыя, ружовыя кветачкі... А потым і чорны павой. Мы з вамі гаварылі пра ўвесь гэты накіп. Знешне, калі глянеш, жывуць і багата, і лёгка, і прыгожа, а калі зазірнеш знутры — чорна. Так і павой, калі пасадзіць яго ля веранды, ён будзе цвісці бела, ружова, прыгожа быццам. А як прагледзіш, глушыць усё сабой, і гнілле

пад ім пачынаецца. Усё пагубіць пад сабою і згноіць... Чорны павой, як казала Вера.

— Будзем палоць,— кіўнуў галавой Пяткевіч.

Ён устаў з-за стала, падзякаваў гаспадару.

— А пакуль мяне начальства не паслала зноў на тэрміновую «праполку» і падпісала рапарт на адпачынак, раненька заўтра еду на Прыпяць. Знайдзіце, што ўдакладніць, і прыязджайце да мяне ў палатку. Не пакаецеся.

Тумаоўскі правёў госця да машыны, паглядзеў услед, усміхнуўся, пацёр рукі: матэрыял атрымаецца, і шэфа ён яшчэ раз прыстрашыць тым, што падасць заяву і пойдзе на пенсію.

## АСАБЛІВА НЕБЯСПЕЧНАЕ

Пракурор выклікаў Дземаша да сябе зранку. Выклік быў звычайны, рабочы. Учора Дземаш скончыў чарговую справу.

— Вазьміся за гэта, Іван Васільевіч. Перадгісторыя скаргі такая. На заводзе бухгалтарка ў змове з работнікамі ІВЦ абманвала і электроніку, і дзяржаву. Праходзілі на зарплату мёртвыя душы, грошы за іх атрымоўвалі. Цягнулася гэта некалькі гадоў. Кампанія такая: бухгалтарка Кажух, інжынер, падстаўных некалькі. Грошы прагульваліся і прапіваліся... Суд быў у мінулым годзе. Бухгалтарка атрымала восем з канфіскацыяй, яе памочніцы таксама сваё. У час следства ўсплыло, што да гэтага крадзяжу мела адносіны і доўгі час памагала бухгалтарцы тэхнік Волгіна. Яна памерла ў мінулым годзе... Піла яна апошнія гады. А праз нейкі час загінуў яе муж. Аступіўся і ўпаў пад машыну з тратуара. У скарзе намякаецца, што смерці гэтыя невыпадковыя. Больш таго, што Волгіны загінулі з-за

таго, што ведалі галоўнага арганізатара і віноўніка ўсіх крадзяжоў — галоўнага бухгалтара. А Кажух і ўсе астатнія — толькі пешкі падстаўныя. Пісьмо супраць галоўбуха, абвінавачванні цяжкія...

— Ананімнае?

— Без подпісу.

— Ананімшчыка можна шукаць і не следчаму па асабліва важных справах... Дыскваліфікуюся, Рыгор Пятровіч.

— Не спяшай. Папраўляйся. Пакуль лета, пакуль нічога такога не здарылася.

Ён палюбіў свой штодзённы маршрут: па ціхім завулку, зацененым густымі пасляваеннымі ліпамі, да трамвайнага прыпынку, потым трамваем на ўскраіну горада і адтуль — да возера. Ён не спяшаўся выходзіць з кабінета, не спяшаўся ісці, не лез штурхацца ў перапоўнены трамвай. Ён цешыўся шчодрым яшчэ, але ўжо не пякучым сонцам, дзіўным, не зразумелым яму дасюль спакоем, які сыходзіў на яго ад гэтае сонечнае ласкавасці, ад цішыні, якая ахіляла яго пасля трамвая ў парку. Там было зелена яшчэ, але ўжо і прасторна, і трава пакудлачаная. У ёй не надта кідаліся ў вочы апалыя сухія лісцікі. Адзінокія, дачасна пажаўцелыя, яны не давалі яшчэ восеньскае прыгажосці дрэвам.

У парку, пад дрэвамі, па скудлачанай траве бегала наўкруга група здароўя: больш жанчын і некалькі пажылых мужчын. Было нешта сумнае ў тым, як стаpанна яны выконвалі практыкаванні, наіўна спадзеючыся вярнуць маладую лёгкасць. Дземаш лавіў сябе на тым, што ён спачувае гэтым людзям. І сам ён зусім нядаўна нізавошта не выбраў бы часу, каб гэтак спакойна і лагодна траціць цэлы адвячорак на дарогу, на цёплую ваду пад негарачым ужо сонцам. Ён нібыта пераступіў нябачную мяжу, уступіў у новы адлік часу: тая пара, калі не было як спыняцца і азірацца нават, калі ад імклівасці гудзела ў жылах кроў, а жыццё здавалася

доўгім і падуладным табе,— тая пара кончылася неяк раптоўна. Цяпер нібыта намнога болей стала часу для одуму, і не звінела ў жылах кроў, і не туманілася ў галаве...

Тады быў вясновы перадмайскі дзень. Вясна ўзялася сапраўдная. Адгукнулася на сонечную цеплыню зямля, зазелянела лісце на дрэвах, а ў горадзе ў заціш-ках бела і густа зацвілі чарэшні. Адна з іх расла ў двары перад самым ягоным акном. Дземаш адчыніў акно насцеж, удыхаў жывы водар вясны, адчуваў сябе лёгкім і маладым.

Ён скончыў цяжкую і доўгую справу пра лютае забойства маладое дзяўчыны. Ззаду застаўся пошук, які не даваў яму спакою ні дзень ні ноч. Ён падпісваў апошнія паперы і думаў пра сваю аднапакаёвую кватэру, дзе цень ад дрэў і дзе ў адчыненую фортку дыхае вясна. Ён вымыецца ў ванне і засне, як не спаў ні разу за апошнія дні.

Дземаш загарнуў папку, устаў, лёгка ўскінуў рукі ўгору, каб пацягнуцца, з хрустам разварушыць плечы,— і адчуў, як востра, нібыта шыла, увайшоў у сэрца боль. Ён нібы ўбачыў і гэтае шыла, і сваё сэрца. Перахапіла дыханне. Паволі ён апусціў рукі. Буйныя, як боб, кроплі поту астудзілі твар. Сэрца не магло здрыгануцца. Ён з мёртвым ужо сэрцам выйшаў на калідор... Потым як скрозь туман ён адчуваў, што яго некуды неслі, нешта рабілі з ім. Ён не чуў ужо ні болю, нічога...

Вярнуўся Дземаш на белы свет у цішыні палаты. Па тым як весела гаварыў з ім доктар, зразумеў, што ўсё абышлося не горшым чынам. Потым дактары гаварылі, што ў яго і не інфаркт яшчэ быў, а перадінфарктнае становішча ад launch пeратомленасці. Таму яму надалей трэба жыць крыху асцярожней, памятаць пра тое, што першы званок ужо быў... Ён усміхаўся з гэтае парады. «Асцярожней жыць» асацыіравалася ў яго з тым, што

ідзе ён паволі, нібыта яйка нясе на галаве.

Тады да яго прыходзіла Лена. Ён толькі-толькі акрыяў, балела яшчэ ў грудзях, калі сястра з радасцю паведаміла, што да яго прыйшла жонка.

Усярэдзіне ў Дземаша ўсё здрыганулася: ён не хацеў, каб Лена бачыла яго хворага, ён адвык ужо ад слова «жонка», яно не мела да яго дачынення. Сястра была шчаслівая, што ўзрадавала яго, і нічога не заўважыла.

Лена ўвайшла да яго спакойна, прывіталася:

— Дзень добры, Іван.

Ён кіўнуў галавою.

Яна была ўсё гэтакая ж ладная, не надта і рослая, і не надта і прыгожая быццам, але нейкая асаблівая, якой магла быць толькі яна. Прысела на крэсла воддаль ложка.

— Лепш крыху?

— Лепш.

Вочы яе глядзелі на яго спачувальна і спакойна. Знаёмыя яму вочы, у якіх раптам мог загарэцца зялёны вядзьмарскі аганёк. І прычоска ўсё гэтакая ж кароткая, стрыжка.

— Як Валодзя? — папытаў ён пра сына.

— Дзякуй, нармальна. Паехаў на спаборніцтвы. Яна зразумела, што Дземаш хацеў убачыць сына.

Дземаш кіўнуў галавою. Ён здагадаўся, што сын нічога не ведае, яна так вырашыла і пра гэтае рашэнне сказала яму. Толькі цяпер ён прыкмеціў тое, што не адразу кідалася ў вочы: двайны падбародак, які абазначыўся тоненькаю маршчынкаю, складачкі ля куточкаў губ, лятучы, але нейкі жорсткі прыжмур вачэй. Гаварыла Лена ўсё роўна як загадвала, і права на папраўку сказанаму не было. Пастарэла і змянілася яна. Дамаглася, праўда, камандаваць і распараджацца. Ёсць жанчыны, якія не могуць, каб не камандаваць хоць мужам ці дзецьмі. І яны датуль не адчуюць сябе

шчаслівымі, пакуль ім не будзе здавацца, што яны дамагліся свайго, што ўсё ў жыцці кружыцца вакол іх.

Цяпер Дземаш з палёгкаю думаў: як добра, што яны некалі разышліся з Ленаю.

Лена адчула на сабе ягоны доўгі позірк. Калі яны жылі разам, яна не любіла такога позірку.

Дземаш адвёў вочы.

— Калі што трэба, скажы, я дапамагу.

— Дзякуй, пакуль што быццам нічога...

Дземаш усміхнуўся і ўбачыў, як паморшчылася Лена. Яна абяцала дапамогу, і ёй гэта лёгка было зрабіць, як разлічыцца з чужога кашалька. Ёй не падабалася ягоная ўсмешка: Дземаш ведаў становішча яе цяперашняга мужа і тое, што ёй хацелася, пабыць перад ім, былым сваім мужам, бацькам яе сына, высакароднаю. Тым больш што жыццё ў яго склалася не лепшым чынам, як думала яна. І ляжыць у адзіночнай палаце Дземаш таксама дзякуючы Лене.

— Калі што трэба будзе, усё ж пазвані.

— Скажы Валодзю, як вернецца...

— Скажу. Але думаю, цябе выпішуць. Я гаварыла з галоўным. Табе яшчэ пашанцавала...

Яна выйшла з палаты ўпэўнена і цвёрда на маладых нагах у маленькіх туфельках з высокімі абцасамі.

Дземаш адчуў, як сціскаецца сэрца. Боль, мабыць, адбіўся і на твары, бо сястра, якая зазірнула, хуценька села лічыць пульс і потым зрабіла ўкол...

Журботная прасторнасць панавала ў парку асабліва ў буднія дні. Сумавала касірка ў будачцы з сакавітаю шыльдаю саюзатракцыёнаў. Толькі на адной лодачцы-арэлях весела гойдаліся ў купальніках дзяўчынкі-школьніцы. Прывычна лузгала сланечнік вяснушкаватая дзяўчына ў палатцы пракату пляжнага начыння. Была яна надзіва незагарэлая, але на сонца не паказвалася, сядзела ў сваёй рэзідэнцыі, як царэўна, і лузгала сланечнік.

Дземаш аблюбаваў сабе месца непадалёку ад вады і ад раздзявалкі. У гэтым месцы было пясчанае, не заґнатае ілам дно. Дземаш раздзяваўся, даставаў з аздобленага белым металам «дыпламата» махровы ручнік, цёмныя акуляры, лажыўся і разгортваў кнігу. Кніга пастаянна была з ім. Пра лес, пра чалавека, які толькі і жыве тым, што ходзіць па лесе і піша пра гэта. Чытаў Дземаш кнігу паволі і забываўся, што яна пра лес: пачынала здавацца, што гэта сам ён праходзіць па жыцці...

Калі добра прыгравала і ад цяпла рабілася цяжка ляжаць, Дземаш заходзіў у ваду і плыў. Вада была цёплая і густая, а таму здавалася жывою. Узнікала адчуванне, што ён нібы і не плыве, што вада сама нясе яго. Ён пакорліва падстаўляў ёй то адну, то другую шчаку, заплюшчаў вочы.

Плаваў Дземаш па паўгадзіны. Калі выходзіў на бераг і клаўся адпачываць, у вушах, здавалася, усё яшчэ роўна і шаўкавіста шумела вада. Ён паварочваўся на спіну, заплюшчваў вочы, і тады здавалася, што ад вады і ад сонца ў ягонае цела ўліваецца сіла і маладосць...

Паляжаў Дземаш у бальніцы дзевяць дзён. Першае, што ўразіла яго — раптоўна прапала цяпло, над зялёным лісцем павявала тугім ветрыкам. Пад ім асыпаліся прыжоўклыя і пакамечаныя, зусім нядаўна такія святочныя вішнёвыя пялёсткі. Цяпер яны ляжалі маленькімі сумётамі на тратуарах, і на іх не шкода было наступаць.

Дземаш асцярожна ўдыхаў свежае паветра, якое п'яніла яго пасля бальніцы. Яго накіравалі яшчэ на два тыдні ў прафілакторый. Дземаш ведаў, што гэта перастрахоўваюцца дактары.

Бадзёра і молада ён узышоў на свой паверх, адамкнуў дзверы, адчыніў форткі, каб праветрыць пакой, на-

пусціў ванну вады, з асалодаю думаў, як будзе ляжаць у белай мяккай пене. Гэтага толькі і не ставала яму, каб быць зусім здаровым.

...Боль узнік паволі, аднекуль знутры падышоў да сэрца. Дземаш спыніўся, прыслухоўваўся да сябе. Яму стала аж страшна дыхнуць, паварушыцца, ступіць хоць крок. Ён заплюшчыў вочы і ступіў. Потым мыўся ў ванне, хадзіў у магазін, назаўтра ў цесным і душным аўтобусе дабіраўся да прафілакторыя, наперакор гэтаму болю, прывучаючы сябе да яго, і сябе — не звяртаць на яго ўвагі. Ён не прызнаваўся нават сабе самому, што хвароба пачала пакрысе быццам звужаць ягонае жыццё.

На першым часе яна ўмяшалася ў работу. Пасля хваробы яму далі зусім звычайную справу — знайсці паклёпніка, які замучыў дырэктара школы і дзесятак арганізацый, куды пісаў свае ананімныя лісты.

Дземашу, следчаму, які разблытаў не адно цяжкае злачынства, неяк і смешна было брацца за гэтую справу. Вядома, начальства яго разумела, але нельга не ўлічваць рэкамендацыі дактароў...

Ён і не заўважыў, як запаволіўся рытм жыцця, за першаю дробнаю справаю паплыла другая, трэцяя, стала раптам многа вольнага часу... Лета прынесла Дземашу возера, парк, стракаты, як луг, пляж, кнігу, спакой — тое простае і даступнае, чаго чалавеку амаль ніколі не хапае ці, правільней, на што ў чалавека не хапае часу. Не хапала яго і ў Дземаша, як гаварылі, «прыроджанага сышчыка». Ён толькі скептычна ўсміхаўся, калі гаворка заходзіла аб прызванні: успамінаўся малы смаркаты хлопчык у картовых штоніках на адной шлейцы, з парэпанымі нагамі і пукам шчаўевых «цырбуноў» запазухаю. Ён пасе свіней на аселіцы, яму холадна ў ногі і хочацца есці. Але Ванька, седзячы пры свіннях, марыць, задраўшы галаву ўгору, пра тое, каб стаць сышчыкам і лавіць зладзеяў і бандытаў. Успамін

пра дзяцінства заўсёды звязваўся з пастаянным адчуваннем голаду і холаду, якім студзіла ногі пастушку раса.

І яшчэ Дземаш успамінаў пра Анціка Грышкавага. Анцік жыў у сталічным горадзе, летам разоў колькі прыязджаў дадому на бартавым ЗІСу, сам за рулём. Быў ён невысокага росту, лысаваты. Працаваў на аўтабазе майстрам, і гэта гучала значна і загадкава. Ён меў ужо двухпакаёвую кватэру. Пра тое, што Анцік дасягнуў многага ў жыцці, сведчыў і жывоцік, што, як малады гарбуз, абазначыўся пад белаю тэніскаю-сетачкаю. Гэта быў гарадскі жывоцік, а не той рабочы трыбух, які мелі некаторыя вясковыя дзядзькі.

Ён быў старэйшы за Дземаша і ўспамінаўся як стары чалавек, хаця меў тады гадоў за трыццаць. Хадзіў ён па бацькавым садзе ў паласатых піжамных штанах, і гэтыя штаны на гумцы, якія ён час ад часу падцягваў на свой гарбузок, найбольш запомніліся. На ад'езд Анцік грузіў у кузаў мяшкі з бульбаю, карзіну з яйкамі і салам. Сам Грышка, гэтакі ж маларослы, як і сын, толькі худы, быццам верабей, у зашчытным галіфэ і гімнасцёрцы, з ліхімі будзёнаўскімі вусамі, ганарыста дапамагаў сыну грузіцца і моцна, каб чулі суседзі, падварушваў сваю мажную, што кузня, Вольку, якая цяжка дыхала і таксама дапамагала:

— Сыр і масла не забыла? А цыбулі са свае грады?

Пра апошні клопат — а цыбулі са свае грады? — ён паўтараў нязменна. У вёсцы ад гэтых праводзін засталася прымаўка: «Добра, брат, жывеш, толькі яшчэ каб цыбулі са свае грады». Але гэта пасля. А тады Анцік цалаваў на развітанне маці, шчаслівага і аж пакруглелага ад гонару Грышку. І ўся вёска чула, як раве матор, калі ён ад'язджае...

Маці тады гаварыла Дземашу: бач, што дае чалавеку навука. Вывучышся і будзеш, як Анцік Грышкаў.

А не будзеш вучыцца, то будзеш, як Меходзіеў, і ў горадзе пустадомкам астанешся.

Рыжы доўгі Меходзіеў Васіль таксама прыязджаў з Мінска. Жыў ён у бараку, халасцякаваў. І прыязджаў на веласіпедзе, на спартыўным, у трусах і майцы, з невялікаю сумкаю на плячах.

Вядома, у чалавека, які ўдзень адкручвае нагамі больш за сто кіламетраў, ніякі «гарбуз» не завяжацца, ды і на веласіпед не ўзгрузіш ні бульбы, ні нават карзіны з салам. У старога сапатлівага Меходзія не надта і знайшлося б што грузіць...

У вёсцы ніхто не чуў, калі Васіль ад'язджаў, бо выязджаць трэба было зранку, каб дакруціць да горада. Дзверцы не ляпалі, не гуў матор.

Пакрысе ўслед за Анцікамі і за Васілямі пацягнуліся ў горад «выбівацца ў людзі» вясковыя хлопцы і дзяўчаты...

Дземаш усміхнуўся сваім успамінам. Як потым аказалася, уся навука Анціка была ў сем класаў, і працаваў ён простым шафёрам. Рыжы Меходзіеў Васіль, які меў тую ж самую адукацыю, «выкруціў» сабе чэмпіёнскае званне, вячэрнюю дзесяцігодку кончыў, потым інстытут і прыязджаў разоў пару ў вёску на сваім легкавічку... Ён хваліўся, якую мае кватэру, як жыве, напіваўся і хадзіў па вуліцы з чырвонай, як велікоднае яйка, мордаю...

Тады ўжо мода была ісці ў навуку, калі не ў інстытут, то хоць у школу ФЗН... Не ехалі паступаць толькі тыя, пра каго ўжо і гаворкі не магло быць.

Дземаш паступіў на юрыдычны. Чаму на юрыдычны? Таму, што настаўнікам яму быць не хацелася, а што такое юрыдычны факультэт, ён ведаў даволі прыблізна, але з вёскі там ужо вучыліся...

Дземаш сеў. Па возеры чародкаю ішлі тры байдаркі. Мокра паблісквалі вёслы, і лодачкі, здавалася, ляцелі

над самаю вадою, а дзяўчаткі ў спартыўных маечках — чырвонай, жоўтай, блакітнай — матылькамі. Гледзячы на іх, верылася, што ў іхнім жыцці ўсё лёгка, проста і шчасліва, як і бывае ў маладосці.

Гэтак жа лёгка выляталі з вёсак у невядомае жыццё і яны.

Пасля вучобы Дземаша як лепшага студэнта размеркавалі ў горад, у пракуратуру. Ён успрыняў гэта, як звычайнае, пачаў вучыцца рабіць сваю работу. Гэта быў ягоны чэсны хлеб, і новая работа пакрысе стала другою натураю, тым, што цяпер высока называюць прызваннем.

Потым ён сустрэўся з Ленаю. Яна пасля інстытута вучыла ў школе. У іх нарадзіўся сын, які вучыўся хадзіць, гаварыць, а потым пайшоў у першы клас...

Цяпер усё гэта злівалася ў памяці ў нешта адно шчаслівае, сонечнае, як водсвет на вадзе. Пачыналася ўсё ад першага пацалунка з Ленаю ў яе на двары пад кустом бэзу. Пасля, калі ён цалаваў Лену, здавалася, што ў яго кружыцца галава ад бэзавага чаду...

Гэтак жа добра памятаецца, калі ўсё скончылася. Не тыя, дробныя сутычкі, без якіх не бывае жыццё, а тое, калі ён адчуў, што шчасце кончылася. Ён вёў справу пра забойства маладога хлопца, які паехаў на вяселле ў вёску і адтуль не вярнуўся. Знайшлі яго збоч дарогі, якая вяла да прыпынку электрычкі. Забойства здарылася хутчэй за ўсё з-за тых модных джынсавых «дудачак», якія былі на хлопцу...

Дадому ён прыехаў больш чым праз два тыдні, калі знайшлі і тыя джынсы, і здаровага, як бугай, вясковага «стылягу». Ён браў бацькаву машыну-цыстэрну, якая начавала пры доме, і ездзіў на танцы. А па дарозе падабраў п'яненькага гарадскога піжона ў штанах, якіх яму не хапала. Ён проста стукнуў, каб не трапятаўся, пакуль будзе здымаць штаны. Ён іх і начапіў на сябе назаўтра, а зняў толькі тады, калі пачуў, што знайшлі забітага...

Лены не было дома. Пакуль Дземаш мыўся, прыйшоў з вуліцы Валодзя.

— Маці званіла, што пазней прыйдзе. Зрабі з'есці і мне.

Валодзя зайшоў у ванны пакой.

— Не пытаешся, як у мяне?

— А што пытацца, раскруціў, як заўсёды. Ты ж у мяне не пытаешся, як вучоба.

Дземаш усміхнуўся: сын падрастаў.

Лена вярнулася пасля праграмы «Час». Дземаш выйшаў сустрэць яе, і яна заспяшала пацалаваць яго.

— Ты вячэраў? Кавы вып'еш? Я зраблю і табе.

Каву пілі на кухні. Лена ў доўгім стракатым халаце, ён у трэніровачным касцюме.

— Даведайцеся. Пазваніце. Як звалі хлопчыка?

— Сяргейка ці Юрка.

З завода Дземаш паехаў трамваем да возера. Думаў ён не пра галоўнага бухгалтара і нават не пра ананімку. Бухгалтар атрымаў строгую партыйную вымову, зрабіў вывады, як гаворыцца. Думаў ён пра малога хлопчыка, якіastaўся без бацькоў, пра той холад бяды і адзіноты, які працяў яго маленькую душу. І гэтага ўжо ніхто не паправіць, ніхто нічога не пераменіць. Яшчэ Дземаш думаў пра тое, што супрацоўніцы Волгінай прыходзілі да яе на дні нараджэння і насілі яго на руках. Цяпер не памяталі нават, як яго завуць. І гэтае прыкрыванне выпівак Волгінай таксама ад раўнадушша ішло. Усім добра было быць добрымі. Волгіна за ўсё разлічылася па самым высокім рахунку...

Сёння Дземаш ішоў па парку і не заўважаў ні сонечнае цеплыні і спакою, ні групы здароўя. Ён думаў пра маленькага хлопчыка, а ў галаве праклёўвалася здагадка, што дзве смерці Волгіных — залішне многа, каб была выпадковасць. Цяпер паўстала пытанне: чаму іх не стала абаіх?

Да дома, дзе жыла сям'я Волгіных, Дземаш прыехаў на аўтобусе, хвілін пятнаццаць блукаў між аднолькавых чатырох-пяціпавярховых будынкаў па дварах, спрэс засаджаных дрэвамі, пакуль не знайшоў патрэбны яму 27 а. Ля пад'езда былі пароблены лаўкі. На адной з іх сядзела бабка ў мультановай клятчатай кофце, у сіняй спадніцы, у панчохах і хатніх шлёпанцах. Побач у вынашаным шэрым касцюмчыку сядзеў сухенькі лысы стары. Пры ім стаяла купленая ў аптэцы крывулька.

Сонца прыгравала, і старыя былі падобныя на асенніх вераб'ёў, якія селі пагрэцца. Яны з цікавасцю паглядзелі на Дземаша.

Ён павітаўся са старымі, зайшоў у пад'езд з паабіванаю са сцен тынкоўкаю. На другім паверсе пазваніў у адны, потым у другія, потым у трэція дзверы. На апошні званок дзіцячы голас з-за дзвярэй завучана далажыў:

— Мамы няма дома.

Дземаш выйшаў з пад'езда, прыпыніўся ля старых.

— Ну, чаго глядзіш, як на допыце? Ох, недарэмна вас лягавымі завуць!..

Яна асеклася, сама зразумела, што гэтага не трэба было, але не сказала нават дзяжурнага «прабач».

— Ты нічога не хочаш бачыць, акрамя сваіх жулікаў. Яны былі да цябе і пасля цябе астануцца. А я хачу жыць як людзі... Я абыдуся і без цябе!

Дземаш хлебануў з кубачка асадак, і ў роце стала горка...

Цяпер канец сямейнага жыцця ў Дземаша звязваецца са звонам чайнае лыжачкі і з горкім смакам кававага асадку. Можа, таму, што памяць не хацела варушыць усё тое, што было потым. Лена і сапраўды пакінула работу ў школе, перайшла ў інстытут педагогікі, паступіла ў аспірантуру.

Каб не нарывацца на сварку, на панурае маўчанне дома, Дземаш, цяпер снедаў, абедаў і вячэраў у горадзе, пасля абеду не спяшаў дадому.

Лена ў той вечар вярнулася дадому раней за яго.

— А дзе Валодзя? Яго няма?

— Клопат пра сына прарэзаўся? Слухай, папачка, ты што, і праўда святы і сляпы? Няўжо ты думаеш, што я, маладая, здаровая... Ці ты пісьма чакаеш, што твая жонка табе ..?

Дземаш ударыў наводмаш, заўважыў, што на нейкае імгненне ў яе вачах успыхнуў раптоўны страх, не пагардлівасць і самаўпэўненасць, а страх.

Яна азірнулася, прыкрылася рукою, але Дземаш крута завярнуўся і выйшаў з калідора. Ужо ў горадзе з глухім болем думаў, што вінаваты сам, што трэба было ў пару паставіць Лену на сваё месца...

Назаўтра ён пазваніў, і яны сустрэліся ў горадзе. Яна прыйшла, як звычайна, модная, маладжавая і нібы спалоханая. Ён нават пашкадаваў яе, здалося, што ўсё яшчэ склеіцца.

Усё ж Дземаш суха, нават казённа сказаў, што прапануе разысціся без суда. Ён забярэ толькі свае рэчы.

— Не ведаю толькі, як з Валодзем. Паспрабую пагаварыць з ім.

— Не трэба. Я гаварыла... Ён астанецца са мною... Можаш пазваніць яму, калі не верыш.

Лена заспяшалася гаварыць. У голасе яе ён адчуў палёгку, а за гэтай палёгкаю радасць, з якою да яе вярнулася ўпэўненасць.

Дземаш астаўся сядзець на лаўцы, глядзеў услед Лене — з сумачкаю на плячы, і нечага так і не мог звязаць у адно ў жыцці.

Меней чым праз паўгода яна выйшла замуж за намесніка дырэктара свайго інстытута, ужо прафесара, віднага, як гавораць цяпер, чалавека, нядаўна аўдаве-

лага. Потым абараніла дысертацыю, і Дземаш сустракаў яе ў горадзе за рулём «Волгі», модную, элітную даму...

— Ну што, і грэе яшчэ?

Дземаш сцепануўся, нібы яго заспелі ў чужым агародзе.

Жанчына прыпынілася на сцяжынцы. Валасы яе былі распушчаны па плячах, шаўкавістыя і густыя каштанавыя валасы, стракатая паркалёвая сукенка. Усміхалася яна стрымана, крышку нават гаркавата і спагадна, спакойныя цёплыя вочы пад чорнымі ўразлёт брывамі ўсмешліва глядзелі на яго.

— А вы паспрабуйце... Давайце разам,— сказаў Дземаш першае, што звязалася на языку.

— Я ўжо спрабавала. І не адзін дзень...

У голасе яе Дземашу здаўся нейкі выклік.

Жанчына пайшла далей па беразе, памахваючы цыратаваю пляжнаю сумкаю, на якой былі намаляваны вялікія жоўтыя кляновыя лісты.

Дземаш устаў, нібы збіраўся дагнаць жанчыну. Яму і на самай справе раптам здалося, што сонца не грэе. Ён рашуча ўвайшоў у ваду і паплыў, плаваў доўга, а потым, калі сабраўся дадому, пайшоў сцежкаю ўздоўж берага...

Дземаш уважліва перачытваў старонкі допытаў, паказанні сведак, заключэнне экспертызы. На чыстым лістку паперы ён памячаў тое, на што не знайшоў адказу ні ў адной судовай справе, ні ў матэрыялах следства.

У справе пра кражу былі аж дзве смерці — жонкі і мужа Волгіных. Ён аказаўся на праезнай частцы дарогі перад самым аўтобусам раптоўна. Машыну нельга было спыніць. У дакументах аб смерці самой Волгінай было медыцынскае заключэнне. Чаму маладая здаровая жан-

чына пайшла дома на такую аперацыю? Ці не дапамагаў ёй хто?

Дачыненне Волгінай да кражы высветлілася, калі яе ўжо не было жывое. Яе мужа таксама. Ен ведаў пра гэта ці не?

Не знаходзіў Дземаш дакладнага адказу і на тое, дзе падзеліся накрадзеныя грошы. Яны агулам спісваліся на выпіўкі і на пагулянкі, якія наладжвала кампанія, на пакупкі модных «ануч». Наўрад ці на гэта б разышлося гэтулькі грошай.

Галоўны бухгалтар амаль на сто працэнтаў характарызаваўся станоўча і кіраўніцтвам завода, і тымі камісіямі, якія пасля не раз правяралі работу заводскае бухгалтэрыі. Болей таго, усе яны сыходзіліся на выснове, што новы галоўны навёў парадак у бухгалтэрыі. Ці мог ён прагледзець, што рабіла ягоная падначаленая? Бухгалтарка Кажух была чалавек вопытны, яна актыўна памагала галоўнаму з першых дзён ягонага прыходу на работу. Няма нічога дзіўнага, што галоўны бухгалтар не мог праверыць, як налічваецца зарплата кожнаму рабочаму ці інжынеру.

Чаму тады галоўны бухгалтар вярнуў пяцьсот рублёў, якія «пазычаў» у бухгалтэрыі толькі пасля таго, як пачалося следства? Кажух, несумненна, ведала пра гэта.

Яшчэ Дземаш памеціў на лістку адно пытанне: што з сынам Волгіных?

Гэтае пытанне, праўда, не мела ніякіх адносін ні да ананімкі, ні да самой справы.

Пачынаць Дземаш вырашыў з галоўнага бухгалтара. Пісьмо было супраць галоўнага, і пачынаць трэба было не з яго. Але Дземашу хацелася паглядзець на чалавека, які заслужыў нечыю такую зацятую няміласць.

У кабінет зайшоў рослы, спартыўнага складу малады яшчэ мужчына з густымі, пабітымі сівізною валасамі.

— Сядайце, Віктар Іванавіч.

Выгляд мужчыны ніяк не стасаваўся з ягонай прафесіяй.

— У мяне, Віктар Іванавіч, некалькі пытанняў у сувязі са справай Кажух.

Мужчына кіўнуў галавою.

— Скажыце, Віктар Іванавіч, як бухгалтар, вы верыце, што ўкрадзеныя грошы Кажух, Волгіна, Сераброва проста прагулялі, прапілі, патрацілі на пакупкі?

Бухгалтар здзіўлена паглядзеў на Дземаша. Пытанне было для яго нечаканае.

— Я пра гэта не думаў... У міліцыі не горшыя спецыялісты, палічылі.

Дземаш кіўнуў галавою. У матэрыялах следства якраз і вынікала, што не палічылі.

— Вы давяралі Кажух? Што вы цяпер можаце сказаць пра яе?

— Кажух — вопытны бухгалтар. Я гэта гаварыў і паўтару. І дасюль не магу паверыць, што яна злодзей. Неяк не ўвязваецца гэта з яе характарам. Яна і з маім папярэднікам не ладзіла за тое, што хацела навесці парадак у фінансах, і мне многае падказала і дапамагла. Я ёй давяраў. І сёння тое, што адбылося, для мяне нейкая загадка.

— Віктар Іванавіч, хаця гэта і непрыемна вам... Тыя пяцьсот рублёў, пра якія ведала Кажух, яны не маглі... ну, скоўваць вас у плане кантролю за ёй?

— Што ж, сам вінаваты... Самае крыўднае, што ўсе думаюць, што я хацеў прысвоіць гэтыя грошы... Тэлевізар купіў, думаў, аддам з квартальнае прагрэсіўкі. Сотнямі тысяч варочаю, а напавер аказалася, што нейкая сотня важней. Нельга пераступаць мяжу, не меў я маральнага права пазычаць тыя грошы. Не, на мае адносіны з Кажух гэта не ўплывала, я іх не збіраўся прысвойваць... І вам прыйшла ананімка?

— Чаму вы пытаецеся?

— Ужо пісалі ўсюды. У народны кантроль, у гарком, у абком... Цяпер і да вас дайшлі.

— Як вы думаеце, чаму на вас пішуць ананімкі?

— Пры мне, як пачалі наладжваць улік, многія асталіся без прэмій і прагрэсівак... Не толькі сярэдняе, але нават і вышэйшае кіраўнічае звяно. Цяпер гэтая справа з Кажух. Яна мая памочніца была. Скампраментывана бухгалтэрыя. І гэтыя пяцьсот рублёў... Зачэпка ёсць фармальная, каб аднесці мне пірагі. Нехта і адносіць.

Віктар Іванавіч выняў з чамаданчыка папку, паклаў на стол.

— Што гэта?

— Гэта заключэнні ўсіх камісій, якія правяралі мяне і бухгалтэрыю. Можа, трэба будуць.

Бухгалтар горка ўсміхнуўся:

— Я ўжо падумваць пачаў: кіну к чорту гэты завод. І не кідаю, не хочацца, каб думалі, што я такі, як пішуць пра мяне.

— Папку вы забярыце. Як трэба будзе, я папрашу. Значыць, па натуры Кажух была не злодзей?

— Яна прыгожая жанчына, можа, лічыла, што ёй не пашанцавала ў каханні... Адчувалася, што яна любіла ўвагу мужчын. Зарабляла няблага, ды і муж таксама. Так што грошай ёй хапала. У мяне з галавы не выходзіць, як яна аднойчы пажартавала, каб я не толькі давяраў, але і правяраў. Цяпер я гэта ўспамінаю і думаю: нашто ёй было так гаварыць? Ды, урэшце, яна і адна магла ўкрасці, і не менш. Нашто ёй трэба была шайка? Я не магу ўсё гэта зразумець.

— Што ж, Віктар Іванавіч, ідзіце, працуйце, а мы паспрабуем знайсці ананімшчыка.

Дземаш у блакноце запісаў — запрасіць усе ананімкі на галоўбуха. Ён не сумняваўся, што пісаў адзін і той жа ці адны і тыя ж.

Тое, што гаварыў галоўбух, і сапраўды не стасава-

лася з Кажух. Па справе яна ішла галоўнай фігурай і не спрабавала адмаўляць гэта. Што яе, адукаваную, прыгожую, з дастаткам у хаце, звязала з бесталковаю Волгінай, з прагнаю на грошы Серабровай, якая арганізоўвала падстаўных?.. Што ці хто?

Пасля абеду Дземаш сабраўся і паехаў на завод. Новы адміністрацыйны корпус яшчэ будаваўся. Інфармацыйна-вылічальны цэнтр туліўся ў двухпавярховым будынку адразу ж за прахадною. Работнікі мясціліся па пяць-шэсць чалавек у пакойчыку. «Кабінет» начальніка быў у кутку, за фанернаю перагародкаю з дзвярамі. Начальнікам аказалася чарнявая хударлявая жанчына з востранькім носам і цёмнымі кругамі пад вачамі.

— А, вы пра Вальку... Бесталковая яна была. Ёсць такія пустыя бабы, балбатухі, мяцёлкі. Яна ўмела арганізоўваць дні нараджэння, расказваць анекдоты, мацюкнуцца — таксама... Работнік была не вельмі, але і не калека. Сын у яе быў. Муж яе, Толік, калі яна і загуляе, малога забярэ. Ён не піў. На яе добрага мужчыну трэба было, каб духу яго баялася, а ён — Валька, Валька... А гэтая яго Валька хвост трубою і пайшла падбрыкваць!

Жанчына ў такт словам прыстуквала рукою па стале. Зірнула на Дземаша і змоўкла.

— Гэта праўда, Ларыса Анатольеўна, што апошні час Волгіна і на работу п'яная паказвалася?

Ларыса Анатольеўна сумелася. Яна не хацела такіх пытанняў.

— Было. Баялася мяне, хавалася.

— І вы не ведалі, што яна і тут умудралася, на рабоце?

Ларыса Анатольеўна апусціла вочы:

— Ну, напісала б я дакладную, выгнала б яе. А куды яе потым, гэтую Вальку... Тым больш што работу яна рабіла, я ўжо гаварыла.

— Вы цярпелі. І муж таксама цярпеў?

— Не, дайшло і да яго... Раз так правучыў, што на работу не магла выйсці. Яна пасля гэтага баялася дадому ісці начаваць п'яная. Яна і ў бальніцу не пайшла, бо яго баялася...

— З кім яна піла?

— Здаецца, з буфетчыцаю пачалося. Была ў нас некалі такая Анюта. Чорная, як выжла. Яна і прывабіла Вальку. А потым Валька і сама сабе сябровак знаходзіла. А пасля і не толькі сябровак...

Ларыса Анатольеўна паморшчылася.

— А хлопчык іхні дзе?

— Сын?

Ларыса Анатольеўна напружана прыжмурыла вочы, старалася ўспомніць. Толькі цяпер Дземаш заўважыў, што ёй трэба насіць акуляры пастаянна, а яна саромелася, зняла і зараз, калі гаварыла з ім.

— Пачакайце, я ў дзяўчат папытаю.

Дземаш праз фанерную перагародку чуў, як яна клікала Нінаў, Зінаў, як яны ўсе разам гаварылі: «Вальчыны бацькі», «Толікавы бацькі»...

Ларыса Анатольеўна зайшла збянтэжаная:

— Адны гавораць, што ў Вальчыных бацькоў, другія, што ў Толікавых, трэція, што сястра Валіна забрала... Яна ж памерла даўно, усё гэта ўсплыло пасля яе смерці. Пра тое, што Толік папаў пад машыну, мы толькі цяпер дазналіся, як следства пачалося...

Ларыса Анатольеўна апраўдвалася:

— Калі трэба, я даведаюся.

— Як тваё расследаванне?

— Скончылі. За анучу забілі чалавека. Усё роўна як чорт ведама дзе рос. А хадзіў у школу, піянерам быў...

Лена паклала лыжачку ў кубачак, і яна звонка грукнула па беражку.

— Цяпер модна ўсё спісваць на школу і на настаўнікаў!

— Прабач, я не гэта хацеў сказаць...

— Ты помніш, я цябе прасіла: не магу больш у школе. Як толькі падумаю, што заўтра на работу, злосць бярэ на дзяцей!

— Я не ведаю, як мне...

— Баішся, што табе прыпішуць злоўжыванне службовым?

Лена ўсміхалася. За ўсмешкаю гэтаю была і насмешка, і перавага. Ён не ведаў дасюль такое яе ўсмешкі і насцярожыўся.

— Іван, я гляджу на цябе і не ведаю: ты праўда нічога не бачыш кругом ці прытвараешся?

— Як не бачу? Чаго прытвараюся?

— Ты не бачыш, як жывуць людзі?

Яна прыціснула на як.

— Па-рознаму... Я многа бачыў, з многімі гавару.

Лена махнула рукою:

— Я не пра гэта. Табе не прыходзіла ў галаву, што мы маглі мець машыну, дачу, адзявацца як людзі...

Ён паглядзеў на жонку.

— Не бойся, я не пра тое, каб ты браў хабар, не пужайся.

Лена ўпэўнена ўсміхалася.

— У цябе вялікая практыка. Табе не прыходзіла ў голаў, што ты мог абараніцца? Напісаць кандыдацкую, мець людскую работу?

Яму гэта не прыходзіла ў голаў. Ён не ведаў, што ў сям'і ягоная работа — «нялюдская». Ад разгубленасці і крыўды сказалася моцна і жорстка:

— Я пра гэта не думаў і думаць не збіраюся!

— Які святы! Можа, за тваю святасць я паліто сабе куплю і сыну штроксы? Каб не Коля...

Дземашаў шурын Коля рабіў на міжнародных аўтаперавозках і забяспечваў радню «імпартам».

Дземаш нічога не адказваў, толькі пільна паглядзеў на Лену.

— А Волгіны што, на рабоце?

— Волгіны? — старая ўстрапянулася і прыгледзелася да Дземаша.

— Мы з Толікам некалі разам вучыліся. Прыехаў у горад, думаю, зайду, адведаю.

Дземаш прысеў на лаўку.

— Вунь яно што,— праспявала старая.— Няма, душа мая, Волгіных. Ні Валькі, ні Толіка.

І старая пачала расказваць пра тое, што Дземаш ведаў ужо.

— Яна бесталковая была, але каб не гэтая чорная буфетчыца, што яе са свету зводзіла... Я зразу казала, што ведзьма гэтая чорная!

— Якая буфетчыца? — перапытаўся Дземаш.

— На заводзе ў іх была, чарнявая такая, як цыганка. Валька і нам прыносіла то сасісак, то мяса якога добрага. Буфетчыца сюды і гэтага дурня чырванамордага прыводзіла. Потым дружба тая пачала раскідацца. Толік за нешта неўзлюбіў гэтую хеўру. Чорная прыбягала да Валькі, каб толькі Толік не бачыў.

— Хэ, дружба раскідалася! Мардаты гэты пачаў да Валькі... Валька ж маладая, а яму гэтая чорная старая курыца прыелася. Я Толіку і сказаў, каб пёр ён гэтага рыжага, калі не хоча рыжых гадаваць. А на жонку дрын добры бяры і таўчы, бо толку не будзе... Хэ! — не ўтрываў і стары.

— У цябе адна песня — таўчы. Ён жа і паслухаў цябе. Счэрніць яе на горкае яблыка: сам вып'е і плача на кухні.

— Бо позна таўчы пачаў, раней трэба было.

— Хваціць, што ты і мне здароўе адтоўк, свету за табою не бачыла.

— Мала тоўк, трэба было яшчэ і языка ўрэзаць!

Стары абмацаў рукою крывульку, нібы збіраўся напомніць тое, што было некалі.

— Яна ж і аборт сабе ўстроіла, бо Толік прыгразіў, што як народзіць рыжага...

— Не ведаў твой Толік нічога. Сама баялася, бо вечна п'яная была. Чорная і нараіла ёй бабку...

— Не бабку, а фельчарыцу.

— А ты бачыла тую фельчарыцу?

— А ты бабку бачыў? Валька ж казала, што сама...

— Мала што казала. Толік грэзіў чорнай. Яна і на пахаванне не пайшла. Але і сам, бедны, пад машыну папаў. Ён і так хадзіў, як спутаны, у бакі яго зыбала, пакуль пад машыну не зыбнуўся.

— Хэ, зыбнуўся. Ён Сярожыка павінен быў забраць з садзіка. З малым ён ніколі не зыбаўся.

— А дзе малы цяпер?

— У Толікавых бацькоў. Яны харошыя, талковыя людзі. Нестарыя яшчэ. Сярожыку ў іх будзе мо і лепш, чым з бацькамі. Толік-то добры натураю быў, але сцерлася жыццё і ў яе, і ў яго.

— Ты ўжо мо і заплачаш, ай-я-яй! Устаць памажы! — прыкрыкнуў стары на старую. Бабка ўзяла яго пад руку, падняла і павяла да пад'езда. Стары ішоў, нібы на драўляных нагах. Побач з мажнаю старою ён здаваўся маленькі і худзенькі, як карчучок.

Пракурор моўчкі слухаў Дземаша, спадылба толькі коратка пазіраў на яго і нешта крэсліў на лістку паперы. Хто не ведаў пракурора, то падумаў бы, што ён злуецца. Дземаш жа чакаў пытання, на якое цяжка будзе адказаць. Але пракурор не пытаўся, ён коратка сфармуляваў тое, што сказаў яму Дземаш:

— Значыць, Іван Васільевіч, у сувязі са справай пра ананімнае пісьмо ты ствараеш дзве: адна — пошук ананімшчыка, другая — пра забойства, якое дасюль значылася няшчасным выпадкам. Аргументаваных доказаў наконт другога ў цябе няма... Значыць, выздаравеў, калі сам сабе шукаеш надзвычайную справу?

Пракурор скупа ўсміхнуўся.

— У свой час смерць самой Волгінай, а потым і яе

мужа разглядаліся самі па сабе, без сувязі з крадзяжом на заводзе. Цяпер, што гэта выпадковасць, трэба правяраць. Тым больш што роля буфетчыцы і ў справе крадзяжу не даследавана, мы не ведаем прычыны сувязей яе з Волгінай.

— Ладна, Іван Васільевіч. Ананімкамі зоймуцца. Ты пакуль што будзеш рабіць праверку справы аб крадзяжы. Так будзем называць тваю работу. А калі знойдзеш доказы, а не толькі дагадкі, тады будзем думаць далей.

Пракурор устаў і гэтым даў зразумець, што гаворка скончана. На большае Дземаш і не разлічваў.

Бацькі Волгіна жылі ў прыгарадзе. Дваццаць хвілін язды на электрычцы. Ад станцыі Дземаш выйшаў на старую вулачку, тую, што была вясковаю вуліцаю. Цяпер вёска разбудавалася ў прыгарадны пасёлак, і былая вёска засталася толькі ўскраіннаю звілістаю вулачкаю з травою паўз платы, па якой тоненька беглі сцяжынкі.

Патрэбная Дземашу хата стаяла за пафарбаваным штыкетным плотам з металічнымі варотцамі. Праз плот былі відаць і акуратна дагледжаны сад, і грады, і выкладзеныя з бетонных плітак сцяжынкі, быццам нехта знарок выфарбаваў і вымеў усё да Дземашавага прыезду.

Ён адчыніў варотцы і па абсаджанай кустамі агрэсту і парэчак сцяжынцы падышоў да веранды, пагрукаў, памацаў за ручку. Дзверы былі замкнуты. Дземаш пастаяў і рушыў назад.

— Вы да нас? — пачуў ён мужчынскі густы голас, азірнуўся.

Хударлявы рослы мужчына ў чорным фартуху, з рубанкам у руцэ стаяў на парозе невялічкага дашчатага дамка, які, мабыць, служыў за майстэрню.

— Да вас.

Дземаш падышоў, павітаўся.

Мужчына ўздыхнуў, зняў фартух, акуратна павесіў яго на цвік. Апрануты ён быў у старое вайсковае адзенне, падцягнуты. Вочы суровыя і строгія. Рухі рашучыя і ўпэўненыя.

— Слухаю вас,— коратка сказаў ён і паказаў на невялічкую лаўку тут жа пры майстэрні.

— Заехаў пагаварыць з вамі... А як Сярожка?

— Паехалі з бабаю ў кіно ў горад. А пры чым тут Сярожка?

— Ні пры чым. Проста ні на рабоце, ніхто мне не мог сказаць толкам, дзе ён.

— На рабоце даўно забылі пра яе. Тым больш што пасля смерці яна аказалася і злодзеем.

Мужчына не назваў імя Волгінай.

— Вы не любілі нявестку?

— Не любіў. І быў праў. З-за яе ў нас не стала і сына.

— Як гэта зразумець?

— Не пара яны былі. Толіку другая жонка патрэбна была, а не гэты крутасвет.

— Вы часта бывалі ў гасцях у сына, сын у вас?

— Часцей Толік прыязджаў з Сярожкам.

— Нявестка не прыязджала?

— Яна ведала, што мы пра яе думаем. Ды і інтарэсы ў яе другія былі. Ёй гуляць трэба было. Ёй нават муж і сын заміналі. У іх парода такая, шалёная. Брат адзін у турме сядзіць, бацька век светам брыдзіў.

— Яны даўно знаёмыя былі?

—Толік з ёю вучыўся разам у школе. Ён у нас усё з кніжкамі сядзеў. Ну, а потым яна пад яго... Яна ўжо ўсё ўмела. Толіка да яе нібы прысаладзіла. А ёй такі ціхоня толькі і трэба быў...

— Калі вы бачыліся апошні раз з сынам?

— За два дні да таго,— Дземаш адчуў, як здрыгануўся голас мужчыны.— Я прыязджаў, хацеў забраць

Сярожку. Толік сказаў, што на выхадныя ён сам яго прывязе... Прывёз.

— Пастарайцеся ўспомніць, пра што яшчэ вы гаварылі.

— А я і так да смерці памятаць буду. Я сварыўся на яго, што спрабуе выпіваць. Не ўмеў ён гэтага, ды і здароўе ў яго не такое, каб улягаць у гэтае паскудства. Ён усміхаўся, гаварыў, скора перастану, бацька, выведу гэтую чорную на раку і кончу... Ажно яна яго вывела.

— А хто гэта яна?

— Ён мне не сказаў. Вальчына нейкая падружка. Я насварыўся на яго, каб выкінуў усё дурное з галавы, каб пра жывое думаў, пра сына. Малады яшчэ мужчына, жанчын хопіць... Ён усё па гэтай нудзіўся, не адпускала яна яго. Во як бывае. А чаму вы зноў пра гэта?

— Я не пра гэта. Пісьмо нам прыйшло...

Стары Волгін не дапытваўся болей.

— А вы даўно ў адстаўцы?

— Я? На пенсіі трэці год. Я не ваенны, я чыгуначнік.

Ён устаў, падаў на развітанне Дземашу руку, вочы яго былі сухія і строгія, і цяпер толькі Дземаш здагадаўся, што сталі яны такімі ад затоенага глыбокага гора, з якім усё не можа змірыцца чалавек.

— Толік у нас адзіны сын быў...

Стары Волгін сутула завярнуўся і пайшоў у майстэраньку.

Дземаш ужо на вуліцы прыпыніўся, азірнуўся на акуратны, радасна расфарбаваны дамок, але цяпер ён чамусьці здаўся яму нейкім сумным і пустынным.

— Ну, Дземаш, ты мне ўдружыў,— прагудзеў у трубку хрыплаваты голас следчага Камарова.— Трэба пакаваць чамаданы і збірацца на поўдзень.

Стары, вопытны следчы Камароў дарабляў да пенсіі.

Ён усім гаварыў, што чакае гэтага дня, каб з'ехаць на дачу — ад жонкі, ад дзяцей, ад унукаў і ад усяго таго зброду, які ён ловіць гэтулькі гадоў і пералавіць не можа. Ён наглядзеўся ўсяго, і камандзіроўка ў Крым яму была зусім не патрэбна.

— Хочаш, Іван Іванавіч, каб я за цябе злятаў?

— Можна і табе. Ты маладзейшы, пакуль што на адгуле.

— А я-то тут пры чым?

— А на тых ананімках, што ты на мяне сапхнуў, паштовыя штэмпялькі аднолькавыя.

— Пачакай, пачакай, Іван Іванавіч, я да цябе сам зайду,— Дземаш паклаў трубку, ад хвалявання ўстаў з-за стала. Гэтыя звесткі пра паштовы штэмпялёк, як святлом, асвяцілі тое, што ўжо ведаў Дземаш з гаворкі ў буфеце будаўнічага будтрэста, дзе працавала Салодава, тая самая «чорная».

Прыбіральшчыца, старая ўжо, нападпітку цётка, насцярожана паглядзела на Дземаша.

— Га, вы пра Анюту,— у голасе яе прагучала палёгка.— Спраўная была, не тое што гэтая курыца белая.

Прыбіральшчыца кіўнула галавою на прачыненыя дзверы, дзе стаяла ля прылаўка круглая белая буфетчыца.

— Усё камандуе, усё ёй не так! У цыганкі ўсё гарэла ў руках: у стакан лінула, на вясы кінула — і пайшло, пайшло. Калі што выгрузіць трэба, то рыжы яе тут як тут... Усяго ў буфеце было, не тое што цяпер. А гэта толькі і ведае, што мяне пільнуе...

— А чаго Анюта кінула работу?

— Чаго кінула? Лепшую знайшла. У яе ўвесь свет знаёмы. Недзе на бераг мора паехала... Гэта рыжы мне хваліўся. Мы з ім тут віна бутэлечку распілі. Я пачала яго дражніць, што ходзіць, як абарванец. А ён мне скаліцца, што скора будзе, як міністр, на «Волзе» ездзіць і

на ўсіх паплёўваць. Анютка тут якраз усунулася, вызверылася на яго, бутэльку схапіла. Яна ніколі такога не рабіла, выпіць не шкадавала, абы, гаворыць, работа была зроблена. У бутэльцы яшчэ добры стакан віна астаўся.

— Яны жанатыя былі?

— Не, не разам жылі.

— Хіба Саладава не магла сабе лепшага знайсці?

— Чаму не? Яна баба яркая, відная.

— Дык чаму яна з гэтым п'яніцам?..

— П'яніца-то п'яніца, але ніколі п'яны не быў і не валяўся. Анютка што скажа, усё споўніць. Ён і не рыжы, цёмнавалосы, нават валаска сівага няма. Бровы белыя толькі. А як выгаліцца, дык аж блішчыць... Мабыць, нешта меў, недарам Анютка яго не адпускала...

Прыбіральшчыца хіхікнула, паказаўшы рэдкія старэчыя зубы.

Дземаш прайшоў па пакоі. Прадчуванне не абманвала яго — ён знайшоў след буфетчыцы Саладавай. Значыць, Камарову ехаць у Феадосію нельга. Дземаш зняў тэлефонную трубку. Пракурор будзе толькі заўтра. У яго, такім чынам, быў яшчэ час, каб усё праверыць і ўзважыць, падрыхтавацца да дакладу.

Дземаш, каб крыху супакоіцца, яшчэ раз прааналізаваць усё, што было яму вядома, выйшаў з кабінета і па вуліцы неўзаметку пайшоў у той бок, дзе ён ужо не раз бываў за апошнія дні. Вядома, спадзявання, што хоць што-небудзь удасца знайсці, у яго не было, але ён пайшоў на тую вуліцу, дзе загінуў Волгін.

Праз добрае паўгадзіны хаджэння па лесвічных пляцоўках ад дзвярэй да дзвярэй яму адчыніла на званок рослая маладзіца ў халаце. Бялявыя валасы былі каротка падстрыжаны, халат прыхвачаны поясам.

— З пракуратуры? Заходзьце.

Голас у жанчыны быў хрыплаваты, як прастуджаны. Яна пайшла паперадзе Дземаша. У калідорчыку

пахла душным і нечым кіславатым, як звычайна ў камунальных кватэрах. У пакой жанчына прапусціла наперад Дземаша. Пакой займалі канапа, шафа, сервант, дзіцячы ложачак, тэлевізар, стол, на балкончыку сушыліся пялёнкі і калготкі. У ложачку поўзаў, гудзеў сабе пад нос і спрабаваў устаць і пайсці мардаценькі малы.

Жанчына перахапіла Дземашаў позірк.

— Шэсць гадоў з мужам дамы будуем, а з гэтага клапоўніка вылезці не можам.

Яна змахнула рукою з крэсла, хоць на ім нічога і не было.

— Я хацеў папытаць, ці не помніце вы пра тое, як тут на вуліцы аўтобус збіў чалавека.

— А-а-а, усё ж прыйшлі! Я тады гаварыла Віцю, а ён — не лезь, куды не след. Калі трэба, то самі прыйдуць папытаюць.

— Што вы бачылі?

— Я на балконе пялёнкі вешала. Якраз змена канчаецца, і ў гэту пару на тратуары людзі аж не ўмяшчаюцца, усе спяшаюць. Адзін толькі паміж імі ў пінжачку замінае. Зверху відно, што ўжэ так вочы замазаў, як вобмацкам ідзе. Зверху смешна глядзець на яго, нязграбны такі. Адале гляджу, недалёка ад яго, але следам другі ідзе. Здаровы, у зялёнай штармоўцы. Бачу, што быццам і за ім ідзе, але блізка не падыходзіць, як назіркам усё роўна. Потым я адвярнулася, чую, тармазы завішчалі, бабы крыку нарабілі... Мне з акна не надта відно было... А той, у зялёнай штармоўцы ці ў робе, бачу, з кучы выбіраецца. Спяшаў, каб скарэй выбрацца...

— Што вы яшчэ можаце сказаць?..

— Нічога. Здаровы такі...

— А ў гэтай робе пазналі б яго?

— Не знаю, можа, і пазнала б... Паходка ў яго нейкая, быццам рубам. А можа, п'яны быў... Яго яшчэ

стары бачыў, ён над намі жыве. Ен на балконе цэлыя дні сядзіць. Ен мне пра гэта расказваў. На яго нявестка і сын прыгразіліся, каб не лез альбы куды...

Дземаш дакладваў спакойна і ўпэўнена. Пракурор не перабіваў яго, толькі па ходу дакладу задаваў пытанні.

— Ваша версія, што Волгін забіты?

— Магчыма. Бяспрэчна адно, што Соладава — а па адзенні, па паходцы чалавек у робе яе напарнік — мае дачыненне да смерці Волгіна. Значыць, ён нешта знаў такое. У гэтым я ўпэўнены. Самалячэннем Волгінай дапамагала займацца Соладава... І сёння мы так і не ведаем, дзе ж накрадзеныя зладзеямі грошы. Значыць, яны ў некага...

— У Камарова ёсць звесткі, што Соладава арандавала дачку. Утульнае такое месца. Там бывалі часта мужчыны, жанчыны... Частая госця — Кажух... З мужам яна не ладзіла.

— Пра гэта, здаецца, гаварыў галоўбух. Думаю, што мне трэба ехаць на поўдзень. Расследаваць ананімку, а пад выглядам яе...

— Паедзеш. Падключыцца міліцыя. Камароў будзе тут працягваць. Табе дапамогуць мясцовыя таварышы. З Соладавай не спяшайся, правер усё. Вельмі асцярожна. І не забывай пра сваё сэрца...

Дземаша сустрэлі ў аэрапорце, і праз дзве гадзіны ён быў на пабярэжжы мора ў невялічкім гарадку, у маленькай белай гасцініцы. Тут жа адразу Дземаш быў і ашарашаны паведамленнем маладога міліцэйскага маёра: у іх тут ніякай Соладавай няма, тым больш такое, што пасялілася нядаўна. Гэтага Дземаш не чакаў:

— Прабачце, тады чаго я ехаў сюды? Вы маглі паведаміць...

— Мы паведамілі, але вы ўжо былі ў дарозе.

Маёр хітра ўсміхнуўся.

— Толькі вы не думайце, што мы дадзім вам тут купацца і загараць. Вашу Соладаву знайшлі. Пасялілася яна непадалёку ў пасёлачку, за дваццаць восем тысяч купіла сабе домік. Працуе буфетчыцай у палатцы ля выратавальнага прычала. Жыве з Бурцавым Фёдарам Пятровічам. Незарэгістраваная, але жывуць разам. Ён вартаўніком працуе ноччу на турбазе. У мясцовай міліцыі ні да Соладавай, ні да яе мужа прэтэнзій няма. Ён не п'е. Возіць Соладаву на машыне. Машыну яны купілі год назад... Думаю, што нумар у гасцініцы вам здаваць не трэба. З пасёлка да нас пятнаццаць хвілін язды рэйсавым... Калі трэба там будзе застацца, пакойчык вам знойдуць.

Праз нейкую гадзіну лейтэнант у сваім пакойчыку ўчастковага паўтараў сказанае маёрам.

— Мяне вось што толькі бянтэжыць, таварыш следчы. Чаму яна жыве з гэтым Бурцавым. Яна прыгожая жанчына, а ён крышку ўсё ж дэбільны нейкі, дурнаваты. Тут у пасёлку гаварылі, што яна з'язджае на дзён колькі ці ў Сімферопаль, ці нават у Севастопаль, з мужчынамі там яе бачылі. Ён слухае яе як робат. Я раз бачыў, як ён збоку глядзеў на мужчын, якія жартавалі з гэтай Анюткай у буфеце. А яна толькі вокам стрэліла на яго — нагнуў галаў і пайшоў.

Участковы пасяліў Дземаша ў прыватным доме, у пакойчыку з асобным выхадам. Домік стаяў у ціхім завулку, недалёка ад берага, на ўзгорку.

Вечарам Дземаш схадзіў павячэраў у рэстаранчыку, які мясціўся ў чатырохпавярховым будынку турбазы.

Мора ў заліве было спакойнае, белы караблік, які заходзіў да прычала, запаліў агні. Гулялі на набярэжнай болей парачкамі, і ў святле ліхтароў усё здавалася святочным.

У канцы набярэжнай, ля выратавальнай станцыі Дземаш знайшоў збіты з дошак і пафарбаваны ў сіні колер буфет. Перад ім стаяла на дварэ некалькі сталоўстоек. На іх мужчыны пілі віно і піва. Дземаш таксама выпіў піва, дачакаўся, пакуль буфет будзе зачыняцца.

Соладава была крутагрудая жанчына ў белай кофце і белай спадніцы, лёгкая і маладжавая ў рухах. Бурцава Дземаш таксама пазнаў па апісанні. Праўда, адзеты ён быў у «фірмовыя» джынсы, у сінюю рубашку з закасанымі рукавамі. Але і джынсы, і гэтая рубашка на заклёпках сядзелі на ім, быццам з чужога пляча. Мабыць, у брызентавай робе ён адчуваў сябе больш утульна.

Соладава аддала Бурцаву сваю гаспадарчую сумку, узяла яго пад руку. Ён пайшоў, угнуўшы галаву, нібы збычыўся. І ў Дземаша, які глядзеў на гэтую збычаную постаць, не асталося ніякага сумнення, што гэтае крутое плячо магло лёгка папхнуць Волгіна, асабліва калі гэта загадала зрабіць Соладава.

Ноччу Дземаш праз адчыненае акно чуў, як шуміць мора, як наплывае начны халадок, і думаў пра тое, што дамовіцца з гаспадарамі і потым прыедзе да іх на які тыдзень...

Прачнуўся Дземаш раненька, схадзіў пакупацца ў моры і пасля купання, бадзёры, лёгкі, пайшоў да турбазы.

На душы ў яго было прывычнае адчуванне лёгкасці, як і заўсёды, калі зроблена асноўная работа, калі загадка разгадана, калі справа раскрыта.

Дземаш папрасіў дзяжурную паклікаць вартаўніка ў свой пакой. Бурцаў зайшоў у пакой паволі, па ўсім адчувалася, што быць у кабінетах ён не любіў.

— Фёдар Пятровіч, чаму вы пакінулі работу на заводзе? — Дземаш прыдумаў гэтае пытанне на хаду. Ён цяпер толькі здагадаўся, што калі там працавала Соладава, то павінен быў працаваць і Бурцаў.

— Прайшло новае начальства і сказала, што нас многа там розных падсобнікаў.

— Новае начальства — гэта галоўбух?

— І галоўбух.

Бурцаў глядзеў на Дземаша насцярожанымі вачамі. У іх Дземаш бачыў толькі адно — жаданне як найхутчэй выйсці з кабінета.

— Таму вы і рашылі пісаць на яго пісьмы?

— Я не пісака, я толькі распісваюся.

Бурцаў упарта глядзеў на Дземаша, і ў ягоных вачах была тупая пустата.

— А ў горадзе вы жылі ў раёне вуліцы Міхайлава?

Дземаш заўважыў, як у вачах у Бурцава на імгненне нешта ўспыхнула, яны быццам асвятліліся жахам.

— Не, я на Галадзеда жыву... Я не спаў ноч, я спаць хачу.

— Ладна, Бурцаў, ідзіце паспіце, успомніце, што і дзе пісалі...

Дземаш дачакаўся на турбазе ўчастковага, яны зайшлі ў аддзел кадраў, узялі справу Бурцава. Варта было толькі вокам кінуць на напісаную ім заяву, каб зразумець, што ананімкі напісаны не рукою Бурцава. Дземаш зразумеў, што дарэмна паспяшаў, калі вырашыў, нібы ўсё скончана. Участковы напомніў Дземашу, што званілі з райаддзела і прасілі, каб ён пазваніў у сталіцу.

— Іван Васільевіч! У цябе цудоўная інтуіцыя,— у голасе пракурора Дземаш улавіў здзеклівасць.— Шанцуе табе, а то я паказаў бы табе за гэтую інтуіцыю. Соладава і Бурцаў ананімак не пісалі. У іх там на заводзе ў планавым аддзеле займаўся адзін. Адтуль, дзе ты на поўдні пуза грэеш, ягоная сястрычка іх перасылала. Вось так, інтуіцыя! Але не бойся, тут твой стары знаёмы капітан Малышаў табе сёе-тое цікавае раскажа.

— Здароў, Іван Васільевіч! Як у цябе справы з ма-

ладзіцаю, за якой па возеры прагульваўся? Павер маёй інтуіцыі, тут-то ты прагарэў. Гэта точна!

— А ты адкуль ведаеш? І што табе да гэтага?

— Я павінен многа ведаць. А пра тое, што будзе — інтуіцыя... Цяпер слухай уважліва. Соладава, яна ж і Церахава, і Санько. Судзілася тры разы. Разбэшчванне непаўналетніх, шантаж. На дачы ў яе бывалі многія, з каго можна пацягнуць грошы. Прытон. Кажух і Волгіна таксама. Соладава шантажыравала іх. Пад яе камандаваннем і ёй кралі грошы. Цяпер зразумела, чаму Кажух брала ўсё на сябе? У яе двое дзяцей, яна баялася, што Соладава абнародуе тое, што выраблялі на дачы. Баялася гэтага больш, чым турмы. Соладава жыла на кватэры ў раёне вуліцы Міхайлава. Там, дзе загінуў Волгін. Ён прыходзіў да яе. Я дапытаў старога. Думаю, што Волгін сам яшчэ знайшоў сведкаў — пад чаркаю і ў адчаі...

— Ты хочаш сказаць, што Соладава падвяла яго пад самагубства?

— Няма доказаў, што Волгіна падапхнулі пад колы. Мы тут на дачы і на старой кватэры шукаем негатывы ці фатаграфіі. Не думаю, каб Соладава не зберагала іх. Звярні на гэта ўвагу. Бурцаў па нашай картатэцы не значыцца. З сабраных звестак відаць, што чалавек дэбілаваты, але не злачынец. У Соладавай за рабочую сілу і для задавальнення... Так, пошасці яе... Гэта мае вывады. Лагічна? Зараз галоўнае — Соладава і Бурцаў...

Дземаш не даслухаў да канца, паклаў трубку. Трывожнае прадчуванне памылкі кальнула яго.

На буфеце, перад якім прытармазіў міліцэйскі «козлік», вісела паперка з традыцыйным «паехала на базу».

Калі міліцыянеры і Дземаш увайшлі на двор Соладавай, то Іван Васільевіч ужо ведаў, што машыны ў гаражы няма. Бурцаў спаў нераспрануты. Ад яго смяр-

дзела перагарам. Спрасонку ён няўцямна глядзеў на міліцыянераў, на Дземаша.

— Дзе Анюта?

— У буфеце!

— Пайшлі!

Бурцаў устаў і толькі цяпер угледзеў на двары міліцэйскую машыну. У тое ж імгненне ён коратка рыкнуў, міліцыянеры разляцеліся ў два бакі, а Бурцаў, расхінуўшы целам у два бакі аконныя рамы, выскачыў на двор.

Дземаш выскачыў услед. Ён бачыў, як Бурцаў пераляцеў цераз высокі бетонны плот, ірвануўся следам за ім, сходу схапіўся рукамі паверх плота, і той раптам паляцеў на яго...

З сардэчным прыступам Дземаш праляжаў у раённай бальніцы два тыдні. Клапатлівыя дактары баяліся выпускаць раней, хаця Іван Васільевіч адчуваў сябе не так ужо і дрэнна на другі дзень.

Бурцава злавілі тады ж, Соладаву — на восьмыя суткі ў Архангельскай вобласці, ужо пад іншым прозвішчам. У чамаданчыку пры ёй былі грошы, каштоўнасці і негатывы фотаздымкаў. Малышаў правёў ужо першыя допыты. Так, Волгіну яны паказалі здымкі яго жонкі на дачы, каб прыпужнуць. Напаілі. Бурцаў ішоў следам за п'яным Волгіным, каб той дайшоў дадому. Адправіла яго Соладава.

Калі Волгін кінуўся пад аўтобус, Соладава спалохалася, што іх могуць западозрыць з Бурцавым у забойстве.

Справа была падрыхтавана для перадачы ў суд. У рэшце рэшт, хоць і не да канца, але пацвердзілася ягоная версія, справа была пачата ім, Дземашам, і даведзена да таго, што затрыманы злачынцы.

— Ты адлежвайся там, каб стаў на ногі. І на будучае запомні, што мне трэба твая галава і вопыт, а не

твае ногі, каб цераз плыты гальцаць ці за бамбізамі ганяцца...— журыў Дземаша пракурор, і голас яго быў дабрадушны.— Тут табе звоняць, пытаюцца, я сказаў, што ў тэрміновай камандзіроўцы... Адным словам, папраўляйся як след. Нам загадку падкінулі, не раўня. Папраўляйся, не засумуеш!

Пасля гэтае гаворкі з пракурорам Дземаш канчаткова зразумеў, што рабіць яму больш у бальніцы няма чаго.

Прыехаў Дземаш цягніком, раніцаю. Пасля таго як выйшаў з таксі, пастаяў, паглядзеў на вокны свае кватэры, якія былі роўна зашторaны. Ён паволі ўзышоў на свой паверх, адамкнуў дзверы і найперш, як і заўсёды рабіў, адчыніў вокны, пусціў у ванну ваду. Праз гадзіну ён сядзеў у крэсле ад журнальнага століка і перабіраў газеты і часопісы, якіх сабралася без яго поўная паштовая скрынка, пакрысе адсёрбваў чай, яшчэ гарачы.

Потым зазваніў тэлефон, і сынаў басок павітаўся:

— Дзень добры, папа.

— Дзень добры, Валодзя. Як у цябе спаборніцтвы?

— Нармальна. Выйшаў на трэцяе. Гэта ўсесаюзныя.

— Віншую.

— Ну, дык як ты адчуваеш?

— Гэта ты мне званіў на работу?

— Я.

— Прыязджай у госці, паглядзіш.

— І па бакалу шампанскага вып’ем?

— Вып’ем.

— Ну, тады веру, што ўсё ў парадку. Пад’еду заўтра. Сёння ў мяне дзень распісаны.

— Прыязджай.

Дземаш падумаў, што яму вельмі хочацца, каб сын прыехаў зараз... Хацелася ўбачыць, пагутарыць з ім чым хутчэй, неадкладна...

Назаўтра Дземаш прывычна выйшаў на прыпынку з трамвая, сцяжынкаю пакіраваў да свайго берага. У выхадны дзень не было на сваім кругу групы здароўя, але папісквалі нязмазаныя арэлі-лодачкі, пазяхала, як і ўсё лета, у касе атрыкцыёнаў касірка. Але пункт пракату быў зачынены ўжо да наступнага сезона на ўсе вокны і дзверы наглуха. На беразе яшчэ загаралі. Дземаш падышоў да свае мясціны, пастаяў над вадою не распранаючыся. Вада ў возеры была па-асенняму зазелянелая. Нізка над галавою прайшлася чародка качак — з тых, што сабраліся зімаваць у горадзе. Дземаш раптам успомніў жанчыну з сумкай у буйныя жоўтыя плямы, яе сумнаваты позірк, і толькі цяпер да яго дайшла і яе туга, і яе адзінота, і жаданне пазбавіцца ўсяго гэтага. Ён нават павёў вачамі ўздоўж берага, нібы хацеў позіркам дагнаць яе. І сапраўды адчуў, што сонца ўжо не грэе, толькі залоціць святлом. Ён завярнуўся і пайшоў прэч. На рабоце Дземаш узяў новую справу, выехаў у камандзіроўку, нягледзячы на ўсе папярэджанні з-за хворага сэрца.

# ЗМЕСТ

## АПАВЯДАННІ

Хлопчык на краі поля — 4
Пагарэльцы — 14
Абочыны — 20
Садоўнік — 34
Каценька-Кацюша — 48
Вецер — 54
Багамолка — 57
Плынь — 63
«Еду я і плачу...» — 73
Бярозы над зямлёй — 83
Каліна ў жыце — 91
Калі ідуць дажджы — 98
Наваселле — 102
Вечар — 109
Антракт — 116
Сляпая сіла — 122
Чужая песня — 129
Зялёны дождж — 136
Панскія кніжкі (*Расказ дзеда*) — 141
На дазорнай сцяжыне — 146
Эцюды вяртання — 158
    Зімовыя лебедзі — 158
    Жытнікі — 160

## АПОВЕСЦІ

Чорны павой — 167
Асабліва небяспечнае — 331

Издание для детей и юношества

**ЖУК Александр Александрович**

**НА СТОРОЖЕВОЙ ТРОПЕ**

**Рассказы и повести**

Для старшего школьного возраста
Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке
Выданне для дзяцей і юнацтва

**ЖУК Алесь Аляксандравіч**

**НА ДАЗОРНАЙ СЦЯЖЫНЕ**

**Апавяданні і аповесці**

Для старэйшага школьнага ўзросту

Загадчык рэдакцыі *В. М. Новік*. Рэдактар *Я. І. Хвалей*. Малодшы рэдактар *Г. Д. Зінчанка*. Мастацкі рэдактар *В. І. Кліменка*. Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*. Карэктар *Л. І. Саўчанка*.
ІБ № 1400

Здадзена ў набор 19.07.89. Падпісана да друку 19.02.90. АТ 11161. Фармат 70×108[1]/32. Папера друк. № 1. Гарнітура Школьная. Высокі друк з ФПФ. Ум. друк. арк. 16,10. Ум. фарб.-адб. 16,1. Ул.-выд. арк. 16,48. Тыраж 12 000 экз. Зак. 2732. Цана 85 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.